Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**В.Е. Лявончыкаў, Л.А. Дзямешка, Р.І. Саматыя**

# ТЛУМАЧАЛЬНЫ СЛОЎНІК БІБЛІЯТЭЧНЫХ І БІБЛІЯГРАФІЧНЫХ ТЭРМІНАЎ

*3-е выданне, выпраўленае і дапоўненае*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2012

УДК [01+02](038)
ББК 78.0я21
Л 97

А ў т а р ы:
*Лявончыкаў В.Е.*, доктар педагагічных навук, прафесар;
*Дзямешка Л.А.*, кандыдат педагагічных навук, прафесар кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў;
*Саматыя Р.І.*, старшы выкладчык кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў

Р э ц э н з е н т ы:
*Кірухіна Л.Г.*, намеснік дырэктара па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь;
*Ляйко Н.А.*, кандыдат гістарычных навук, прафесар кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў

Рэкамендаваны да выдання навукова-метадычным саветам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (пратакол № 7 ад 30.06.2011 г.)

**Лявончыкаў В.Е.**
Л 97 Тлумачальны слоўнік бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў / В. Е. Лявончыкаў, Л. А. Дзямешка, Р. І. Саматыя ; Мін-ва культуры Рэспублікі Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – 3-е выд., выпр. і дап. – Мінск : БДУКМ, 2012. – 232 с.
ISBN 978-985-522-053-5.

Падаюцца азначэнні бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў, а таксама дэфініцыі сумежных галін сістэмы дакументных камунікацый, асабліва па інфармацыйнай дзейнасці і інфарматыцы, кніжнай справе і кнігазнаўстве.

Адрасаваны бібліятэкарам і бібліёграфам, работнікам навукова-тэхнічнай інфармацыі і кніжнай справы, выкладчыкам, аспірантам, магістрантам і студэнтам вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў дадзенага профілю.

**УДК [01+02](038)**
**ББК 78.0я21**

**ISBN 978-985-522-053-5**

© Лявончыкаў В. Е., Дзямешка Л. А., Саматыя Р. І., 2000
© Лявончыкаў В. Е., Дзямешка Л. А., Саматыя Р. І., 2012, са змяненнямі
© Афармленне. УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», 2012

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРАДМОВА

Актуальнасць выдання прапануемага тлумачальнага слоўніка бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў абумоўлена як патрабаваннямі бібліятэчна-бібліяграфічнай практыкі, так і развіццём навук − бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства. У тэрміналагічнай сістэме бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства адбыліся істотныя змены, якія грунтуюцца на дынамічных і разнастайных пераўтварэннях у бібліятэчнай справе і бібліяграфіі пад уздзеяннем перамен у жыцці беларускага грамадства.

За апошнія гады бібліятэчная і бібліяграфічная тэрміналогія істотна папоўнілася новымі азначэннямі навукова-інфармацыйнай дзейнасці, інфарматыкі, што з'яўляецца адлюстраваннем актыўнага развіцця працэсаў пабудовы ў нашай дзяржаве інфармацыйна дасведчанага грамадства. Акрамя таго, шырокая аўтаматызацыя бібліятэчна-бібліяграфічнай тэхналогіі патрабавала ўвядзення значнай колькасці спецыяльнай лексікі. Сведчаннем развіцця гэтых працэсаў з'яўляецца распрацоўка і прыняцце новых міждзяржаўных і дзяржаўных стандартаў. У прыватнасці, у Рэспубліцы Беларусь у 2004 г. быў прыняты комплексны дзяржаўны стандарт «Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць. Бібліяграфія».

У тлумачальны слоўнік уключаны галоўным чынам тэрміны па тэорыі, гісторыі, тэхналогіі і методыцы, арганізацыі, метадалогіі бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства. У выданні шырока пададзена тэрміналогія па сумежных навуках і галінах дзейнасці, асабліва па кніжнай справе і кнігазнаўстве, навукова-інфармацыйнай дзейнасці і інфарматыцы, з якімі бібліятэчна-бібліяграфічная справа мае сістэмныя сувязі. У слоўнік таксама ўключаны асобныя агульнанавуковыя тэрміны, якія ўжываюцца ў сферах бібліятэчнай і бібліяграфічнай дзейнасці і будуць неабходныя для спецыялістаў.

Асноўную частку тлумачальнага слоўніка складаюць тэрміны папярэдніх выданняў. Акрамя таго, змест яго дапоўнены новымі тэрмінамі, што з'явіліся ў апошнія гады.

Галоўнымі крыніцамі выяўлення новай тэрміналогіі ў бібліятэчна-бібліяграфічнай сферы для аўтараў з'явіліся «Библиотечная энциклопедия», выдадзеная Расійскай дзяржаўнай бібліятэкай у 2007 г., тэрміналагічны слоўнік «Библиографическая наука и практика», складзены В. А. Факеевым і выдадзены ў 2008 г., а таксама манаграфіі і навуковыя артыкулы, апублікаваныя ў прафесійных выданнях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прынцыповым адрозненнем трэцяга выдання слоўніка з'яўляецца тое, што пры азначэнні таго ці іншага тэрміна спачатку падаецца дэфініцыя, вызначаная ў тэрміналагічных стандартах, прытым у асобных выпадках прыводзіцца азначэнне альтэрнатыўнае, якое існуе ў манаграфіях, падручніках, энцыклапедыях і іншых крыніцах. Зразумела, што перавага аддаецца менавіта тым азначэнням, якія прапанаваны стандартамі. У дапоўненым выданні ўдакладняюцца азначэнні тых тэрмінаў, якія ў першым выданні былі пададзены не зусім дакладна, а ў апошнія гады развіццё тэорыі і практыкі дазволіла больш адэкватна раскрыць іх змест.

Фармулёўка тэрмінаў, якія стандартызаваны, адпавядае дзяржаўнаму стандарту Рэспублікі Беларусь «Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць. Бібліяграфія» (Мінск, 2004). У тых выпадках, калі па асобных тэрмінах яшчэ няма пэўнай дэфініцыі, азначэнне ў слоўніку падаецца на падставе найбольш распаўсюджаных уяўленняў. Для большай інфармацыйнасці ў слоўнікавым артыкуле прыводзяцца сінонімы стандартызаваных ці нестандартызаваных тэрмінаў, якія размяшчаюцца ў канцы артыкула. У слоўніку таксама пададзены абрэвіятуры тэрмінаў. Найбольш распаўсюджаныя з іх размешчаны ў алфавітным парадку і прыводзіцца спасылка на поўны стандартызаваны тэрмін. Напрыклад: **ББК гл.: Бібліятэчна-бібліяграфічная класіфікацыя.** Астатнія абрэвіятуры падаюцца ў дужках пасля поўнага тэрміна. Напрыклад: **Міжнародны стандартны нумар кнігі (ISBN).**

Тэрміны ў слоўніку згрупаваны ў алфавітным парадку. Складаныя тэрміны размешчаны па алфавіце першага слова. Напрыклад: **Бібліятэчная справа, Бібліятэчныя рэсурсы.**

Зразумела, што ў рабоце над слоўнікам аўтарам не ўдалося поўна раскрыць тэрмінасістэму бібліятэчнай справы і бібліяграфіі, а тым больш вычарпальна і адназначна растлумачыць ужывальныя ў гэтых сферах паняцці. Адносна зместу і аб'ёму асобных з іх да цяперашняга часу ў вучоных і практыкаў няма адзінай думкі.

Аўтары з удзячнасцю прымуць заўвагі і прапановы і выкарыстаюць іх у далейшай працы над слоўнікам.

У якасці даведачнага выдання тлумачальны слоўнік адрасаваны шырокаму колу бібліятэкараў і бібліёграфаў у галіне практычнай дзейнасці, а таксама выкладчыкам і студэнтам сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў дадзенага профілю; спецыялістам сумежных галін, якія цікавяцца праблемамі бібліятэчнай справы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# СПІС СКАРАЧЭННЯЎ

АБС – аўтаматызаваная бібліятэчная сістэма
АПМ – аўтаматызаванае працоўнае месца
АПП – алфавітна-прадметны паказальнік
АТД – агульныя тыпавыя дзяленні
ББК – бібліятэчна-бібліяграфічная класіфікацыя
БВ – база ведаў
БД – база даных
БЗ – бібліяграфічны запіс
ВРІ – выбарачнае распаўсюджанне інфармацыі
ДБА – даведачна-бібліяграфічны апарат
ДКД – дзесятковая класіфікацыя дакументаў
ІПМ – інфармацыйна-пошукавая мова
ІПС – інфармацыйна-пошукавая сістэма
ISBD – міжнароднае стандартнае бібліяграфічнае апісанне
ISBN – міжнародны стандартны нумар кнігі
ISDS – міжнародная сістэма даных аб серыйных выданнях
ISSN – міжнародны стандартны нумар серыйнага выдання
ІФЛА – міжнародная федэрацыя бібліятэчных асацыяцый і ўстаноў
МБА – міжбібліятэчны абанемент
МТД – моўныя тыпавыя дзяленні
МФД – міжнародная федэрацыя па дакументацыі
НІД – навукова-інфармацыйная дзейнасць
НТБ – навукова-тэхнічная бібліятэка
НТІ – навукова-тэхнічная інфармацыя
ПВД – пошукавы вобраз дакумента
ПВЗ – пошукавы вобраз запыту
ПДБ – публічныя дзяржаўныя бібліятэкі
ПК – прадметны каталог
СК – сістэматычны каталог
ТТД – тэрытарыяльна-тыпавыя дзяленні
УДК – універсальная дзесятковая класіфікацыя
ЦБС – цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма
ЦІ – цэнтралізаванае індэксаванне
ЭВМ – электронна-вылічальныя машыны
ЭК – электронны каталог

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# А

**АБАВЯЗКОВЫ МЯСЦОВЫ ЭКЗЭМПЛЯР**

Устаноўленая і перыядычна зацвярджаемая колькасць дакументаў, якія з'яўляюцца ў межах пэўнага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення (край, вобласць і інш.) і падлягаюць абавязковай перадачы ва ўстановы і арганізацыі (бібліятэкі, архівы і г.д.).

Існуюць платны і бясплатны А.м.э.

**АБАВЯЗКОВЫ ЭКЗЭМПЛЯР ДАКУМЕНТАЎ (АБАВЯЗКОВЫ ЭКЗЭМПЛЯР)**

Устаноўленая і перыядычна зацвярджаемая колькасць айчынных дакументаў, якія падлягаюць абавязковай перадачы іх вытворцамі ў пэўныя ўстановы і арганізацыі. У склад абавязковага бясплатнага і платнага экзэмпляраў уваходзяць усе віды дакументаў.

**АБАВЯЗКОВЫ ЭЛЕМЕНТ БІБЛІЯГРАФІЧНАГА АПІСАННЯ**

Элемент, які змяшчае звесткі, што забяспечваюць ідэнтыфікацыю дакумента.

**АБАНЕМЕНТ**

1. Форма бібліятэчнага абслугоўвання, бібліятэчная паслуга, якая дае права карыстацца творамі друку і іншымі дакументамі бібліятэчнага фонду па-за бібліятэкай; прадугледжвае выдачу бібліятэчных матэрыялаў яе асобным карыстальнікам (індывідуальны), арганізацыям (калектыўны), бібліятэкам (міжбібліятэчны абанемент – МБА).

2. Структурнае падраздзяленне бібліятэкі, якое ажыццяўляе выдачу дакументаў для карыстання па-за бібліятэкай.

**АБАНЕМЕНТНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ**

Бібліятэчнае абслугоўванне, ажыццяўляемае на абанеменце, на міжбібліятэчным і міжнародным міжбібліятэчным абанеменце, у межах нестацыянарнага абслугоўвання.

**АБАНЕМЕНТНАЯ КАРТКА**

Картка ўстаноўленага ўзору з указаннем нумара абанента і звестак аб ім. На А. к. запісваюцца звесткі аб даце выдачы дакументаў і іх звароце ў бібліятэку.

**АБАНЕМЕНТНЫ ТЭРМІН**

Тэрмін здачы ў бібліятэку (на абанемент) узятых для чытання кніг ці іншых дакументаў. А. т. вызначаецца ў адпаведнасці з «Правіламі карыстання бібліятэкай».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**АБАНЕНТ БІБЛІЯТЭКІ**

Фізічная або юрыдычная асоба, якая зарэгістравана бібліятэкай як яе пастаянны карыстальнік **(3.2.2.23)**[1].

**АБАНЕНТ МІЖБІБЛІЯТЭЧНАГА АБАНЕМЕНТА (МБА)**

Фізічная або юрыдычная асоба, якая звяртаецца да паслуг міжбібліятэчнага абанемента і зарэгістравана ў бібліятэцы ў адпаведнасці з існуючым парадкам.

**АБАНЕНТ СІСТЭМЫ ВЫБАРАЧНАГА РАСПАЎСЮДЖВАННЯ ІНФАРМАЦЫІ**

Асоба ці ўстанова, якія карыстаюцца інфармацыйным абслугоўваннем па сістэме выбарачнага распаўсюджвання інфармацыі.

**АБАРАЧАЛЬНАСЦЬ ФОНДУ**

Адносны паказчык, які адлюстроўвае інтэнсіўнасць выкарыстання бібліятэчнага фонду. Вымяраецца колькасцю кнігавыдач, якія прыходзяцца на адзінку фонду ў пэўны прамежак часу.

**АБАРАЧАЛЬНАЯ КАМБІНАЦЫЯ ІНДЭКСАЎ**

Камбінацыйныя індэксы (з незалежнымі вызначальнікамі) са знакам плюс, двукроп’ем, перастаноўка элементаў якіх магчыма без змянення іх сэнсу.

**АБ’ЕКТ ІНФАРМАЦЫІ**

Прадмет ці з’ява, да якога прама ці ўскосна адносіцца дадзеная інфармацыя.

**АБ’ЕКТ КАТАЛАГІЗАЦЫІ**

Дакумент, яго састаўная частка ці сукупнасць дакументаў, якія паступілі да каталагізатара на апрацоўку.

**АБ’ЁМ ВЫДАННЯ**

Колькасная характарыстыка выдання, выражаная ў папяровых, друкаваных (умоўных і фізічных), улікова-выдавецкіх аркушах, у старонках, калонках.

**АБ’ЁМ ФОНДУ**

Колькасць дакументаў ва ўстаноўленых адзінках уліку ў бібліятэчным фондзе. А. ф. – адна з характарыстык дакументнага фонду бібліятэкі і забеспячэння насельніцтва бібліятэчнымі дакументамі.

Сін.: Велічыня фонду.

[1] Тут і далей азначэнне тэрмінаў падаецца ў адпаведнасці з фармулёўкай ДАСТ з указаннем яго пазіцыі. Гл.: комплексны дзяржаўны стандарт «Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць. Бібліяграфія». Мінск, 2004.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**АБЗАЦ**

1. Частка тэксту; самая дробная рубрыкацыйна-кампазіцыйная яго адзінка ў пачатку першага радка і звычайна ў канцы апошняга. У А. з некалькіх сказаў яны павінны быць звязаны агульным сэнсам.

2. Абзацны водступ, прабел у пачатку першага радка А.

**АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Універсальная навуковая бібліятэка, якая выконвае функцыі бібліятэчнага абслугоўвання і рэгіянальнага каардынацыйнага навукова-метадычнага цэнтра, а таксама цэнтра МБА для ўсіх бібліятэк вобласці.

**АБЛАСНАЯ ГАЛІНОВАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Спецыяльная бібліятэка, якая задавальняе спецыфічныя інфармацыйныя патрэбы спецыялістаў вобласці на базе галіновага фонду дакументаў, якія адпавядаюць рэальным і патэнцыяльным запытам карыстальнікаў.

**АБЛАСНАЯ ЎНІВЕРСАЛЬНАЯ НАВУКОВАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Бібліятэка, якая задавальняе шматлікія інфармацыйныя патрэбы насельніцтва вобласці на аснове ўніверсальнага фонду, збірае найбольш поўную калекцыю краязнаўчых дакументаў, выконвае функцыі цэнтра МБА для бібліятэк свайго рэгіёна.

**АБМЕННА-РЭЗЕРВОВЫ ФОНД**

Частка бібліятэчнага фонду, якая фарміруецца з дзвюма мэтамі: 1) забяспечыць замену ў дзеючым фондзе тых выданняў, якія зношваюцца ці губляюцца з-за павышанага чытацкага попыту; 2) наладзіць кнігаабмен з іншымі бібліятэкамі на існуючыя ў іх фондах выданні, патрэбныя пэўнай бібліятэцы, або бясплатную перадачу дублетных экзэмпляраў у парадку пераразмеркавання дакументаў.

**АБМЕННЫ ФОНД**

Частка бібліятэчнага фонду, вызначаная для ўзаемнага абмену дакументамі на спецыяльна агавораных умовах ці іх бясплатнай перадачы.

Сін.: Кнігаабменны фонд.

**АБРЭВІЯТУРА**

Складанаскарочанае слова, утворанае з назваў пачатковых літар ці з пачатковых элементаў зыходнага словазлучэння.

**АБС**

Гл.: Аўтаматызаваная бібліятэчная сістэма.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**АБ'ЯДНАНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ЗАПІС**

Бібліяграфічны запіс, які аб'ядноўвае звесткі аб розных публікацыях аднаго твора (яго перавыданнях, адбітках, перакладах) і (ці) звязаных з ім іншых творах – рэцэнзіях на яго, рэфератах і г.д.

**АВАНТЫТУЛ**

Першая старонка выдання, якая папярэднічае тытульнаму развароту і мае дэкаратыўна-кампазіцыйнае прызначэнне. Звычайна А. змяшчае пэўную частку выхадных звестак: выдавецкую марку, назву серыі, прозвішча аўтара і загаловак твора, радзей – эпіграф.

Сін.: Выхадны ліст; Фартытул.

**АГЕНЦТВА ПА ІНФАРМАЦЫІ**

Камерцыйная арганізацыя (іншы раз індывідуум), якая ажыццяўляе лакалізацыю, пошук, выбарку і падачу інфармацыі па розных пытаннях **(3.4.1.6)**.

**АГЛЯД**

Навуковы твор, у якім коратка перададзены змест іншых навуковых дакументаў па якой-небудзь тэме, што з'явіліся за пэўны час. Можа быць зроблена абагульненне іх зместу.

**АГЛЯДНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ**

Вынік аналітыка-сінтэтычнай перапрацоўкі дакументаў, які адлюстроўвае ў сціслай форме іх асноўны змест.

**АГУЛЬНАДАСТУПНАСЦЬ БІБЛІЯТЭК**

Прынцып арганізацыі бібліятэчнай сістэмы, які азначае юрыдычнае раўнапраўе грамадзян пры карыстанні бібліятэкамі. Умовы, якія забяспечваюць А. б., наступныя: 1) набліжэнне бібліятэк да насельніцтва; 2) прымяненне шэрагу формаў і метадаў абслугоўвання; 3) стварэнне паслуг бібліятэчнага сэрвісу; 4) пераважна бясплатнае карыстанне бібліятэкамі.

**АГУЛЬНАЕ БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА**

Раздзел бібліятэказнаўства, зместам якога з'яўляюцца агульнатэарэтычныя, метадалагічныя, гістарычныя праблемы; структура, аб'ект і прадмет бібліятэказнаўства; тыпалогія і тэрміналогія; заканамернасці, асноватворчыя прынцыпы і канцэпцыі; суадносіны з іншымі навукамі і месца ў сістэме навук; методыка бібліятэказнаўчых даследаванняў; гісторыя бібліятэказнаўчай думкі. Як тэрмін замацаваўся ў спецыяльнай літаратуры ў канцы 40-х – пачатку 50-х гг. ХХ ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**АГУЛЬНАЯ АНАТАЦЫЯ**

Анатацыя, якая характарызуе бібліяграфаваны дакумент увогуле.

**АГУЛЬНАЯ БІБЛІЯГРАФІЯ**

Бібліяграфія, якая забяспечвае шырокае кола спажыўцоў (грамадства ў цэлым) інфармацыяй аб усіх дакументах і ажыццяўляе іх пошук.

**АГУЛЬНАЯ ПРАДМЕТНАЯ РУБРЫКА**

Прадметная рубрыка, фармулёўка якой выражае аб’ём паняцця значна больш шырокі, чым аб’ём паняцця аб прадмеце дакумента.

**АГУЛЬНАЯ ЧАСТКА ЗБОРНАГА АПІСАННЯ**

Частка зборнага бібліяграфічнага апісання, якая змяшчае звесткі, характэрныя для шматтомнага ці серыйнага выдання ў цэлым або шэрагу тамоў (выпускаў).

**АГУЛЬНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік, які прызначаецца для шырокага кола чытачоў (грамадства ў цэлым), створаны на падставе фармальнай улікова-рэгістрацыйнай методыкі, зарыентаваны на аптымізацыю кнігавыдання, бібліяграфічнай справы. Напрыклад: дзяржаўны бібліяграфічны паказальнік, каталог бібліятэкі і г.д.

**АГУЛЬНЫ ЗАГАЛОВАК**

1. Загаловак групы састаўных частак дакументаў (артыкулаў, водгукаў, выказванняў, дыскусій, навуковых звестак, дакладаў і іншых матэрыялаў), надрукаваных у серыйным выданні. Надрукаваны ў выданні А. з. разглядаюць як асноўны загаловак.

2. Загаловак шматтомнага ці серыйнага выдання цалкам, які паказаны ва ўсіх тамах (выпусках) у адрозненне ад прыватнага загалоўка асобнага тома (выпуску).

**АГУЛЬНЫ ТЫТУЛЬНЫ ЛІСТ**

Тытульны ліст, які змяшчае звесткі, што адносяцца да шматтомнага ці серыйнага выдання ў цэлым.

**АГУЛЬНЫЯ ТЫПАВЫЯ ДЗЯЛЕННІ (АТД)**

Тыпавыя дзяленні ББК, межы прымянення якіх не вызначаны. Табліца АТД умоўна складаецца з дзвюх частак: АТД тэматычныя і АТД па форме дакумента. У пэўных класіфікацыйных дзяленнях фармулёўкі АТД могуць мець спецыфічны характар.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**АДАПТАВАНАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, у якім тэкст друкаванага твора (твораў) спрошчаны, скарочаны дзеля таго, каб прыстасаваць яго да магчымасцей чытача, які недастаткова падрыхтаваны да ўспрымання гэтых твораў у поўным аб'ёме (напрыклад, для тых, хто пачынае вывучаць замежную мову ці іншую вучэбную дысцыпліну).

**АДБОР ЛІТАРАТУРЫ**

Вызначэнне ў працэсе камплектавання мэтанакіраванасці набыцця і захоўвання ўжо існуючых дакументаў у фондзе бібліятэкі; крытэрыямі А.л. з'яўляюцца: навуковая, гістарычная, мастацкая каштоўнасць дакумента, ступень яго адпаведнасці профілю фонду, задачам бібліятэкі і інтарэсам яе карыстальнікаў. Адрозніваюць першасны і другасны А. л.

**АДДЗЕЛ БІБЛІЯТЭКІ**

Найбольш буйное структурнае падраздзяленне бібліятэкі. Адрозніваюць функцыянальны, комплексны, галіновы А. б.

**АДДЗЕЛ НАВУКОВАЙ ІНФАРМАЦЫІ (АНІ)**

Інфармацыйнае падраздзяленне, якое ўваходзіць у структуру навукова-даследчай, інфармацыйна-бібліятэчнай установы і пастаянна ажыццяўляе інфармацыйную працу па тэматыцы ўстановы.

**АДЗІНАРНЫ ТЫТУЛЬНЫ ЛІСТ**

Першая старонка выдання (тытул) і яго адварот, якія змяшчаюць асноўныя бібліяграфічныя звесткі.

**АДЗІНКА АПІСАННЯ**

Дакумент (носьбіт інфармацыі, ведаў), на які складаецца асноўнае апісанне.

**АДЗІНКА ЗАХОЎВАННЯ ФОНДУ**

Самастойны дакумент (ці сукупнасць дакументаў), што ўлічваецца пры захоўванні як асобная адзінка.

**АДЗІНКА ЎЛІКУ ФОНДУ**

Паняцце аднаго элемента бібліятэчнага фонду, якое прымяняецца для традыцыйнага і аўтаматызаванага ўліку дакументаў і вызначэння іх абсалютнай колькасці ў калекцыях.

Асноўнымі адзінкамі ўліку фонду для ўсіх відаў выданняў, акрамя газет і неапублікаваных матэрыялаў, з'яўляюцца назвы, для газет – назва і гадавы камплект.

**АДЗІНЫ БІБЛІЯТЭЧНЫ ФОНД**

Сукупнасць узаемадзеючых і ўзаемаўжывальных фондаў бібліятэк усіх сістэм і ведамстваў, а таксама бібліятэк акцыя-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нерных, кааператыўных, грамадскіх арганізацый, якія фарміруюцца на падставе абавязковай каардынацыі па тэрытарыяльным і галіновым прынцыпах.

**АДЗІНЫ ДАВЕДАЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНЫ ФОНД**

Сукупнасць узаемадзеючых на аснове каардынацыі ўзаемавыкарыстоўваемых даведачна-інфармацыйных фондаў аддзела навукова-тэхнічнай інфармацыі бібліятэкі аднаго прадпрыемства, галіны, тэрыторыі і г.д.

**АДЗІНЫ ДАПАМОЖНЫ ПАКАЗАЛЬНІК**

Алфавітны аб'яднаны пералік прадметных, геаграфічных, імянных і іншых рубрык.

**АДЗІНЫ РЭГІЯНАЛЬНЫ (ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫ) ФОНД**

Сукупнасць узаемадзеючых фондаў бібліятэк пэўнай тэрыторыі (раёна, вобласці, эканоміка-геаграфічнага рэгіёна), якія фарміруюцца і выкарыстоўваюцца як адзіная сістэма.

Галоўныя ўмовы для стварэння: каардынаванае і кааперанае камплектаванне, раскрыццё складу фондаў у даведніках, даведачных дапаможніках і зборных каталогах, паказальніках і іншых элементах даведачна-бібліяграфічнага апарату; рэалізацыя тэрытарыяльнай сістэмы дэпазітарнага захоўвання фондаў; бясплатнае пераразмеркаванне нявыкарыстаных дакументаў паміж бібліятэкамі, актыўнае выкарыстанне фондаў пры дапамозе МБА і шырокага інфармавання.

**АДЗІНЫ ФОНД ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЙ БІБЛІЯТЭЧНАЙ СІСТЭМЫ**

Сукупнасць аб'яднаных у цэласную сістэму бібліятэчных фондаў падраздзяленняў ЦБС. Фонд характарызуюць наступныя прыметы: цэнтралізаванае камплектаванне; адзінае кіраванне яго фарміраваннем; раскрыццё поўнага складу фонду ў цэнтральным карткавым, друкаваным ці электронным каталогу; рэгулярнае апавяшчэнне чытачоў ЦБС аб навінках фонду; даступнасць усяго фонду для чытачоў кожнага падраздзялення ЦБС.

**АДКРЫТЫ ДОСТУП ДА ФОНДУ**

Сістэма абслугоўвання, якая дае чытачам магчымасць пошуку і выбару дакументаў непасрэдна ў фондзе бібліятэкі.

**АДКРЫТЫ ПРАГЛЯД**

Азнаямленне з дакументамі, якія змешчаны ў экспазіцыі выставы ці цыкла выстаў з адкрытым доступам з мэтай інфармавання аб дакументах; уключае значную колькасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выданняў усіх відаў па адной ці некалькіх галінах навукі або творчасці, тэхнікі; як правіла, мае інфармацыйны характар.

**АДМОВА**

Адказ на запыт, які змяшчае матывіроўку немагчымасці выдаць чытачу дакумент, што адсутнічае ў фондзе ўвогуле ці ў момант паступлення запыту (знаходзіцца на рэстаўрацыі, заняты іншым чытачом і г.д.).

**АДНАМОЎНЫ СЛОЎНІК**

Слоўнік, у якім звесткі аб моўных адзінках ці паняццях, што яны абазначаюць, перадаюцца сродкамі адной мовы.

**АДНАРАЗОВЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ЗАПЫТ**

Аднаразовы запыт на бібліяграфічную інфармацыю, што паступае ад спажыўца ў арганізацыю (бібліятэку, орган навукова-тэхнічнай інфармацыі, архіў і інш.), якая ажыццяўляе даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне.

**АДНАРОДНАЯ ІНДЭКСАЦЫЯ**

Індэксацыя, пры якой класіфікацыйныя індэксы абазначаюцца ці літарамі, ці лічбамі (у адным шэрагу з матэматычнымі, пунктуацыйнымі і іншымі знакамі).

**АДНАТОМНАЕ ВЫДАННЕ**

Неперыядычнае выданне, надрукаванае ў адным томе.

**АДНАЎЛЕННЕ ФОНДУ**

Змена зместу і аб'ёму фонду ў працэсе яго фарміравання за кошт паступлення і выключэння дакументаў.

**АДНАЎЛЯЛЬНАСЦЬ ФОНДУ**

Паказчык, які характарызуе ступень аднаўлення фонду ў пэўны тэрмін (ад аднаго да пяці гадоў), вызначаецца формулай А = П, дзе П – аб'ём паступленняў за пэўны час, А – аб'ём фонду на канец даследаванага часу.

**АДНОСНАЯ ПАЎНАТА ФОНДУ**

Рэальна дасягнутая ступень максімальнай укамплектаванасці бібліятэчнага фонду ў адпаведнасці з яго профілем і ўлікам дзеючай у бібліятэчна-інфармацыйных працэсах заканамернасці распаўсюджвання і канцэнтрацыі інфармацыі.

**АДНОСНЫЯ ПАКАЗЧЫКІ БІБЛІЯТЭЧНАЙ СТАТЫСТЫКІ**

Паказчыкі, выражаныя адносінамі дзвюх абсалютных велічынь, звязаных між сабою зместам; прымяняюцца для параўнальнай ацэнкі стану вывучаемай з'явы, аналізу яе змяненняў і ступені развіцця.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адрозніваюць тры віды адносных велічынь: паказчыкі дынамікі, паказчыкі структуры, паказчыкі інтэнсіўнасці ці ступені.

**АДРАСНАЯ БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА**

Бібліяграфічная даведка, якая змяшчае звесткі аб наяўнасці і месцазнаходжанні запатрабаванага дакумента ў пэўным фондзе (бібліятэкі, органа НТІ, архіва і г.д.).

Сін.: Бібліяграфічная даведка.

**АДРАСНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ПОШУК**

Пошук дакументаў па крыніцах бібліяграфічнай інфармацыі і (ці) дакладным адрасе (шыфры) захоўвання ў пэўным фондзе (бібліятэцы), органе навукова-тэхнічнай інфармацыі, архіве і г.д.

**АДЭКВАТНАЯ ПРАДМЕТНАЯ РУБРЫКА**

Прадметная рубрыка, фармулёўка якой адлюстроўвае аб'ём паняцця, што найбольш дакладна адпавядае аб'ёму паняцця аб прадмеце дакумента.

**АКАДЭМІЧНАЕ ВЫДАННЕ**

1. Найбольш поўнае навуковае выданне, якое грунтоўна падрыхтавана і ўтрымлівае навукова вывераны тэкст класічнага твора і яго розных варыянтаў, мае вялікі даведачны апарат, у тым ліку падрабязныя каментарыі.

2. Выданне, надрукаванае ў Акадэміі навук.

**АКАДЭМІЧНАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Бібліятэка, якая з'яўляецца структурным падраздзяленнем акадэмічнай навукова-даследчай установы і арганізоўвае бібліятэчнае абслугоўванне яе калектыву.

**АКТАВАЯ СІСТЭМА ДЫФЕРЭНЦАВАНАГА ЎЛІКУ**

Сістэма традыцыйнага і (або) аўтаматызаванага ўліку дакументаў, пры якой на пастаўленую ў бібліятэку партыю кніг складаюць акты – спісы, а кожная кніга (дакумент) набывае актавы нумар з трох элементаў: года запісу, нумара акта і парадкавага нумара кнігі ў акце.

**АКТАЎНАЯ ІНДЭКСАЦЫЯ**

Сістэма метак дзяленняў аднаго рада, што не мае абмежаванасцей, звязаных з базай індэксацыі. У А. і. лічба 9 выкарыстоўваецца ў якасці апазнавальнага знака той жа ступені дзялення і стварае з наступнай лічбай чарговае дзяленне рада: 1, 2, 3… 91, 92, 93… 991, 992, 993 і г.д.

Прапанавана Ш.Р.Ранганатанам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**АКТУАЛІЗАЦЫЯ**

Карэкціроўка назапашаных даных; змяненне, абнаўленне іх у адпаведнасці з новымі данымі, г.зн. прывядзенне іх у адпаведнасць з адэкватным станам аб'ектаў прадметнага абсягу.

**АКТУАЛІЗАЦЫЯ ДАКУМЕНТАЎ БІБЛІЯТЭЧНАГА ФОНДУ**

Від бібліятэчнага абслугоўвання, які прадугледжвае доступ карыстальніка да дакументаў бібліятэчнага фонду (у формах тэматычных, персанальных і іншых выстаў, аглядаў, спісаў і г.д.) і мае на мэце актывізацыю ўвагі карыстальнікаў.

**АКТУАЛІЗАЦЫЯ ДАНЫХ**

Утрыманне даных у іх банку ці базе ў адпаведнасці са станам адлюстраваных імі аб'ектаў прадметнай галіны і наяўнасцю адпаведных інфармацыйных запатрабаванняў.

**АКТУАЛІЗАЦЫЯ КАТАЛОГА**

Сукупнасць мерапрыемстваў арганізацыйнага і метадычнага характару, якія забяспечваюць адпаведнасць структуры і зместу каталога сучаснаму стану развіцця навукі, культуры, грамадства; укараненне дапаўненняў і паправак да сістэмы класіфікацыі, своечасовае адлюстраванне актуальнай палітычнай інфармацыі (перайменаванняў, змен у палітыка-адміністрацыйных дзяленнях і інш.).

**АКТЫЎ БІБЛІЯТЭКІ**

Гл.: Бібліятэчны актыў.

**АКТЫЎНАЯ ЧАСТКА ФОНДУ**

Частка фонду, абарачальнасць якой больш частотная ў параўнанні з іншымі часткамі дадзенага фонду.

**АКЦЫЯНЕРНАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Бібліятэка, створаная пры акцыянерным таварыстве ў адпаведнасці з яго статутам. Пачалі існаваць у Рэспубліцы Беларусь з 1990 г.

**АЛГАРЫТМ**

Дакладнае прадпісанне, якое азначае вылічальны працэс, што ідзе ад вар'іруемых даных да пошукавага выніку.

**АЛІГАТ**

Самастойнае выданне ці рукапісная кніга, што пераплецены ў адзін том з іншымі самастойнымі выданнямі ці рукапісамі па прымеце адзінства фармату; састаўная частка канвалюта.

**АЛФАВІТ КОДА**

Гл.: База індэксацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**АЛФАВІТ АНАТАЦЫІ**

Гл.: База індэксацыі.

**АЛФАВІТ СІСТЭМЫ**

Упарадкаваны набор знакаў, адрозных паміж сабой (літар, лічбаў, спецыяльных і службовых знакаў, а таксама знака «прабел»). Адрозніваюцца ўваходныя і выходныя алфавіты сістэмы як сукупнасць адрозных знакаў.

**АЛФАВІТНА-ПРАДМЕТНЫ ПАКАЗАЛЬНІК (АПП)**

Дапаможны апарат да табліц класіфікацыі сістэматычных каталогаў, навуковых, вучэбных, даведачных, перыядычных выданняў, які ўяўляе сабой алфавітны пералік прадметных рубрык (паняццяў), адлюстраваных у асноўных масівах інфармацыі.

**АЛФАВІТНА-ПРАДМЕТНЫ ПАКАЗАЛЬНІК (АПП) ДА СІСТЭМАТЫЧНАГА КАТАЛОГА**

Дапаможны апарат да сістэматычнага каталога; уяўляе сабой алфавітны пералік прадметных рубрык, якія раскрываюць змест адлюстраваных у сістэматычным каталогу твораў друку і іншых дакументаў з указаннем адпаведных класіфікацыйных індэксаў. У гэтым значэнні не рэкамендуецца ўжываць тэрмін «ключ да сістэматычнага каталога».

**АЛФАВІТНА-ПРАДМЕТНЫ ПАКАЗАЛЬНІК У ТАБЛІЦЫ БІБЛІЯТЭЧНАЙ КЛАСІФІКАЦЫІ (АПП у ТБК)**

Паняційны апарат сістэмы ведаў, прадстаўлены ў алфавіце прадметных рубрык (лексічных адзінак) з указаннем класіфікацыйных індэксаў.

**АЛФАВІТНАЯ РАССТАНОЎКА ФОНДУ**

Фармальная расстаноўка па алфавіце аўтараў ці загалоўкаў дакументаў; прымяняецца як асноўная ці (часцей) як дапаможная ў спалучэнні з сістэматычнай расстаноўкай, а таксама з храналагічнай (звычайна для размяшчэння перыядычных выданняў).

**АЛФАВІТНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік, у якім бібліяграфічныя запісы размешчаны ў алфавітным парадку індывідуальных і калектыўных аўтараў і (або) загалоўкаў дакументаў **(3.3.2.36).**

**АЛФАВІТНЫ КАТАЛОГ**

Бібліятэчны каталог, у якім бібліяграфічныя запісы размешчаны ў алфавітным парадку імён (прозвішчаў) індывідуальных аўтараў, назваў, калектыўных аўтараў ці загалоўкаў дакументаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**АЛФАВІТНЫ ПАКАЗАЛЬНІК ДА ВЫДАННЯ**

Паказальнік (імянны, прадметны, геаграфічны і г.д.) да выдання, арганізаваны ў алфавітным парадку.

**АЛЬБОМ**

1. Кніжнае або комплекснае ліставое выданне выяўленчага мастацтва з кароткім тлумачальным тэкстам.

2. Від белавога выдання з чыстымі лістамі для аўтографаў, малюнкаў, газетных выразак, марак і г.д.

**АЛЬБОМНЫ КАТАЛОГ**

Каталог, у якім бібліяграфічныя запісы размяшчаюцца на старонках альбома.

**АЛЬМАНАХ**

Неперыядычны зборнік ці зборнік, які прадаўжае выходзіць; утрымлівае звесткі з розных галін грамадскай дзейнасці, звычайна з указаннем літаратурных навінак, навуковых дасягненняў, заканадаўчых змен і г.д.

**АЛЬТЭРНАТЫЎНАЕ КЛАСІФІКАЦЫЙНАЕ ДЗЯЛЕННЕ**

Класіфікацыйнае дзяленне, якое можа быць выбрана сістэматызатарам з двух ці некалькіх магчымых узаемавыключальных класіфікацыйных дзяленняў. А. к. дз. звязваюцца адзін з адным метадычнымі ўказаннямі і (ці) спасылкамі і адсылкамі.

**АЛЬТЭРНАТЫЎНЫ ЗАГАЛОВАК**

Другі загаловак выдання, які звязаны з першым злучнікам і з'яўляецца часткаю асноўнага загалоўка.

**АЛЬТЭРНАТЫЎНЫ ІНДЭКС**

Класіфікацыйны індэкс у табліцах класіфікацыі, які прадугледжаны складальнікамі для прыняцця альтэрнатыўных рашэнняў пры сістэматызацыі.

**АМАГРАФІЯ**

Уласцівасць двух або некалькіх знакаў, якія маюць адну і тую ж графічную форму, але розныя значэнні (**3.1.17**).

**АМАНІМІЯ**

Уласцівасць двух і больш знакаў, якая заключаецца ў тым, што яны маюць адну і тую ж матэрыяльную форму, але незалежныя значэнні (**3.1.16**).

**АМАФОНІЯ**

Уласцівасць двух або некалькіх знакаў, якія маюць адну і тую ж фанетычную форму, але розныя значэнні (**3.1.18**).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**АНАЛІЗ АБ'ЕКТА КАТАЛАГІЗАЦЫІ**

Выяўленне і ацэнка фармальных і змястоўных прымет аб'екта каталагізацыі (асобнага дакумента, яго часткі ці сукупнасці дакументаў) з мэтай поўнага і шматаспектнага прадстаўлення яго ў бібліяграфічным запісе (у выглядзе загалоўка БЗ, элементаў бібліяграфічнага апісання, класіфікацыйных індэксаў і прадметных рубрык).

**АНАЛІЗ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭКІ**

Метад дыягнастычнага вывучэння і ацэнкі дзейнасці бібліятэкі або аднаго з яе падраздзяленняў (кірункаў) з мэтай забеспячэння кіраўніцтва і калектыву інфармацыяй для прыняцця пэўных рашэнняў і кантролю за іх ажыццяўленнем.

**АНАЛІЗ КНІЖНЫХ ФАРМУЛЯРАЎ**

Метад вывучэння бібліятэчнай дзейнасці, які дазваляе высветліць абарачальнасць кніг за пэўны прамежак часу.

**АНАЛІЗ ЧЫТАЦКІХ ФАРМУЛЯРАЎ**

Метад вывучэння бібліятэчнай дзейнасці, які дазваляе высветліць змест і аб'ём чытання карыстальніка бібліятэкі за пэўны прамежак часу.

**АНАЛІТЫК**

1. Спецыяліст у інфарматыцы і (ці) пэўнай прыкладной галіне, абавязкамі якога з'яўляюцца аналіз праблем, пастаноўка задач, распрацоўка прапаноў па іх рашэнні.

2. Мова праграмавання, арыентаваная на апісанне інжынерных і даследчых навуковых задач, якая ўтрымлівае сродкі для выкарыстання аналітычных пераўтварэнняў, а таксама сродкі зносін з машынай у рэжыме дыялога.

**АНАЛІТЫКА-СІНТЭТЫЧНАЯ КЛАСІФІКАЦЫЙНАЯ СІСТЭМА**

Класіфікацыйная сістэма з развітой, складанай структурай для шматаспектнага пошуку інфармацыі. Галоўныя дзяленні ўтвараюць іерархічныя рады па галінах ведаў; у рамках кожнай галіны ёсць некалькі табліц катэгорый, якія пабудаваны ў выніку папярэдняга правядзення катэгарыяльнага аналізу тэрміналогіі дадзенай галіны. Тыповыя прыметы, характэрныя для ўсіх ці большасці галоўных дзяленняў класіфікацыі, адлюстроўваюцца ў дапаможных табліцах агульных катэгорый. У асобнай табліцы падаецца абазначэнне сувязей паміж паняццямі. Дакументы аналізуюцца па прадугледжаных для дадзенай галіны ведаў катэгорыях; знойдзеныя ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

табліцах індэксы сінтэзуюцца на падставе класіфікацыйнай формулы, што адлюстроўвае як змест асобных паняццяў, так і сістэму сувязей паміж імі.

**АНАЛІТЫКА-СІНТЭТЫЧНАЯ ПЕРАПРАЦОЎКА (АСП)**

Пераўтварэнне дакументаў у працэсе іх аналізу і атрымання неабходнай інфармацыі, а таксама ацэнка, супастаўленне, абагульненне і прадстаўленне інфармацыі ў выглядзе, які адпавядае запыту **(3.2.1.9)**.

**АНАЛІТЫКА-СІНТЭТЫЧНАЯ ПЕРАПРАЦОЎКА ІНФАРМАЦЫІ**

Апрацоўка зместу дакументаў з мэтай іх аналізу, адбору неабходных звестак, а таксама іх ацэнкі, супастаўлення і абагульнення; складаецца з наступных працэсаў: анатаванне, рэферыраванне, адбор фактаў і падрыхтоўка аглядаў.

**АНАЛІТЫЧНАЕ БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ АПІСАННЕ**

Бібліяграфічнае апісанне састаўной часткі дакумента. Складаецца з дзвюх частак, якія ўключаюць звесткі аб састаўной частцы і аб выданні, у якім яна надрукавана.

**АНАЛІТЫЧНАЯ АНАТАЦЫЯ**

Анатацыя, якая характарызуе пэўную частку ці аспект зместу бібліяграфуемага дакумента.

**АНАЛІТЫЧНАЯ АПРАЦОЎКА**

Бібліятэчная апрацоўка аб'екта каталагізацыі ў выглядзе часткі дакумента. Вынікам А. а. з'яўляецца аналітычнае бібліяграфічнае апісанне, аналітычны класіфікацыйны індэкс.

**АНАЛІТЫЧНАЯ ПРАДМЕТЫЗАЦЫЯ**

Прадметызацыя, пры якой прадметныя рубрыкі прысвойваюцца не толькі дакументу цалкам, але і асобным яго часткам (главам, артыкулам і г. д.).

**АНАЛІТЫЧНАЯ СІСТЭМАТЫЗАЦЫЯ**

Сістэматызацыя, пры якой поўны індэкс адлюстроўвае змест не толькі аб'екта сістэматызацыі цалкам, але і асобных яго частак.

**АНАЛІТЫЧНЫ АГЛЯД**

Агляд, які ўключае ўсебаковы аналіз разглядаемых першасных дакументаў, іх крытычную, аргументаваную ацэнку і абгрунтаванасць рэкамендацыі па сутнасці даследуемых пытанняў. А. а. іншы раз называюць крытычным аглядам.

**АНАЛІТЫЧНЫ КЛАСІФІКАЦЫЙНЫ ІНДЭКС**

Дадатковы класіфікацыйны індэкс, які адлюстроўвае змест якой-небудзь часткі аб'екта сістэматызацыі, напрыклад уступ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нага артыкула ці бібліяграфічнага дадатку да асобнага тома ў камплекце шматтомнага выдання і г.д.

**АНАЛІТЫЧНЫ ФАРМУЛЯР ЧЫТАЧА**

Фармуляр, які не толькі ўключае звесткі аб агульным аб'ёме выдадзеных чытачу дакументаў, але і адлюстроўвае іх раскладку па галінах ведаў. Прымяняецца часцей у дзіцячых бібліятэках для мэтанакіраванага кіраўніцтва чытаннем дзяцей.

**АНАНІМ**

1. Аўтар, які апублікаваў выданне без указання свайго імя (прозвішча, псеўданіма).

2. Выданне, апублікаванае без абазначэння аўтара.

**АНАНІМНАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, аўтар якога ў ім не пазначаны.

**АНАНІМНЫ КЛАСІЧНЫ ТВОР**

Твор народнага эпасу (быліны, казкі і г.д.), выдадзены пад рознымі загалоўкамі, але вядомы пад адной назвай, якая стала класічнай.

**АНАТАВАНАЯ КАТАЛОЖНАЯ КАРТКА**

Каталожная картка з анатацыяй.

**АНАТАВАННЕ**

Працэс складання анатацыі.

**АНАТАВАНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік, у якім усе або большасць бібліяграфічных запісаў уключаюць анатацыю **(3.3.2.35)**.

**АНАТАВАНЫ ДАКУМЕНТ**

Дакумент, на змест якога складаецца анатацыя. А. д. у большасці выпадкаў з'яўляецца першасным, але анатацыя можа складацца і на другасны дакумент, напрыклад на выпуск рэфератыўнага часопіса і г.д. А. д. можа быць асобным выданнем (кніга, часопіс і інш.) ці яго састаўной часткай (артыкул і інш.).

**АНАТАВАНЫ КАТАЛОГ**

Каталог, забяспечаны анатацыяй.

**АНАТАВАНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН ВЫДАВЕЦТВА**

Бібліяграфічнае выданне, якое ўтрымлівае анатаваны пералік запланаваных на год выданняў пэўнага выдавецтва. Прызначаецца для інфармавання аб плануемым выпуску літаратуры з мэтай збірання заказаў на яе і вызначэння тыражу выдання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**АНАТАЦЫЯ**

Кароткая характарыстыка дакумента, яго часткі ці сукупнасці дакументаў з пункта гледжання прызначэння, зместу, формы і іншых асаблівасцей.

**«АНГЛА-АМЕРЫКАНСКІЯ ПРАВІЛЫ КАТАЛАГІЗАЦЫІ»**

Звод правілаў, якія рэгламентуюць складанне бібліяграфічнага апісання кніг, серыйных выданняў, картаграфічных матэрыялаў, рукапісаў, нотных выданняў, гуказапісаў, кінафільмаў, відэазапісаў, мікраформ, файлаў і г.д. У аснову гэтага зводу пакладзены Парыжскія прынцыпы 1961 г., поўная адпаведнасць міжнароднаму стандарту і асаблівая ўвага да машыннай апрацоўкі.

**АНКЕТАВАННЕ**

Метад вывучэння бібліятэчнай дзейнасці, які ўяўляе сабой завочнае апытанне, дзе ўсім рэспандэнтам у ідэнтычнай друкаванай форме прапаноўваецца сістэма пытанняў з магчымымі варыянтамі (або без іх) адказаў. Дае магчымасць атрымаць звесткі аб карыстальніках інфармацыі. Звычайна А. ананімнае.

**АНТАЛОГІЯ**

Збор выбраных літаратурна-мастацкіх твораў (пераважна вершаў), якія прадстаўляюць літаратуру тых ці іншых народаў, эпохі, жанраў і г.д.

**АНТЫКВАРНАЯ КНІГА**

Кніга, выдадзеная ад пачатку кнігадрукавання да 1890 г. уключна.

**АПАРАТ ВЫДАННЯ**

Звесткі даведачнага, навуковага ці тлумачальнага характару, якія дапаўняюць асноўны тэкст і дапамагаюць лепш разумець яго і больш зручна карыстацца выданнем.

**АПЕРАТЫЎНЫ ПЛАН КАМПЛЕКТАВАННЯ**

План з пэўнымі лічбавымі паказчыкамі, якія адлюстроўваюць мяркуемае набыццё літаратуры ў крыніцах камплектавання, віды і колькасць дакументаў, а таксама фінансавыя разлікі.

**АПІСАЛЬНАЯ КАТАЛАГІЗАЦЫЯ**

Частка каталагізацыі, якая ўключае ідэнтыфікацыю дакумента, складанне бібліяграфічнага апісання і афармленне каталагізацыйнага запісу. Тэрмін шырока распаўсюджаны ў замежнай англамоўнай практыцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**АПІСАЛЬНАЯ ПРАДМЕТНАЯ РУБРЫКА**

Складаная прадметная рубрыка, у якой камбінацыя лексічных адзінак, часцей за ўсё адасобленых адна ад адной прыназоўнікамі і злучнікамі, прадстаўлена ў выглядзе адзінага словазлучэння.

**АПРАЦОЎКА ДАКУМЕНТАЎ**

Комплекс аперацый па падрыхтоўцы дакументаў да захавання і выкарыстання.

**АПРАЦОЎКА ІНФАРМАЦЫІ (ДАНЫХ)**

Сукупнасць аперацый, звязаных з захоўваннем, пошукам, аналізам, ацэнкай, узнаўленнем інфармацыі з мэтай прадстаўлення яе ў выглядзе даных, зручных для выкарыстання спажыўцамі (**3.2.1.3**).

**АПТЫМАЛЬНЫ АБ'ЁМ ФОНДУ**

Аб'ём фонду, пры якім забяспечваюцца прынятыя для дадзенага тыпу бібліятэк паказчыкі яго выкарыстання і дасягаецца неабходны ўзровень забеспячэння запытаў чытачоў і захаванасць фонду.

**АПТЫЧНЫ ЧЫТАЛЬНЫ АПАРАТ**

Апарат, прызначаны для аўтаматычнага распазнавання літар, лічбаў і іншых знакаў оптыка-электронным спосабам.

**АРГАНІЗАЦЫЯ БІБЛІЯТЭЧНАГА АБСЛУГОЎВАННЯ**

Гл.: Бібліятэчнае абслугоўванне.

**АРГАНІЗАЦЫЯ БІБЛІЯТЭЧНАЙ СПРАВЫ**

Сукупнасць узаемазвязаных і спланаваных мерапрыемстваў, якія накіраваны на паляпшэнне бібліятэчнай справы ў працэсе яе функцыянавання ў залежнасці ад зменлівасці знешніх і ўнутраных умоў.

**АРГАНІЗАЦЫЯ КАТАЛОГА**

Вызначэнне структуры бібліятэчнага каталога і сукупнасць працэсаў яго ўнутранага і знешняга афармлення.

**АРГАНІЗАЦЫЯ ПРАЦЫ Ў БІБЛІЯТЭЦЫ**

Комплекс мерапрыемстваў, якія забяспечваюць рацыянальнае выкарыстанне працы работнікаў бібліятэкі; уключае расстаноўку кадраў у працэсе работы, раздзяленне і кааперацыю працы ў калектыве, нарміраванне і распрацоўку метадаў работы, арганізацыю працоўных месцаў і стварэнне неабходных умоў працы.

**АРГАНІЗАЦЫЯ РАБОТЫ БІБЛІЯТЭКІ**

Сукупнасць мерапрыемстваў (і правіл, па якіх яны ажыццяўляюцца), накіраваных на забеспячэнне функцыянавання

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліятэкі і дасягненне ёю аптымальных вынікаў на аснове ўпарадкаванасці дзейнасці. А. р. б. вызначае структуру бібліятэкі; у адпаведнасці са статусам, законам, чытацкім запытам і запатрабаваннямі ствараецца апарат для функцыянавання ў пэўным напрамку.

**АРГАНІЗАЦЫЯ ФОНДУ**

Сукупнасць працэсаў і аперацый, якія забяспечваюць функцыянаванне фонду ў адпаведнасці з яго задачамі і патрабаваннямі; уключае прыём, улік, тэхнічную апрацоўку, размяшчэнне і захаванне дакументаў.

**АРГТЭХНІКА Ў БІБЛІЯТЭЦЫ**

Тэхнічныя сродкі, якія выкарыстоўваюцца для механізацыі і аўтаматызацыі працэсаў уліку, планавання, кантролю, аналізу работы бібліятэкі. Да сродкаў А. адносяцца: прыстасаванні, прыборы, машыны рознай ступені складанасці (ад алоўкаў да ЭВМ).

**АРКУШ**

Тое, што і друкаваны ліст.

**АРТАТЭКА**

Спецыялізаваная бібліятэка ці падраздзяленне публічнай бібліятэкі, што фарміруюць фонд выяўленчых выданняў, рэпрадукцый твораў мастацтва, аўдыявізуальных матэрыялаў і іншых дакументаў, якія звязаны з выяўленчым мастацтвам і якія задавальняюць інфармацыйныя патрэбы ў дадзенай сферы.

**АРТЭФАКТ**

Істотная частка інфармацыі (мадэль, элемент мадэлі, дакумент), якая ствараецца, змяняецца, выкарыстоўваецца ў працэсах традыцыйнай і электроннай інфармацыйна-бібліятэчнай дзейнасці для дасягнення яе задач; уяўляе вобласць адказнасці, дае магчымасць кіравання версіямі.

**АРФАГРАФІЧНЫ СЛОЎНІК**

Слоўнік, які падае агульнапрынятае напісанне слоў.

**АРФАЭПІЧНЫ СЛОЎНІК**

Слоўнік, які падае правільнае (нарматыўнае) літаратурнае вымаўленне слоў.

**АРХІВАРЫУС**

Захавальнік архіўных дакументаў.

**АРХІТЭКТУРА БІБЛІЯТЭКІ**

Аб’ёмна-планіровачная арганізацыя будынка і памяшканняў бібліятэкі, якая ўключае яе знешні выгляд і інтэр’ер. У А. б.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

галоўнае значэнне набывае функцыянальнае прызначэнне памяшканняў.

**АРХІЎ**

1. Сукупнасць архіўных дакументаў, прызначаных для бестэрміновага захоўвання адказнымі за іх выпуск ці іх пераемнікамі ў залежнасці ад патрэб або кампетэнтнымі архівамі з нагоды пастаяннай каштоўнасці дадзеных дакументаў.

2. Арганізацыя, якая адказвае за збіранне, захоўванне і захаванасць архіва і за прадастаўленне архіўных матэрыялаў у распараджэнне карыстальнікаў.

А. можа быць дзяржаўным (нацыянальным, федэральным), дэпартаменцкім, цэнтральным, спецыяльным; існуюць таксама фотаархіў, А. мікрафільмаў і інш.

**АРХІЎ ВЫКАНАНЫХ ДАВЕДАК**

Фонд, што ўключае дублікаты дакументаў, падрыхтаваных у працэсе даведачна-інфармацыйнага абслугоўвання (даведак-адказаў на запыты); забяспечаны даведачна-пошукавым апаратам і можа быць выкарыстаны для хуткай падрыхтоўкі даведак па паўторных запытах.

**АРХІЎНАЯ БІБЛІЯГРАФІЯ**

1. Бібліяграфічная частка дзейнасці ў архіўных установах, звязаных са стварэннем і выкарыстаннем бібліяграфічнай інфармацыі аб архіўных дакументах.

2. Бібліяграфія, аб’ектам якой з’яўляюцца архіўныя дакументы.

**АРХІЎНЫ ДАКУМЕНТ**

Дакумент, які знаходзіцца на захоўванні ў архіве.

**АРХІЎНЫ ФОНД**

Сістэматызаваны і забяспечаны даведачна-пошукавым апаратам збор архіўных дакументаў, які створаны і назапашаны ў працэсе дзейнасці якой-небудзь установы ці асобы.

**АРХІЎНЫ ЭКЗЭМПЛЯР**

Экзэмпляр айчынных твораў друку, які захоўваецца ў нацыянальных бібліятэках і дзяржаўных фондасховішчах. А. э. павінен захоўвацца пастаянна, яго нельга выдаваць чытачам за межы бібліятэкі, а таксама выключаць з фонду.

**АРЫГІНАЛЬНАЕ ВЫДАННЕ**

1. Выданне неперакладнога твора (твораў).

2. Выданне, якое адрозніваецца навізной, своеасаблівасцю і адметнасцю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**АСАРТЫМЕНТ ПЛАТНЫХ ПАСЛУГ**

Пералік платных паслуг, якія бібліятэка прапаноўвае абаненту. Многія з іх адносяцца да паслуг бібліятэчнага сэрвісу.

Гл.: Платныя паслугі ў бібліятэцы.

**АСАЦЫЯТЫЎНЫ ДЭСКРЫПТАР**

Дэскрыптар, звязаны з другім семантычнай сувяззю, характар якой не паказаны.

**АСКРЫПТАР**

Лексічная адзінка інфармацыйна-пошукавага тэзаўруса, якая ў пошукавым вобразе дакумента належыць замене на дэскрыптар пры пошуку ці апрацоўцы інфармацыі.

**АСНОЎНАЯ КАРТКА АЛФАВІТНАГА КАТАЛОГА**

Каталожная картка, якая змяшчае асноўны бібліяграфічны запіс.

**АСНОЎНАЯ КАРТКА СІСТЭМАТЫЧНАГА КАТАЛОГА**

Каталожная картка з поўным індэксам, месца якой у сістэматычным каталогу вызначаецца асноўным індэксам.

**АСНОЎНАЯ КРЫНІЦА БІБЛІЯГРАФІЧНЫХ ЗВЕСТАК**

Крыніца, якая павінна быць выкарыстана ў першую чаргу пры складанні бібліяграфічнага апісання. Для кожнай вобласці бібліяграфічнага апісання прадвызначана свая А. к. б. з.

**АСНОЎНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ЗАПІС**

Бібліяграфічны запіс, які забяспечвае ідэнтыфікацыю выдання і пошук па асноўнай пошукавай прымеце. Прадстаўляе дакумент ва ўсіх каталогах бібліятэкі, але асноўная пошукавая прымета залежыць ад віду каталога. У алфавітным каталогу – гэта загаловак, у сістэматычным – каталожны індэкс, у прадметным – прадметная рубрыка.

**АСНОЎНЫ ЗАГАЛОВАК**

Загаловак выдання, які адлюстроўвае яго асноўны змест; размяшчаецца на тытульным лісце першым ці вылучаецца паліграфічным спосабам (шрыфтам або колерам).

**АСНОЎНЫ ЗАГАЛОВАК СЕРЫІ**

Пададзены ў вобласці серыі загаловак серыйнага ці шматтомнага выдання, у склад якога ўваходзіць дакумент, на які складаецца апісанне.

**АСНОЎНЫ ІНДЭКС**

Першы класіфікацыйны індэкс са складу поўнага індэкса (пры шматразовым адлюстраванні), што паказвае дзяленне сістэматычнага каталога, у якім гэты дакумент адлюстроўваецца па асноўным тэксце.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**АСНОЎНЫ ТЫТУЛЬНЫ ЛІСТ**

Тытульны ліст, які змяшчае ўсе найбольш істотныя для выдання ці яго часткі (напрыклад, тома) выхадныя звесткі; з’яўляецца асноўнай крыніцай звестак для складання бібліяграфічнага апісання; пярэдняя частка адзінарнага тытульнага ліста, трэцяя старонка двайнога тытульнага ліста (правая частка развароттнага тытульнага ліста).

**АСНОЎНЫ ТЭКСТ**

Тэкст выдання, які ўяўляе сабой цэласны тэкст надрукаванага твора за выключэннем прадмовы, пасляслоўя, каментарыяў і г.д.

**АСНОЎНЫ ФОНД**

Частка бібліятэчнага фонду, якая ўяўляе сабой найбольш поўны камплект дакументаў па профілю бібліятэкі. Яго прызначэнне – пастаяннае захоўванне дакументаў і задавальненне чытацкага попыту на дакументы рознай храналагічнай глыбіні.

**АСНОЎНЫЯ ДЗЯЛЕННІ Ў КЛАСІФІКАЦЫЙНЫХ СІСТЭМАХ**

Прыметы, па якіх ажыццяўляецца дзяленне аб’екта паняцця.

**АСНОЎНЫЯ ТАБЛІЦЫ КЛАСІФІКАЦЫІ**

Састаўная частка табліц класіфікацыі, якая ўключае іерархічныя табліцы класіфікацыйных дзяленняў па асноўных класіфікацыйных прыметах.

**АСОБНІК**

Гл.: Экзэмпляр.

**АСОБНЫ АДБІТАК**

Частка выдання (напрыклад, артыкул), афармленая ў выглядзе брашуры, з надрукаваных сшыткаў пры падрыхтоўцы тыражу выдання ў цэлым, як правіла, без змянення пагінацыі, радзей з дабаўленнем тытульнага ліста, вокладкі.

Гл.: Рэпрынтнае выданне.

**АСОБНЫ НУМАР (ТОМ, ВЫПУСК)**

Нумар (том, выпуск) серыйнага выдання, надрукаваны самастойна.

**АСПЕКТНАЯ КЛАСІФІКАЦЫЯ**

Класіфікацыйная сістэма, у якой адно і тое ж паняцце можа быць адлюстравана ў некалькіх класах у залежнасці ад аспектаў яго разгляду.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**АСПІРАНТУРА**

Галоўная форма падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў па спецыяльнасці 05.25.03 Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства. Ажыццяўляе УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».

**АСТЭРЫСК**

Графічны знак у выглядзе зорачкі, які выкарыстоўваецца ў якасці абазначэння спасылкі, можа быць знакам для падзелу частак твора.

**АТЛАС**

1. Альбом, які змяшчае відарыс розных аб’ектаў (карты, чарцяжы, малюнкі, абрысы і інш.); прызначаны для вучэбных ці практычных мэт і асвятляе пэўную галіну ведаў.

2. Выданне сістэматычнага збору карт (мапаў).

**АТРЫБУТ АПІСАННЯ ВЫДАННЯ**

Лінгвістычная, сімвалізаваная, лічбавая і інш. характарыстыка выдання, прызначаная для адлюстравання яго сутнасці.

**АТЭСТАЦЫЯ БІБЛІЯТЭКАРАЎ**

Своеасаблівая здача экзамену па практыцы і тэорыі бібліятэчнай справы спецыяльнай камісіі, у кампетэнцыі якой пацвердзіць былую пасаду бібліятэчнага работніка, прысвоіць яму новую, больш высокую, або дыскваліфікаваць. Атэстацыя праводзіцца на аснове аб’ектыўнай ацэнкі дзейнасці работніка ва ўмовах галоснасці і адпаведнасці з працоўным заканадаўствам.

**АЎДЫЯВІЗУАЛЬНАЕ ІНФАРМАЦЫЙНА-БІБЛІЯТЭЧНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ**

Абслугоўванне з выкарыстаннем аўдыявізуальных сродкаў і дакументаў на аснове новых інфармацыйных тэхналогій.

**АЎДЫЯВІЗУАЛЬНЫ ДАКУМЕНТ**

Дакумент, які нясе гукавую і зрокавую інфармацыю.

**АЎДЫЯВІЗУАЛЬНЫ ТВОР**

Твор (кінематаграфічны, тэлевізійны, аўдыявізуальны), які складаецца з зафіксаванай серыі ўзаемазвязаных кадраў (часта з гукавым суправаджэннем); прызначаны для візуальнага і гукавога ўспрымання з дапамогай адпаведных тэхнічных прыстасаванняў (кіна-, тэле-, відэа-, дыя-, слайдфільмы і інш.).

**АЎДЫЯВІЗУАЛЬНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ**

Дакументы, што ўтрымліваюць гукавую, зрокавую ці зрокава-гукавую інфармацыю, якая ўзнаўляецца з дапамогай

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

тэхнічных сродкаў. Да іх ліку адносяцца: кінафотадакументы (кінафільмы, дыяфільмы, дыяпазітывы, магнітныя фанаграмы, грампласцінкі), магнітафільмы, відэазапісы, галаграмы і інш. Да А. м. належаць таксама розныя спалучэнні гэтых дакументаў паміж сабой і з творамі друку.

**АЎДЫЯЛЬНЫ ДАКУМЕНТ**

Дакумент, які змяшчае запіс фанетычнай інфармацыі, што прызначаецца для аднаўлення. Напрыклад, грампласцінка, магнітная стужка з запісанай інфармацыяй і г.д.

**АЎТАБІБЛІЯГРАФІЯ**

Персанальны бібліяграфічны дапаможнік, складзены той асобай, каму ён прысвечаны, уключае працы аўтара і публікацыі аб ім.

**АЎТАІНФАРМАТАР**

Сістэма аўтаматычнага інфармавання супрацоўнікаў установы (прадпрыемства) або чытачоў бібліятэкі – карыстальнікаў інфармацыйнай сістэмы.

**АЎТАМАТЫЗАВАНАЕ ІНДЭКСАВАННЕ**

Абазначэнне зместу дакумента пры дапамозе аўтаматызаванага выбару і вымання слоў ці тэрмінаў з дакументнай мовы. У адрозненне ад аўтаматызаванай апрацоўкі даных А. і. не прадугледжвае непасрэднага ўдзелу чалавека.

**АЎТАМАТЫЗАВАНАЕ ПРАЦОЎНАЕ МЕСЦА (АПМ)**

Сукупнасць тэхнічных, лінгвістычных і праграмных сродкаў, якія забяспечваюць інфармацыйныя і бібліяграфічныя працэсы ва ўмовах аўтаматызаванай апрацоўкі. Тэхнічныя сродкі – тэрмінал, прынтар, ці алфавітна-лічбавае друкарскае прыстасаванне, прайгравальнік для кампакт-дыскаў, персанальны камп'ютар, сістэма сувязі, якая забяспечвае ўваход і выхад з АПМ у банкі даных і знешнія базы даных, прыстасаванне для чытання дакументаў на мікраносьбітах. Лінгвістычныя сродкі – інфармацыйна-пошукавыя мовы класіфікацыйнага ці прадметнага тыпу, што прадстаўлены ў машыначытальнай форме ў выглядзе файлаў ці ў кніжнай, карткавай формах на мікраносьбітах. Праграмныя сродкі – спецыяльна распрацаваныя алгарытмы і праграмы, якія дазваляюць весці аўтаматызаваную апрацоўку даных, электронны каталог, даведачныя і дапаможныя файлы.

**АЎТАМАТЫЗАВАНАЯ АПРАЦОЎКА ДАНЫХ**

Апрацоўка даных, якая выконваецца аўтаматызаванымі сродкамі пры магчымым удзеле чалавека.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**АЎТАМАТЫЗАВАНАЯ БІБЛІЯТЭЧНАЯ СІСТЭМА (АБС)**

1. Комплекс арганізацыйных, інфармацыйных, тэхнічных і праграмна-алгарытмічных сродкаў, якія забяспечваюць аўтаматызацыю бібліятэчных працэсаў у пэўнай бібліятэцы ці ў бібліятэчнай сістэме.

2. Бібліятэчная сістэма, у якой тэхналагічныя працэсы поўнасцю ці часткова аўтаматызаваны.

**АЎТАМАТЫЗАВАНАЯ ІНФАРМАЦЫЙНА-БІБЛІЯТЭЧНАЯ СІСТЭМА (АІБС)**

Аўтаматызаваная інфармацыйна-пошукавая сістэма (АІБС), прызначаная для генерыравання, уводу, захавання, трансляцыі, пошуку, распаўсюджвання, выдачы, давядзення да карыстальніка бібліятэчна-інфармацыйных рэсурсаў і інфармацыі.

**АЎТАМАТЫЗАВАНАЯ ІНФАРМАЦЫЙНАЯ СІСТЭМА (АІС)**

Комплекс праграмных, тэхнічных сродкаў і інфармацыйных масіваў, прызначаных для збору, захавання, пошуку і выдачы інфармацыі карыстальнікам па іх запытах.

**АЎТАМАТЫЗАВАНАЯ ІНФАРМАЦЫЙНА-ПОШУКАВАЯ СІСТЭМА**

Інфармацыйна-пошукавая сістэма, рэалізаваная на базе электроннай вылічальнай тэхнікі.

**АЎТАМАТЫЗАВАНАЯ СІСТЭМА (АС)**

Комплекс праграмных і тэхнічных сродкаў, прызначаных для аўтаматызацыі розных працэсаў, звязаных з дзейнасцю чалавека. Чалавек у гэтым выпадку з'яўляецца ўдзельнікам гэтай сістэмы ў адрозненне ад аўтаматычнай сістэмы, якая функцыянуе без яго ўдзелу.

**АЎТАМАТЫЗАВАНАЯ СІСТЭМА АПРАЦОЎКІ ІНФАРМАЦЫІ (АСАІ)**

Сукупнасць праграмных і тэхнічных сродкаў, прызначаных для вырашэння шырокага кола інфармацыйна-вылічальных задач. Забяспечвае ўвод даных, іх апрацоўку па зададзеных праграмах (алгарытмах) і вывад вынікаў у запатрабаванай форме.

**АЎТАМАТЫЗАВАНАЯ СІСТЭМА НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАЙ ІНФАРМАЦЫІ (АСНТІ)**

Сістэма збору, апрацоўкі, захоўвання, пошуку і перадачы навукова-тэхнічнай інфармацыі з выкарыстаннем сучасных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

электронна-вылічальных комплексаў, якія ўключаюць спецыялізаваныя інфармацыйна-тэхналагічныя прыстасаванні.

**АЎТАМАТЫЗАВАНАЯ СІСТЭМА ФАРМІРАВАННЯ БІБЛІЯТЭЧНАГА ФОНДУ**

Фарміраванне бібліятэчнага фонду з выкарыстаннем электронна-вылічальных прыстасаванняў.

**АЎТАМАТЫЗАВАНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ КАТАЛОГ**

Электронны каталог, які раскрывае склад і змест акрэсленага фонду (яго часткі) ці некалькіх акрэсленых фондаў дакументаў. Па прымеце сферы складання і выкарыстання А. б. к. можа быць бібліятэчным, кнігагандлёвым, выдавецкім, архіўным і г.д. Ён носіць назву зборнага, калі адлюстроўвае фонды дакументаў дзвюх і больш устаноў.

**АЎТАМАТЫЗАВАНЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЦЭНТР**

Пастаянны ці часова дзеючы інфармацыйны орган, які ажыццяўляе інфармацыйнае абслугоўванне па раней вызначаных праблемах (тэмах) з выкарыстаннем пры гэтым ЭВМ. Арганізуе і каардынуе работу прама ці апасродкавана падпарадкаваных яму інфармацыйных органаў, падраздзяленняў.

**АЎТАМАТЫЗАВАНЫ ЭЛЕКТРОННЫ ДОСТУП ДА ТЭКСТАЎ**

Доступ да тэкстаў, іх ідэнтыфікацыя, арыентацыя ў інфармацыйных масівах на базе выкарыстання ЭВМ.

**АЎТАМАТЫЗАЦЫЯ БІБЛІЯТЭКІ**

Комплекс навуковых, праектных, тэхнічных работ і арганізацыйных мерапрыемстваў па пераводзе бібліятэчна-бібліяграфічных працэсаў на камп’ютарныя тэхналогіі.

Аўтаматызацыя бібліятэк забяспечвае: скарачэнне тэрміну апрацоўкі паступаючых дакументаў; аднаразовы ўвод бібліяграфічных і фактаграфічных даных, тэкстаў, выяўленчых матэрыялаў, гукавой інфармацыі, а таксама шматмэтавае іх выкарыстанне; шматаспектны аператыўны пошук даных; дыстанцыйны доступ да электронных каталогаў і дакументаў; выхад чытачоў у сусветную інфармацыйную прастору; прадастаўленне прыватных баз даных для агульнага выкарыстання ў глабальных інфармацыйных сетках; камплектаванне фондаў з выкарыстаннем банкаў даных выдавецкіх кнігагандлёвых арганізацый.

Вылучаюцца наступныя кірункі аўтаматызацыі бібліятэк: стварэнне электронных каталогаў; рэтраспектыўная канверсія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каталогаў у электронную форму; падключэнне да сетак перадачы даных, забеспячэнне тэледоступу ў Інтэрнэт; укараненне аўтаматызаваных рабочых месцаў, аўтаматызацыя розных функцый бібліятэк; распрацоўка сумесных праектаў аўтаматызацыі бібліятэк і стварэнне бібліятэчных камп'ютарных сетак; тэхналагічнае і метадалагічнае забеспячэнне распрацовак; стварэнне электронных бібліятэк; арганізацыя службаў электроннай дастаўкі дакументаў.

Аўтаматызацыя бібліятэк у комплексным канчатковым выглядзе ўяўляе сабой аўтаматызаваную інфармацыйна-бібліятэчную сістэму (АІБС), у склад якой могуць уваходзіць і электронныя бібліятэкі.

**АЎТАМАТЫЗАЦЫЯ БІБЛІЯТЭЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНЫХ ПРАЦЭСАЎ**

Укараненне сучасных сродкаў электронна-вылічальнай тэхнікі для ажыццяўлення дзейнасці бібліятэчна-бібліяграфічных устаноў. Сістэма мерапрыемстваў, накіраваных на павышэнне вытворчасці працы бібліятэчнага персаналу пры дапамозе гэтых сродкаў у мэтах павышэння аператыўнасці, дакладнасці і паўнаты задавальнення запытаў карыстальнікаў.

**АЎТАМАТЫЗАЦЫЯ БІБЛІЯТЭЧНЫХ ПРАЦЭСАЎ**

Прымяненне аўтаматычных канструкцый і сістэм, якія вызваляюць (часткова ці поўнасцю) бібліятэчных работнікаў ад непасрэднага ўдзелу ў тэхналагічных бібліятэчных працэсах з мэтай інтэнсіфікацыі працы, паскарэння, павышэння дакладнасці і паўнаты задавальнення запытаў карыстальнікаў бібліятэк. Адначасова з аўтаматызацыяй асобных працэсаў распрацоўваюцца і ўкараняюцца сістэмы аўтаматызацыі, напрыклад абслугоўванне чытачоў бібліятэк, інфармацыйна-пошукавыя сістэмы і інш.

**АЎТАМАТЫЧНАЕ ІНДЭКСАВАННЕ**

Індэксаванне, тэхналогія якога прадугледжвае выкарыстанне толькі фармальных працэдур апрацоўкі тэксту, якія ажыццяўляюцца пры дапамозе вылічальнай тэхнікі. Падача зместу дакумента ў сціслым выглядзе пры дапамозе аўтаматычнага адбору слоў, тэрмінаў з тэксту ці аўтаматычнага прыпісвання тэрміна з інфармацыйна-пошукавай мовы (ІПМ).

**АЎТАР**

Асоба, якая стварыла твор ці прыняла ўдзел у яго стварэнні, а таксама ўстанова ці арганізацыя, ад імя якой друкуюцца матэрыялы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**АЎТАРСКАЕ ПРАВА**

Частка грамадзянскага права, якое рэгулюе правы і абавязкі, звязаныя са стварэннем і выкарыстаннем твораў літаратуры, навукі, мастацтва.

**АЎТАРСКАЯ РАССТАНОЎКА**

Размяшчэнне дакументаў у кнігасховішчы, картак з бібліяграфічнымі запісамі ў каталогу ці ў картатэцы паводле алфавітнага парадку прозвішчаў аўтараў.

**АЎТАРСКІ ВЕЧАР**

Мерапрыемства ў бібліятэцы, мэта якога – рэклама творчасці пэўнага аўтара (пры магчымасці праводзіцца ў прысутнасці аўтара).

**АЎТАРСКІ ЗАГАЛОВАК**

Загаловак, які азначае прозвішча індывідуальнага ці назву калектыўнага аўтара.

**АЎТАРСКІ ЗНАК**

Умоўнае абазначэнне прозвішча аўтара ці першага слова загалоўка дакумента; выкарыстоўваецца для расстаноўкі дакументаў у алфавітным парадку. А. з. уключае пачатковую літару прозвішча аўтара ці загалоўка дакумента і лічбу, вызначаную па табліцах аўтарскіх знакаў.

**АЎТАРСКІ КАЛЕКТЫЎ**

Калектыў асоб, якія выступаюць у якасці аўтара.

**АЎТАРСКІ КАТАЛОГ**

Каталог, у якім карткі размяшчаюцца ў алфавітным парадку па прозвішчах аўтараў ці складальнікаў.

Гл.: Алфавітны каталог.

**АЎТАРСКІ ЛІСТ (АРКУШ)**

Адзінка аб’ёму літаратурнага твора, якая раўняецца 40 тыс. друкаваных знакаў, уключаючы прабелы паміж словамі, ці 7000 радкоў вершаванага тэксту, або 3000 см$^2$ друкаванага графічнага матэрыялу (картаў, ілюстрацый і г.д.).

Гл.: Ліст.

**АЎТАРСКІЯ ТАБЛІЦЫ**

Алфавітны пералік найбольш распаўсюджаных пачатковых літаратурных спалучэнняў, пранумараваных арабскімі лічбамі ад 11 да 99 (у двухзначных А. т.) ці ад 111 да 999 (у трохзначных А. т.). Прызначаны для выяўлення аўтарскага знака.

**АЎТАРЫТЭТНАЕ АПІСАННЕ**

Гл.: Нарматыўнае апісанне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**АЎТАРЫТЭТНЫ ЗАПІС**

Гл.: Нарматыўны запіс.

**АЎТАРЫТЭТНЫ ФАЙЛ**

Гл.: Нарматыўны запіс.

**АЎТАРЫТЭТНЫЯ ДАНЫЯ**

Уніфікаванае зацвярджэнне даных, якія падрыхтаваны цэнтрамі дзяржаўнай бібліяграфіі: даныя аб прозвішчах (імёнах) аўтараў, складальнікаў і іншых асоб, што прымалі ўдзел у падрыхтоўцы выдання (антрапонімы); даныя аб назвах калектываў (сацыёнімы); даныя аб загалоўках ананімных класічных твораў; тэрміны індэксавання; даныя аб загалоўках серый, аб назвах месцаў выданняў, выдавецтвах і друкарнях. А. д. могуць выпускацца ў выглядзе поўных баз даных ці іх фрагментаў па заказах і разавымі запытамі, у машыначытальнай ці кніжнай формах.

**АЎТАРЭФЕРАТ**

Кароткі пераказ навуковай працы, падрыхтаваны яе аўтарам і надрукаваны для папярэдняга азнаямлення з творам (дысертацыяй і інш.).

**АЎТАРЭФЕРАТ ДЫСЕРТАЦЫІ**

Кароткі пераказ дысертацыі ў адпаведнасці з яе асноўнымі палажэннямі, апублікаваны з мэтай азнаямлення шырокай грамадскасці са сціслым зместам і асноўнымі палажэннямі дысертацыі.

**АЎТОГРАФ**

1. Арыгінал рукапісу аўтара.

2. Уласнаручны аўтарскі надпіс ці подпіс.

**АФАРМЛЕННЕ ВЫДАННЯ**

1. Наданне закончанай знешняй і ўнутранай формы выданню, вызначэнне пэўнага фармату, выбар шрыфта, падрыхтоўка ілюстрацый і г.д.

2. Знешняя і ўнутраная форма выдання**.**

**АФАРМЛЕННЕ КАТАЛОГА**

Шэраг працэсаў – афармленне этыкетак і нумарацыйных азначэнняў на каталожных шафах, надшафных надпісаў, сродкаў інфармацыі, змешчаных непасрэдна на каталожных шафах (знешняе афармленне), а таксама афармленне каталожных раздзяляльнікаў (унутранае афармленне), якія адносяцца да арганізацыі бібліятэчнага каталога. Знешняе А. к. звязана з сістэмай сродкаў нагляднай рэкламы бібліятэчных каталогаў.

**АФІЦЫЙНАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне матэрыялаў заканадаўчага, нарматыўнага характару, якое друкуецца ад імя дзяржаўных ці грамадскіх арганізацый, устаноў, ведамстваў.

**АФІЦЫЙНАЕ ЭЛЕКТРОННАЕ ВЫДАННЕ**

Электроннае выданне ад імя дзяржаўных органаў, устаноў, ведамстваў ці грамадскіх арганізацый, якое ўтрымлівае матэрыялы нарматыўнага або дырэктыўнага характару.

**АФІША**

Рэкламнае ці інфармацыйна-даведачнае выданне на паперы або іншым матэрыяле, якое абвяшчае аб мерапрыемстве.

## *Б*

**БАЗА ВЕДАЎ (БВ)**

База даных, што ўтрымлівае сукупнасць фактаў і правіл, якія апісваюць пэўны прадмет, галіну на аснове мадэляў (працэдурная, фрэймавая, семантычная, сеткавая і г.д.); разам з механізмам вываду дазваляе фарміраваць адказы, якія ва ўяўным выглядзе не прысутнічаюць.

**БАЗА ДАНЫХ (БД)**

Набор даных, дастатковы для намечанай мэты і прадстаўлены на машынным носьбіце ў такім выглядзе, што дазваляе ажыццяўляць аўтаматызаваную перапрацоўку інфармацыі (ДАСТ 7.73-96). Сукупнасць даных, арганізаваных па пэўных правілах, якія прадугледжваюць агульныя прынцыпы апісання, захавання даных і маніпуліравання імі незалежна ад прыкладных праграм. Сукупнасць узаемазвязаных даных, якія адносяцца да пэўнай галіны ведаў (тэмы, праблемы), прадстаўленая ў пэўным фармаце на машынным носьбіце.

Гл.: Адрасна-даведачная база даных; База даных паказчыкаў; База першасных даных; Бібліяграфічная база даных; Гіпертэкставая база даных; Дакументальная база даных; Лексіграфічная база даных; Аб’ектаграфічная база даных; Рэфератыўная база даных; Тэкставая база даных; Лічбавая база даных; Лічбава-тэкставая база даных.

**БАЗА ДАНЫХ ПАКАЗЧЫКАЎ**

База першасных даных, якая ўтрымлівае даныя аб уласцівасцях матэрыялаў, працэсаў і з’яў. Звычайна мае лічбавую або лічбава-тэкставую форму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**БАЗА ІНДЭКСАЦЫІ**

Сукупнасць знакаў (літар, лічбаў, матэматычных і пунктуацыйных знакаў), якія выкарыстоўваюцца ў сістэме індэксацыі. У тэорыі кадзіравання аналагічныя тэрміны – «алфавіт кода», «алфавіт анатацыі».

**БАЗА ПАКАЗЧЫКАЎ**

Фактаграфічная база даных, запісы ў якой утрымліваюць звесткі аб той ці іншай характарыстыцы (паказчыку) інфармацыйна-бібліятэчнай дзейнасці.

**БАЗА ПЕРШАСНЫХ ДАНЫХ (ФАКТАГРАФІЧНАЯ БАЗА ДАНЫХ )**

База даных, якая ўтрымлівае інфармацыю, што адносіцца непасрэдна да прадметнай галіны.

**БАЛАСТ ФОНДУ**

Частка бібліятэчнага фонду, якая страціла навуковую, пазнавальную і практычную каштоўнасць для бібліятэкі; уключае ў сябе ўстарэлыя дакументы, старыя зачытаныя кнігі, якія нельга рэстаўраваць, выданні, на якія адсутнічае попыт чытачоў з прычыны выдавецкага ці паліграфічнага браку ў іх.

**БАНК ДАНЫХ**

Сукупнасць баз даных лінгвістычнага і праграмнага забеспячэння для рэалізацыі карыстальнікамі працэсаў апрацоўкі інфармацыі на электроннай вылічальнай машыне.

**БАР-КОД**

Гл.: Штрыхавы код.

**БАШНЕВАЕ СХОВІШЧА**

Гл.: Вертыкальнае размяшчэнне фонду.

**ББК**

Гл.: Бібліятэчна-бібліяграфічная класіфікацыя.

**БЕЗЫНВЕНТАРНЫ ЎЛІК ФОНДУ**

Спрошчаны, індывідуальны ўлік фонду, які заключаецца ў рэгістрацыі кожнага экзэмпляра. Прымяняецца для ўліку тых дакументаў, што паступаюць у бібліятэку ў вялікай колькасці экзэмпляраў.

**БЕЛАРУСАЗНАЎСТВА**

Навука, што вывучае адметнасць і агульнасць беларусаў, іх нацыянальны рух, узаемаадносіны з суседзямі і ролю ў сістэме міжнароднай супольнасці народаў у мінулым і сучасным. У межах навуковай плыні існуе асветнае Б., якое распаўсюджвае сярод насельніцтва веды па мове, літаратуры, гісторыі, этнаграфіі, геаграфіі, эканоміцы, фалькларыстыцы, мас-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тацтвазнаўстве і інш. У межах бібліятэчнай справы і бібліяграфіі вядуцца збор і ўлік навуковай і мастацкай літаратуры пра Беларусь і выдзяляецца асобны раздзел гэтай літаратуры (дакументаў) пад назвай «беларусазнаўства» ці «беларусістыка» (або «беларусіка», «альбаросіка», «альбарутэніка»).

**БЕЛАРУСІКА**

Гэтае паняцце ў бібліятэчнай справе і бібліяграфіі Беларусі ўжываецца для азначэння твораў друку і іншых дакументаў, якія па мове, аўтарстве і змесце датычацца Рэспублікі Беларусь, але выйшлі па-за межамі яе тэрыторыі (фонд беларусікі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі). У многіх краінах існуюць адпаведныя тэрміны для азначэння такіх матэрыялаў (у Расіі – «росіка», у Польшчы – «палоніка», у Літве – «літуаніка» і г.д.). Міжнародным тэрмінам адносна трох груп пералічаных вышэй дакументаў з'яўляецца «экстэрыёрыка».

**БЕНЕФІС ЧЫТАЧА**

Масавае мерапрыемства ў бібліятэцы, мэта якога – ушанаванне актыўных чытачоў, а таксама рэклама бібліятэкі, фонду, бібліятэчнай працы; спрыяе павышэнню аўтарытэту бібліятэкі сярод насельніцтва і выяўленню сапраўдных аматараў чытання.

**БЕСТСЕЛЕР**

Выданне (часцей літаратурна-мастацкае), надрукаванае вялікім тыражом і разлічанае на самыя шырокія колы чытачоў; карыстаецца найвялікшым попытам.

**БІБЛІЁГРАФ**

1. Прафесія, зместам якой з'яўляюцца падрыхтоўка і давядзенне да спажыўцоў крыніц бібліяграфічнай інфармацыі (бібліяграфічных дапаможнікаў).

2. Пасада ў бібліятэках, а таксама кніжных палатах, установах навуковай і тэхнічнай інфармацыі, выдавецтвах, кнігарнях, рэдакцыях газет і часопісаў.

**БІБЛІЯГРАФАВАННЕ**

Падрыхтоўка бібліяграфічнай інфармацыі. Асноўны працэс: бібліяграфічны пошук, бібліяграфічны аналіз дакументаў, іх адбор, складанне бібліяграфічных запісаў, групаванне, сістэматызацыя, прадметызацыя.

**БІБЛІЯГРАФАЗНАЎСТВА**

Навуковая дысцыпліна, якая вывучае тэорыю, гісторыю, метадалогію, тэхналогію, методыку, арганізацыю бібліяграфіі **(3.1.38)**.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Грамадская навука аб структуры і якасцях бібліяграфічнай інфармацыі, заканамернасцях працэсаў яе стварэння, распаўсюджвання і выкарыстання. Сучаснае Б. падзяляецца на агульнае і прыватнае. Агульнае Б. займаецца праблемамі, якія адносяцца да бібліяграфіі ўвогуле. У межах агульнага Б. выдзяляюцца ў якасці адносна самастойных навуковыя дысцыпліны: тэорыя бібліяграфіі, яе гісторыя, арганізацыя, методыка бібліяграфічнай дзейнасці. Дысцыпліны прыватнага Б. вывучаюць асобныя часткі, вынікі, працэсы бібліяграфічнай дзейнасці, напрыклад галіновае, рэкамендацыйнае Б., бібліяграфічнае крыніцазнаўства, методыка бібліяграфавання і г.д.

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ**

Працэс давядзення бібліяграфічнай інфармацыі да спажыўцоў.

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ АДШУКАННЕ**

Від бібліяграфічнага пошуку, звязаны з адшуканнем элементаў бібліяграфічнага апісання, якіх нестае ці якія неабходна ўдакладніць.

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ АПІСАННЕ**

Сукупнасць бібліяграфічных звестак аб дакуменце, якія прыведзены па ўстаноўленых правілах і прызначаны для яго ідэнтыфікацыі і агульнай характарыстыкі. Адрозніваюць манаграфічнае, аналітычнае і зборнае Б.а.

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ ВЫДАННЕ**

Бібліяграфічны дапаможнік, які выдадзены асобным дакументам (**3.3.2.7**).

Бібліяграфічны дапаможнік, надрукаваны ў форме неперыядычнага (уключаючы лістоўкі, плакаты), серыйнага, перыядычнага выдання ці выдання, якое прадаўжае выходзіць.

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ ВЫЯЎЛЕННЕ**

Выяўленне дакументаў як аб'ектаў бібліяграфавання з мэтай іх далейшай бібліяграфічнай апрацоўкі (складання апісання, адбору, групоўкі і г.д.).

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ**

Забеспячэнне патрабаванняў разнастайных сфер грамадскай практыкі пры дапамозе бібліяграфічнай інфармацыі сродкамі мэтанакіраванага даведачна-інфармацыйнага абслугоўвання і стварэнне неабходнай бібліяграфічнай прадукцыі.

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ ІНФАРМАВАННЕ**

Сістэматычнае забеспячэнне бібліяграфічнай інфармацыяй абанента ў адпаведнасці з яго доўгатэрміновым запытам (**3.2.2.7**).

Сін.: Інфармацыйна-бібліяграфічнае абслугоўванне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ**

Інфармацыя, якая змяшчае бібліяграфічныя звесткі (запісы) **(3.3.1.6)**.

Элемент бібліяграфічнай інфармацыі, які ўтрымлівае арганізаваныя па вызначаных правілах (стандартныя) звесткі аб дакуменце (яго частках ці групе дакументаў), неабходныя і дастатковыя для рэалізацыі асноўных грамадскіх мэт бібліяграфічнай інфармацыі. Б. п. можа перадавацца ў дакументальна фіксаванай ці вуснай формах.

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ РЭДАГАВАННЕ**

Рэдагаванне бібліяграфічных запісаў і бібліяграфічных дапаможнікаў у адпаведнасці з патрабаваннямі нарматыўна-рэгламентуючай дакументацыі.

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ АПЕРАЦЫЯ**

Частка тэхналагічнага працэсу, што выконваецца на адным працоўным месцы.

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ АПРАЦОЎКА**

Сукупнасць працэсаў, якія забяспечваюць ідэнтыфікацыю дакумента і яго адлюстравання ў бібліяграфічных дапаможніках (каталогах, спісках, паказальніках).

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ БАЗА ДАНЫХ**

Арганізаваная сукупнасць звестак бібліяграфічнага апісання ў аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэме.

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ ГРУПОЎКА**

Упарадкаванне бібліяграфічных запісаў па падабенстве і (або) адрозненні прымет дакументаў **(3.2.2.21)**.

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА**

Адказ на разавы запыт, які змяшчае бібліяграфічную інфармацыю аб наяўнасці і (або) месцазнаходжанні дакумента (адрасная даведка), аб змесце бібліяграфічнай інфармацыі па вызначанай тэме (тэматычная даведка); аб элементах бібліяграфічнага апісання, што адсутнічаюць або скажоны ў запыце (удакладняльная даведка) **(3.2.2.19)**.

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ**

Галіна інфармацыйнай дзейнасці, скіраваная на задавальненне патрэб у бібліяграфічнай інфармацыі, г. зн. усебаковае забеспячэнне (выяўленне, задавальненне і фарміраванне дакументных інфармацыйных патрэб), што ажыццяўляецца ў навукова-дапаможных, вытворчых, выхаваўчых і іншых мэтах бібліятэкамі, органамі НТІ, выдавецтвамі і да таго падоб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нымі грамадскімі інстытутамі ў сістэме дакументных камунікацый; з сістэмнага пункта гледжання ўключае працэсы (бібліяграфаванне, бібліяграфічнае абслугоўванне і інш.), арганізацыйныя формы, суб'екты, вынікі і сродкі.

Сін.: Бібліяграфічная работа; Бібліяграфічная справа.

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ ЗАКЛАДКА**

Кароткі рэкамендацыйны спіс, які адрасаваны чытачу вызначанай кнігі, звязаны з кнігай па змесце і ўкладзены ў яе ў выглядзе закладкі. Існуюць дзве асноўныя разнавіднасці: 1) закладка «З чаго пачаць», якая рэкамендуе літаратуру, патрэбную для першапачатковага азнаямлення з тэмай кнігі; 2) закладка «Што чытаць далей», якая прызначаецца чытачу, што жадае больш паглыблена і ўсебакова вывучыць пытанні, закранутыя ў кнізе.

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ ІДЭНТЫФІКАЦЫЯ**

Устанаўленне тоеснасці дакумента на аснове тых ці іншых прымет.

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ**

Інфармацыя аб дакументах, якая ствараецца і выкарыстоўваецца ў грамадстве з мэтай ідэнтыфікацыі і апавяшчэння аб дакументах, іх пошуку, дыферэнцыраванай рэкамендацыі і рэкламы.

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ КАНСУЛЬТАЦЫЯ**

Адказ на разавы запыт, які ўтрымлівае парады адносна самастойнага выкарыстання шляхоў і сродкаў бібліяграфічнага пошуку.

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ КАРТАТЭКА**

Бібліяграфічны дапаможнік, які рэалізаваны ў карткавай форме і не звязаны цвёрда з пэўным фондам дакументаў **(3.3.2.8)**.

Бібліяграфічны дапаможнік, які складзены ў карткавай форме і ўтрымлівае бібліяграфічную інфармацыю. Па спосабе групоўкі выдзяляюць алфавітныя, сістэматычныя, прадметныя і іншыя Б. к. У адрозненне ад бібліяграфічнага каталога Б. к. могуць уключаць звесткі аб дакументах, якія адсутнічаюць у фондах бібліятэкі.

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ КЛАСІФІКАЦЫЯ БЛІСА**

Іерархічная камбінацыйная сістэма бібліятэчна-бібліяграфічнай класіфікацыі, распрацаваная амерыканскім бібліятэказнаўцам Г. І. Блісам (1870–1955). На аснове яго палажэнняў была сфармулявана ўніверсальная аналітыка-сінтэтычная кла-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сіфікацыйная сістэма пад кіраўніцтвам Дж. Мілса (Вялікабрытанія).

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ КРЫНІЦА**

Гл.: Крыніца бібліяграфічнай інфармацыі.

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ КУЛЬТУРА**

Паказчык узроўню распаўсюджанасці бібліяграфічных ведаў у грамадстве, развіцця бібліяграфіі, забеспячэння грамадскіх запатрабаванняў бібліяграфічнай інфармацыяй, якасці бібліяграфічных дапаможнікаў.

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ ЛІСТОЎКА**

Бібліяграфічны дапаможнік у форме лістоўкі.

Гл.: Лістоўка.

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ МАНАГРАФІЯ**

Аб'ёмны манаграфічны дапаможнік навуковага прызначэння, які створаны на аснове паглыбленага вывучэння вялікага масіву дакументаў, падвергнутых першаснай бібліяграфічнай апрацоўцы.

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ ПАЛОСКА**

Радок на абложцы нумара перыядычнага выдання, які ўтрымлівае звесткі аб загалоўку твора ў скарочанай форме і (вельмі рэдка) аб месцы, годзе, нумары выпуску, колькасці старонак.

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ ПАМЯТКА**

Жанр рэкамендацыйнага бібліяграфічнага дапаможніка малой формы, які прысвячаецца звычайна пэўнай гістарычнай падзеі або асобе ў сувязі з юбілеем і ўтрымлівае фактычныя звесткі і спіс літаратуры па тэме.

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ ПАСЛУГА**

Вынік бібліяграфічнага абслугоўвання, які задавальняе патрэбнасці ў бібліяграфічнай інфармацыі (**3.2.2.15**).

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ ПАТРЭБА**

Неабходнасць у выяўленні і выкарыстанні бібліяграфічнай інфармацыі з мэтай атрымання патрэбных дакументаў.

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ ПРАДУКЦЫЯ**

Інфармацыйная прадукцыя, якая змяшчае бібліяграфічную інфармацыю (**3.3.1.5**).

Дакументальна зафіксаваная бібліяграфічная інфармацыя як вынік (і сродак) бібліяграфічнай дзейнасці. Часцей за ўсё гэты тэрмін выкарыстоўваецца для абазначэння вынікаў складальніцкай работы тых ці іншых суб'ектаў бібліяграфічнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ РАБОТА**

Гл.: Бібліяграфічная дзейнасць.

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ РЭДКАСЦЬ**

Рэдкі дакумент, які захоўваецца ў адносна малой колькасці экзэмпляраў, у асноўным вядомы па бібліяграфічным апісанні.

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ РЭКАМЕНДАЦЫЯ**

Метад ацэнкі і адбору дакументаў з пункта гледжання іх карысці і даступнасці для пэўнай чытацкай катэгорыі.

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ СЛУЖБА**

Самастойная ўстанова або падраздзяленне, асноўнай функцыяй якога з'яўляецца бібліяграфічнае абслугоўванне або іншыя віды бібліяграфічнай дзейнасці (кніжная палата, бібліяграфічнае бюро, бібліяграфічны аддзел бібліятэкі, выдавецтва, кнігарні і г.д.).

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ СПАСЫЛКА**

Сукупнасць бібліяграфічных звестак пра цытаваны ці ўзгаданы (разглядаемы ці ўпамінаемы) дакумент, неабходных для яго ідэнтыфікацыі і пошуку **(3.3.2.1)**.

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ СПРАВА**

Гл.: Бібліяграфічная дзейнасць.

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА**

Сукупнасць звестак, якія ўтрымліваюцца ў бібліяграфічным запісе (апісанне дакумента, анатацыя, рэферат і інш.), што дазваляе яго ідэнтыфікаваць па фармальных прыметах і змесце.

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ**

Жанр даведачна-бібліяграфічнага дапаможніка, які ўключае размешчаныя ў алфавітным, прадметна-тэматычным або сістэматычным парадку фактычныя звесткі і апісанне літаратуры па пэўнай галіне ведаў ці тэме.

**БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ ЭЎРЫСТЫКА**

1. Тэорыя і практыка бібліяграфічнага пошуку.

2. Бібліяграфічны пошук.

**БІБЛІЯГРАФІЧНЫ АГЛЯД**

1. Бібліяграфічны дапаможнік, які ўяўляе звязнае апавяданне аб выданнях або дакументах **(3.3.2.6)**.

2. Вуснае паведамленне аб дакументах; шырока выкарыстоўваецца ў бібліятэках розных тыпаў як форма вуснай прапаганды літаратуры. Адрозніваюцца агляды новых паступленняў, якія знаёмяць чытачоў з новымі выданнямі, што па-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ступілі ў бібліятэку за вызначаны час, і тэматычныя агляды літаратуры, прысвечаныя якой-небудзь тэме ці праблеме.

**БІБЛІЯГРАФІЧНЫ АДБОР**

Адбор бібліяграфаваных дакументаў у адпаведнасці з вызначанымі крытэрыямі.

**БІБЛІЯГРАФІЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ**

Бягучы бібліяграфічны дапаможнік рознай перыядычнасці ў форме бюлетэня.

**БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік, які змяшчае біяграфічныя звесткі аб пэўнай асобе або асобах, а таксама бібліяграфічную інфармацыю аб іх творах і літаратуры аб іх **(3.3.2.24)**.

Дакумент, які змяшчае ўпарадкаваную сукупнасць бібліяграфічных запісаў. Можа мець розныя формы – друкаваныя выданні, машынапісныя карткі, магнітныя стужкі, кампакт-дыскі, мікрафішы і г.д., калі яны прызначаны для выкарыстання ў бібліяграфічным абслугоўванні. Звычайна складаецца з асноўнай часткі, дзе змяшчаюцца бібліяграфічныя запісы, і дадатковых тэкставых матэрыялаў (прадмова, дадатак і інш.).

**БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ЗАПІС**

Бібліяграфічнае паведамленне, якое зафіксавана ў дакументнай форме; складаецца з бібліяграфічнага апісання, якое па меры неабходнасці можа быць дапоўнена загалоўкамі, анатацыяй ці рэфератам, класіфікацыйным індэксам, прадметнымі рубрыкамі, шыфрамі захоўвання і іншымі элементамі.

**БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ЗАПІС ПАД ЗАГАЛОЎКАМ**

Запіс, дзе ў якасці першага элемента абраны асоба, назва ўстановы (арганізацыі) ці іншыя аднастайна сфармуляваныя звесткі.

**БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ЗАПІС У КАМУНІКАТЫЎНЫМ ФАРМАЦЕ**

Сукупнасць палёў, якія ўключаюць маркер запісу, даведнік і поле даных, што апісвае адну ці некалькі бібліяграфічных адзінак як адзінае цэлае.

Гл.: Камунікатыўны фармат.

**БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ЗАПЫТ**

Інфармацыйны запыт на бібліяграфічную інфармацыю **(3.2.2.18)**.

**БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ІНТЭРВАЛ**

Тэрмін ад выхаду ў свет дакумента да адлюстравання інфармацыі аб ім у бягучым ці з працягам бібліяграфічным дапа-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

можніку. Велічыня бібліяграфічнага інтэрвалу служыць вымяральнікам аператыўнасці бібліяграфічнай інфармацыі.

Сін.: Інфармацыйны інтэрвал.

**БІБЛІЯГРАФІЧНЫ КАТАЛОГ**

Бібліяграфічны дапаможнік, які раскрывае склад і змест аднаго ці некалькіх вызначаных фондаў дакументаў (бібліятэк, кніжных палат, органаў НТІ, архіваў і г.д.). Па прымеце стварэння і выкарыстання Б. к. можа быць бібліятэчны, кнігагандлёвы, архіўны і г.д.

**БІБЛІЯГРАФІЧНЫ МЕТАД**

Сістэма прыёмаў і правіл, якія забяспечваюць магчымасць выбраць са шматлікіх фіксаваных крыніц інфармацыі неабходныя, ацаніць інфармацыйную сітуацыю, вызначыць асноўныя кірункі вывучэння літаратуры.

**БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ПАДБОР**

Працэс збірання матэрыялу, які адносіцца да тэмы бібліяграфічнага дапаможніка або запыту ў адпаведнасці з пэўным мэтавым і чытацкім прызначэннем.

**БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ПАКАЗАЛЬНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік са складанай структурай, які мае дапаможныя паказальнікі, а ў неабходных выпадках і іншыя элементы, характэрныя для самастойна выдадзенага дакумента (прадмова, змест і г.д.).

**БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ПАКАЗАЛЬНІК ДА ВЫДАННЯ**

Частка даведачнага апарату выдання, якая раскрывае склад або змест твораў, што змешчаны ў дадзеным выданні **(3.3.2.47)**.

**БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ПОЧЫРК**

Рукапісны стандартызаваны шрыфт, які нагадвае друкаваныя літары. Знаходзіць шырокае прымяненне ў каталагізацыі. Прапанаваны ў 1876 г. амерыканскім бібліятэкарам М. Дзьюі, перапрацаваны расійскім бібліятэказнаўцам Ю. У. Грыгор'евым.

**БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ПОШУК**

Інфармацыйны пошук, які ажыццяўляецца на аснове бібліяграфічных даных (**3.2.2.16**).

**БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ПРАЦЭС**

Сукупнасць паслядоўных бібліяграфічных аперацый, накіраваных на выкананне адной адзінкі бібліяграфічнай дзейнасці. У айчынным бібліяграфазнаўстве выдзяляюцца два асноўныя працэсы: бібліяграфічнае абслугоўванне і бібліяграфаванне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СЛОЎНІК**

Жанр бібліяграфічнага дапаможніка, які выконвае даведачна-бібліяграфічную функцыю і адпавядае патрабаванням даведачных выданняў.

**БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС**

Бібліяграфічны дапаможнік з простай структурай без дапаможнага апарату, які ўяўляе сабой невялікі ўпарадкаваны пералік бібліяграфічных запісаў.

**БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ЦЭНТР**

Інфармацыйны цэнтр, які выконвае функцыі па стварэнні, зборы, перапрацоўцы і распаўсюджванні бібліяграфічнай інфармацыі (**3.4.1.8**).

**БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ШТОГОДНІК**

Бягучае бібліяграфічнае выданне гадавой перыядычнасці, якое ўключае звесткі аб дакументах пэўнага года, указанага ў загалоўку.

**БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ ЗВЕСТКІ**

Канкрэтныя звесткі аб дакуменце, якія выкарыстоўваюцца пры складанні бібліяграфічнага апісання і загалоўка бібліяграфічнага запісу.

Сін.: Бібліяграфічныя даныя.

**БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ РЭСУРСЫ**

Від інфармацыйных рэсурсаў, якія ўяўляюць сабой сукупнасць бібліяграфічнай прадукцыі (паказальнікі, спісы, агляды, базы даных).

**БІБЛІЯГРАФІЯ**

Інфармацыйная інфраструктура, якая забяспечвае падрыхтоўку, распаўсюджванне і выкарыстанне бібліяграфічнай інфармацыі (**3.1.35**).

1. Дзейнасць, якая звязана з забеспячэннем функцыянавання бібліяграфічнай інфармацыі ў грамадстве (уключаючы практычную бібліяграфічную работу, бібліяграфазнаўства, кіраванне і падрыхтоўку кадраў).

2. Галіна навукова-практычнай дзейнасці па падрыхтоўцы і давядзенні да спажыўцоў бібліяграфічнай інфармацыі. У такой якасці гэтае паняцце з'яўляецца сінонімам паняцця «бібліяграфічная дзейнасць».

**БІБЛІЯГРАФІЯ БЕЛАРУСАЗНАЎСТВА**

Від беларускай бібліяграфіі, які адлюстроўвае дакументы па беларускай мове, літаратуры, гісторыі, этнаграфіі, геагра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фіі, эканоміцы, фальклярыстыцы, мастацтвазнаўстве і іншых галінах ведаў і садзейнічае інфармацыйнаму забеспячэнню навуковага і асветнага беларусазнаўства.

**БІБЛІЯГРАФІЯ БІБЛІЯГРАФІІ**

Бібліяграфія, якая забяспечвае арыентацыю ў наяўных рэсурсах бібліяграфічнай інфармацыі.

Сін.: Бібліяграфія другой ступені.

**БІБЛІЯГРАФІЯ ПАТРЫЁТЫКІ**

Бібліяграфія, аб'ектам якой з'яўляецца літаратура аб той ці іншай краіне, выдадзеная за яе межамі. Гэты тэрмін ёсць у слоўніках Я. І. Шамурына «Словарь книговедческих терминов», К. Р. Сімона «Библиография: основные понятия и термины». Папулярызацыі тэрміна прысвяціў артыкул «Национальная библиография и библиография "патриотики"» В. П. Лiраў (Сов.библиография. 1962. №3. С. 41–50), аднак ён не стаў агульнапрызнаным як у тэорыі бібліяграфіі, так і ў практыцы бібліяграфічнай дзейнасці.

Сін.: Бібліяграфія экстэрыёрыкі.

**БІБЛІЯПСІХАЛОГІЯ**

Навукова-псіхалагічная аснова традыцыйнай і электроннай інфармацыйна-бібліятэчнай дзейнасці; тэорыя і практыка ўстанаўлення псіхалагічнага ўздзеяння кнігі на чытача і функцыянальнай залежнасці паміж чытачом, кнігай і аўтарам.

**БІБЛІЯТЫПАЛОГІЯ**

Тыпалогія, якая прымяняецца ў кніжнай справе (тыпалогія кніг, выдавецка-кнігагандлёвых установаў), у бібліятэчнай справе (тыпалогія бібліятэк), у традыцыйнай і электроннай бібліяграфіі (тыпалогія крыніц) бібліяграфічнай інфармацыі, суб'ектаў, працэсаў, вынікаў (прадуктаў), сродкаў бібліяграфічнай дзейнасці.

**БІБЛІЯТЭКА**

Інфармацыйная, культурная, адукацыйная ўстанова, якая валодае арганізаваным фондам дакументаў і прадастаўляе іх у часовае карыстанне абанентам, а таксама ажыццяўляе іншыя бібліятэчныя і бібліяграфічныя паслугі (**3.1.39**).

**БІБЛІЯТЭКА ВЫШЭЙШАЙ НАВУЧАЛЬНАЙ УСТАНОВЫ**

Структурнае падраздзяленне вышэйшай навучальнай установы, якое задавальняе інфармацыйныя патрэбы студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў, прафесарска-выкладчыцкага складу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і супрацоўнікаў ВНУ, што звязаны з навучальным і выхаваўчым працэсам, навукова-даследчай дзейнасцю.

**БІБЛІЯТЭКА-ДЭПАЗІТАРЫЙ**

Бібліятэка, якая забяспечвае гарантаванае захаванне і выдачу па запытах абанентаў максімальна ўкамплектаванага фонду дакументаў па вызначаным профілі, а таксама прыём ад іншых бібліятэк на захаванне малаўжывальных дакументаў, якіх не хапае ў яе фондзе.

**БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА**

Навуковая дысцыпліна, якая вывучае тэорыю, гісторыю, метадалогію, тэхналогію, методыку і арганізацыю бібліятэчнай справы **(3.1.41)**.

Навука, якая вывучае бібліятэчную справу, заканамернасці, прынцыпы фарміравання, развіцця, функцыянавання бібліятэк, узаемадзеянне іх у розных аспектах. Структура Б. уключае: агульнае Б. (тэорыя, метадалогія, гісторыя, методыка і арганізацыя) і прыватнае Б. – вучэнне аб бібліятэчных фондах, каталогах, тэорыя кіраўніцтва чытаннем дзяцей і падлеткаў, тэорыя функцыянавання бібліятэк і бібліятэчных сістэм. У структуру Б. уваходзяць таксама такія бібліятэказнаўчыя раздзелы, якія ўзніклі ў выніку інтэграцыі Б. з іншымі навукамі: бібліятэчная псіхалогія, бібліятэчная педагогіка, бібліятэчная рэклама і менеджмент, фандрэйзінг для бібліятэк, бібліятэчная статыстыка, эканоміка бібліятэчнай справы, бібліятэрапія, бібліятэчнае права, бібліятэчная этыка, бібліятэчная эстэтыка, бібліятэчная канфлікталогія і інш.

**БІБЛІЯТЭКАЗНАЎЦА**

Спецыяліст, які займаецца навукова-даследчай работай у галіне бібліятэказнаўства.

**БІБЛІЯТЭКАЗНАЎЧАЯ ДЫСЦЫПЛІНА**

Раздзел бібліятэказнаўства, фарміруецца як навуковая дысцыпліна ці ўяўляе сабой курс у сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі на бібліятэчных факультэтах ВНУ культуры і на спецыяльных аддзяленнях універсітэтаў ці педагагічных інстытутаў (агульнае бібліятэказнаўства, гісторыя бібліятэчнай справы, бібліятэчныя фонды, бібліятэчныя каталогі, бібліятэчнае абслугоўванне, бібліятэчны менеджмент і маркетынг, бібліятэчны фандрэйзінг і інш.).

**БІБЛІЯТЭКА СЯМЕЙНАГА ЧЫТАННЯ**

Спецыялізаваная ўстанова па абслугоўванні бацькоў і дзяцей, асноўнымі кірункамі дзейнасці якой з’яўляюцца камп-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лектаванне фонду спецыялізаванай літаратуры па пытаннях сямейнага чытання, педагогікі, псіхалогіі, выхавання ў сям'і; рэкламаванне дакументаў у дапамогу псіхолага-педагагічнай кампетэнтнасці бацькоў, чытацкай культуры бацькоў і дзяцей; арганізацыя вольнага часу сям'і ў бібліятэцы; выкарыстанне традыцыйных і інавацыйных тэхналогій бібліятэчнага абслугоўвання бацькоў і дзяцей псіхолага-педагагічнай, метадычнай, дзіцячай літаратурай. Звычайна фарміруецца на базе публічнай бібліятэкі.

**БІБЛІЯТЭКАР**

1. Прафесія, змест якой уключае комплекс бібліятэчных працэсаў: камплектаванне і арганізацыю фондаў, абслугоўванне чытачоў, інфармацыйную дзейнасць; патрабуе шырокага культурнага кругагляду, умення працаваць у аўтаматызаваным рэжыме, прафесійных ведаў.

2. Пасада ў бібліятэцы. У залежнасці ад складанасці бібліятэчных працэсаў і ўзроўню спецыяльнай падрыхтоўкі выдзяляюцца наступныя катэгорыі: стажор-Б., старшы Б., галоўны Б.

**БІБЛІЯТЭРАПІЯ**

Кнігалячэнне (лячэнне кнігай), якое пры дапамозе спецыяльна падабранай літаратуры і адпаведных традыцыйных і электронна-бібліяграфічных дапаможнікаў здольнае аказаць прафілактычнае, псіхалагічнае, лячэбна-рэабілітацыйнае ўздзеянне на хворых.

**БІБЛІЯТЭКА-ФІЛІЯЛ**

Бібліятэка, якая знаходзіцца ў адміністрацыйным падпарадкаванні другой бібліятэкі. Часцей за ўсё гэтым тэрмінам абазначаецца структурнае падраздзяленне цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы, якое працуе пад кіраўніцтвам цэнтральнай бібліятэкі. Ствараюцца спецыялізаваныя бібліятэкі-філіялы новага тыпу (бізнес-бібліятэкі, бібліятэкі-цэнтры прававой інфармацыі, бібліятэкі экалагічнай асветы, бібліятэкі сямейнага чытання, бібліятэкі-клубы, бібліятэкі-тэатры, бібліятэкі-артатэкі і інш.).

**БІБЛІЯТЭЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ**

Абслугоўванне абанентаў бібліятэчнымі і бібліяграфічнымі сродкамі. Працэс уключае выдачу чытачу дакументаў (непасрэднае бібліятэчнае абслугоўванне), звестак аб дакументах (бібліяграфічнае абслугоўванне), пэўных фактычных да-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных, уключаючы аналітычныя даведкі (фактаграфічнае абслугоўванне), складанне для чытачоў тэматычных падборак і дайджэстаў.

**БІБЛІЯТЭЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ АДУКАЦЫЯ**

Сістэма падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў вышэйшай і сярэдняй кваліфікацыі. Бібліятэчных спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі ў Рэспубліцы Беларусь рыхтуюць Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў (факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый – дзённае і завочнае навучанне), Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт (завочнае аддзяленне), сярэдняй – Магілёўскі дзяржаўны бібліятэчны каледж, Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў (завочнае навучанне).

**БІБЛІЯТЭЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ КЛАСІФІКАЦЫЯ (ББК)**

Іерархічная камбінацыйная сістэма бібліятэчна-бібліяграфічнай класіфікацыі, распрацаваная ў 1958–1968 гг. аб'яднанымі намаганнямі спецыялістаў ДБЛ СССР, ДПБ, БАН СССР, Усесаюзнай Кніжнай палаты і іншых устаноў пры ўдзеле вучоных. ББК выдадзена ў выглядзе варыянтаў табліц з рознай ступенню дэталізацыі: поўныя табліцы і скарочаны іх варыянт для навуковых бібліятэк; табліцы для абласных, публічных, дзіцячых і школьных бібліятэк, для краязнаўчых каталогаў і інш. ББК распрацоўвалася са змешанай літаралічбавай індэксацыяй, якую выкарыстоўваюць навуковыя бібліятэкі. У табліцы ББК абласных, публічных, дзіцячых і школьных бібліятэк для вызначэння асноўных дзяленняў былі ўведзены лічбавыя індэксы. Структура ББК усіх выданняў аднолькавая: асноўныя табліцы, дапаможныя табліцы тыпавых дзяленняў, метадычныя ўказанні, алфавітна-прадметны паказальнік, дадаткі. ББК мела ярка выражаны ідэалагічны характар. Прадугледжана выкарыстанне міжнародных сістэм УДК, ДКД і інш.

**БІБЛІЯТЭЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ РЭСУРСЫ**

Інфармацыйны, матэрыяльна-тэхнічны і кадравы патэнцыял, які маюць бібліятэкі для ажыццяўлення сваіх функцый **(3.3.1.3)**.

**БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ**

Інфармацыйная дзейнасць, якая ажыццяўляецца бібліятэкамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**БІБЛІЯТЭЧНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ**

Сукупнасць розных відаў дзейнасці бібліятэкі па задавальненні патрэбнасцей яе карыстальнікаў шляхам прадастаўлення бібліятэчных паслуг і прадуктаў **(3.2.2.4)**.

**БІБЛІЯТЭЧНАЕ АБСТАЛЯВАННЕ**

Сродкі матэрыяльна-тэхнічнага абсталявання бібліятэк, неабходныя для выканання бібліятэчных працэсаў і працы чытачоў у бібліятэцы. Асноўнае Б. а.: стэлаж, каталожная шафа, выставачная вітрына, кафедра выдачы, чытацкі стол, дысплей, апарат для чытання мікраносьбіта, электронныя сродкі і інш.

**БІБЛІЯТЭЧНАЕ АБ'ЯДНАННЕ**

1. Сукупнасць бібліятэк аднаго ці розных тыпаў, ведамстваў, створаная на прынцыпах каардынацыі дзейнасці або цэнтралізацыі ў структурнай арганізацыі. Да Б. а. адносяцца цэнтралізаваныя бібліятэчныя тэрытарыяльныя комплексы, міжведамасныя сістэмы, міжзаводскія, карпаратыўныя сеткі і інш.

2. Добраахвотнае аб'яднанне бібліятэкараў аднаго ці некалькіх ведамстваў з мэтамі сацыяльнай абароны, абмену вопытам ці павышэння кваліфікацыі, напрыклад Беларуская бібліятэчная асацыяцыя.

**БІБЛІЯТЭЧНАЕ АСЯРОДДЗЕ**

Сукупнасць умоў, элементаў прадметнага і духоўнага акружэння бібліятэкара і карыстальніка бібліятэкі, што складае частку інфармацыйна-культурнага асяроддзя грамадства. У бібліятэчным асяроддзі вылучаюць макраасяроддзе (асяроддзе сацыяльнага плана, якое актыўна ўплывае на развіццё бібліятэчнай справы ў грамадстве) і мікраасяроддзе (унутранае бібліятэчнае асяроддзе, якое ўтрымлівае розныя складальнікі – інфармацыйны, матэрыяльны, эмацыянальна-псіхалагічны, экалагічны і інш.).

**БІБЛІЯТЭЧНАЕ ВУЧНЁЎСТВА**

Форма індывідуальнага вытворчага навучання, якая аб'ядноўвае тэарэтычную падрыхтоўку з практычнымі заняткамі; ажыццяўляецца непасрэдна ў бібліятэцы.

**БІБЛІЯТЭЧНАЕ ВЫДАННЕ**

1. Выданне бібліятэкі.

2. Выданне для выкарыстання ў бібліятэцы, аформленае адпаведным чынам.

**БІБЛІЯТЭЧНАЕ ЗАКАНАДАЎСТВА**

Форма дзяржаўнага кіравання бібліятэчнай справай, якая заключаецца ў выданні заканадаўчых актаў, што вызначаюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у маштабах краіны прававыя асновы бібліятэчнай справы, неабходныя ўмовы развіцця і дзейнасці бібліятэк.

**БІБЛІЯТЭЧНАЕ МЕРАПРЫЕМСТВА**

Мерапрыемства, якое арганізуецца ў бібліятэцы ці па-за яе межамі.

**БІБЛІЯТЭЧНАЕ ПАДРАЗДЗЯЛЕННЕ**

Структурнае падраздзяленне бібліятэкі: аддзел камплектавання і апрацоўкі дакументаў, аддзел рэкламы і маркетынгу, аддзел абслугоўвання чытачоў (абанемент, чытальная зала), аддзел кнігасховішча, даведачна-бібліяграфічны аддзел і інш.

**БІБЛІЯТЭЧНАЯ АПРАЦОЎКА**

Комплекс уніфіцыраваных і рэгламентаваных дзяржаўнымі актамі працэсаў падрыхтоўкі для выкарыстання ў бібліятэцы дакументаў, які ўключае складанне бібліяграфічнага апісання ў традыцыйнай і (ці) электроннай форме, індэксаванне (сістэматызацыю і прадметызацыю), тэхнічную апрацоўку.

**БІБЛІЯТЭЧНАЯ АДУКАЦЫЯ**

Гл.: Бібліятэчныя кадры; Бібліятэчна-бібліяграфічная адукацыя.

**БІБЛІЯТЭЧНАЯ АПЕРАЦЫЯ**

Закончаная сукупнасць службова-прафесійных дзеянняў і прыёмаў, якія выконваюцца супрацоўнікамі бібліятэкі.

**БІБЛІЯТЭЧНАЯ БІБЛІЯГРАФІЯ**

Кагнітыўна-інфармацыйная інфраструктура бібліятэчнай справы, якая садзейнічае фарміраванню і выкарыстанню бібліятэчных фондаў і іншых рэсурсаў бібліятэкі; часткі бібліятэчнай дзейнасці, дзе здзяйсняецца стварэнне і выкарыстанне бібліятэчных крыніц бібліяграфічнай інфармацыі (бюлетэні навін, бібліятэчныя каталогі, картатэкі, планы чытання, анатаваныя карткі і г.д.).

**БІБЛІЯТЭЧНАЯ ВЫСТАВА**

Форма бібліятэчнага абслугоўвання, якая забяспечваецца шляхам нагляднай дэманстрацыі дакументаў, іншых экспанатаў інфармавання аб выданні, падзеях, праблемах і г.д.

Гл.: Выстава навін; Адкрыты прагляд; Тэматычная выстава.

**БІБЛІЯТЭЧНАЯ ГЕНЕАЛОГІЯ**

Навукова-практычны комплексны кірунак, які даследуе праблемы генеалогіі бібліятэчных калекцый.

**БІБЛІЯТЭЧНАЯ ДАВЕДКА**

Гл.: Адрасная бібліяграфічная даведка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**БІБЛІЯТЭЧНАЯ ДАКУМЕНТАЦЫЯ**

Сукупнасць дакументаў, якія рэгламентуюць прававыя, тэхналагічныя і арганізацыйныя аспекты дзейнасці бібліятэкі. Дакументы падраздзяляюцца на: агульныя для ўсіх бібліятэк (інструкцыя аб захаванні фондаў); агульныя для бібліятэк вызначанай ведамаснай прыналежнасці (правілы ўнутранага распарадку для ўсіх работнікаў бібліятэк Міністэрства культуры); агульныя для бібліятэк вызначанага тыпу (статуты бібліятэк, палажэнні аб бібліятэках); дзеючыя толькі ў дадзенай бібліятэцы (службовыя інструкцыі).

Да Б. д. адносяцца таксама планы работы бібліятэк, уліковыя дакументы (дзённікі работы), справаздачы. Разнавіднасцю Б. д. з'яўляецца набор розных формаў дакументаў, адзіных для ўсіх бібліятэк (напрыклад, картка бланка-заказу дакументаў па міжбібліятэчным абанеменце, фармуляр чытача, рэгістрацыйная картка, акт на выключэнне з фонду дакументаў і інш.).

**БІБЛІЯТЭЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ**

Сукупнасць працэсаў, якія ахопліваюць усе кірункі функцыянавання бібліятэчных сістэм, у прыватнасці бібліятэчна-бібліяграфічнай (электронна-бібліяграфічнай) дзейнасці.

**БІБЛІЯТЭЧНАЯ КАНФЛІКТАЛОГІЯ**

Дысцыпліна, якая вывучае сутнасць канфліктных сітуацый у бібліятэчным асяроддзі і шляхі іх пераадолення.

**БІБЛІЯТЭЧНАЯ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ РАБОТА**

Навуковыя даследаванні, накіраваныя на ўдасканаленне бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва, якія даюць магчымасць узмацніць тэарэтычную базу бібліятэчнай справы; накіраваныя на распрацоўку новых ведаў у галінах бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства, гісторыі кнігі і кнігазнаўства, аптымізацыю бібліятэчнай тэхналогіі. Адрозніваюць даследаванні: тэарэтычныя (у выніку – паглыбленне тэарэтычных ведаў у галіне бібліятэчнай справы); прыкладныя (даюць тэарэтычнае вырашэнне адной з праблем бібліятэчнай практыкі і распрацоўкі з канкрэтнымі ўказаннямі, рэкамендацыямі і прапановамі па ўдасканаленні вызначанага працэсу практычнай дзейнасці). Здзяйсняецца Б. н.-д. р. непасрэдна ў бібліятэках, фінансуецца як адзін з напрамкаў дзейнасці бібліятэк, навукова-даследчых аддзелаў і сацыялагічных груп пры буйных бібліятэках.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**БІБЛІЯТЭЧНАЯ ПАСЛУГА**

Канкрэтны вынік бібліятэчнага абслугоўвання, які задавальняе пэўную патрэбнасць карыстальніка бібліятэкі (выдачу і абаніраванне дакументаў, прадастаўленне інфармацыі аб новых паступленнях, даведкі, выстаўкі, кансультацыі і г. д.) **(3.2.2.14)**.

**БІБЛІЯТЭЧНАЯ ПЕДАГОГІКА**

Дысцыпліна, якая вывучае педагагічныя асновы бібліятэчнай работы, праблемы тэорыі чытання і яго культуры, а таксама ўзаемаадносін бібліятэкара і карыстальніка.

**БІБЛІЯТЭЧНАЯ ПРАДУКЦЫЯ**

Вынік бібліятэчнай дзейнасці па вытворчасці спецыфічных прадметаў бібліятэчнай працы (бібліятэчны фонд, бібліятэчныя дапаможнікі, у т.л. каталогі, базы даных і г.д.).

**БІБЛІЯТЭЧНАЯ ПРАФЕСІЯГРАФІЯ**

Навуковая бібліятэказнаўчая дысцыпліна, якая вывучае задачы, змест, тэхналогію, формы і спецыфіку працоўнай дзейнасці бібліятэкара.

**БІБЛІЯТЭЧНАЯ ПСІХАЛОГІЯ**

Дысцыпліна, якая вывучае псіхалагічныя асновы бібліятэчнай дзейнасці, у тым ліку праблемы пошуку і ўспрымання дакументнай інфармацыі, кантактаў бібліятэкара і чытача, а таксама стварэнне аптымальнага псіхалагічнага асяроддзя ў калектыве.

**БІБЛІЯТЭЧНАЯ РЭКЛАМА**

Рэклама, галоўным кампанентам якой з’яўляецца інфармацыя аб бібліятэцы, бібліятэчных рэсурсах, паслугах і прадукцыі з мэтай абвяшчэння карыстальнікаў (насельніцтва), стымулявання попыту і павышэння іміджу бібліятэкі.

**БІБЛІЯТЭЧНАЯ СЕРЫЯ**

Серыя кнігі мэтавага прызначэння для публічных бібліятэк; уключае творы, якія карыстаюцца павышаным чытацкім попытам.

**БІБЛІЯТЭЧНАЯ СЕТКА**

Бібліятэчная сістэма, якая аб’яднана агульнасцю задач, арганізацыйных рашэнняў, шэрагам адзіных прымет (прыналежнасць да пэўнай тэрыторыі, заснавальніка, галіны і г. д.). На сучасным узроўні развіцця тэхналогій бібліятэчныя ўстановы, якія складаюць сетку, аб’ядноўваюцца сеткай электроннай сувязі для выканання бібліятэчных функцый **(3.4.2.2)**.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**БІБЛІЯТЭЧНАЯ СІСТЭМА**

Сукупнасць бібліятэк, аб’яднаных на пэўных дагаворных умовах з мэтай больш поўнага задавальнення запытаў карыстальнікаў і эфектыўнага выкарыстання бібліятэчных рэсурсаў (ДАСТ 7.0-99).

**БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА**

Галіна інфармацыйнай, культурна-асветніцкай і адукацыйнай дзейнасці, задачамі якой з’яўляецца стварэнне і развіццё сеткі бібліятэк, фарміраванне і апрацоўка бібліятэчных фондаў, арганізацыя бібліятэчнага, інфармацыйнага і даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк, падрыхтоўка бібліятэчных кадраў, навуковае і метадычнае забеспячэнне дзейнасці бібліятэк.

**БІБЛІЯТЭЧНАЯ СТАТЫСТЫКА**

Навуковая бібліятэказнаўчая дысцыпліна, якая ўзнікла ў выніку інтэграцыі бібліятэказнаўства і статыстыкі; вывучае колькасны бок масавых з’яў і працэсаў бібліятэчнай справы. Выкарыстоўвае тэорыю і метадалогію сацыяльна-эканамічнай статыстыкі і галіновай статыстыкі культуры. Аснову Б. с. складаюць збіранне, групоўка зыходнай інфармацыі, разлік статыстычных паказчыкаў. Уключае шэраг раздзелаў, сярод якіх: статыстыка бібліятэчнай сеткі; статыстыка бібліятэчных кадраў; статыстыка бібліятэчных фондаў; статыстыка бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва.

**БІБЛІЯТЭЧНАЯ ТЭХНАЛОГІЯ**

Сукупнасць бібліятэчных працэсаў і аперацый, а таксама прыёмаў, метадаў і сродкаў іх ажыццяўлення, накіраваных на стварэнне і захаванне бібліятэчнай прадукцыі і выканання бібліятэчных паслуг.

**БІБЛІЯТЭЧНАЯ ТЭХНІКА**

Дапаможныя сродкі бібліятэчнай дзейнасці, неабходныя ў рабоце бланкі заказу літаратуры, інвентарныя кнігі, кніжныя і чытацкія фармуляры, кніжныя ярлыкі, раздзяляльнікі для каталогаў, каталожныя карткі, электронна-вылічальная тэхніка як сродак бібліятэчнай работы. Тэрмін выкарыстоўваецца таксама ў якасці сіноніма тэрміна «бібліятэчная тэхналогія».

**БІБЛІЯТЭЧНАЯ ЧЫТАЛЬНАЯ ЗАЛА**

Форма абслугоўвання чытачоў, якая прадугледжвае выдачу дакументаў для работы ў памяшканні бібліятэкі, што спецыяльна абсталявана для чытачоў і работы з дакументамі (**3.4.2.19**).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**БІБЛІЯТЭЧНАЯ ЭСТЭТЫКА**

Дысцыпліна, якая вывучае прыёмы і метады эстэтычнага фарміравання бібліятэчнага асяроддзя і выкарыстання дасягненняў дызайну як пры знешнім, так і ўнутраным афармленні бібліятэкі, яе інтэр'ераў з мэтай задавальнення інтарэсаў чытачоў бібліятэкі.

**БІБЛІЯТЭЧНАЯ ЭТНАЛОГІЯ**

Навуковая дысцыпліна ў структуры бібліятэказнаўства, якая даследуе вытокі і розныя стадыі станаўлення сістэм бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання да пэўнага нацыянальна-культурнага асяроддзя.

**БІБЛІЯТЭЧНАЯ ЭТЫКА**

Сукупнасць нормаў і правілаў прафесійных паводзін бібліятэчных спецыялістаў, выпрацаваных вучэбна-навуковай дысцыплінай, якая інтэгруе адпаведныя раздзелы бібліятэказнаўства і этыкі.

**БІБЛІЯТЭЧНЫ АБАНЕМЕНТ**

Норма бібліятэчнага абслугоўвання, якая прадугледжвае выдачу дакументаў для карыстання па-за бібліятэкай (на пэўных умовах) **(3.2.2.25)**.

**БІБЛІЯТЭЧНЫ ДЫЗАЙН**

Аб'ёмна-прасторавае і планіровачна-тэхналагічнае рашэнне будынка бібліятэкі; складовая частка бібліятэчнай рэкламы.

**БІБЛІЯТЭЧНЫ КАЛЕКТАР**

Спецыялізаваная кнігагандлёвая арганізацыя, якая займаецца кнігазабеспячэннем бібліятэк, а таксама забеспячэннем неабходнымі матэрыяламі і дакументамі.

**БІБЛІЯТЭЧНЫ КАЛЕКТЫЎ**

Сацыяльна-прафесійная група, якая аб'яднана сумеснай грамадска неабходнай дзейнасцю і агульнасцю інтарэсаў пры выкананні службовых абавязкаў.

**БІБЛІЯТЭЧНЫ КАТАЛОГ**

Пералік дакументаў у фондзе бібліятэкі ці групы бібліятэк, складзены на аснове пэўнага прынцыпу, які раскрывае склад ці змест бібліятэчных фондаў. Можа быць у карткавай або машыначытальнай форме, на мікраносьбітах і ў форме кніжнага выдання. У назве Б. к. паступова адлюстроўваюцца розныя прыметы: прызначэнне (чытацкая, службовая, генеральная); спосаб групоўкі (алфавітная, сістэматычная, прадметная); віды дакументаў (кнігі, перыядычныя выданні, нотныя,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

картаграфічныя выданні); назва структурнага падраздзялення бібліятэкі (чытальная зала, аддзел рэдкай кнігі, абанемент і г. д.). Тэрмінаэлементы: зборны, цэнтральны заўсёды папярэднічаюць іншым элементам назваў (напрыклад «Зборны краязнаўчы сістэматычны каталог»).

**БІБЛІЯТЭЧНЫ КАТАЛОГ НА МІКРАНОСЬБІТАХ**

Адна з формаў бібліятэчнага каталога, выкананая на мікрафішах або мікрафільмах.

**БІБЛІЯТЭЧНЫ КАТАЛОГ У ФОРМЕ КНІЖНАГА ВЫДАННЯ**

Каталог, падрыхтаваны традыцыйным спосабам ці з дапамогай ЭВМ або ў выніку рэпрадуцыравання каталожных картак, надрукаваны ў выглядзе кніжнага выдання.

**БІБЛІЯТЭЧНЫ МАРКЕТЫНГ**

Сістэма бесперапыннага назірання за фактычным станам рынку бібліятэчных прадуктаў і паслуг з мэтай своечасовага выяўлення рыначнай кан'юнктуры, тэндэнцый развіцця рынку, уплыву на яго, у прыватнасці з дапамогай бібліятэчна-бібліяграфічнай рэкламы, прагназавання развіцця рыначных працэсаў.

**БІБЛІЯТЭЧНЫ ПЕРАПЛЁТ**

Складаны пераплёт з карашком і вугламі, зроблены з трывалай тканіны. Выкарыстоўваецца для твораў друку, выдадзеных у мяккіх вокладках ці ў цвёрдым пераплёце.

**БІБЛІЯТЭЧНЫ ПЛАКАТ**

Форма нагляднай рэкламы – кампазіцыя з тэксту і ілюстрацый, выкананая на паперы ці кардоне з мэтай прыцягнення ўвагі чытачоў, наведвальнікаў бібліятэк да актуальнай праблемы, тэмы, пэўнай кнігі, творчасці аўтара. У апошні час часцей выкарыстоўваецца ў якасці элемента эстэтычнага афармлення бібліятэкі.

**БІБЛІЯТЭЧНЫ ПРАЕКТ**

Планавы дакумент, які ахоплівае пэўную праблему, дэталізуе задачы яе вырашэння; распрацоўваецца часцей за ўсё з мэтай атрымання дадатковых фінансавых сродкаў.

**БІБЛІЯТЭЧНЫ ПРАДУКТ**

Прызначаны для карыстальнікаў вынік працы спецыялістаў бібліятэк, які валодае сукупнасцю карысных уласцівасцей, г.зн. мае спажывецкую каштоўнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**БІБЛІЯТЭЧНЫ ПРАЦЭС (ТЭХНАЛАГІЧНЫ)**

Закончаная сукупнасць паслядоўных бібліятэчных аперацый з мэтай выканання пэўных, адносна самастойных задач. Напрыклад, каталагізацыя, тэхнічная апрацоўка дакументаў, падбор іх па запатрабаванні чытача і інш.

**БІБЛІЯТЭЧНЫ ПУНКТ**

Форма нестацыянарнага абслугоўвання − тэрытарыяльна абасобленае падраздзяленне бібліятэкі, якое арганізуецца па месцы жыхарства, працы або вучобы карыстальнікаў бібліятэк **(3.4.2.8)**.

**БІБЛІЯТЭЧНЫ САВЕТ**

1. Грамадскі орган калектыўнага кіравання дзейнасцю бібліятэкі і сродак кантролю з боку грамадскасці за яе работай. Выбіраецца з ліку чытачоў – прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый, працоўных калектываў, саветаў.

2. Дарадчы орган прадстаўнікоў бібліятэк розных ведамстваў, якія арганізуюць узаемадзеянне гэтых бібліятэк.

**БІБЛІЯТЭЧНЫ СЭРВІС**

Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк, якое ўключае наступныя паслугі: а) паслугі, якія забяспечваюць набліжэнне бібліятэкі да абанентаў (выдача дакументаў на пэўных умовах, арганізацыя пазастацыянарных формаў абслугоўвання, аддзелаў і філіялаў бібліятэк, міжбібліятэчны абанемент, формы тэлефоннага заказу дакументаў і даведак, інфармаванне па тэлефоне аб бібліятэчных навінах, рэклама бібліятэкі і бібліятэчных паслуг); б) паслугі, якія забяспечваюць дыферэнцыраванае абслугоўванне абанентаў у памяшканні бібліятэкі (арганізацыя сістэмы спецыялізаваных чытальных залаў, даведачна-бібліяграфічнай службы, формаў прыярытэтнага абслугоўвання); в) паслугі, якія забяспечваюць зручнасць карыстання бібліятэкай (адпаведны рэжым работы бібліятэкі, працяг тэрмінаў карыстання, рэзерваванне літаратуры, пастаноўка на чаргу, стварэнне ўмоў працы і адпачынку чытачоў – наяўнасць зон адпачынку, сталовай, зручных пасадачных месцаў, асвятлення, афармлення бібліятэкі і інш.); г) паслугі, якія задавальняюць запатрабаванні абанентаў у развіцці бібліятэчнага абслугоўвання (пашырэнне сферы абслугоўвання, аб’ёму бібліятэчных паслуг, наменклатуры гэтых паслуг, паляпшэнне іх якасці); д) паслугі на падставе электронных тэхналогій.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**БІБЛІЯТЭЧНЫ ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫ КОМПЛЕКС**

Рэгіянальная сістэма бібліятэк розных ведамстваў, заснаваная на карпаратыўных і каардынацыйных прынцыпах дзейнасці.

**БІБЛІЯТЭЧНЫ ФОНД**

Упарадкаваная сукупнасць дакументаў, што складаецца бібліятэкай у адпаведнасці з яе функцыямі для фарміравання, выкарыстання і захоўвання. Па профілі камплектавання адрозніваюць універсальны, шматгаліновы і спецыялізаваны Б. ф.

**БІБЛІЯТЭЧНЫ ШЫФР**

Гл.: Шыфр.

**БІБЛІЯТЭЧНЫЯ БУДЫНКІ**

Будынкі, прызначаныя для размяшчэння бібліятэк. Для бібліятэк будуюцца спецыяльныя асобныя будынкі; могуць размяшчацца ў памяшканнях будынкаў іншага прызначэння ці на першых паверхах жылых дамоў. Б. б. адрозніваюцца па памерных катэгорыях, якія залежаць ад аб'ёму фонду, колькасці чытацкіх месцаў, памераў карыснай плошчы і кубатуры ўсіх памяшканняў, штату бібліятэкі.

**БІБЛІЯТЭЧНЫЯ ЗНОСІНЫ**

Камунікацыя людзей у працэсе бібліятэчнага абслугоўвання, у тым ліку: бібліятэкара і карыстальніка, міжасабовыя зносіны карыстальнікаў, прафесійныя зносіны бібліятэкараў.

**БІБЛІЯТЭЧНЫЯ КАДРЫ**

Пастаянны склад прафесійных бібліятэчных работнікаў, персанал бібліятэчна-бібліяграфічных устаноў.

**БІБЛІЯТЭЧНЫЯ ПАМЯШКАННІ**

Памяшканні для работы чытачоў і бібліятэкараў, чытальныя залы, абанементы, пакоі для даведачна-бібліяграфічнага апарату, фондасховішча, а таксама пакоі для выканання бібліятэчных працэсаў (камплектавання, бібліятэчнай апрацоўкі, бібліяграфічнай і метадычнай работы і інш.).

**БІБЛІЯТЭЧНЫЯ РЭСУРСЫ**

Патэнцыял, якім валодаюць бібліятэкі для здзяйснення сваіх функцый, у тым ліку: сетка бібліятэк, бібліятэчныя фонды, даведачна-інфармацыйны апарат, кадравы персанал, матэрыяльна-тэхнічная база, фінансавыя сродкі.

**БІБЛІЯФІЛЬСТВА**

Цяга да кнігі, да збірання і глыбокага вывучэння рэдкіх і каштоўных выданняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**БІЯГРАФІЧНЫ СЛОЎНІК**

Слоўнік, які ўтрымлівае звесткі аб жыцці і дзейнасці асобы (асоб).

**БЛОК-КАРТКАВЫ КАТАЛОГ**

Каталог, які складаецца з асобных лістоў, змацаваных па баках зашчэпкамі. З'яўляючыся разнавіднасцю каталога ў форме кніжнага выдання, Б.-к. к. у адрозненне ад яго дае магчымасць аператыўна ўнесці дапаўненні шляхам замены асобных лістоў. Прымяняецца часцей за ўсё ў бібліятэках дзіцячых і тэхнічных (для адлюстравання фондаў спецыяльных відаў тэхнічнай дакументацыі).

**БРАНДМАЎЭР**

Глухая сцяна памяшкання бібліятэкі, якая часам выкарыстоўваецца для размяшчэння рэкламных шчытоў.

**БРАЎЗЕР**

Праграма для прагляду гіпертэкставых дакументаў у Інтэрнэце.

**БРАШУРА**

Кніжнае выданне аб'ёмам звыш 4, але не больш за 48 старонак, звычайна ў мяккай вокладцы.

**БРЭНД**

1.Ураджанне аб тавары, якое фарміруецца ў спажыўца.

2. Вобраз, асацыяцыі, што ўзнікаюць у свядомасці спажыўца пры ўпамінанні тавару або паслугі пэўнай гандлёвай маркі.

**БУКВАР**

Першы падручнік для навучання грамаце і чытанню.

Сін.: Азбука.

**БУКІНІСТЫЧНАЯ КНІГА**

Рукапіснае ці друкаванае выданне, якое трапіла ў паўторнае гандлёвае абарачэнне.

**БУКЛЕТ**

Ліставое выданне ў выглядзе аднаго аркуша друкаванага матэрыялу, сфальцаванага любым спосабам у два і больш згібаў.

**БЮЛЕТЭНЬ**

Перыядычнае выданне ці выданне, што прадаўжаецца, якое змяшчае кароткія інфармацыйныя матэрыялы ў межах кампетэнцыі арганізацыі (установы), што выпускае дадзенае выданне.

**БЮЛЕТЭНЬ ВОДГУКАЎ**

Бібліятэчны дапаможнік, які змяшчае падборку чытацкіх водгукаў на адзін ці некалькі дакументаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**БЮЛЕТЭНЬ НОВЫХ ПАСТУПЛЕННЯЎ**

Бібліяграфічны дапаможнік, які інфармуе чытачоў аб новых дакументах, што паступілі ў бібліятэку.

**БЯГУЧАЕ КАМПЛЕКТАВАННЕ**

Папаўненне фонду творамі друку і іншымі дакументамі.

**БЯГУЧАЯ БІБЛІЯГРАФІЯ**

Бібліяграфія, якая забяспечвае аператыўнае і рэгулярнае інфармаванне аб паступленні новых дакументаў.

**БЯГУЧАЯ НУМАРАЦЫЯ**

Адзіная парадкавая нумарацыя выпускаў серыйнага выдання, аднаўляемая кожны год.

**БЯГУЧЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Перыядычны бібліяграфічны дапаможнік, выпускі якога рэгулярна і аператыўна адлюстроўваюць дакументы, якія з'явіліся ў друку (**3.3.2.30**).

**БЯГУЧЫ ПЛАН РАБОТЫ БІБЛІЯТЭКІ**

Дакумент бягучага планавання, у якім вызначаюцца кірункі, змест, аб'ём работы, яе выканаўцы на пэўны тэрмін (месяц, квартал, год), удакладняюцца заданні перспектыўных планаў. Бывае, што Б. п. р. б. называюць аператыўным, напрыклад аператыўны план камплектавання.

**БЯСПЕКА ФОНДУ**

Абарона фонду як пэўнага матэрыяльнага і сацыяльнага аб'екта. У тэрмін «Абарона бібліятэчнага фонду» ўваходзіць эканамічная, экалагічная, юрыдычная, электронная і іншая абарона.

**БЯСПЛАТНЫ АБАВЯЗКОВЫ ЭКЗЭМПЛЯР**

Экзэмпляр кожнага айчыннага выдання, які накіроўваецца бясплатна ў вызначаныя ўрадавымі рашэннямі бібліяграфічныя ўстановы і буйныя бібліятэкі.

Сін.: Кантрольны экзэмпляр.

## *В*

**ВАЙСКОВАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Бібліятэка, якая належыць вайсковаму ведамству.

**ВАЛАВАЯ НУМАРАЦЫЯ**

Адзіная парадкавая нумарацыя выпускаў серыйнага выдання з часу яго заснавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ВЕДАМАСНАЕ ВЫДАННЕ**

Інфармацыйнае, інструкцыйнае, метадычнае, нарматыўнае выданне, якое выдаецца ад імя ведамства (прадпрыемства, арганізацыі, установы) і прызначаецца, як правіла, для рэгламентацыі дзейнасці гэтага ведамства ці для рэкламы і паляпшэння карыстання падрыхтаванымі ім вырабамі.

**ВЕДАМАСНАЯ БІБЛІЯТЭЧНАЯ СЕТКА**

Прызначана галоўным чынам для задавальнення прафесійнага попыту супрацоўнікаў міністэрстваў, прадпрыемстваў, навуковых устаноў, інстытутаў і г.д. Асноўны тып гэтых бібліятэк – спецыяльныя бібліятэкі: навукова-тэхнічныя, сельскагаспадарчыя, медыцынскія, акадэмічныя, вайсковыя, духоўныя і інш. Размяшчаюцца яны, як правіла, па вытворчым прынцыпе, у залежнасці ад структуры адпаведнага ведамства ці сацыяльнага інстытута.

**ВЕДАМАСНЫ АБАВЯЗКОВЫ ЭКЗЭМПЛЯР**

Бясплатны экзэмпляр выданняў, які выпускаецца прадпрыемствамі і ўстановамі пэўнага ведамства і дасылаецца зацікаўленым арганізацыям і ўстановам дадзенага ведамства.

**ВЕДЫ**

Від інфармацыі, які захоўваецца ў базах ведаў і адлюстроўвае веды чалавека–спецыяліста (эксперта) у пэўным прадметным абсягу.

**ВЕЛІЧЫНЯ БІБЛІЯТЭЧНАГА ФОНДУ**

Гл.: Аб'ём фонду.

**ВЕРТЫКАЛЬНАЕ РАЗМЯШЧЭННЕ БІБЛІЯТЭЧНАГА ФОНДУ**

Размяшчэнне фонду ў вертыкальных шмат'ярусных фондасховішчах. Прымяняецца, як правіла, для размяшчэння буйных фондаў.

**ВЕРТЫКАЛЬНАЯ КАРТАТЭКА**

Картатэка, у якой карткі замацаваны на свабодна перагортваемых «старонках» падвешанага ў вертыкальным становішчы альбома-круцёлкі.

**ВЕЧАР ПАРТРЭТАЎ**

Комплекснае масавае мерапрыемства, мэтай якога з'яўляецца азнаямленне чытачоў з творчасцю пісьменнікаў, кампазітараў, мастакоў, артыстаў.

**ВЕЧАР ПЫТАННЯЎ І АДКАЗАЎ**

Масавае мерапрыемства, мэта якога – уключыць чытачоў у пазнавальную дзейнасць, актывізаваць іх інфармацыйныя запыты ў галіновай і мастацкай літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ВЕЧАРЫНА**

Масавае мерапрыемства, якое праводзіцца часцей за ўсё ў форме сустрэч са знакамітымі людзьмі або прысвечанае ім.

**ВІД БІБЛІЯГРАФІІ**

Падраздзяленне класіфікацыйнай сістэмы бібліяграфіі як галіны дзейнасці, якое з'яўляецца падначаленым у адносінах да больш агульнага падраздзялення.

**ВІД БІБЛІЯГРАФІЧНАГА ДАПАМОЖНІКА**

Падраздзяленне класіфікацыйнай сістэмы бібліяграфічных дапаможнікаў, якое з'яўляецца падпарадкаваным у адносінах да больш агульнага падраздзялення.

**ВІДЫ БІБЛІЯТЭЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ**

Бібліятэчныя працэсы, у якія ўваходзяць: камплектаванне і апрацоўка кніжных фондаў; размяшчэнне кніжных фондаў і раскрыццё іх; бібліятэчнае, інфармацыйнае абслугоўванне чытачоў, спажыўцоў інфармацыі, наведвальнікаў бібліятэк; навукова-даследчая і метадычная дзейнасць; даведачна-бібліяграфічная дзейнасць; дзейнасць па бібліятэчнай рэкламе, забеспячэнні бібліятэчнага сэрвісу і інш.

**ВІДЫ БІБЛІЯТЭЧНЫХ СЕТАК**

Вызначаюцца па прынцыпе прыналежнасці да міністэрства, ведамства, грамадскай арганізацыі (агульнадзяржаўная бібліятэчная сетка, ведамасныя (галіновыя) бібліятэчныя сеткі, бібліятэчная сетка грамадскіх арганізацый і інш.).

**ВІДЫ КАМПЛЕКТАВАННЯ**

Вызначаюцца ў залежнасці ад папаўнення фонду дакументамі–навінкамі ці ранейшымі выданнямі. Існуюць такія В. к., як бягучае і рэтраспектыўнае.

**ВІДЫ КАТАЛОГАЎ ПА ПРЫЗНАЧЭННІ**

Каталогі, якія раскрываюць паўнату бібліятэчных фондаў у залежнасці ад прызначэння. Існуюць чытацкі, службовы, генеральны каталогі.

Гл.: Бібліятэчны каталог.

**ВІДЫ КАТАЛОГАЎ ПА СПОСАБЕ ГРУПОЎКІ**

Каталогі, у аснове раскрыцця фондаў якіх ляжыць спосаб групоўкі дакументаў. Існуюць алфавітны, сістэматычны, прадметны каталогі.

Гл.: Бібліятэчны каталог.

**ВІДЫ ФОНДАЎ ПА ЗМЕСЦЕ ДАКУМЕНТАЎ**

Размяжоўваюцца на ўніверсальныя, шматгаліновыя, галіновыя і спецыялізаваныя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ВІДЫ ФОНДАЎ ПА ЗМЕШЧАНЫХ У ІХ ДАКУМЕНТАХ**

Размяжоўваюцца на кніжныя фонды, фонды кінадакументаў, фонадакументаў, прадукцыі выяўленчага мастацтва, відэафонды, а таксама фонды электронных выданняў, дакументаў на мікраносьбітах, спецвідаў тэхнічнай літаратуры (патэнты, нарматыўна-тэхнічная дакументацыя) і інш.

**ВІДЫ ФОНДАЎ ПА ПРЫЗНАЧЭННІ**

У адпаведнасці з мэтавым і чытацкім прызначэнні могуць быць: даведачныя, вучэбныя, для правядзення вольнага часу чытачоў, фонды навуковых, навукова-папулярных выданняў, фонды дзіцячай літаратуры і г.д.; па форме выкарыстання ў бібліятэцы – асноўны фонд кнігасховішча, падсобныя фонды бібліятэчных падраздзяленняў, напрыклад чытальных залаў, абанемента, дэпазітарныя, абменна-рэзервовыя.

**ВІДЭАДАКУМЕНТ**

Дакумент, які ўтрымлівае інфармацыю, зафіксаваную шляхам гукавідэазапісу, аднаўленне якой адбываецца пры дапамозе адпаведнага абсталявання.

**ВІДЭАДАНЫЯ**

Інфармацыя, якая прыводзіцца ў выглядзе малюнкаў, схем, графікаў.

**ВІДЭАДЫСК**

Носьбіт зрокавай і гукавой інфармацыі ў выглядзе дыска з адна- ці двухбаковым слоем.

**ВІДЭАТЭКА**

Арганізацыя або служба (аддзел бібліятэкі), у абавязкі якой уваходзіць збор, захоўванне і прадастаўленне ў распараджэнне карыстальнікаў відэадакументаў **(3.4.2.23)**.

**ВІДЭАТЭРМІНАЛ**

Гл.: Дысплей.

**ВІКТАРЫНА ЛІТАРАТУРНАЯ**

Від літаратурнай гульні, у час якой чытачы адказваюць на самыя розныя пытанні з галіны літаратуры. Прымяняюцца ў бібліятэках як форма масавай работы.

**ВІНЧЭСТАР**

Гл.: Цвёрды дыск.

**ВІНЬЕТКА**

Элемент мастацкага афармлення выдання ў выглядзе невялікага арнаментальна-дэкаратыўнага ці арнаментальна-сюжэтнага малюнка, які размяшчаецца на пераплёце, вокладцы, у па-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чатку ці ў канцы главы; першапачаткова ў ёй абавязкова прысутнічаў матыў вінаграднай лазы (гэта і вызначае гучанне тэрміна).

**ВІРТУАЛЬНАЯ БАЗА ДАНЫХ**

Створанае прадстаўленне даных, у якое можа быць ператворана кожная з інтэграваных БД адвольнай сістэмы ўпраўлення базамі даных.

**ВІРТУАЛЬНАЯ (ЭЛЕКТРОННАЯ, ЛІЧБАВАЯ) БІБЛІЯТЭКА**

Сукупнасць паўнатэкставых баз і банкаў даных, якія адлюстроўваюць рэальныя фонды існуючых бібліятэк з неабходным даведачна-пошукавым апаратам, даступныя для грамадскага карыстання.

**ВОБЛАСЦІ БІБЛІЯГРАФІЧНАГА АПІСАННЯ**

Структурная адзінка бібліяграфічнага апісання, якая ўтрымлівае адзін ці некалькі функцыянальна і змястоўна аднародных элементаў. Склад В. б. а. і яе месца ў структуры вызначаюцца Міжнародным стандартным бібліяграфічным апісаннем (ISBD).

**ВОБЛАСЦЬ ВЫДАННЯ**

Вобласць бібліяграфічнага апісання, якая змяшчае звесткі аб паўторнасці выдання, аб яго асаблівасцях, адрозненнях пэўнага выдання ад іншых публікацый таго ж дакумента ці яго ідэнтычнасці з іншымі публікацыямі.

**ВОБЛАСЦЬ ВЫХАДНЫХ ЗВЕСТАК**

Вобласць бібліяграфічнага апісання, якая змяшчае звесткі аб месцы выдання, выдавецтве ці выдавецкай арганізацыі, даце (годзе) выдання дакумента, а таксама звесткі аб друкаванні.

**ВОБЛАСЦЬ ЗАГАЛОЎКА І ЗВЕСТАК АБ АДКАЗНАСЦІ**

Вобласць бібліяграфічнага апісання, якая змяшчае асноўныя звесткі аб дакуменце, неабходныя для яго ідэнтыфікацыі; складаецца з загалоўка і звязаных з ім звестак, а таксама са звестак аб асобах, арганізацыях ці ўстановах, якія ўдзельнічалі ў стварэнні дакумента і яго друкаванні.

**ВОБЛАСЦЬ ЗАЎВАГ**

Вобласць бібліяграфічнага апісання, якая мае дадатковыя звесткі, што адносяцца да асобных абласцей апісання ці дакументаў у цэлым.

**ВОБЛАСЦЬ КОЛЬКАСНАЙ ХАРАКТАРЫСТЫКІ**

Вобласць бібліяграфічнага апісання, якая змяшчае звесткі аб аб’ёме (пагінацыі), памеры дакумента, аб выяўленчым ці іншым матэрыяле, якім ён забяспечаны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ВОБЛАСЦЬ ПРЫМЯНЕННЯ КЛАСА УДК**

Метадычныя ўказанні аб змесце, прымяненні класа УДК і размежаванні яго з сумежнымі галінамі.

**ВОБЛАСЦЬ МІЖНАРОДНАГА СТАНДАРТНАГА НУМАРА КНІГІ (ISBN), ЦАНЫ І ТЫРАЖУ**

Вобласць бібліяграфічнага апісання, якая змяшчае звесткі, неабходныя для ідэнтыфікацыі і рэгістрацыі кнігі, для кнігаабмену, кніжнага гандлю, статыстыкі друку.

**ВОБЛАСЦЬ МІЖНАРОДНАГА СТАНДАРТНАГА НУМАРА СЕРЫЙНАГА ВЫДАННЯ (ISSN), ЦАНЫ І ТЫРАЖУ**

Вобласць бібліяграфічнага апісання, якая змяшчае звесткі, неабходныя для ідэнтыфікацыі і рэгістрацыі серыйнага выдання, для кнігаабмену, кніжнага гандлю, статыстыкі друку, а таксама для ажыццяўлення падпіскі на серыйныя выданні.

**ВОБЛАСЦЬ НУМАРАЦЫІ**

Вобласць бібліяграфічнага апісання, якая мае звесткі аб першым і апошнім надрукаваным нумарах, датах заснавання і спынення выдання, а таксама звесткі аб перапынках у выданні, зменах і аднаўленнях у нумарацыі.

**ВОБЛАСЦЬ СЕРЫІ**

Вобласць бібліяграфічнага апісання, якая мае звесткі аб серыйным ці шматтомным выданні, выпускам якога з'яўляецца дакумент.

**ВОБЛАСЦЬ СПЕЦЫФІЧНЫХ ЗВЕСТАК**

Вобласць бібліяграфічнага апісання, якая змяшчае звесткі, характэрныя толькі для пэўнага віду дакументаў.

**ВОЛЬНАЕ БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ АПІСАННЕ**

Бібліяграфічнае апісанне шматтомнага ці серыйнага выдання ў цэлым або некалькіх яго тамоў, выпускаў, нумароў і г. д. Складаецца з агульнай часткі і спецыфікацыі.

**ВОПІС ІНВЕНТАРНЫХ НУМАРОЎ**

Дакумент фонду, у якім фіксуюцца паступленне і выбыццё дакументаў. З'яўляецца таксама ўліковым дакументам па перадачы тых ці іншых дакументаў з адной бібліятэкі ў другую.

**ВУЗКІ КОМПЛЕКС ПРАДМЕТНЫХ РУБРЫК**

Комплекс прадметных рубрык, у якім рубрыкі аб адным прадмеце сабраны ў адным месцы прадметнага каталога (спіса, паказальніка).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ВУСНАЯ БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА**

Бібліяграфічная даведка, якая дадзена спажыўцу ў вуснай форме.

**ВУСНАЯ РЭКАМЕНДАЦЫЯ ДАКУМЕНТАЎ**

Дзейнасць бібліятэкара па рэкамендацыі дакументаў з дапамогай слова. Асноўныя формы – інфармацыя аб характары і змесце дакумента (агляд твораў), азнаямленне чытачоў з тэкстам (чытанні), абмеркаванне кніг (чытацкія канферэнцыі, тэматычныя, вусныя часопісы і інш.), прапанова пэўнага твора для чытання (гутаркі).

**ВУСНЫ ЧАСОПІС**

Форма вуснай рэкамендацыі літаратуры, аналагічная па змесце і структуры з друкаваным часопісам.

**ВУЧЭБНА-БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Рэкамендацыйны бібліяграфічны дапаможнік, які прызначаны ў дапамогу навучэнцам у сістэме агульнай і спецыяльнай, сярэдняй і вышэйшай адукацыі.

**ВУЧЭБНА-ДАПАМОЖНАЯ БІБЛІЯГРАФІЯ**

Рэкамендацыйная бібліяграфія, якая забяспечвае вучэбныя інфармацыйныя патрэбы навучэнцаў у сістэме агульнай і спецыяльнай, сярэдняй і вышэйшай адукацыі.

**ВУЧЭБНАЕ ВЫДАННЕ**

Неперыядычнае выданне, якое змяшчае сістэматызаваныя звесткі навуковага ці прыкладнога характару, пададзеныя ў форме, зручнай для выкладання і вывучэння ва ўмовах пэўнай сістэмы адукацыі.

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Вучэбнае выданне, якое змяшчае матэрыялы па методыцы выкладання вучэбнай дысцыпліны, яе раздзела, часткі ці па методыцы выхавання.

**ВУЧЭБНАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Спецыяльная бібліятэка, якая забяспечвае задавальненне спецыфічных патрэбнасцей карыстальнікаў (чытачоў), што ўзнікаюць у працэсе вучэбнай дзейнасці ў школах, сярэдніх спецыяльных, вышэйшых навучальных установах і да т. п. **(3.4.2.18)**.

**ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА**

Вучэбнае выданне, якое вызначае змест, аб'ём, парадак вывучэння і выкладання якой-небудзь дысцыпліны ці яе раздзела, часткі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ВУЧЭБНЫ ДАПАМОЖНІК**

Вучэбнае выданне, якое часткова ці цалкам замяняе або дапаўняе падручнік і афіцыйна зацверджана ў якасці такога выдання.

**ВУЧЭБНЫ НАГЛЯДНЫ ДАПАМОЖНІК**

Вучэбнае тэкставае ці з выявамі выданне, якое змяшчае матэрыялы ў дапамогу вывучэнню, выкладанню, выхаванню і пададзенае ў нагляднай форме.

**ВУЧЭБНЫ СЛОЎНІК**

Адна-, двух- ці шматмоўны слоўнік, які складзены ў вучэбных мэтах і дапамагае арганізаваць вывучэнне і выкладанне лексічнага складу мовы.

**ВЫБАР ПЕРШАГА ЭЛЕМЕНТА БІБЛІЯГРАФІЧНАГА ЗАПІСУ**

Выяўленне пошукавых элементаў і вызначэнне асноўнага пошукавага элемента, які становіцца першым элементам асноўнага бібліяграфічнага запісу, і дапаможных пошукавых элементаў, што служаць пашырэнню аспектаў пошуку і выкарыстоўваюцца ў якасці першых элементаў дадатковых бібліяграфічных запісаў.

**ВЫБАРАЧНАЕ РЭДАГАВАННЕ КАТАЛОГА**

Работа з традыцыйным і электронным каталогам па рэдакцыі некаторых іх фрагментаў.

**ВЫБАРАЧНАЕ РЭФЕРЫРАВАННЕ**

Рэферыраванне не ўсіх дакументаў, якія ёсць па зададзенай пэўнай тэматыцы, а толькі некаторых з іх (звычайна найбольш значных).

**ВЫБАРАЧНАЯ КАТАЛАГІЗАЦЫЯ**

Каталагізацыя дакументаў, выбраных па якім-небудзь крытэрыі.

**ВЫБАРАЧНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік, які адлюстроўвае дакументы, што адабраны па пэўным крытэрыі (**3.3.2.29**).

**ВЫБАРКА**

1. Перазапіс даных са знешняй памяці ў асноўную.

2. Перадача даных з асноўнай памяці на рабочыя рэгістры або арыфметычна-лагічнае прыстасаванне ЭВМ.

**ВЫБАРАЧНАЕ РАСПАЎСЮДЖАННЕ ІНФАРМАЦЫІ**

Сістэматычнае забеспячэнне інфармацыяй аб бягучых паступленнях дакументаў у адпаведнасці з пастаянна дзеючымі запытамі пры абавязковай адваротнай сувязі і выдачай у да-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лейшым па запатрабаванні спажыўца дакументаў, іх копій і фактаграфічнай інфармацыі.

**ВЫБРАНЫЯ ТВОРЫ**

Аднатомнае ці шматтомнае выданне, якое змяшчае найбольш значныя творы аўтара.

**ВЫВАД ДАНЫХ (з камп'ютара)**

Канчатковыя аперацыі работы аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы ці камп'ютара па апрацоўцы дакументаў сродкамі вылічальнай тэхнікі, звязаныя з перадачай даных з асноўнай памяці ЭВМ на знешняе прыстасаванне: экран дысплея, прынтар, дыскеты, магнітныя стужкі, аптычныя дыскі і інш.

**ВЫВУЧЭННЕ ПЕРАДАВОГА БІБЛІЯТЭЧНАГА ВОПЫТУ**

Збор фактаў і матэрыялаў у бібліятэчнай справе, іх аналіз, абагульненне, апісанне з мэтай яе ўдасканалення і вызначэння заканамернасцей, перспектыў развіцця навукі і практыкі.

**ВЫВУЧЭННЕ ФОНДУ**

Аналіз складу, развіцця і выкарыстання фонду ў адпаведнасці з задачамі бібліятэкі, адпаведнасці інфармацыйным патрэбам чытачоў і эфектыўнасці выкарыстоўвання. Існуе шэраг метадаў В. ф., сярод якіх найбольш распаўсюджаны колькасныя (статыстычныя), бібліяграфічныя, сацыялагічныя, метады матэматычнага мадэлявання і інш.

**ВЫВУЧЭННЕ ЧЫТАЧОЎ**

Даследаванні чытання розных чытацкіх груп і чытацкай псіхалогіі ў канкрэтных сацыяльных умовах з мэтай удасканалення работы бібліятэк па абслугоўванні, сацыялагічнага і псіхалагічна-педагагічнага абгрунтавання работы з чытачамі (асабліва з дзецьмі, падлеткамі і моладдзю).

**ВЫДАВЕЦ**

Установа, арганізацыя або іншая юрыдычная асоба, якая займаецца падрыхтоўкай і выпускам выдавецкай прадукцыі.

**ВЫДАВЕЦКА-ГАНДЛЁВАЯ БІБЛІЯГРАФІЯ**

Бібліяграфія, аб'ектам якой з'яўляецца прадукцыя пэўнага выдавецтва або выдаўца, якая паступіла ў кнігагандлёвыя арганізацыі.

**ВЫДАВЕЦКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ**

Міністэрства, камітэт, ведамства, прадпрыемства, карпаратыў, якія маюць права на выпуск літаратуры, абмінаючы выдавецтва, і ажыццяўляюць такі выпуск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ВЫДАВЕЦКАЯ БІБЛІЯГРАФІЯ**

Бібліяграфія твораў друку, якія выпушчаны ці падрыхтаваны да выпуску пэўным выдавецтвам.

**ВЫДАВЕЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ**

Дзейнасць выдаўца па падрыхтоўцы і выпуску ў свет друкаванай прадукцыі на падставе спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі).

**ВЫДАВЕЦКАЯ МАРКА**

Эмблема, якая сімвалізуе тэматычную накіраванасць выдавецтва.

**ВЫДАВЕЦКАЯ ПРАДУКЦЫЯ**

Сукупнасць выданняў, прызначаных для выпуску або выпушчаных выдаўцом.

**ВЫДАВЕЦКАЯ СЕРЫЯ**

Нумараваная серыя кніг markmap рознага зместу, якой выдавец даў агульны загаловак і аднолькавае афармленне.

**ВЫДАВЕЦКАЯ СПРАВА**

Галіна культуры і вытворчасці, звязаная з падрыхтоўкай і распаўсюджваннем выдавецкай прадукцыі.

**ВЫДАВЕЦКІ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік, які адлюстроўвае друкаваную прадукцыю, выпушчаную або запланаваную да выпуску адным або некалькімі выдавецтвамі (**3.3.2.26**).

**ВЫДАВЕЦКІ ПЕРАПЛЁТ**

Пераплёт, у якім тыраж выдання (яго часткі) зроблены друкарняй па ўказанні выдаўца.

**ВЫДАВЕЦТВА**

Юрыдычна аформленае прадпрыемства, якое ажыццяўляе арганізацыйную і практычную работу па выпуску твораў друку.

**ВЫДАННЕ**

Паліграфічна аформлены дакумент, які прайшоў рэдакцыйна-выдавецкую апрацоўку, мае ўстаноўленыя выхадныя звесткі і прызначаны для перадачы змешчанай у ім інфармацыі.

**ВЫДАННЕ АГЛЯДАЎ**

Інфармацыйнае выданне, якое змяшчае публікацыю аднаго ці некалькіх аглядаў.

**ВЫДАННЕ ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА**

Выданне, большасць аб’ёму якога займае рэпрадукцыя ўзноўленага жывапіснага, графічнага, скульптурнага твора, спецыяльнай ці мастацкай фатаграфіі і іншых графічных работ.

**ВЫДАННЕ ДЛЯ ВОЛЬНАГА ЧАСУ**

1. Выданне, якое змяшчае агульнадаступныя звесткі па арганізацыі быту, а таксама розных відах самадзейнай творчасці, захапленнях, забавах і інш.

2. Выданне, якое ў прыдатнай для ўспрымання форме змяшчае звесткі аб мерапрыемствах, выбарах, паслугах і г.д. з мэтай інфармавання пра іх і стварэння спажывецкага попыту.

**ВЫДАННЕ ДЛЯ СЛЯПЫХ**

Выданне спецыфічнага афармлення, што мае спецыяльныя прыстасаванні для чытання людзей сляпых ці з аслабленым зрокам.

**ВЫДАЧА**

Колькасць дакументаў, выдадзеных карыстальнікам па іх запытах як у самой бібліятэцы, так і па-за яе межамі.

**ВЫЗНАЧАЛЬНІКІ**

Ва УДК дзяленні дапаможных табліц класіфікацыі. Сістэма УДК уключае: а) агульныя В., якія прымяняюцца ва ўсіх раздзелах УДК (агульныя В. часу, месца, народаў, пункта гледжання, формы, мовы і агульныя В. з дэфісам); б) спецыяльныя В., якія прымяняюцца толькі ў пэўных вызначаных раздзелах УДК (аналагічныя і сінтэтычныя В.).

**ВЫКАНАННЕ ЧЫТАЦКАГА ЗАПЫТУ**

1. Тэхналагічны працэс па выдачы і дакументным афармленні выдачы чытачу запытаных твораў друку ці іншых дакументаў.

2.Выкананне па просьбе чытача даведкі.

**ВЫКАРЫСТАННЕ ФОНДУ**

Выкарыстоўванне наяўных у фондзе дакументаў чытачамі і абанентамі бібліятэкі. З'яўляецца адным з крытэрыяў адпаведнасці складу фонду чытацкім інтарэсам і запатрабаванням; асноўныя паказчыкі В. ф. – кнігавыдача, абарачальнасць, ступень паўнаты задавальнення чытацкага попыту.

**ВЫКЛЮЧЭННЕ ДАКУМЕНТАЎ**

Вывад з фонду і зняцце з уліку няпрофільных, залішне дублетных, устарэлых дакументаў, а таксама зняцце з уліку дакументаў, якія не вернуты чытачамі.

**ВЫКЛЮЧЭННЕ З ФОНДУ**

Спісанне пэўнай колькасці дакументаў з балансу бібліятэкі за справаздачны перыяд.

**ВЫЛІЧАЛЬНАЯ ТЭХНІКА**

Вылічальныя машыны, канструкцыі і прыборы, якія выкарыстоўваюцца для механізацыі і аўтаматызацыі працэсаў апрацоўкі інфармацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ВЫПРАЎЛЕНАЕ ВЫДАННЕ**

Перавыданне, у якім тэкст твора не падвяргаўся значным зменам, але быў выпраўлены ў дэталях з мэтай удакладнення фармулёвак, пазбаўлення недакладнасцей і г.д.

**ВЫПУСК У СВЕТ**

Выхад выдання ў друк; вызначаецца датай яго рэгістрацыі ў Кніжнай палаце.

**ВЫПУСКНЫЯ ЗВЕСТКІ**

Частка выхадных звестак, якая ўключае дату здачы выдавецкага арыгінала ў набор, дату падпісання выдання ў друк, фармат паперы, долю аркуша і іншыя вытворчыя і тэхніка-эканамічныя даныя, якія размешчаны на канцавой паласе выдання ці на адвароце тытульнага ліста.

**ВЫСОКІ ДРУК**

Від кантактнага друку, пры якім друкаваныя элементы формы ўзвышаюцца над прабеламі.

**ВЫСТАВА АДНОЙ КНІГІ**

Форма рэкламы кнігі; у цэнтры выставы змяшчаецца кніга ці ілюстрацыя яе, а пабочныя матэрыялы (звесткі аб аўтары, водгукі чытачоў і інш.) даюць магчымасць прыцягнуць увагу чытачоў да гэтай кнігі.

**ВЫСТАВА-ВІКТАРЫНА**

Своеасаблiва афармленая выстава твораў друку ці іншых дакументаў, мэта якой – паставіць перад чытачом пытанні, адказы на якія ён павінен знайсці на выставе. Прымяняецца часцей за ўсё ў дзіцячых бібліятэках.

**ВЫСТАВА ЛІТАРАТУРЫ**

Асноўная форма нагляднага раскрыцця фонду; комплекс спецыяльна падабраных і сістэматызаваных твораў друку, якія прапануюцца чытачам для агляду і азнаямлення.

**ВЫСТАВА НАВІНАК**

Рэгулярная выстава паступаючых у бібліятэку новых твораў друку і іншых дакументаў з мэтай інфармацыі чытачоў аб папаўненні фонду.

**ВЫСТАВАЧНАЯ ВІТРЫНА**

Спецыяльная канструкцыя ў выглядзе скрынкі ці шафы, якая прыстасавана для выставы літаратуры або іншых дакументаў. В. в. бываюць двух відаў: адкрытыя для чытачоў і закрытыя (зашклёныя і зачыненыя на замок). Могуць быць вертыкальнымі ці гарызантальнымі, рознай формы, памеру і канструкцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ВЫТВОРЦА (ВЫТВОРЦЫ) ДАКУМЕНТАЎ**

Фізічная асоба, прадпрыемства, установа ці арганізацыя незалежна ад арганізацыйна-прававой формы ўласнасці, якая займаецца вырабам дакументаў. Імі з'яўляюцца паліграфічныя прадпрыемствы, выдавецтвы, рэдакцыі сродкаў масавай інфармацыі, музычныя фірмы, фірмы грамзапісу, тэле- і радыёкампаніі, кінастудыі, відэа- і кінематаграфічныя прадпрыемствы, навукова-даследчыя ўстановы, вышэйшыя навучальныя ўстановы, праектныя і канструктарскія арганізацыі і інш.

**ВЫТВОРЧАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, якое мае звесткі па тэхналогіі, тэхніцы і арганізацыі вытворчасці, разлічанае на спецыялістаў рознай кваліфікацыі.

**ВЫТВОРЧА-ПРАКТЫЧНАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, якое змяшчае звесткі па тэхналогіі, тэхніцы і арганізацыі вытворчасці і іншых галінах грамадскай практыкі, разлічанае на спецыялістаў рознай кваліфікацыі, занятых у сферы практычнай дзейнасці.

**ВЫТВОРЧАСЦЬ ВЫДАВЕЦКАЙ ПРАДУКЦЫІ**

Вытворча-тэхналагічны працэс стварэння на аснове выдавецкага арыгінала і тыражавання друкаванай прадукцыі.

**ВЫТВОРЧАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Бібліятэка, якая ўтрымліваецца пэўным прадпрыемствам і забяспечвае інфармацыйныя патрэбы вытворцаў.

**ВЫХАДНЫЯ ЗВЕСТКІ (ДАНЫЯ)**

Сукупнасць даных, якія характарызуюць выданне і прызначаюцца для яго афармлення, інфармавання спажыўцоў, бібліяграфічнай апрацоўкі і статыстычнага ўліку. Уключаюць звесткі аб асобах, якія прымалі ўдзел у стварэнні выдання, загаловак, падзагаловачныя даныя, выпускныя даныя, выдавецкую анатацыю, рэферат і г.д., што размешчаны на тытульным лісце, яго адвароце, канцавой паласе, на вокладцы ці пераплёце, на супервокладцы.

**ВЫЧАРПАЛЬНАЕ КАМПЛЕКТАВАННЕ**

Камплектаванне фонду ўсімі выдадзенымі дакументамі. В. к. здзяйсняецца, як правіла, пры дапамозе абавязковага экзэмпляра.

**ВЫЧАРПАЛЬНАЯ ПАЎНАТА ФОНДУ**

Мяркуемая ўстаноўка на абсалютна поўнае камплектаванне бібліятэчнага фонду па яго профілі, якая вядзе да неапраўданых затрат і не можа быць рэалізавана, таму што дзе-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ючая ў бібліятэчна-інфармацыйных працэсах заканамернасць рассейвання і канцэнтрацыі інфармацыі робіць немагчымымі пошук і набыццё ўсіх дакументаў па якой-небудзь тэме, галіне.

**ВЫЯЎЛЕНЧАЯ ПАШТОЎКА**

Паштоўка, адзін бок якой з'яўляецца рэпрадукцыяй твора выяўленчага мастацтва, а другі можа быць выкарыстаны для пісьма ці тэксту з тлумачэннем выявы.

**ВЫЯЎЛЕНЧЫ ДАКУМЕНТ**

Дакумент, большасць аб'ёму якога займае відарыс з кароткім тэкстам або без яго.

**ВЫЯЎЛЕНЧЫ ПЛАКАТ**

Выяўленчае выданне, якое змяшчае малюнак, фатаграфію, мантаж ці спецыяльны адбітак з тлумачальным тэкстам або без яго.

**ВЯДЗЕННЕ БАЗЫ ДАНЫХ**

Дзейнасць па абнаўленні, аднаўленні і пераўпарадкаванні структуры базы даных з мэтай забеспячэння яе цэласнасці, захоўвання і эфектыўнага выкарыстання.

**ВЯДЗЕННЕ БІБЛІЯТЭЧНАГА КАТАЛОГА**

Сукупнасць працэсаў, якія забяспечваюць функцыянаванне традыцыйнага бібліятэчнага каталога: расстаноўка каталожных картак, унясенне выпраўленняў, замена і аднаўленне картак і г. д., а таксама працэсы ўнутранага і знешняга афармлення бібліятэчнага каталога.

**ВЯДЗЕННЕ ТЭЗАЎРУСА**

Тэхналагічны працэс, які заключаецца ў зборы і абагульненні даных па выкарыстанні дэскрыптараў тэзаўруса, падрыхтоўцы прапаноў на ўвод і выкарыстанне тэрмінаў, карэкціроўцы парадыгматычных адносін і г.д.

**ВЯДЗЕННЕ ФАЙЛА**

Перыядычная рэарганізацыя файла для забеспячэння аптымальнага размяшчэння даных; выконваецца пры частым дабаўленні і выключэнні запісаў.

**ВЯДУЧАЕ СЛОВА ПРАДМЕТНАЙ РУБРЫКІ**

Першае слова прадметнай рубрыкі, якое вызначае яе месцазнаходжанне ў прадметным каталогу (спісе, паказальніку) і дапамагае вызначыць пэўны змястоўны комплекс.

**ВЯЧОРКІ**

Мерапрыемства, форма арганізацыі вольнага часу насельніцтва ў бібліятэцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Г

**ГАДАВАЯ СПРАВАЗДАЧА БІБЛІЯТЭКІ**

Форма справаздачнасці, у якой адлюстроўваюцца змест і аб’ём праведзенай за год работы па ўсіх кірунках дзейнасці бібліятэкі. Г. с. б. афармляецца ў двух відах: інфармацыйным (тэкставым) і статыстычным (лічбавым).

Гл.: Справаздача бібліятэкі.

**ГАДАВЫ КАМПЛЕКТ**

Дадатковая адзінка ўліку бібліятэчнага фонду. Сукупнасць нумароў перыядычных выданняў за год, якая прымаецца за адну ўліковую адзінку фонду.

**ГАДАВЫ ПЛАН РАБОТЫ БІБЛІЯТЭКІ**

Дакумент, які вызначае змест, аб’ём, паслядоўнасць, тэрміны выканання работы і выканаўцаў на працягу года.

Гл.: План работы бібліятэкі.

**ГАЗЕТА**

Перыядычнае тэкставае ліставое выданне, якое выходзіць звычайна праз невялікія прамежкі часу і змяшчае аператыўную інфармацыю, артыкулы па актуальных грамадска-палітычных, навуковых, вытворчых і іншых пытаннях, а таксама літаратурныя творы, ілюстрацыі, фотаздымкі, рэкламу.

**ГАЗЕТНАЕ ВЫДАННЕ**

Ліставое выданне ў выглядзе аднаго або некалькіх аркушаў друкаванага матэрыялу вызначанага фармату, па-выдавецку прыстасаванага да спецыфікі дадзенага выдання.

**ГАЗЕТНЫ ФОНД**

Частка бібліятэчнага фонду, якая фарміруецца з твораў друку з прыметамі газетнага выдання.

**ГАЛІНОВАЯ БІБЛІЯГРАФІЯ**

Бібліяграфія, якая задавальняе інфармацыйныя патрэбнасці па пэўнай галіне ведаў або практычнай дзейнасці (грамадска-палітычная, навукова-тэхнічная, медыцынская, сельскагаспадарчая і інш.) на аснове адпаведнага фонду і інфармацыйна-пошукавага апарату (**3.4.2.10**).

Бібліяграфія, аб’ектам якой з’яўляюцца дакументы, што адносяцца па змесце да пэўнай галіны ведаў ці практычнай дзейнасці.

**ГАЛІНОВАЯ БІБЛІЯТЭЧНАЯ СЕТКА**

Гл.: Ведамасная бібліятэчная сетка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ГАЛІНОВЫ АБАНЕМЕНТ**

Абанемент, дзе абслугоўванне чытачоў размяркоўваецца паміж бібліятэкарамі, якія адказваюць за пэўную частку фонду і спецыялізуюцца па галіновай літаратуры.

**ГАЛІНОВЫ АДДЗЕЛ**

Аддзел бібліятэкі, які абслугоўвае чытачоў дакументамі па пэўнай галіне ведаў.

**ГАЛІНОВЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік, які адлюстроўвае дакументы па пэўнай галіне ведаў і (або) практычнай дзейнасці (**3.3.2.18**).

**ГАЛІНОВЫ СКЛАД ФОНДУ**

Суаднесенасць колькасці дакументаў па розных галінах ведаў у бібліятэчным фондзе. Звычайна адлюстроўваецца ў працэнтах, якія паказваюць удзельную вагу дакументаў кожнай галіны ў адносінах да ўсяго фонду. Аптымальны для пэўнага тыпу бібліятэкі Г. с. ф. устанаўліваецца з улікам патрабаванняў чытачоў.

**ГАЛІНОВЫ ФОНД**

Бібліятэчны фонд, які складаецца з дакументаў па пэўнай галіне ведаў.

**ГАЛІНОВЫЯ ТАБЛІЦЫ КЛАСІФІКАЦЫІ**

Табліцы класіфікацыі, якія ўключаюць поўны варыянт табліц па адпаведнай галіне ведаў і скарочаную выбарку з табліц класіфікацыі па сумежных галінах.

**ГАЛОЎНАЯ ДАВЕДАЧНАЯ КАРТАТЭКА**

Бібліяграфічная картатэка ў спецыяльнай навуковай бібліятэцы, якая адлюстроўвае матэрыялы (дакументы) незалежна ад іх наяўнасці ў фондзе бібліятэкі ў адпаведнасці з інфармацыйнымі запатрабаваннямі асноўных груп чытачоў і абанентаў бібліятэкі.

**ГАЛОЎНЫ (АСНОЎНЫ) ЗАПІС**

Асноўны запіс звестак, які ў мэтах павышэння сапраўднасці і захавання інфармацыі мае копіі.

**ГАЛОЎНЫ БІБЛІЯТЭКАР**

Пасада спецыяліста вышэйшай кваліфікацыі, абавязкі якога вызначаны тарыфікацыйнымі дакументамі.

Гл.: Бібліятэкар.

**ГАЛОЎНЫ ТЫТУЛЬНЫ ЛІСТ**

Тытульны ліст, які змяшчае звесткі, што адносяцца да шматтомнага ці серыйнага выдання ўвогуле, звычайна ўяўляе сабой контртытул.

Сін.: Агульны тытульны ліст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ГАРАДСКАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Бібліятэка, якая размешчана ў адміністрацыйных межах горада і абслугоўвае яго насельніцтва.

**ГАРЫЗАНТАЛЬНАЕ РАЗМЯШЧЭННЕ ФОНДУ**

Размяшчэнне фонду ў працягнутых у даўжыню і шырыню фондасховішчах; прымяняецца для фондаў featurenага аб'ёму – малых, невялікіх, сярэдніх, буйных, найбуйнейшых.

**ГАРЫЗАНТАЛЬНАЯ КАРТАТЭКА**

Картатэка, у якой карткі размяшчаюцца ў плоскай скрынцы ў гарызантальным становішчы адна за другою ступенькамі; на выступах ніжніх абрэзкаў картак змешчаны асноўныя звесткі аб дакументах ці індэксы. У практыцы бібліятэк прымяняюцца таксама «робат-кардэксы» – механізаваныя Г. к., у якіх скрынкі высоўваюцца і засоўваюцца аўтаматычна.

Сін.: Кардэкс; Плоская картатэка.

**ГЕАГРАФІЧНАЯ РАССТАНОЎКА ФОНДУ**

Фармальная расстаноўка дакументаў па месцы іх выдання або па геаграфічных назвах месцаў, якім прысвечаны змест дакумента; прымяняецца для размяшчэння частак фонду: газет, некаторых відаў тэхнічнай дакументацыі; як дапаможная выкарыстоўваецца пры сістэматычнай і нумарацыйнай расстаноўках.

Сін.: Тапаграфічная расстаноўка фонду.

**ГЕАГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНЫ ПАКАЗАЛЬНІК**

Дапаможны паказальнік, які ўяўляе сабой алфавітны пералік назваў геаграфічных аб'ектаў, што ўпамінаюцца ў бібліяграфічным апісанні.

**ГЕАГРАФІЧНЫ КАТАЛОГ**

Бібліятэчны каталог, у якім бібліяграфічныя запісы размяшчаюцца ў адпаведнасці з месцам выдання твораў друку ў іншых дакументах у алфавітным парадку.

**ГЕАГРАФІЧНЫ ПАКАЗАЛЬНІК ДА ВЫДАННЯ**

Паказальнік да выдання, які складаецца з назваў геаграфічных аб'ектаў, што згадваюцца ў асноўным тэксце выдання.

**ГЕКТОГРАФ**

Прыстасаванне для размножвання тэкстаў, прынцып дзейнасці якога заснаваны на здольнасці жэлацінавага пласта ўспрымаць спецыяльнае чарніла, якім напісаны зыходны тэкст, і пераносіць яго на прыціснутыя да жэлацінавага пласта аркушы паперы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ГЕНЕРАЛЬНЫ КАТАЛОГ**

Пералік дакументаў бібліятэчнага фонду ў каталогу, за выключэннем абменных і рэзервовых фондаў; прымяняецца галоўным чынам для службовага карыстання.

**ГІГІЕНА ФОНДУ**

Комплекс мерапрыемстваў па забеспячэнні ўстойлівасці фонду да знішчальнага ўздзеяння на яго біялагічных аб'ектаў (мікраарганізмаў, грызуноў, насякомых і г.д.). Уключае: стварэнне аптымальнага фізіка-хімічнага і біялагічнага рэжыму ў фондасховішчы, абяспыльванне, выяўленне і лячэнне «хворых» кніг, дэзынфекцыю і знішчэнне бактэрый, дэзынсекцыю (знішчэнне насякомых), дэратызацыю (знішчэнне грызуноў).

**ГІСТОРЫКАЗНАЎЧЫЯ КЛУБЫ**

Клубы аматараў гісторыі і прафесійных гісторыкаў; найчасцей дзейнічаюць як чытацкія аб'яднанні пры бібліятэках.

**ГІСТОРЫЯ БІБЛІЯГРАФІІ**

Навуковая дысцыпліна, якая вывучае паходжанне і развіццё бібліяграфіі ў цэлым, асобных яе раздзелаў ад старажытных часоў да нашых дзён; вытокі і прычыны ўзнікнення тых ці іншых бібліяграфічных з'яў, іх канкрэтна-гістарычную і сацыяльна-эканамічную абумоўленасць; гістарычныя сувязі бібліяграфіі з сумежнымі галінамі дзейнасці; працэсы фарміравання і ўдасканалення метадаў бібліяграфічнай работы, эвалюцыю тыпаў і формаў бібліяграфічных дапаможнікаў, што забяспечвае выяўленне, захаванне і выкарыстанне вопыту пройдзенага шляху.

**ГІСТОРЫЯ БІБЛІЯТЭЧНАЙ СПРАВЫ**

Навуковая дысцыпліна, якая вывучае змест, формы, метады і арганізацыю бібліятэчнай справы ва ўмовах розных сацыяльна-эканамічных фармацый, на розных этапах развіцця нашай і замежных краін.

**ГЛАВА**

Адна з асноўных структурна-кампазіцыйных адзінак тэксту; звычайна мае тэматычны загаловак, якому папярэднічае родавая назва «глава» і нумар; як правіла, пачынаецца з новай старонкі.

**ГЛЫБІНЯ КАМПЛЕКТАВАННЯ**

Ступень ахопу дакументаў па гадах выдання, тэматыцы і відах пры камплектаванні фонду.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ГЛЫБОКАЕ ІНДЭКСАВАННЕ**

Шматаспектнае індэксаванне з той ступенню дэталізацыі, якую дазваляе класіфікацыйная сістэма.

**ГНУТКАСЦЬ КЛАСІФІКАЦЫІ**

Уласцівасць, якая дазваляе пры індэксаванні выбіраць парадак праходжання элементаў камбінаванага індэкса, а таксама даўжыню індэкса, г.зн. змяняць узровень іерархіі ў залежнасці ад інфармацыйнай патрэбнасці.

**ГНУТКІ МАГНІТНЫ ДЫСК**

Зменны магнітны дыск на гнуткім носьбіце, які выкарыстоўваецца ў персанальных камп'ютарах у якасці знешняй памяці прамога доступу.

**ГОД ВЫДАННЯ**

Год выпуску дакумента ў свет, пазначаны на ім або ўстаноўлены на падставе аналізу тэксту ці шляхам бібліяграфічнага пошуку (магчыма і на падставе іншых крыніц).

**ГРАВЮРА**

1. Друкаваны адбітак на паперы (ці падобным матэрыяле) з пласціны, на якой выразаны малюнак.

2. Від мастацтва графікі, дзе выява – друкаваны адбітак пукатага ці паглыбленага малюнка, зробленага на паверхні пласціны з дрэва, металу ці іншых матэрыялаў пэўнымі прыёмамі гравіравання.

**ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ЛІТАРАТУРА**

Сукупнасць твораў на тэмы грамадскіх адносін і дзяржаўнай дзейнасці, унутранага эканамічнага, сацыяльнага і культурнага жыцця краін, міжнародных адносін.

**ГРАФІЧНЫ ДАКУМЕНТ**

Дакумент, у якім выява адлюстравана лініямі, штрыхамі, святлаценямі.

**ГРАФІЧНЫЯ ДАНЫЯ**

Электронны рэсурс, які ўтрымлівае выявы (у адрозненне ад літарных і лічбавых сімвалаў) на экране камп'ютара, напрыклад фотакартак, твораў дзелавой і інжынернай графікі, малюнкаў і інш.

**ГРАФІЧНЫЯ ФАЙЛЫ**

Файлы, дзе захоўваюцца ўстойлівыя графічныя даныя любых тыпаў, вызначаных для наступнай візуалізацыі.

**ГРАФІЧНЫЯ ФАРМАТЫ**

Спосаб арганізацыі графічных файлаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ГРУПА (КАТЭГОРЫЯ, МЭТАВАЯ АЎДЫТОРЫЯ) ЧЫТАЧОЎ (КАРЫСТАЛЬНІКАЎ, СПАЖЫЎЦОЎ) ІНФАРМАЦЫІ**

Умоўная градацыя чытачоў, іх пэўная частка, аб'яднаная ў адпаведнасці з шэрагам прымет – узроставых, сацыяльных, функцыянальных, сацыяльна-дэмаграфічных, прафесійна-дзейнасных, звязаных з разуменнем, перапрацоўкай, выкарыстаннем інфармацыі.

**ГРУПАВАЯ АБАГУЛЬНЯЛЬНАЯ АНАТАЦЫЯ**

Анатацыя, якая ўтрымлівае абагульняльную характарыстыку двух і больш дакументаў.

**ГРУПАВАЯ АПРАЦОЎКА**

Метад бібліятэчнай апрацоўкі, пры якім аднародныя па змесце ці блізкія паводле віду або іншых прымет дакументы аб'ядноўваюцца ў групу. Г. а. уключае: сумарны ўлік, тэхнічную апрацоўку, сістэматызацыю і аб'яднанне дакументаў у групы, складанне бібліяграфічнага апісання і адлюстраванне ў каталогах.

**ГРУПАВОЕ АБСЛУГОЎВАННЕ ЧЫТАЧОЎ**

Форма арганізацыі абслугоўвання чытацкіх груп, вызначаных па якой-небудзь прымеце (узрост, прафесійная прыналежнасць і інш.) і аб'яднаных агульным інтарэсам.

**ГРУПАВОЕ ІНФАРМАВАННЕ**

Інфармаванне груп спажыўцоў інфармацыі, якія аб'яднаны па прыметах падабенства інфармацыйных патрэбнасцей **(3.2.2.9)**.

**ГРУПАВЫ АБАНЕМЕНТ**

Абанемент інфармацыйна-бібліятэчнай установы, які забяспечвае абслугоўванне традыцыйнымі і электронна-інфармацыйнымі сродкамі абанентаў у адпаведнасці з чытацкімі групамі, вылучанымі па розных прыметах: узроставых, адукацыйных, прафесійных і інш.

**ГУТАРКА АБ ДАВЕДАЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНЫМ АПАРАЦЕ**

Індывідуальная, групавая ці масавая форма рэкламы бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў сярод чытачоў; інфармацыя чытачоў аб складзе даведачна-бібліяграфічнага апарату пэўнай бібліятэкі.

**ГУТАРКА АБ КНІГАХ**

1. Размова (можа быць дыялог) з чытачом пры выдачы і прыёме літаратуры. Г. можа быць інфармацыйна-рэкаменда-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыйная, аб прачытаным і з’яўляецца асноўнай формай індывідуальных зносін паміж бібліятэкарам і чытачом.

2. Жанр рэкамендацыйнага бібліяграфічнага дапаможніка.

**ГУТАРКА АБ ПРАЧЫТАНАЙ КНІЗЕ**

Размова з чытачом (хутчэй за ўсё пры здачы літаратуры) з мэтай устанавіць з ім лепшы кантакт, паспрыяць правільнаму разуменню ім тэксту (маюцца на ўвазе дзеці); абмен меркаваннямі, адна з формаў бібліятэчных зносін.

**ГУТАРКА ПРЫ ЗАПІСЕ Ў БІБЛІЯТЭКУ**

Размова з чытачом з мэтай азнаямлення яго з правіламі карыстання бібліятэкай, правамі і абавязкамі, а таксама з мэтай устанаўлення псіхалагічнага кантакту і вывучэння яго чытацкіх інтарэсаў і запытаў.

**ГУЧНЫЯ ЧЫТАННІ**

Чытанне ўслых тэкстаў выданняў з далейшымі каментарыямі і абмеркаваннем прачытанага як адна з формаў абслугоўвання пэўных чытацкіх груп. Выкарыстоўваюцца ў дзіцячых бібліятэках і пры абслугоўванні чытацкіх груп, якія з прычыны сваіх фізічных ці іншых асаблівасцей не могуць прачытаць патрэбную кнігу.

## *Д*

**ДАВЕДАЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ**

Абслугоўванне ў адпаведнасці з запытамі спажыўцоў інфармацыі, якое звязана з прадастаўленнем даведак і іншых бібліяграфічных паслуг (**3.2.2.2**).

**ДАВЕДАЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНЫ АПАРАТ**

Сукупнасць даведачных і бібліяграфічных выданняў, бібліятэчных каталогаў і картатэк, якія прызначаюцца для пошуку інфармацыі (**3.3.2.48**).

**ДАВЕДАЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ФОНД**

Частка бібліятэчнага фонду і даведачна-бібліяграфічнага апарату, якая ўключае даведачныя выданні і бібліяграфічныя дапаможнікі (акрамя карткавых каталогаў і картатэк), матэрыялы заканадаўчага характару, неабходныя для ажыццяўлення ўсіх працэсаў бібліяграфічнай дзейнасці.

**ДАВЕДАЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНЫ ФОНД**

Сукупнасць упарадкаваных масіваў і даведачна-пошукавага апарату, якія прызначаюцца для задавальнення патрэб у навукова-тэхнічнай інфармацыі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ДАВЕДАЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ (ДІА)**

Сукупнасць працэсаў па выкананні інфармацыйных запытаў карыстальнікаў інфармацыі.

**ДАВЕДАЧНА-ПОШУКАВЫ АПАРАТ**

Сукупнасць упарадкаваных масіваў другасных дакументаў, якія прызначаюцца для пошуку навукова-тэхнічнай інфармацыі. У бібліятэчнай практыцы для характарыстыкі Д.-п. а. выкарыстоўваецца тэрмін «даведачна-бібліяграфічны апарат».

**ДАВЕДАЧНАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, якое змяшчае звесткі навуковага, навукова-папулярнага або прыкладнога характару, пададзеныя ў зручным для хуткага адшуквання парадку; не прызначана, як правіла, для суцэльнага чытання.

**ДАВЕДАЧНАЯ АНАТАЦЫЯ**

Анатацыя, што ўдакладняе загаловак дакумента ці паведамляе дадатковыя звесткі, якія часцей за ўсё адсутнічаюць у бібліяграфічным апісанні.

**ДАВЕДАЧНАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Спецыяльная бібліятэка, якая праводзіць кансультацыйную і інфармацыйна-даведачную работу на аснове фонду даведачных выданняў і іншых кампанентаў даведачна-пошукавага апарату (**3.4.2.17**).

**ДАВЕДНІК**

Выданне прыкладнога, практычнага характару, матэрыял у якім размешчаны ў сістэматызаваным парадку ці па алфавіце загалоўкаў артыкулаў. Адрозніваюць навуковы, вытворча-практычны, вучэбны, папулярны і іншыя Д.

**ДАВЕДНІК АБ ЛІТАРАТУРЫ**

Бібліяграфічны дапаможнік, які звычайна спалучае ў сабе звесткі аб першасных дакументах і крыніцах бібліяграфічнай інфармацыі па тэме даведніка з рознымі метадычнымі парадамі і рэкамендацыямі.

**ДАВЕДНІК БІБЛІЯТЭКІ**

Даведнік для чытачоў ці наведвальнікаў, які змяшчае падрабязныя звесткі аб бібліятэцы, яе гісторыі, фондах, структуры, парадку і формах бібліятэчнага абслугоўвання.

**ДАДАТАК**

1. Несамастойны твор друку, што выдадзены асобна, але мае сувязі з асноўным выданнем, якое ён тлумачыць, каменціруе, дапаўняе (напрыклад, альбомы картаў, фатаграфій).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Даведачная ці дакументальная частка выдання, якая размешчана пад той жа назвай у канцы яго (артыкулы, дакументы, карты, схемы, табліцы і г. д.).

3. Выданне (напрыклад, збор твораў пісьменніка), якое распаўсюджваецца па падпісцы разам з асноўным перыядычным выданнем (часцей з пэўным часопісам).

**ДАДАТКОВАЕ АДЛЮСТРАВАННЕ**

Індэксацыйнае адлюстраванне наступных паняццяў, якія ўваходзяць у склад поўнага індэкса.

**ДАДАТКОВАЯ КАРТКА**

Картка алфавітнага каталога, якая змяшчае дадатковы бібліяграфічны запіс.

**ДАДАТКОВАЯ КАРТКА СІСТЭМАТЫЧНАГА КАТАЛОГА**

Каталожная картка, месца якой у сістэматычным каталогу вызначаецца другім і наступнымі класіфікацыйнымі індэксамі, што ўваходзяць у склад поўнага індэкса пры шматразовым адлюстраванні дакумента ў сістэматычным каталогу.

**ДАДАТКОВЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ЗАПІС**

Запіс, які забяспечвае ідэнтыфікацыю выдання і пошук па дадатковай пошукавай прымеце, што адрозніваецца ад пачатковых слоў асноўнага бібліяграфічнага запісу; забяспечвае пашыраны аспектны пошук выдання.

**ДАДАТКОВЫ ІНДЭКС**

Другі і наступныя класіфікацыйныя індэксы, якія ўваходзяць дадаткова ў склад поўнага індэкса пры шматразовым адлюстраванні дакумента ў сістэматычным каталогу.

**ДАДАТКОВЫ ТЫРАЖ**

Дадрукоўка тыражу выдання на аснове выдавецкага арыгінала без змяненняў.

**ДАДАТКОВЫ ТЫТУЛЬНЫ ЛІСТ**

Левая частка разваротнага тытульнага ліста; у асобных выпадках ліст, які ідзе наступным за асноўным тытульным лістом ці папярэднічае яму. Утрымлівае звесткі, якія поўнасцю супадаюць са змешчанымі на асноўным тытульным лісце ці чым-небудзь адрозніваюцца ад іх; у іншым паліграфічным выкананні; звесткі аб першым ці папярэднім выданні; звесткі на мове арыгінала, з якога зроблены пераклад выдання, або на мове, на якую перакладзены асноўныя выхадныя звесткі выдання (паралельны тытульны ліст); звесткі аб шматтомным ці серыйным выданні ўвогуле (агульны тытульны ліст).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ДАДАТКОВЫЯ КРЫНІЦЫ ФІНАНСАВАННЯ БІБЛІЯТЭК**

Сродкі на развіццё і ўдасканаленне бібліятэк не з дзяржаўнага фонду; можа быць фундатарства, пагадненні з замежнымі краінамі, прыватныя ахвяраванні грамадзян, платныя паслугі.

**ДАЙДЖЭСТ**

Выданне, якое ўключае фрагменты тэкстаў многіх дакументаў (цытаты, вытрымкі, рэфераты), падабраныя па пэўнай тэме і згрупаваныя такім чынам, каб аблегчыць успрыманне матэрыялу (ад агульнага да прыватнага; па тэматычных кірунках; у адпаведнасці з рознымі пунктамі гледжання і г.д.). Тэкст Д. таксама можа ўключаць кароткую прадмову (характарыстыка крыніц і крытэрыяў падбору публікацый), спіс выкарыстанай літаратуры.

**ДАКАМПЛЕКТАВАННЕ**

Разнавіднасць бягучага камплектавання, якое заключаецца ў папаўненні фонду адсутнымі адзінкамі друку або дакументамі, што маюцца ў недастатковай колькасці.

**ДАКЛАДНАСЦЬ БІБЛІЯГРАФІЧНАГА ПОШУКУ**

Паказчык, які адлюстроўвае адносіны колькасці рэлевантных запытаў бібліяграфічных запісаў, выдадзеных у выніку бібліяграфічнага пошуку да нерэлевантных (інфармацыйны шум).

**ДАКУМЕНТ**

Матэрыяльны аб'ект з зафіксаванай на ім інфармацыяй у выглядзе тэксту, гукапісу, відарысу, (у т.л. у машыначытальнай форме), які прызначаны для захоўвання і грамадскага выкарыстання.

**ДАКУМЕНТНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ**

Інфармацыя, якая ўтрымліваецца ў дакументах **(3.1.27)**.

**ДАКУМЕНТНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ**

Забеспячэнне бібліятэкі неабходнымі дакументамі з дапамогай кніжнага гандлю, сістэмы прадастаўлення абавязковага экзэмпляра выданняў, кнігаабмену, ахвяраванняў і іншых крыніц камплектавання.

**ДАКУМЕНТНАЯ БІБЛІЯТЭЧНАЯ ПАСЛУГА**

Выдача па запытах абанентаў дакументаў, іх копій, звестак аб дакументах. Пры гэтым вызначаюць акрэсленыя і неакрэсленыя запыты. Да Д. б. п. адносяцца: дакументныя паслугі па

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

разавых запытах абанентаў; апераджальныя дакументныя паслугі (інфармаванне аб навінках, арганізацыя рэкламы літаратуры, дазвол абанентам выкарыстоўваць даведачна-бібліяграфічны апарат, у тым ліку машыначытальныя базы даных і інш.).

Гл.: Бібліятэчная паслуга.

**ДАКУМЕНТНАЯ ІНФАРМАЦЫЙНА-ПОШУКАВАЯ СІСТЭМА**

Інфармацыйна-пошукавая сістэма, якая прызначаецца для пошуку дакументаў ці звестак аб іх.

**ДАКУМЕНТНЫ ЗАПЫТ**

Запатрабаванне на дакумент, якое паступіла ад спажыўца інфармацыі ў арганізацыю, што ажыццяўляе інфармацыйнае абслугоўванне: бібліятэку, орган НТІ, архіў і г. д.

**ДАКУМЕНТНЫ ПОШУК**

Пошук адпаведных інфармацыйнаму запыту дакументаў.

**ДАКУМЕНТНЫ РЫНАК**

Уключае рынак друкаваных выданняў, аўдыявізуальных матэрыялаў, электронных рэсурсаў, рэпрадуцыраваных і неапублікаваных дакументаў.

**ДАКУМЕНТНЫЯ РЭСУРСЫ**

Від інфармацыйных рэсурсаў, які прадстаўляе сукупнасць асобных дакументаў, масіваў дакументаў у інфармацыйных сістэмах (**3.3.1.2**).

**ДАКУМЕНТЫ ПАСТАЯННАГА ЗАХОЎВАННЯ**

Абавязковыя экзэмпляры айчынных, а таксама тых дакументаў, што прымаюцца бібліятэкай на дэпазітарнае захаванне.

**ДАКУМЕНТЫ ПРАЦЯГЛАГА ЗАХОЎВАННЯ**

Дакументы з інвентарным нумарам, прызначаныя для задавальнення бягучага і прагназуемага чытацкага попыту, незалежна ад віду дакумента, аб'ёму, тэматыкі і іншых фармальных прымет.

**ДАКУМЕНТЫ ЧАСОВАГА ЗАХОЎВАННЯ**

Дакументы без інвентарных нумароў, якія змяшчаюць інфармацыю кароткатэрміновага значэння.

**ДАНЫЯ**

Інфармацыя, якая апрацавана і прадстаўлена ў фармалізаваным выглядзе для далейшай апрацоўкі (**3.2.1.2**).

**ДАПАМОЖНАЯ ТАБЛІЦА КЛАСІФІКАЦЫІ**

Частка класіфікацыйнай табліцы, вылучаная са складу асноўнай класіфікацыйнай табліцы; уключае класіфікацый-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ныя запісы, якія выкарыстоўваюцца галоўным чынам для дэталізацыі класаў асноўнай класіфікацыйнай табліцы.

**ДАПАМОЖНЫ ДЭСКРЫПТАР, КВАЛІФІКАТАР**

Дэскрыптар, які выкарыстоўваецца толькі сумесна з іншымі дэскрыптарамі.

**ДАПАМОЖНЫ ПАКАЗАЛЬНІК**

Частка бібліяграфічнага дапаможніка, якая адлюстроўвае звесткі аб дакументах у іншым аспекце, які адрозніваецца ад асноўнага тэксту дапаможніка, з адсылкай да адпаведных бібліяграфічных запісаў (**3.3.2.10**).

**ДАПАМОЖНЫ ПАКАЗАЛЬНІК АЎТАРАЎ І ЗАГАЛОЎКАЎ**

Дапаможны паказальнік, які ўяўляе сабой алфавітны пералік аўтараў, складальнікаў і загалоўкаў дакументаў, што адлюстраваны ў бібліяграфічным дапаможніку.

**ДАПАМОЖНЫ ПАКАЗАЛЬНІК КАЛЕКТЫВАЎ**

Дапаможны паказальнік, які ўяўляе сабой алфавітны пералік назваў арганізацый, устаноў, прадпрыемстваў, што прымалі ўдзел у стварэнні дакументаў або адказвалі за іх выпуск.

**ДАПАМОЖНЫ ПАКАЗАЛЬНІК КЛЮЧАВЫХ СЛОЎ**

Бібліяграфічны дапаможнік, у якім бібліяграфічныя запісы прыведзены пад ключавымі рубрыкамі, размешчанымі ў алфавітным парадку.

**ДАПАМОЖНЫ ПАКАЗАЛЬНІК МЕСЦАЎ ВЫДАННЯ**

Дапаможны паказальнік, які ўяўляе сабой пералік геаграфічных назваў, што азначаюць месца выдання дакументаў, адлюстраваных у бібліяграфічным дапаможніку.

**ДАПАМОЖНЫЯ ТАБЛІЦЫ КЛАСІФІКАЦЫІ**

Састаўная частка табліц класіфікацыі, якая ўключае табліцы класіфікацыйных дзяленняў па дапаможных прыметах: тэматычных, фармальных, тэрытарыяльных, храналагічных, этнічных, моўных і г. д.

**ДАПОЎНЕНАЕ ВЫДАННЕ**

Перавыданне, якое змяшчае дадатковыя матэрыялы (тэкст, ілюстрацыі і г. д.) у параўнанні з папярэднім выданнем.

**ДАР**

Бязвыплатная перадача бібліятэцы дакументаў асобай, групай людзей, установай ці іншай бібліятэкай.

**ДВУХМОЎНЫ СЛОЎНІК**

Слоўнік, які супастаўляе моўныя адзінкі дзвюх моў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ДЗВЮХКАРТКАВАЯ АБАНЕМЕНТНАЯ СІСТЭМА**

Сістэма кантролю за выдачай і зваротам выданняў на абанеменце шляхам паралельнага запісу выдадзеных чытачам дакументаў і тэрміну іх звароту ў фармуляры чытача і ў фармуляры кнігі ці іншага дакумента.

**ДЗЕНЬ ІНФАРМАЦЫІ**

Комплекснае мерапрыемства, якое прадугледжвае інфармаванне аб новых дакументах, якія паступілі ў бібліятэку за вызначаны перыяд: арганізуюцца выставы, праводзяцца інфармацыйныя бібліяграфічныя агляды. На Дз. і. запрашаюцца работнікі службаў інфармацыі, рэферэнты і іншыя чытачы.

**ДЗЕНЬ СПЕЦЫЯЛІСТА**

Комплекснае мерапрыемства, якое прадугледжвае арганізацыю адкрытага прагляду літаратуры па пэўнай спецыяльнасці; суправаджаецца прэзентацыямі, бібліяграфічнымі аглядамі, лекцыямі, экскурсіямі па бібліятэцы; у залежнасці ад працягласці Дз. с. мае розныя назвы: дэкада спецыяліста, тыдзень спецыяліста.

**ДЗЕСЯТКОВАЯ ІНДЭКСАЦЫЯ**

Індэксацыя, у якой класіфікацыйныя дзяленні маюць абазначэнні на падставе дзесятковай сістэмы ўліку.

**ДЗЕСЯТКОВАЯ КЛАСІФІКАЦЫЯ ДАКУМЕНТАЎ (ДКД)**

Сістэма бібліятэчна-бібліяграфічнай класіфікацыі, распрацаваная амерыканскім бібліятэказнаўцам Мэлвілам Дзьюі (1851–1931). Перападліковая сістэма, дзе розныя аднародныя прыметы выражаны стандартнымі дзяленнямі, якія не маюць вызначальных апазнавальных знакаў і набліжаныя непасрэдна да дзесятковых індэксаў. Назву ДКД атрымала ад дзесяці асноўных класаў (аддзелаў), кожны з якіх вызначаны арабскімі літарамі і, у сваю чаргу, падраздзяляецца на дзесяць падраздзелаў і г.д.

**ДЗЕЮЧЫ ФОНД**

Частка бібліятэчнага фонду, якая выкарыстоўваецца ў сістэме абслугоўвання чытачоў.

**ДЗІЦЯЧАЕ ЧЫТАННЕ**

Чытанне дзяцей.

Гл.: Чытанне.

**ДЗІЦЯЧАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Бібліятэка, якая арганізуе бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей і кіраўнікоў дзіцячым чытаннем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ДЗЯЖУРНЫ Ў ЧЫТАЛЬНАЙ ЗАЛЕ**

Бібліятэкар, які выконвае функцыі кансультанта па розных пытаннях бібліятэчнай справы.

**ДЗЯРЖАЎНАЯ БІБЛІЯГРАФІЯ**

Падраздзяленне агульнай бібліяграфіі, якое забяспечвае рэгістрацыю ўсіх дакументаў, што выйшлі на тэрыторыі дзяржавы (галоўным чынам твораў друку) і інфармаванне аб іх з дапамогай універсальных крыніц бібліяграфічнай інфармацыі (дзяржаўных паказальнікаў). У нашай рэспубліцы падрыхтоўку дзяржаўных паказальнікаў здзяйсняе галоўным чынам Нацыянальная кніжная палата Беларусі і НББ.

**ДЗЯРЖАЎНАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Бібліятэка, якая заснавана органамі дзяржаўнай улады, належыць дзяржаўным установам, прадпрыемствам, фінансуецца з дзяржаўнага бюджэту.

**ДЗЯРЖАЎНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ПАКАЗАЛЬНІК**

Паказальнік, які інфармуе грамадства аб дакументах, што выходзяць у дзяржаве (галоўным чынам творах друку) на аснове іх дзяржаўнай рэгістрацыі.

**ДЗЯРЖАЎНЫ РУБРЫКАТАР НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАЙ ІНФАРМАЦЫІ**

Універсальная іерархічная класіфікацыя галінаў ведаў, прынятая для сістэматызацыі ўсяго патоку навукова-тэхнічнай інфармацыі. Мае тры ўзроўні іерархіі. Коды рубрык складаюцца з пар арабскіх лічбаў, падзеленых кропкаю. Рубрыкам у якасці даведачнай інфармацыі прыпісаны індэкс УДК. Гэта забяспечвае ўзаемасувязь паміж дзвюма класіфікацыйнымі сістэмамі, прадстаўленую ў выглядзе гіпертэкставага пераходу ў выпадках, калі гэтай сувязі адпавядае рэальная рубрыка УДК.

**ДЖОЙСТЫК**

Прыстасаванне для ручнога кіравання рухам курсора на экране дысплея.

**ДОСТУП ДА ДАКУМЕНТАЎ**

1. Магчымасць атрымання дакументаў і (ці) іх выяў, засваенне дакументаў, ідэнтыфікацыя.

2. Працэдура наладжвання сувязі з выкарыстаннем ЭВМ (электронна-інфармацыйнай сістэмы) для атрымання неабходнай падборкі запісу звестак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ДОСТУП ІНФАРМАЦЫІ**

Магчымасць атрымання інфармацыі. Пераадоленне камунікацыйных бар'ераў паміж інфармацыяй і яе карыстальнікамі.

**ДРУГАСНЫ АДБОР**

Адбор дакументаў у фондзе на аснове вынікаў вывучэння складу, развіцця і выкарыстання фонду; працэс заключаецца ў вызначэнні дакументаў, неабходных для дадзенага фонду, і дакументаў, якія належыць выключыць з фонду.

**ДРУГАСНЫ ДАКУМЕНТ**

Дакумент, які з'яўляецца вынікам аналітыка-сінтэтычнай перапрацоўкі аднаго або некалькіх першасных дакументаў **(3.1.28).**

**ДРУК**

1. Выдавецкая прадукцыя ўвогуле.

2. Сукупнасць друкаваных выданняў (прэсы).

3. Працэс атрымання адбіткаў на паперы, тканіне ці іншым матэрыяле шляхам пераносу фарбы з пэўнай друкаванай формы.

**ДРУКАВАНАЯ КАРТКА**

Каталожная картка, падрыхтаваная друкарскім ці іншым спосабам; прызначана для прымянення ў карткавых каталогах.

**ДРУКАВАНЫ АРКУШ**

Адзінка друкаванага аб'ёму твора, якая адпавядае аднаму боку ліста паперы стандартнага фармату і змяшчае розную колькасць друкаваных знакаў у залежнасці ад фармату набарнай паласы, асаблівасцей набору. Адрозніваюць фізічны Д. а. (яго азначэнне супадае з азначэннем Д.а.) і ўмоўны (за яго прыняты друкаваны аркуш фармату 60 х 90 см; служыць для супастаўлення друкарскіх аб'ёмаў выданняў, надрукаваных на паперы рознага фармату).

**ДРУКАВАНЫ КАТАЛОГ**

Бібліятэчны каталог у форме кніжнага выдання.

**ДУБЛЕТНЫ ЭКЗЭМПЛЯР**

Паўторны экзэмпляр дакумента ў бібліятэчным фондзе. Адрозніваюць запланаваную дублетнасць і залішнія Д. э.

**ДЫВЕРСІФІКАЦЫЯ**

Пашырэнне асартыменту пэўнай прадукцыі; пашырэнне кірункаў дзейнасці арганізацыі.

**ДЫЗАЙН**

Мастацкае канструяванне розных дэталяў, якое адыгрывае асаблівую ролю ў афармленні бібліятэчнага інтэр'еру.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ДЫКТАФОН**

Апарат, які служыць для запісу гукавой інфармацыі шляхам дыктоўкі з мэтай яе далейшага ўзнаўлення (поўнасцю ці часткова).

**ДЫНАМІКА ФОНДУ**

Змяненне характарыстык фонду ў выніку пастаяннага аднаўлення, колькасных і якасных пераўтварэнняў складу, структуры і арганізацыі фонду, а таксама перамяшчэння яго ў маштабе асобнай бібліятэкі, сеткі бібліятэк.

**ДЫСЕРТАЦЫЯ**

Дакумент, які змяшчае апісанне і вынікі самастойнага навуковага даследавання; прадстаўляецца на атрыманне вучонай ступені.

**ДЫСКУСІЙНЫ КЛУБ**

Арганізацыя чытачоў пры бібліятэцы, заснаваная на агульнасці іх інтарэсаў да якіх-небудзь праблем, тэм, аўтараў.

**ДЫСПЕТЧАРЫЗАЦЫЯ БІБЛІЯТЭЧНЫХ ЦЫКЛАЎ**

Цэнтралізаваны кантроль і аператыўнае рэгуляванне руху дакументаў і чытацкіх запатрабаванняў, тэрмінаў і паслядоўнасці выканання працэсаў і аперацый апрацоўкі дакументаў, чытацкіх запатрабаванняў.

**ДЫСПЕТЧАРЫЗАЦЫЯ ТЭХНАЛАГІЧНАГА ПРАЦЭСУ**

Цэнтралізаванае рэгуляванне аднаго ці групы бібліятэчных тэхналагічных працэсаў, кантроль за тэрмінам і паслядоўнасцю выканання тэхналагічных працэсаў і аперацый.

**ДЫСПЛЕЙ**

Прыстасаванне для візуальнага адлюстравання інфармацыі, заснаванае на выкарыстанні электронна-прамянёвай трубкі і забяспечанае клавіятурай для ўвядзення даных у электронна-вылічальную машыну.

Гл.: Тэрмінал.

**ДЫСПУТ**

Публічная спрэчка на навуковую ці грамадска важную тэму; адносіцца да камунікатыўных бібліятэчных паслуг.

**ДЫСТАНЦЫЙНАЕ ІНФАРМАЦЫЙНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ**

Абслугоўванне карыстальнікаў, якое здзяйсняецца інфармацыйна-бібліятэчнай установай па каналах сувязі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ДЫФЕРЭНЦАВАНАЕ БІБЛІЯТЭЧНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ**

Абслугоўванне чытачоў з улікам запытаў і псіхалогіі пэўных чытацкіх груп; грунтуецца на вывучэнні чытацкіх інтарэсаў і складу чытачоў; выяўляецца ў стварэнні пэўных умоў і прымяненні розных формаў абслугоўвання для больш эфектыўнага выкарыстання дакументаў.

**ДЫФЕРЭНЦАВАНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ КІРАЎНІЦТВА НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАЙ ІНФАРМАЦЫЯЙ**

Забеспячэнне кіраўніцтва розных узроўняў спецыяльна падрыхтаванай інфармацыяй, якая прызначаецца для вырашэння задач кіраўніцтва.

**ДЫФЕРЭНЦАВАНЫ АБАНЕМЕНТ**

Від арганізацыі абанемента, сутнасць якога ў абслугоўванні розных груп чытачоў на пэўных кафедрах.

**ДЫФЕРЭНЦЫЯЦЫЯ ЧЫТАЧОЎ**

Групоўка чытачоў паводле прымет (дэмаграфічных, сацыяльна-прафесійных, сацыяльна-псіхалагічных, узроставых і інш.), якія істотна ўплываюць на чытанне і фарміраванне чытацкай псіхалогіі.

**ДЫХАТАМІЧНАЯ КЛАСІФІКАЦЫЯ**

Класіфікацыя, у аснову якой пакладзена паслядоўнае дзяленне на два супрацьлеглыя ўзаемавыключальныя паняцці.

**ДЫЯГРАМА**

Умоўнае адлюстраванне лікавых велічынь або іх стасункаў, якое выканана геаметрычнымі спосабамі.

**ДЫЯЛОГАВАЯ ІНФАРМАЦЫЙНА-ПОШУКАВАЯ СІСТЭМА**

Аўтаматызаваная ІПС, якая забяспечвае здзяйсненне дыялогавага пошуку.

**ДЫЯПАЗІТЫЎ**

Фатаграфічны здымак на шкле або празрыстай плёнцы, які разглядаецца на святло ці праектуецца на экран.

Сін.: Каляровы дыяпазітыў; Слайд.

**ДЫЯСКОП**

Праекцыйны апарат, які служыць для ўзнаўлення на экране нерухомых выяў як з празрыстых, так і з непразрыстых носьбітаў.

**ДЫЯФІЛЬМ**

Дыяпазітыў ці дыяпазітывы на адрэзку рулоннай фотаплёнкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ДЭАНТАЛОГІЯ БІБЛІЯТЭКАРА**

Тэрмін, які азначае прафесійную этыку і гарантуе даверлівыя адносіны паміж спажыўцом і асобаю, якая аказвае паслугу.

**ДЭЗІДЭРАТА**

Дакумент, які адпавядае профілю камплектавання, але адсутнічае ў фондзе, хоць і неабходны бібліятэцы, інфармацыйнаму цэнтру для напаўнення лакун ці дабаўлення фонду дублетнымі матэрыяламі.

**ДЭІДЭАЛАГІЗАЦЫЯ БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНЫХ УСТАНОЎ**

Адказ ад прыярытэту палітыка-ідэалагічных каштоўнасцей і ўстановак, працэс вызвалення ад партыйна-ідэалагічнага ўціску органаў сацыяльнага кіравання.

**ДЭПАЗІТАРНАЕ ЗАХОЎВАННЕ ФОНДУ**

Пастаяннае захоўванне дакументаў (у тым ліку малаўжывальных) па пэўным профілі ў спецыяльна выдзеленых бібліятэках ці дапаможных кнігасховішчах для найбольш рацыянальнага размяшчэння і выкарыстання бібліятэчных фондаў рэгіёна і ўсёй краіны.

**ДЭПАЗІТАРНЫ ФОНД**

Бібліятэчны фонд, які падлягае пастаяннаму захоўванню ў бібліятэках-дэпазітарыях.

**ДЭПАЗІТАРЫЙ**

Спецыяльная бібліятэка ці дапаможнае кнігасховішча, прыстасаванае для больш рацыянальнага размяшчэння бібліятэчных фондаў рэгіёна ці краіны ўвогуле.

Гл.: Дэпазітарнае захоўванне фонду.

**ДЭПАНІРАВАННЕ НАВУКОВЫХ ПРАЦ**

Форма збору і распаўсюджвання навуковых прац, якая прадугледжвае захоўванне іх рукапісаў у бібліятэках ці інфармацыйных органах, апавяшчэнне чытачоў аб прынятых на захоўванне рукапісаў і высылку іх копій па запатрабаванні. Дэпаніраваныя рукапісы прыраўноўваюцца да апублікаваных дакументаў.

**ДЭСКРЫПТАР**

Лексічная адзінка інфармацыйна-пошукавай мовы, адлюстраваная інфармацыйным словам (вербальна) ці кодам, якая з'яўляецца найменнем класа сінанімічных або блізкіх па сэнсе ключавых слоў. Выкарыстоўваецца пры каардынатным індэксаванні дакументаў і інфармацыйных запытаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ДЭСКРЫПТАРНАЯ ІНФАРМАЦЫЙНА-ПОШУКАВАЯ МОВА**

Інфармацыйна-пошукавая мова, якая прызначаецца для каардынатнага індэксавання дакументаў ці інфармацыйных запытаў пры дапамозе дэскрыптараў і (ці) ключавых слоў.

**ДЭСКРЫПТАРНАЯ ІНФАРМАЦЫЙНА-ПОШУКАВАЯ СІСТЭМА**

Інфармацыйная сістэма, заснаваная на выкарыстанні дэскрыптарнай інфармацыйна-пошукавай мовы ў якасці сродкаў перадачы зместу дакументаў і іх пошуку.

**ДЭФЕКТНЫ ЭКЗЭМПЛЯР**

Экзэмпляр, якому ўласцівы які-небудзь дэфект (пашкоджанне).

## *Ё*

**ЁМІСТАСЦЬ ФОНДАСХОВІШЧА**

Гл.: Змяшчальнасць фондасховішча.

## *Ж*

**ЖАНР БІБЛІЯГРАФІЧНАГА ДАПАМОЖНІКА**

Адна з галоўных класіфікацыйных катэгорый бібліяграфічных дапаможнікаў, якая характарызуецца паўтаральнымі прыметамі.

**ЖАНРАВАЯ ВЫСТАВА**

Выстава твораў друку, арганізаваная ў межах аднаго ці некалькіх жанраў.

## *З*

**ЗАВОД**

Частка агульнага тыражу аднаго выдання, надрукаваная асобна, што адзначаецца ў выхадных даных.

**ЗАВОЧНАЕ КАМПЛЕКТАВАННЕ**

Камплектаванне, якое грунтуецца на сістэме заказаў без папярэдняга прагляду і адбору дакументаў камплектатарам бібліятэкі.

**ЗАВОЧНАЯ ЧЫТАЦКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ**

Абмеркаванне пэўных праблем на чытацкіх канферэнцыях у бібліятэках і на старонках друку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ЗАВОЧНЫ ЧЫТАЦКІ АБАНЕМЕНТ**

Форма індывідуальнага і калектыўнага абслугоўвання чытачоў па-за бібліятэкай на пэўных умовах.

**ЗАГАДЧЫК ФІЛІІ БІБЛІЯТЭКІ**

Адміністрацыйны работнік, які нясе адказнасць за дзейнасць бібліятэкі-філіі.

**ЗАГАЛОВАК (НАЗВА)**

Закончаны сказ, у якім фармулюецца змест (тэма, ідэя, прадмет, аб'ект) літаратурнага твора, часткі, раздзела, главы, параграфа ці іншага рубрыкацыйнага падраздзела выдання.

**ЗАГАЛОВАК БІБЛІЯГРАФІЧНАГА ЗАПІСУ**

Элемент бібліяграфічнага запісу, які ўтрымлівае імя асобы (загаловак індывідуальнага аўтара) ці назву арганізацыі (загаловак калектыўнага аўтара), ці абазначэнне і від дакумента (загаловак формы), ці ўніфікаваную назву або іншыя звесткі, якія размяшчаюцца перад бібліяграфічным апісаннем і выкарыстоўваюцца для ўпарадкавання і пошуку бібліяграфічных запісаў.

**ЗАГАЛОВАК ПРАДМЕТНАЙ РУБРЫКІ**

Першы элемент мнагачленнай прадметнай рубрыкі, які аддзяляецца ад наступных раздзяляльным знакам.

**ЗАГАЛОВАК ФОРМЫ**

Умоўна сфармуляваны загаловак, які ўтрымлівае назву краіны і від дакумента; дазваляе сабраць у адным месцы алфавітнага рада апісанні заканадаўчых дакументаў кожнай краіны.

**ЗАКАЗНОЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, якое выпускаецца выдавецтвам па просьбе заказчыка (арганізацыі, установы, прадпрыемства) за яго кошт, на яго матэрыялах і пры ўмове распаўсюджвання ім усяго тыражу. Прыналежнасць выдання да заказнога павінна абазначацца ў выхадных звестках.

**ЗАКАНСЕРВАВАНЫ КАТАЛОГ**

Бібліятэчны каталог, вядзенне і сістэматычнае выкарыстанне якога перапынена па пэўных прычынах, напрыклад, у сувязі з яго рэтраканверсіяй або ў выніку нязначнага звяртання да яго карыстальнікаў. Разам з тым праводзіцца работа па захаванні яго ў належнай форме.

**ЗАКЛЮЧЭННЕ**

Апошняя, заключная, частка твора, у якой падводзяцца вынікі, робяцца абагульненні і высновы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ЗАЛІШНЯЯ ПАЎНАТА ФОНДУ**

Наяўнасць у фондзе залішняй колькасці малавыкарыстоўваемых дакументаў, у тым ліку тых, якія не зусім адпавядаюць профілю фонду і рэальным запытам чытачоў.

**ЗАМЕНА ДАКУМЕНТА**

Уключэнне ў фонд замест згубленага дакумента яго копіі, аднайменнага экзэмпляра ці раўназначнага яму дакумента.

**ЗАМЕНА КАРТАК**

Адзін з працэсаў вядзення бібліятэчнага каталога: замена ў каталогу старых картак на новыя з мэтай паляпшэння якасці каталога (замяняюцца пацёртыя, зношаныя карткі, карткі з дрэнна чытаемымі літарамі).

**ЗАНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Універсальная бібліятэка, якая выконвае функцыі каардынацыйнага навукова-метадычнага і даследчага цэнтра, а таксама цэнтра МБА для бібліятэк вызначанага рэгіёна (часткі тэрыторыі краіны, вобласці, горада, раёна).

**ЗАПАС ТРЫВАЛАСЦІ ФОНДУ**

Здольнасць фонду забяспечваць попыт чытачоў без павелічэння долі адмоў пры значным росце колькасці чытачоў і пашырэнні тэматыкі іх запытаў. Забяспечваецца часткаю фонду, які не выкарыстоўваецца.

**ЗАПЫТ АБАНЕНТА**

Вуснае ці пісьмовае патрабаванне абанента (чытача) на прадастаўленне яму пэўнай паслугі, напрыклад выдачу дакумента з фонду.

**ЗАПЫТ КАРЫСТАЛЬНІКА БІБЛІЯТЭКІ**

Патрабаванне карыстальніка бібліятэкі на прадастаўленне бібліятэчна-бібліяграфічнай паслугі **(3.2.2.17)**.

**ЗАСТАНОЎКА**

Памылковае месцазнаходжанне дакумента ў фондзе ці каталожнай карткі ў каталогу.

**ЗАЎВАГА**

1. Кароткае тлумачэнне і ўдакладненне пэўных месцаў асноўнага тэксту твора, выдання ці дадатку да яго, якое належыць аўтару, перакладчыку, рэдактару і г.д. У залежнасці ад размяшчэння бывае ўнутрытэкставай (размешчанай услед за тэкстам, да якога адносіцца, звычайна ў круглых дужках), падрадковай (размешчанай унутры паласы, тэкст якой тлумачыць), пазатэкставай (размешчанай у канцы главы, кнігі).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Элемент бібліяграфічнага апісання, які адлюстроўвае дадатковыя звесткі аб выданні, што адносяцца да асобных галін бібліяграфічнага апісання ці выдання ўвогуле.

**ЗАХАВАНАСЦЬ ФОНДУ**

Забеспячэнне цэласнасці і нармальнага фізічнага стану дакументаў, якія захоўваюцца ў фондзе. Ствараецца правільным утрыманнем фонду і аховай яго ад псавання і растрачвання. З. ф. забяспечвае падтрыманне нарматыўных параметраў светлавога, вільготна-цеплавога і санітарна-гігіенічнага рэжымаў.

**ЗАХОЎВАННЕ ФОНДУ**

Комплекс мерапрыемстваў, якія забяспечваюць найбольш рацыянальнае размяшчэнне фонду і яго працяглую захаванасць з мэтай выкарыстання. З. ф. уключае: падрыхтоўку памяшканняў і абсталявання для размяшчэння фонду, расстаноўку на паліцах, стварэнне аптымальных фізіка-хімічнага і біялагічнага рэжымаў.

**ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ ТЭКСТАМ**

Псіхалагічны настрой чытача, пры якім узнікае канцэнтрацыя міжвольнай увагі са станоўчым эмацыянальным тонам чытання. Характарызуецца аптымальным узроўнем працэсаў успрымання, мыслення, запамінання, уяўлення. Адрозніваюць сітуацыйную З. т., якая вызначаецца сукупнасцю знешніх стымулаў, і асабістую як праяўленне ўстойлівых уласцівасцей асобы (інтарэсаў, здольнасцей).

**ЗБАЛАНСАВАНАЕ КАМПЛЕКТАВАННЕ**

Камплектаванне бібліятэчнага фонду, якое забяспечвае нязменнасць яго аб'ёму, г. зн. роўнасць колькасці дакументаў, што паступаюць у фонд і выключаюцца з яго. Гэта дапушчальна толькі пры існуючым на практыцы абсалютным пастаянстве аб'ёму і саставу чытацкіх патрабаванняў, таму сама ідэя З. к. з'яўляецца памылковай.

**ЗБОР ТВОРАЎ**

Аднатомнае ці шматтомнае выданне, якое змяшчае ўсе або значную частку твораў аднаго або некалькіх аўтараў, што дае ўяўленне аб іх творчасці ў цэлым.

**ЗБОРНІК**

Выданне, якое змяшчае некалькі твораў. У залежнасці ад перыядычнасці адрозніваюць перыядычныя, неперыядычныя і выданні, якія прадаўжаюцца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ЗБОРНЫ КАТАЛОГ**

Бібліятэчны каталог, які адлюстроўвае фонды некалькіх самастойных бібліятэк ці бібліятэчнай сеткі рэгіёна (галіны). Пры дапамозе сіглаў (умоўных абазначэнняў бібліятэк-удзельніц) у З.к. указваецца месцазнаходжанне дакумента.

**ЗВАРОТ ДАКУМЕНТА**

1. Зварот чытачом узятага ў бібліятэцы дакумента згодна з устаноўленым тэрмінам.

2. Бібліятэчны тэхналагічны працэс, пры якім бібліятэкар дакументальна афармляе прыняты ад чытача дакумент.

**ЗВЕСТКІ АБ АДКАЗНАСЦІ**

Звесткі аб асобах ці арганізацыях, якія ўдзельнічалі ў стварэнні твора.

**ЗВЕСТКІ ДА ЗАГАЛОЎКА**

Звесткі, што раскрываюць і паясняюць асноўны загаловак, а таксама ўдакладняюць характар і прызначэнне выдання.

**ЗВЫШАКТЫЎНАЯ ЧАСТКА ФОНДУ**

Фонд, што складаецца з дакументаў, фактычная абарачальнасць якіх перавышае сярэднюю.

**ЗМЕННЫ ЗАГАЛОВАК**

Зменeная назва часткі, раздзела, главы, параграфа твора ці іншага рубрыкацыйнага падраздзела выдання на іншую з ведама аўтара.

**ЗМЕСТ**

Элемент апарату выдання, які ўяўляе сабой пералік загалоўкаў твораў, надрукаваных у выданні, ці прозвішчаў аўтараў і загалоўкаў публікуемых твораў, а таксама загалоўкаў раздзелаў, у якіх творы згрупаваны (з указаннем старонак, на якіх пачынаецца кожны твор ці раздзел).

**ЗМЕШАНАЯ ІНДЭКСАЦЫЯ**

Індэксацыя, у якой класіфікацыйныя індэксы абазначаюцца літарамі і лічбамі ў розных спалучэннях (поруч з матэматычнымі, пунктуацыйнымі і іншымі знакамі).

**ЗМЯШЧАЛЬНАСЦЬ ФОНДАСХОВІШЧА**

Колькасная характарыстыка аб’ёму фондасховішча; вызначаецца максімальнай колькасцю дакументаў, якія могуць быць размешчаны ў фондасховішчы.

Сін.: Ёмістасць фондасховішча.

**ЗНАК**

Матэрыяльны прадмет (з’ява, дзеянне, падзея), які выступае ў працэсе камунікацыі як прадстаўнік другога прадмета,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

уласцівасці або адносін і выкарыстоўваецца для перадачы, перапрацоўкі і захавання інфармацыі (**3.1.1**).

**ЗНАКІ ВА УДК**

Сістэма азначэнняў УДК, якая ўключае апазнавальныя, сінтаксічныя, раздзяляльныя і іншыя знакі і сімвалы: знак роўнасці (апазнавальны знак абазначэння мовы); круглыя дужкі, нуль (апазнавальны знак абазначэння формы); круглыя дужкі (апазнавальны знак абазначэння месца); круглыя дужкі, знак роўнасці (апазнавальны знак абазначэння народаў); двукоссе (апазнавальны знак абазначэння часу); дэфіс, нуль (апазнавальны знак абазначэння асоб і матэрыялаў); кропка, нуль (апазнавальны знак спецыяльных (аналітычных) абазначэнняў); апостраф (апазнавальны знак спецыяльных сінтэтычных абазначэнняў); шматкроп'е перад лічбамі (тыпавы працяг); знак прыбаўлення – плюс (сінтэтычны знак: камбінаванне двух ці больш індэксаў, што абазначаюць незалежныя паняцці); знак распаўсюджанасці – косая рыска (сінтэтычны знак: камбінаванне двух ці больш індэксаў, якія стаяць у радзе непасрэдна адзін за другім і абазначаюць незалежныя паняцці); знак адносін – двукроп'е (камбінаванне двух ці болей індэксаў, што абазначаюць паняцці, звязаныя рознымі адносінамі); знак, які фіксуе парадак – двайное двукроп'е (сінтэтычны знак: знак замацавання паслядоўнасці двух ці больш элементаў у састаўным парадку); знак групоўкі – квадратныя дужкі (знак сэнсавага групавання ўнутры камбінаванага індэкса); знак запазычанай натацыі, зорачка, астэрыск (1) знак дабаўлення да індэкса УДК слова, сімвала ці лічбы з іншых класіфікацыйных сістэм, акрамя УДК; 2) знак, які абазначае індэкс УДК для ўнутранага прымянення, не зацверджаны Міжнароднай федэрацыяй па дакументацыі); знак кангруэнтнасці (знак, які абазначае паралельнае падраздзяленне класа); стрэлка (знак, які азначае «гл.» ці «гл. таксама»); кропка (раздзяляльны знак, які ставіцца пасля кожнай трэцяй лічбы індэкса для зручнасці чытання).

**ЗНАКІ Ў ББК**

Сістэма абазначэнняў, якая прымяняецца ў базе індэксацый ББК, амаль цалкам адпавядае практыцы УДК, але выкарыстоўвае і некаторыя дадатковыя знакі: знак роўнасці (адметная прымета пры абазначэнні моўных паняццяў); круглыя дужкі (адметная прымета індэксаў, тэрытарыяльных тыпавых



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзяленняў); круглыя дужкі і знак роўнасці (адметная прымета этнічных тыпавых дзяленняў); двукоссе (адметная прымета пэўных храналагічных дат, уключаных у індэкс); дэфіс (адметная прымета спецыяльных тыпавых дзяленняў); двукроп'е (камбінаванне класіфікацыйных індэксаў); кропка (раздзяляльны знак, які выкарыстоўваецца пасля кожнай групы лічбаў з трох знакаў і паміж літарамі); працяжнік (вызначае «ад–да» пры індэксах храналагічных дат); плюс (камбінаванне двух ці больш індэксаў у поўным індэксе); кропка з коскай (як і знак «плюс», у агульнай методыцы сістэматызацыі); косая рыска (у здвоеных індэксах, у значэнні «ад–да»). У дапаўненнях да табліц ББК уведзены апазнавальны знак «зорачка на радку» для абазначэння індэксаў плана размяшчэння.

**ЗНОСІНЫ БІБЛІЯТЭКАРА З ЧЫТАЧОМ**

Камунікацыя людзей у працэсе бібліятэчнага абслугоўвання, у тым ліку міжасабовыя і прафесійныя зносіны бібліятэкараў.

**ЗНОСКА**

Элемент апарату выдання, які змяшчае дапаможны тэкст паясняльнага ці даведачнага характару (бібліяграфічныя спасылкі, заўвагі); змяшчаецца звычайна ў нізе паласы старонкі і звязаны з тэкстам знакам зноскі – лічбавым нумарам або астэрыскам.

## *І*

**ІДЭАГРАФІЧНЫ СЛОЎНІК**

Лінгвістычны слоўнік, у якім словы размешчаны па іх сэнсавай блізкасці.

**ІДЭНТЫФІКАТАР**

Элемент, што складаецца з аднаго ці некалькіх слоў або сімвалаў, які непасрэдна папярэднічае падполю, па якім можна знайсці запіс у БД.

**ІДЭНТЫФІКАЦЫЯ**

Распазнаванне аб'ектаў; працэс вызначэння тоеснасці аб'екта з адным з вядомых сістэме аб'ектаў. У каталагізацыі – працэс вызначэння тоеснасці і распазнавання аб'екта каталагізацыі па БЗ, які прадстаўляе гэты аб'ект у БД.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ІДЭНТЫФІКУЮЧЫЯ ПРЫМЕТЫ**

Звесткі, якія ўдакладняюць загаловак БЗ: даты, спецыяльнасць, тытул, нумар, геаграфічная назва і г.д.

**ІЕРАРХІЧНАЯ БАЗА ДАНЫХ**

База даных, заснаваная на іерархічнай мадэлі арганізацыі.

**ІЕРАРХІЧНАЯ БІБЛІЯТЭЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ КЛАСІФІКАЦЫЯ**

Класіфікацыйная сістэма, у якой паняцці бібліяаб'ектаў размеркаваны па класах у адпаведнасці з іерархічнымі адносінамі.

**ІЕРАРХІЧНАЯ КЛАСІФІКАЦЫЯ**

Класіфікацыйная сістэма, у якой паняцці раздзелены па класах з адносінамі падпарадкавання і супадпарадкавання (рода-відавымі адносінамі).

**ІЕРАРХІЧНАЯ НАТАЦЫЯ**

Стуктурная натацыя, індэксы якой адлюстроўваюць іерархічныя адносіны паміж класамі.

**ІЕРАРХІЧНАЯ СТРУКТУРА**

Класіфікацыйная структура, заснаваная на адносінах падпарадкавання.

**ІЛЮСТРАВАНАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, якое змяшчае ілюстрацыі.

**ІЛЮСТРАВАНЫ КАТАЛОГ**

Каталог у карткавай, кніжнай, электроннай форме, у якім бібліяграфічныя запісы суправаджаюцца ілюстрацыямі.

**ІЛЮСТРАЦЫЯ**

Выява (малюнак, фатаграфія, схема, чарцёж і г.д.), што паясняе, дапаўняе тэкст і забяспечвае маляўнічасць выдання.

**ІМІДЖ**

Вобраз арганізацыі ці чалавека, які ствараецца сродкамі масавай і прафесійнай камунікацыі; імі самімі; карыстальнікамі, грамадскімі аб'яднаннямі грамадзян.

**ІМЯННЫ ДАПАМОЖНЫ ПАКАЗАЛЬНІК**

Дапаможны паказальнік, які ўяўляе сабой алфавітны пералік прозвішчаў і імёнаў асоб, што ўпамінаюцца ў бібліяграфічных запісах асноўнай часткі бібліяграфічнага дапаможніка.

**ІМЯННЫ ПАКАЗАЛЬНІК (СПІС) ДА ВЫДАННЯ**

Паказальнік (спіс), які ўяўляе сабой пералік прозвішчаў, імёнаў асоб, якія ўпамінаюцца ў тэксце выдання, з адсылкай да адпаведных старонак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ІНВЕНТАРНАЯ КНІГА**

Першасны ўліковы дакумент, прызначаны для індывідуальнага ўліку твораў друку і іншых матэрыялаў, што паступілі ў фонд бібліятэкі або выбылі з яго, а таксама для кантролю за іх захоўваннем. Усё часцей замяняецца на больш зручны ўліковы каталог.

**ІНВЕНТАРНАЯ РАССТАНОЎКА ФОНДУ**

Фармальная расстаноўка ў парадку ўзрастання інвентарных нумароў дакументаў; часцей за ўсё спалучаецца з фарматнай.

**ІНВЕНТАРНЫ НУМАР**

Нумар, які прысвойваецца экзэмпляру ці назве твора друку і іншым матэрыялам пры інвентарызацыі фонду.

Гл.: Інвентарызацыя фонду.

**ІНВЕНТАРЫЗАЦЫЯ ФОНДУ**

Від індывідуальнага ўліку фонду, які заключаецца ў рэгістрацыі дакументаў на аснове традыцыйнай і (ці) электроннай тэхналогіі ва ўліковым дакуменце (ўліковым каталогу, інвентарнай кнізе і інш.) і забяспечваецца інвентарным нумарам.

**ІНВЕРСІЯ Ў ПРАДМЕТНАЙ РУБРЫЦЫ**

Змяненне парадку слоў для вылучэння слова, якое нясе максімальную сэнсавую нагрузку, у пазіцыю вядучага слова прадметнай рубрыкі ці першаснага слова ў падзагаловак шматчленнай прадметнай рубрыкі. Дазваляе аб'ядноўваць паняцці ў комплексы, падаючы ў адным месцы прамыя і інверсіяваныя рубрыкі і падрубрыкі.

**ІНВЕРСІЯ ФАСЕТАЎ**

Прынцып, згодна з якім парадак распалажэння фасетаў з'яўляецца адваротным прынятаму ў фасетнай (класіфікацыйнай) форме.

**ІНДЫВІДУАЛЬНАЕ БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ ІНФАРМАВАННЕ**

Інфармацыйная дзейнасць бібліятэк, якая накіравана на задавальненне інфармацыйных патрэб асобных чытачоў. Гэтым мэтам адпавядаюць віды ВРІ, ДАК.

**ІНДЫВІДУАЛЬНАЕ ІНФАРМАВАННЕ**

Інфармаванне карыстальніка ў адпаведнасці з яго патрэбнасцямі **(3.2.2.8)**.

**ІНДЫВІДУАЛЬНАЯ АПРАЦОЎКА**

Метад бібліяграфічнай апрацоўкі твораў друку ці іншых матэрыялаў, пры якім апрацоўваецца кожны экзэмпляр кожнай назвы дакумента.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ІНДЫВІДУАЛЬНАЯ РАБОТА З ЧЫТАЧОМ**

Ужыванне дыялогавых формаў зносін паміж бібліятэкарам і чытачом з мэтай задавальнення патрэб апошняга ў дакументах, інфармавання, развіцця яго творчасці і г.д. пры максімальным захаванні суверэнітэту чытача.

**ІНДЫВІДУАЛЬНЫ АБАНЕМЕНТ**

Форма арганізацыі абслугоўвання на абанеменце.

Гл.: Абанемент.

**ІНДЫВІДУАЛЬНЫ АЎТАР**

Асоба, якая стварыла твор самастойна ці ў суаўтарстве з іншымі асобамі.

**ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ПЛАН ЧЫТАННЯ**

Бібліяграфічны спіс кніг па вызначанай тэме для чытання ў пэўнай паслядоўнасці, які ўлічвае ўзрост чытача, яго асабістыя якасці, зацікаўленасць, падрыхтоўку да разумовай працы, патрэбы. Часцей за ўсё складаецца бібліятэкарам для дзіцячага чытача.

**ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ЎЛІК ФОНДУ**

Улік кожнага асобнага экзэмпляра ці кожнай назвы дакумента, што паступае ў бібліятэку. Асноўныя віды І. у. – інвентарызацыя фонду, улік з дапамогай уліковай кнігі і каталога і інш.

**ІНДЭКС**

Азначэнне класа (паняцця) сродкамі натацыі класіфікацыйнай сістэмы; умоўны знак (слова, словазлучэнне, лічба, літарны ці літарна-лічбавы код), які вызначае пэўнае паняцце і выкарыстоўваецца для запісу вынікаў класіфікавання, а таксама ідэнтыфікацыі аб’ектаў пошуку ў інфармацыйна-пошукавых сістэмах.

**ІНДЭКС УДК**

Дзесятковы індэкс, які азначае клас у асноўнай ці дапаможнай табліцы УДК.

**ІНДЭКС ФАЙЛА**

Нумар індэкснага дэскрыптара файла.

**ІНДЭКСАТАР**

Асоба, што здзяйсняе індэксаванне дакументаў.

**ІНДЭКСАЦЫЯ**

Сістэма ўмоўных абазначэнняў (лічбаў, літар, матэматычных, пунктуацыйных і іншых знакаў), якія выкарыстоўваюцца пры сістэматызацыі дакументаў для выяўлення класіфікацыйных індэксаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ІНДЭКСАВАННЕ**

Перадача зместу дакумента і (ці) сэнсу інфармацыйнага запыту на інфармацыйна-пошукавай мове.

**ІНДЭКСНЫ ФАЙЛ**

Файл, які забяспечвае доступ да запісу па ключы: лагічны ці фізічны адрас.

**ІНІЦЫЯЛ**

Пачатковая літара вялікага памеру, якая размешчана ў пачатку тэксту кнігі, главы ці іншай часткі выдання.

**ІНКУНАБУЛА**

Кніга ранняга перыяду кнігадрукавання (ад 40-х гадоў XV ст. да 1 студзеня 1501 г.).

**ІНСТРУКЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ДАКУМЕНТАЦЫЯ**

Комплекс дакументаў, які ўтрымлівае прафесійныя нарматывы, кіраўнічыя і метадычныя парады, якія рэгулююць тэхналогію, парадак і спосабы выканання розных бібліятэчна-інфармацыйных працэсаў.

**ІНСТРУКЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ ЛІСТ**

Метадычнае выданне аператыўнага характару, якое змяшчае пэўныя рэкамендацыі па асобных практычных пытаннях бібліятэчнай работы.

**ІНСТРУКЦЫЯ**

Афіцыйнае або нарматыўнае вытворча-практычнае выданне, якое змяшчае правілы па рэгуляванні вытворчай і грамадскай дзейнасці або па карыстанні выбарамі ці паслугамі.

**ІНТЭГРАВАНАЯ АПРАЦОЎКА ДАНЫХ**

Прынцып арганізацыі апрацоўкі даных у аўтаматызаванай сістэме, пры якім працэсы або аперацыі ў розных арганізацыях, падраздзяленнях ці ўчастках тэхналагічнага ланцужка аб'ядноўваюцца ці аптымізуюцца з мэтай павышэння эфектыўнасці сістэмы.

**ІНТЭГРАВАНАЯ СІСТЭМА**

Аўтаматызаваная сістэма, якая забяспечвае розныя (інфармацыйныя, вылічальныя і іншыя) патрэбнасці карыстальнікаў і падтрымлівае адзіны парадак узаемадзеяння з карыстальнікамі. Складальнікамі інтэграваных сістэм з'яўляюцца інтэграваныя базы даных, арганізацыйна-тэхналагічны прынцып аднаразовай апрацоўкі даных для шматразовага і шматфункцыянальнага іх выкарыстання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ІНТЭР'ЕР БІБЛІЯТЭКІ**

Унутраная аб'ёмна-планіровачная арганізацыя бібліятэчных памяшканняў і комплексу бібліятэчнага абсталявання, якая ўспрымаецца ў адзінстве функцыянальнага і эстэтычнага прызначэння.

**ІНТЭРФЕЙС**

Сукупнасць сродкаў і правіл узаемадзеяння аб'ектаў інфармацыйнай сістэмы. Інтэлектуальны І. – правілы ўзаемадзеяння карыстальніка з прыстасаваннямі аўтаматызаванай апрацоўкі звестак.

**ІНФАРМАВАННЕ**

Забеспячэнне інфармацыяй зацікаўленых карыстальнікаў **(3.2.2.6)**.

**ІНФАРМАТЫЗАЦЫЯ**

Комплекс мер, накіраваных на забеспячэнне аператыўнага доступу да інфармацыйных рэсурсаў **(3.1.26)**.

Поўнае і своечасовае выкарыстанне ведаў (звестак) ва ўсіх галінах універсума чалавечай дзейнасці ў асноўным сродкамі электроннай тэхналогіі; выкарыстанне магчымасцей ЭВМ і навейшых сродкаў сувязі і камунікацыі для ўстойлівага развіцця чалавецтва.

**ІНФАРМАТЫКА**

Навуковая дысцыпліна, якая вывучае структуру і ўласцівасці навуковай інфармацыі, тэорыю, гісторыю, арганізацыю, тэхналогію вытворчасці і распаўсюджання, выкарыстанне інфармацыі, інфармацыйную дзейнасць, кнігагандлёвую, бібліятэчную справу і інш.

**ІНФАРМАЦЫЙНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ**

Забеспячэнне спажыўцоў неабходнай інфармацыяй, якое ажыццяўляецца інфармацыйнымі органамі і службамі шляхам прадастаўлення інфармацыйных паслуг **(3.2.2.1)**.

**ІНФАРМАЦЫЙНАЕ АСЯРОДДЗЕ**

Наяўнасць інфармацыі вакол чалавека і яго інфармацыйная дзейнасць. І.а. разглядаецца як сфера дзейнасці суб'ектаў, звязаная са стварэннем, пераўтварэннем, спажываннем інфармацыі.

**ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, што змяшчае сістэматызаваныя звесткі аб друкаваных або недрукаваных дакументах у форме, зручнай для хуткага азнаямлення. Выпускаецца ці рыхтуецца арганізацыямі, якія ажыццяўляюць інфармацыйную дзейнасць. І. в. можа

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

быць бібліяграфічным, рэфератыўным ці аглядным, неперыядычным, перыядычным ці выданнем з працягам.

**ІНФАРМАЦЫЙНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ**

Сукупнасць інфармацыйна-бібліяграфічных рэсурсаў і паслуг для задавальнення доўгатэрміновых патрэбнасцей у інфармацыі (**3.2.2.12**).

**ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ**

Сукупнасць інфармацыйных рэсурсаў і паслуг, якія прадстаўляюцца для вырашэння кіраўніцкіх і навукова-тэхнічных задач у адпаведнасці з этапамі іх выканання (**3.2.2.11**).

**ІНФАРМАЦЫЙНА-ПОШУКАВАЯ МОВА (ІПМ)**

Штучная мова, якая прызначаецца для адлюстравання зместу дакументаў ці запытаў або апісання фактаў з мэтай далейшага пошуку.

**ІНФАРМАЦЫЙНА-ПОШУКАВАЯ СІСТЭМА (ІПС)**

Сукупнасць інфармацыйна-пошукавага масіву, інфармацыйна-пошукавай мовы, правіл яе выкарыстання, крытэрыяў выдачы і тэхнічных сродкаў, якая прызначана для інфармацыйнага пошуку.

**ІНФАРМАЦЫЙНА-ПОШУКАВЫ МАСІЎ**

Упарадкаваная сукупнасць дакументаў, фактаў ці звестак аб іх, прызначаная для інфармацыйнага пошуку.

**ІНФАРМАЦЫЙНА-ПОШУКАВЫ ТЭЗАЎРУС**

Нарматыўны слоўнік дэскрыптараў і ключавых слоў з зафіксаванымі парадыгматычнымі зносінамі, які прызначаецца для каардынацыйнага індэксавання дакументаў і інфармацыйных запытаў.

**ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ**

Сукупнасць працэсаў генерыравання, збору, пераўтварэння, кадзіравання і дэкадзіравання, захавання, пошуку, распаўсюджання і выкарыстання інфармацыі, якая ажыццяўляецца спецыялізаванымі інфармацыйнымі ўстановамі (бібліятэкамі, інфармацыйнымі цэнтрамі, органамі НТІ і інш.), а таксама асобнымі людзьмі ці групамі.

**ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ІНФРАСТРУКТУРА**

Сукупнасць інфармацыйных цэнтраў, банкаў даных, сістэм сувязі, што забяспечвае доступ спажыўцоў да інфармацыйных рэсурсаў (**3.1.34**).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ІНФАРМАЦЫЙНАЯ КАРТКА**

Спецыяльны бланк, які мае стандартную форму для запаўнення і ўтрымлівае звесткі аб новых вырабах, тэхналагічных працэсах, выніках навукова-даследчай ці практычна-канструктарскай работы, вынаходствах, рацыяналізатарскіх прапановах і г.д. І. к. складаюцца на прадпрыемствах і ва ўстановах, якія выпускаюць вырабы ці выконваюць работы, што апісваюцца і характарызуюцца ў картках, і дасылаюцца ў пэўныя інфармацыйныя органы, фонды і г.д.

**ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ПАСЛУГА**

Прадастаўленне інфармацыі пэўнага віду спажыўцу па яго запыце (**3.2.2.13**).

**ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ПАТРЭБА**

Патрэбнасць асобы, калектыву ці якой-небудзь сістэмы, якая выражаецца ў неабходнасці атрымання пэўнай інфармацыі.

**ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ПРАДУКЦЫЯ**

Дакументы, інфармацыйныя масівы, базы даных і інфармацыйныя паслугі, якія з'яўляюцца вынікам функцыянавання інфармацыйных сістэм (**3.3.1.4**).

**ІНФАРМАЦЫЙНАЯ СІСТЭМА**

Сістэма, якая прызначана для захоўвання, апрацоўкі, пошуку, распаўсюджвання, перадачы і прадастаўлення інфармацыі (**3.1.30**).

**ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ТЭХНАЛОГІЯ**

Сукупнасць метадаў, вытворчых працэсаў і праграмна-тэхнічных сродкаў, якія аб'яднаны ў тэхналагічны комплекс, што забяспечвае збор, стварэнне, захоўванне, назапашванне, апрацоўку, пошук, вывад, капіраванне, перадачу і распаўсюджванне інфармацыі (**3.2.1.1**).

**ІНФАРМАЦЫЙНЫ АНАЛІЗ**

Выяўленне ў дакументах і фіксацыя ў выглядзе даных інфармацыі, што адносіцца да пэўнай прадметнай галіны (**3.1.29**).

**ІНФАРМАЦЫЙНЫ БАР'ЕР**

Сукупнасць разнастайных перашкод (моўны бар'ер, цяжкасці ў атрыманні неабходных дакументаў і г.д.), якія ўзнікаюць на шляху распаўсюджвання інфармацыі.

**ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЗАПЫТ**

Запыт, які адлюстроўвае інфармацыйную патрэбу пры звяртанні ў сістэму навукова-тэхнічнай інфармацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ІНФАРМАЦЫЙНЫ МАНІТОРЫНГ**

Сукупнасць працэсаў па адсочванні дынамікі і аналізу развіцця інфармацыйных патокаў, па зборы і тэхнічнай апрацоўцы дакументаў, якія дапускаюць рэгістрацыю, абагульненне, апісанне змяненняў змястоўнага і арганізацыйна-тэхналагічнага характару.

**ІНФАРМАЦЫЙНЫ МАРКЕТЫНГ**

Від інфармацыйна-ўпраўленчай дзейнасці па вывучэнні і аптымізацыі інфармацыйнага рынку і актыўнага ўздзеяння на спажывецкі запыт з мэтай збыту тавараў і паслуг; уключае выяўленне і фарміраванне інфармацыйных патрэбнасцей, мэтавай аўдыторыі, попыту на прадукцыю і паслугі, іх рэкламаванне і г.д.

**ІНФАРМАЦЫЙНЫ МАСІЎ**

Сукупнасць даных (крыніц інфармацыі), якія захоўваюцца ў запамінальным прыстасаванні, пэўным сховішчы дакументаў.

**ІНФАРМАЦЫЙНЫ МЕНЕДЖМЕНТ**

Арганізаванае кіраванне работай прадпрыемства, фірмы або аб'яднання, якое ажыццяўляецца на аснове комплекснага выкарыстання ўсіх відаў інфармацыі, што маюцца як на прадпрыемстве, у фірме ці аб'яднанні, так і за яго межамі **(3.4.1.2)**.

**ІНФАРМАЦЫЙНЫ ПОШУК**

Дзеянні, метады і працэдуры, якія дазваляюць ажыццявіць адбор пэўнай інфармацыі з масіву даных.

**ІНФАРМАЦЫЙНЫ РЫНАК**

Сістэма эканамічных, арганізацыйных і прававых адносін, якія рэгулююць вытворчасць і спажыванне інфармацыйнай прадукцыі.

**ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЦЭНТР**

Арганізацыя, якая выконвае функцыі па зборы, аналітыкасінтэтычнай перапрацоўцы і распаўсюджванні інфармацыі **(3.4.1.3)**.

**ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ РЭСУРСЫ**

Сукупнасць даных, якія арганізаваны для эфектыўнага атрымання дакладнай інфармацыі **(3.3.1.1)**.

**ІНФАРМАЦЫЯ**

Звесткі, якія ўспрымаюцца чалавекам і (або) спецыяльным прыстасаваннем як адлюстраванне фактаў матэрыяльнага ці духоўнага свету ў працэсе камунікацыі **(3.1.19)**.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ІНФАРМАЦЫЯ АБ КАТАЛОГАХ**

Сістэма мерапрыемстваў, якая дае магчымасць распаўсюджваць звесткі аб складзе, структуры, змесце, размяшчэнні каталогаў, правілах карыстання імі.

## *К*

**КААПЕРАВАННЕ Ў БІБЛІЯТЭЧНАЙ СПРАВЕ**

Аб’яднанне рэсурсаў бібліятэк для вырашэння пэўных задач у галіне бібліятэчнай справы. Можа быць часовым і пастаянным; унутрыраённым, унутрыгарадскім, унутрыабласным (асабліва пры камплектаванні фондаў і абслугоўванні чытачоў); міжраённым (каапераванне бібліяграфічнай, навукова-метадычнай, навукова-даследчай работы); унутрыгаліновым ці міжгаліновым. Бывае функцыянальным, калі бібліятэкі аб’ядноўваюцца для задавальнення пэўных відаў інфармацыйных запытаў.

**КААПЕРАТЫЎНАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Бібліятэка, якая арганізавана на падставе асабістых (прыватных) збораў дакументаў; прапануе свае фонды для карыстання за плату.

**КААПЕРАЦЫЯ ПРАЦЫ Ў БІБЛІЯТЭЦЫ**

Сумесны ўдзел супрацоўнікаў бібліятэкі ў адным ці розных, але звязаных паміж сабой працэсах працы. Забяспечваецца фарміраваннем устойлівых адміністрацыйна-вытворчых кантактаў паміж markdown рознымі спецыялістамі як унутрыструктурных падраздзяленняў, так і паміж падраздзяленнямі.

**КААРДЫНАВАНАЕ КАМПЛЕКТАВАННЕ**

Камплектаванне, заснаванае на пагадненні паміж дзвюма або некалькімі бібліятэкамі аб размеркаванні набыцця дакументаў паводле іх тэматыкі і відаў у мэтах ліквідацыі неапраўданага дубліравання і павелічэння сукупнасці набываемых дакументаў.

Сін.: Узгодненае камплектаванне.

**КААРДЫНАТНАЕ ІНДЭКСАВАННЕ**

Індэксаванне шляхам пералічэння ключавых слоў ці дэскрыптараў.

**КААРДЫНАЦЫЯ БІБЛІЯТЭЧНАЙ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ РАБОТЫ**

Сістэматычнае ўзгадненне навукова-даследчых работ у галіне бібліятэчнай справы незалежна ад ведамаснай падпа-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

радкаванасці ўстаноў з мэтай дасягнення найбольш эфектыўнага вырашэння складаных праблем. Практычная дзейнасць К. б. н.-д. р. ажыццяўляецца па розных напрамках: навукова-арганізацыйная работа, метадычная дапамога бібліятэчна-бібліяграфічным установам, у якіх вядзецца навуковая работа. Функцыі цэнтра бібліятэчнай навукова-даследчай работы выконвае Нацыянальная бібліятэка Беларусі.

**КААРДЫНАЦЫЯ Ў БІБЛІЯТЭЧНАЙ СПРАВЕ**

Узгодненае раздзяленне бібліятэчнай работы для сумеснага выкарыстання бібліятэчных рэсурсаў. К. спрыяе ліквідацыі ведамаснай разрозненасці. Можа быць функцыянальнай (узгадняецца галіна дзейнасці), комплекснай (каардынуюцца ўсе асноўныя напрамкі бібліятэчнай работы). Асноўныя формы К.: сумеснае планаванне, каардынацыя планаў работы, пагадненне аб спецыялізацыі і кааперыраванні.

**КАДР**

Здымак на фота- ці кінаплёнцы, які мае стандартныя памеры.

**КАДЗІРАВАННЕ ІНФАРМАЦЫІ**

Працэс пераўтварэння і (або) прадстаўлення даных **(3.2.1.5)**.

**КАЛАФОН**

Тэкст апошняй старонкі рукапісных і старадрукаваных кніг, які змяшчае звесткі пра назву кнігі, яе аўтара, месца і час перапісвання (ці друкавання), перапісчыка, друкара і інш.

**КАЛЕКТЫЎНЫ АЎТАР**

Арганізацыя пастаяннага ці часовага характару, якая друкуе свае афіцыйныя матэрыялы, зборнікі прац супрацоўнікаў і іншыя выданні, што маюць прыватную назву, якая дазваляе яе ідэнтыфікацыю незалежна ад маштабу дзейнасці і тэрміну існавання. Да іх адносяцца таксама часовыя групы і падзеі, напрыклад нарады, канферэнцыі, кангрэсы і г.д.

**КАЛЕКТЫЎНЫ КАРЫСТАЛЬНІК**

Юрыдычная асоба, якая карыстаецца паслугамі бібліятэкі на аснове афіцыйнага запісу (зарэгістравана ў адпаведнасці з існуючай у бібліятэцы тэхналогіяй).

**КАЛЕКТЫЎНЫ ТВОР**

Твор, напісаны калектыўным аўтарам.

**КАЛЕКЦЫЙНА-ЗБІРАЛЬНЫЯ КЛУБЫ**

Гл.: Клубы па чытацкай накіраванасці.

**КАЛОНТЫТУЛ**

Даведачны тэкст над асноўным тэкстам паласы (зрэдку збоку ці знізу), які паведамляе чытачу аб матэрыялах, што надру-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каваны на старонцы (у зборніку – які твор і якога аўтара, у монавыданні – да якога раздзела і падраздзела твора адносіцца тэкст старонкі, у слоўніку – якія словы або словы на якія пачатковыя літары ці літару растлумачаны ці змешчаны на старонцы).

**КАЛЯНДАР**

Перыядычна-даведачнае выданне, якое змяшчае паслядоўны пералік дзён, тыдняў, месяцаў года, а таксама іншыя звесткі рознабаковага характару. К. могуць быць штогоднікамі, штомесячнікамі, штотыднёвікамі, могуць выпускацца аднаразова.

**КАЛЯНДАР ЗНАМЯНАЛЬНЫХ ДАТ**

Каляндар-штогоднік (штоквартальнік, штомесячнік, штотыднёвік), які ўключае выбарачна пералік дзён года, звязаных з памятнымі падзеямі (датамі) і звесткі аб гэтых падзеях.

**КАЛЯРОВЫ ДЫЯПАЗІТЫЎ**

Пазітыўнае фатаграфічнае стварэнне вобраза на святлоадчувальным слоі з празрыстай падкладкай (шкло ці плёнка), якое прызначана для разгляду на прасвет ці праецыравання на экран. Вырабляецца ў выглядзе ці асобных кадраў ці серыі кадраў на плёнцы, аб'яднаных агульнай тэмай (у выглядзе дыяфільма).

**КАМБІНАВАНАЕ РАЗМЯШЧЭННЕ ФОНДУ**

Спалучэнне гарызантальнага і вертыкальнага спосабаў размяшчэння фонду.

**КАМБІНАВАНАЯ КЛАСІФІКАЦЫЯ**

Класіфікацыйная сістэма, у якой асноўная табліца дапоўнена табліцамі тыпавых дзяленняў, а класіфікацыйныя індэксы ствараюцца шляхам камбінавання (пры неабходнасці) класіфікацыйных кодаў асноўнай табліцы з кодамі тыпавых дзяленняў.

**КАМБІНАВАНАЯ ПРАДМЕТНАЯ РУБРЫКА**

Мнагачленная прадметная рубрыка, у якой адзін з элементаў складзены як апісальная прадметная рубрыка.

**КАМБІНАВАНАЯ СІСТЭМА КЛАСІФІКАЦЫІ**

Сістэма класіфікацыі, у якой асноўная табліца спалучаецца з сістэмай дапаможных табліц тыпавых дзяленняў. Камбінаванымі з'яўляюцца большасць існуючых класіфікацыйных сістэм.

**КАМБІНАВАНЫ ІНДЭКС**

Абагульняльнае паняцце для класіфікацыйных індэксаў; складаецца з некалькіх элементаў. Не рэкамендуецца прымяняць радавы тэрмін К. і. замест адпаведных відавых: складаны, састаўны індэкс.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**КАМБІНАЦЫЯ ІНДЭКСАЎ УДК**

Аперацыя пабудовы камбінаванага індэкса з індэксаў асобных паняццяў, складаючых змест дакумента, з выкарыстаннем азначэнняў і сінтаксічных знакаў.

**КАМЕНТАРЫЙ**

Дапаможны тэкст, які ўтрымлівае тлумачэнні і ацэнку дакумента ці асобных яго частак.

**КАМПАКТ-ДЫСК**

Носьбіт інфармацыі, які мае аб'ём памяці ў памеры 300 тыс. друкаваных старонак ці 150 дыскет. Для работы з К.-д. неабходны прайгравальнікі, персанальныя ЭВМ і прынтар. У аптычных К.-д. запіс і счытванне інфармацыі вядуцца з дапамогай лазернага промня. К.-д. бываюць двух відаў: 1) прызначаныя для аднаразовага запісу і шматразовага ўзнаўлення (сціранне ці змяненне інфармацыі не прадугледжана); 2) прызначаныя для запісу, перазапісу, сцірання, змены інфармацыі і шматразовага ўзнаўлення.

Сін.: Аптычны дыск.

**КАМПАКТНАЕ ЗАХОЎВАННЕ ФОНДУ**

Спосаб захоўвання, які дазваляе павысіць змяшчальнасць фондасховішча дзякуючы выкарыстанню перасовачных стэлажоў, эканомных метадаў расстаноўкі фонду, замене арыгіналаў друку іх копіямі.

**КАМПЛЕКТ**

Усе выпускі шматтомнага ці серыйнага выдання, у тым ліку выдадзеныя паказальнікі, дапаўненні, дадаткі і інш., што выйшлі ў друку.

**КАМПЛЕКТАВАННЕ ФОНДУ**

Працэс планамернага адбору і набыцця дакументаў, якія адпавядаюць па змесце, навуковай і мастацкай каштоўнасці задачам бібліятэкі і інфармацыйным запатрабаванням чытачоў. Адрозніваюць тры віды К. ф. – бягучае, рэтраспектыўнае і рэкамплектаванне.

**КАМПЛЕКТАТАР**

Супрацоўнік бібліятэкі, які займаецца камплектаваннем фонду, адсочвае змястоўнае і якаснае напаўненне патоку, сочыць за кан'юнктурай кошту.

**КАМПЛЕКТНАЕ ВЫДАННЕ**

Сукупнасць выданняў, сабраных у папку, футляр, бандэроль ці заключаных у вокладку.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**КАМУНІКАТЫЎНАЯ КАМПЕТЭНТНАСЦЬ**

Сукупнасць ведаў і ўменняў асобы ў галіне арганізацыі ўзаемадзеяння (з іншымі людзьмі, арганізацыямі, прафесійнымі аб’яднаннямі і г.д.).

**КАМУНІКАТЫЎНЫ ФАРМАТ**

Структура, склад і змест запісу для абмену бібліяграфічнымі звесткамі на магнітнай стужцы.

Гл.: Бібліяграфічны запіс у камунікатыўным фармаце; Машыначытальная каталагізацыя.

**КАМУНІКАТЫЎНЫЯ БІБЛІЯТЭЧНЫЯ ПАСЛУГІ**

Паслугі, якія дазваляюць задаволіць патрэбы чытачоў у міжасобасных зносінах. Арганізацыя міжасобасных зносін. Адначасова К. б. п. забяспечваюць рэкламу бібліятэкі. Да К. б. п. адносяцца: навучанне бібліятэчна-бібліяграфічным ведам і іншым элементам інфармацыйнай культуры; арганізацыя гурткоў па вывучэнні мовы; арганізацыя міжасобасных зносін (у форме клубаў па інтарэсах, дыскусій, дыспутаў, кінавідэапраглядаў, дыскатэк і інш.).

Гл.: Бібліятэчная паслуга.

**КАМУНІКАЦЫЯ**

Абмен або перадача інфармацыі паміж дзвюма ці больш асобамі і (ці) сістэмамі.

**КАНАЛ (У ІНФАРМАТЫЦЫ)**

Сукупнасць прыстасаванняў, прызначаных для перадачы і (ці) прыёму інфармацыі.

**КАНАЛЫ НАВУКОВАЙ ІНФАРМАЦЫІ**

Комплекс сродкаў і метадаў, прызначаных для перадачы і (або) атрымання навуковай інфармацыі.

**КАНВЕРСАВАННЕ**

Змяненне формы прадастаўлення даных у адпаведнасці з вызначанымі правіламі пры захаванні інфармацыі, якая ў іх утрымліваецца.

**КАНВЕРСІЯ КАТАЛОГАЎ**

Перавод каталогаў з адной формы ў другую, напрыклад каталога ў карткавай форме – на мікраносьбіты, кампакт-дыскі ці ў форму кніжнага выдання. Уключае рэдагаванне, канверсаванне і іншыя працэсы.

**КАНСЕРВАЦЫЯ ДАКУМЕНТАЎ**

Ахова матэрыяльнай асновы дакументаў ад натуральнага працэсу старэння і разбурэння ва ўмовах іх працяглага захоў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вання. Прымяняюць розныя формы К., напрыклад ламініраванне (запрасоўка лістоў у празрыстыя плёнкі), імпрэгніраванне (прамочванне паперы замацавальнымі рэчывамі) і інш.

**КАНТРОЛЬ ДОСТУПУ**

Вызначэнне і абмежаванне доступу карыстальнікаў да прыстасаванняў, праграм, даных вылічальнай сістэмы.

**КАНТРОЛЬНЫ ЛІСТОК ЧЫТАЧА**

Лісток устаноўленай формы, у якім рэгіструюцца атрыманне і зварот чытачом дакумента. Выкарыстоўваецца для кантролю і першаснага ўліку кнігавыдачы і наведванняў у чытальных залах бібліятэк.

**КАНТЫ**

Край пераплёту вокладкі, які выступае за лінію абрэзу кніжнага блока.

**КАПІРАВАЛЬНЫ АПАРАТ**

Апарат, прызначаны для атрымання копій з дакументаў.

**КАПІРАВАННЕ**

Від узнаўлення (рэпрадуцыравання) дакумента, пры якім забяспечваецца поўная адпаведнасць формы і зместу копіі арыгіналу.

**КАПТАЛ**

Тасёмка шырынёй каля 1 см з патоўшчаным краем, якая наклейваецца на краі карашка абрэзанага кніжнага блока. Служыць для яго ўмацавання, а таксама ў якасці элемента афармлення выдання.

**КАРАШОК**

Край (бок) кніжнага блока, дзе змацаваны ўсе элементы кнігі (сшыткі, лісты блокаў), а таксама частка пераплётнай накрыўкі, што прыкрывае гэтую старонку блока.

**КАРОТКАЕ БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ АПІСАННЕ**

Апісанне, якое ўключае толькі абавязковыя элементы, неабходныя для ідэнтыфікацыі дакумента.

**КАРДЭКС**

Гл.: Гарызантальная картатэка.

**КАРПАРАТЫЎНАСЦЬ**

Дух адзінства, агульнасці; сумесная дзейнасць у згодзе.

**КАРПАРАТЫЎНАЯ БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНАЯ СІСТЭМА**

Добраахвотнае аб'яднанне некалькіх ЦБС, якія ўваходзяць у склад узаеманезалежных у адміністрацыйным і гаспадар-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чым планах прадпрыемстваў, фірмаў і г.д. для сумеснага стварэння і выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў агульнага карыстання пры рашэнні кожным удзельнікам кааперацыі сваіх функцыянальных і інфармацыйных задач.

**КАРТА**

Гл.: Мапа.

**КАРТАГРАФІЧНАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, большую частку аб'ёму якога займае картаграфічны відарыс.

**КАРТАГРАФІЧНЫ ТВОР**

Твор, галоўнай часткай якога з'яўляецца картаграфічны відарыс (мапа, тапаграфічны план, атлас, глобус, рэльефная карта і г.д.).

**КАРТА-СХЕМА**

Карта са спрошчана-абагульненым адлюстраваннем элементаў зместу.

**КАРТАТЭКА**

Сукупнасць арганізаваных вызначаным чынам каталожных картак. Тэрмін К. характарызуе толькі форму. Любы бібліятэчны каталог у карткавай форме з'яўляецца картатэкай.

Гл.: Бібліяграфічная картатэка.

**КАРТАТЭКА АДМОЎ**

Картатэка, у якой улічваецца незадаволены чытацкі запыт на дакументы. Выкарыстоўваецца для папаўнення фонду неабходнымі дакументамі і ўдакладнення профілю камплектавання фонду.

Сін.: Сшытак уліку адмоў.

**КАРТАТЭКА БЯГУЧАГА КАМПЛЕКТАВАННЯ**

Картатэка, якая змяшчае пералік дакументаў, заказаных бібліятэкай. Вядзецца з мэтай кантролю за паступленнем дакументаў.

**КАРТАТЭКА ВЫРАБАЎ**

Картатэка, у якой змяшчаюцца звесткі аб выпускаемых прамысловых вырабах (назва вырабу, яго тэхнічныя і эксплуатацыйныя даныя і г.д.).

**КАРТАТЭКА ДАКАМПЛЕКТАВАННЯ**

Картатэка, якая змяшчае бібліяграфічнае апісанне дакументаў, набытых бібліятэкай у працэсе бягучага камплектавання і заказаных паўторна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**КАРТАТЭКА ДЭЗІДЭРАТАЎ**

Бібліяграфічная картатэка, што змяшчае пералік дакументаў, якія адшукваюцца бібліятэкай. Ствараецца на аснове адмоў чытачам, устанаўлення пропускаў (лакун) у фондзе і ўдакладнення патрэб у дадатковых экзэмплярах.

**КАРТАТЭКА ЗАГАЛОЎКАЎ ТВОРАЎ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ**

Састаўная частка сістэмы каталогаў і картатэк, якая забяспечвае бібліяграфічны пошук па загалоўках твораў мастацкай літаратуры, што размешчаны па алфавіту.

**КАРТАТЭКА МЕТАДЫЧНЫХ РАШЭННЯЎ**

Дапаможная картатэка службовага характару, у якой зафіксаваны рашэнні па складзеных выпадках бібліяграфічнага апісання, сістэматызацыі, прадметызацыі.

**КАРТАТЭКА МЯСЦОВЫХ ПЕРЫЯДЫЧНЫХ ВЫДАННЯЎ І ВЫДАННЯЎ З ПРАЦЯГАМ**

Бібліяграфічная картатэка, якая адлюстроўвае надрукаваныя на дадзенай тэрыторыі перыядычныя выданні і выданні, якія прадаўжаюць выходзіць, незалежна ад іх наяўнасці ў фондзе бібліятэкі.

**КАРТАТЭКА НОВЫХ ВЫДАННЯЎ**

Бібліяграфічная картатэка (сістэматычная ці алфавітная), якая адлюстроўвае дакументы, што паступілі ў бібліятэку за апошнія адзін-два месяцы.

**КАРТАТЭКА ПЕРАКЛАДАЎ**

Бібліяграфічная картатэка, якая адлюстроўвае дакументы, што перакладзены з адной мовы на другую ці на некалькі моў адначасова.

**КАРТАТЭКА ПЕРСАНАЛІЙ**

Бібліяграфічная картатэка, што аб’ядноўвае ў персанальных рубрыках матэрыялы, якія прысвечаны жыццю і дзейнасці пэўных асоб (іх творы і літаратуру аб іх) незалежна ад наяўнасці гэтых матэрыялаў у фондзе бібліятэкі.

**КАРТАТЭКА ПРАДПРЫЕМСТВАЎ**

Картатэка, у якой утрымліваюцца звесткі аб якіх-небудзь прамысловых прадпрыемствах ці іх аб’яднаннях (назвы, месцазнаходжанне, характар выпускаемай прадукцыі і г.д.). У залежнасці ад відаў прадпрыемстваў назва можа змяняцца. Напрыклад, К. фірмаў, К. малых прадпрыемстваў і г. д.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**КАРТАТЭКА РЭЦЭНЗІЙ**

Бібліяграфічная картатэка (сістэматычная ці алфавітная), якая адлюстроўвае надрукаваныя рэцэнзіі незалежна ад наяўнасці іх у фондзе бібліятэкі.

**КАРТАТЭКА СКЛАДУ ЧЫТАЧОЎ**

Гл.: Картатэка чытацкага профілю.

**КАРТАТЭКА ЧЫТАЦКАГА ПРОФІЛЮ**

Картатэка звестак аб складзе чытачоў бібліятэкі (узрост, адукацыя, прафесія і г.д.), аб'яднаных у сацыяльна-прафесійныя групы. Выкарыстоўваецца пры арганізацыі інфармавання, індывідуальнага і масавага абслугоўвання чытачоў.

**КАРТАТЭКА ЭКАНАМІЧНАГА І КУЛЬТУРНАГА ПРОФІЛЮ**

Картатэка даных абслугоўваемага рэгіёна аб галіновай прамысловасці, сельскай гаспадарцы, навуцы, культуры, а таксама кароткія звесткі аб прадпрыемствах і ўстановах, іх бібліятэчным абслугоўванні. Выкарыстоўваецца пры арганізацыі фонду, абслугоўванні насельніцтва.

**КАРТКАВАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, якое складаецца з сукупнасці картак ці перфакартак устаноўленага фармату.

**КАРТКАВЫ КАТАЛОГ**

Бібліятэчны каталог, складзены са стандартных каталожных картак.

Гл.: Бібліятэчны каталог.

**КАРЫСТАЛЬНІК АЎТАМАТЫЗАВАНАЙ СІСТЭМЫ (КАРЫСТАЛЬНІК АС)**

Асоба, якая ўдзельнічае ў функцыянаванні АС ці выкарыстоўвае вынікі яе функцыянавання.

**КАРЫСТАЛЬНІК БІБЛІЯТЭКІ**

Фізічная або юрыдычная асоба, якая звяртаецца да паслуг бібліятэкі.

**КАРЫСТАЛЬНІК ІНФАРМАЦЫЙНАЙ СІСТЭМЫ**

Асоба (група асоб, арганізацыя), якая карыстаецца паслугамі інфармацыйнай сістэмы для атрымання інфармацыі або вырашэння іншых задач **(3.1.31)**.

**КАРЫСТАЛЬНІК ІНФАРМАЦЫЙНАЙ УСТАНОВЫ**

Любы суб'ект (асоба, група асоб, арганізацыя), які звяртаецца ў інфармацыйную ўстанову і (або) атрымлівае яе паслугі **(3.2.2.22)**.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**КАТАЛОГАЗНАЎСТВА**

Раздзел бібліятэчна-інфармацыйнай навукі, які вывучае комплекс праблем, звязаных з каталогамі і каталагізацыяй.

**КАТАЛАГІЗАТАР**

Супрацоўнік бібліятэкі, які забяспечвае працэс каталагізацыі: складанне бібліяграфічных апісанняў, сістэматызацыю, прадметызацыю, вядзенне і рэдагаванне каталогаў.

**КАТАЛАГІЗАЦЫЙНЫ ЗАПІС**

Сукупнасць элементаў, якая ўключае бібліяграфічны запіс і шыфр захавання дакументаў, прысвоены ў адпаведнасці з правіламі, прынятымі арганізацыяй. Тэрмін, прыняты ў сучаснай міжнароднай практыцы, доўгі час існаваў і ў айчыннай, а затым увайшоў у тэрмін «бібліяграфічнае апісанне». Аднак патрэба ў ім застаецца, таму што пакуль існуе каталог, захоўваюцца і асаблівасці бібліяграфічнага запісу для яго.

**КАТАЛАГІЗАЦЫЯ**

Сукупнасць працэсаў, якія ўключаюць складанне бібліяграфічных апісанняў, сістэматызацыю, прадметызацыю, арганізацыю, вядзенне і рэдагаванне бібліятэчных каталогаў. К. забяспечвае стварэнне і функцыянаванне бібліятэчных каталогаў.

**КАТАЛАГІЗАЦЫЯ Ў ВЫДАННІ**

Форма цэнтралізаванай каталагізацыі, пры якой яе элементы (індэкс, макет анатаванай каталожнай карткі) друкуюцца ў выданнях у адпаведнасці з ДАСТам на адвароце тытульнага ліста ці на апошняй старонцы выдання.

**КАТАЛАГІЗАЦЫЯ ЭЛЕКТРОННЫХ РЭСУРСАЎ**

Сукупнасць працэсаў аналітыка-сінтэтычнай апрацоўкі дакументаў на машыначытальных носьбітах.

**КАТАЛОГ**

Нарматыўна-вытворчае, даведачнае ці рэкламнае выданне, якое змяшчае сістэматызаваны пералік прадметаў.

Гл.: Бібліятэчны каталог; Бібліяграфічны каталог.

**КАТАЛОГ БІБЛІЯТЭКІ**

Гл.: Бібліятэчны каталог.

**КАТАЛОГ МЯСЦОВЫХ ВЫДАННЯЎ**

Бібліятэчны каталог выданняў, надрукаваных на дадзенай тэрыторыі, незалежна ад іх тэматыкі. Бібліяграфічныя апісанні размяшчаюцца па гадах выдання твораў друку і іншых дакументаў, а ўнутры года – па алфавіце аўтараў і загалоўкаў. Дапаўняе краязнаўчы каталог.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**КАТАЛОГ МЯСЦОВЫХ ПЕРЫЯДЫЧНЫХ ВЫДАННЯЎ**

Бібліятэчны каталог, які адлюстроўвае надрукаваныя на дадзенай тэрыторыі перыядычныя выданні, што знаходзяцца ў фондзе бібліятэкі.

**КАТАЛОГ НАВІНАК**

Бібліятэчны каталог, які ўтрымлівае бібліяграфічную інфармацыю аб выдавецкай прадукцыі новых паступленняў у фонд.

**КАТАЛОГ ПЕРЫЯДЫЧНЫХ ВЫДАННЯЎ**

Бібліятэчны каталог (звычайна алфавітны), які змяшчае бібліяграфічную інфармацыю аб знаходжанні ў бібліятэцы камплектаў і асобных нумароў перыядычных выданняў.

**КАТАЛОЖНАЯ КАРТКА**

Носьбіт інфармацыі ў карткавых каталогах і картатэках, прызначаны для афармлення бібліяграфічнага запісу, пры неабходнасці – іншых звестак. Фармат каталожнай карткі 75 х 125 мм з адтулінай у ніжняй частцы для стрыжня, які ўтрымлівае картку ў каталожнай шуфлядзе.

**КАТАЛОЖНАЯ ШАФА**

Спецыяльная шафа для размяшчэння карткавага каталога, складаецца з гнёздаў з размешчанымі ў іх каталожнымі шуфлядамі. К. ш. вырабляюцца з дрэва, металу, пластмасы, бываюць розных памераў, мадэляў.

**КАТАЛОЖНЫ ІНДЭКС**

Класіфікацыйны індэкс, што паказвае дзяленні сістэматычнага каталога, у якім павінна быць змешчана дадзеная каталожная картка; вызначаецца на аснове поўнага індэкса. У гэтым значэнні не рэкамендуецца ўжыванне тэрміна «расстановачны індэкс».

**КАТАЛОЖНЫ РАЗДЗЯЛЯЛЬНІК**

Картка з тоўстага і цвёрдага матэрыялу з выступам, які ўзвышаецца над каталожнымі карткамі ў шуфлядзе; на ёй вызначаюцца агульныя прыметы, што аб’ядноўваюць шэраг бібліяграфічных запісаў (прозвішча аўтара, назва ўстановы, прадметная рубрыка, класіфікацыйны індэкс і г. д.). К. р. утрымлівае неабходную інфармацыю для арыентацыі ў каталогу і пошуку дакументаў.

**КАТЭГАРЫЯЛЬНЫ АНАЛІЗ**

Метад навуковага даследавання класіфікацыйных паняццяў шляхам раскладання іх на асобныя катэгорыі (аб’екты, матэрыялы, працэсы і г. д.). У выніку вызначаецца сукуп-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насць усіх тэрмінаў, якімі карыстаецца пэўная навука і якія адлюстроўваюцца ў дакументах, што прадстаўлены ў выглядзе табліц катэгорый. Такая пабудова сістэмы класіфікацыі садзейнічае шматаспектнаму адлюстраванню зместу і іншых класіфікацыйных прымет твораў друку і адпавядае іх шматаспектнаму пошуку. К. а. выкарыстоўваецца ў працэсе аптымізацыі табліц УДК, ББК, рэдагавання сістэматычнага і прадметнага каталогаў, АПП.

**КАТЭГАРЫЯЛЬНЫ СІНТЭЗ**

Аб'яднанне вызначаных класіфікацыйных прымет з улікам іх узаемадзеяння і ўзаемасувязей у поўным класіфікацыйным індэксе. Яму папярэднічае катэгарыяльны аналіз зместу пэўнага дакумента, які праводзіцца па алгарытме, прадугледжаным табліцамі аналітыка-сінтэтычнай сістэмы. К. с. праводзіцца па класіфікацыйнай формуле.

**КАТЭГОРЫЯ**

У аналітыка-сінтэтычных сістэмах класіфікацыі – іерархічны шэраг паняццяў, якія аб'яднаны адзінствам зместу. К. бываюць розных ступеняў абагульнення: усеагульныя, якія выкарыстоўваюцца ва ўсіх навуках; асобныя ці частковыя для вялікіх груп навук; адзінкавыя, толькі для адной навукі ці некалькіх сумежных навук. У адпаведнасці са спецыфікай галіны ведаў распрацоўваюцца розныя сістэмы К., якія часта маюць складаную структуру.

**КАФЕДРА ВЫДАЧЫ**

Месца, абсталяванае для афармлення чытачам выдадзенай ім ці вернутай імі літаратуры (іншых дакументаў), а таксама месца для захоўвання неабходнай у працэсе выдачы дакументацыі, для падручных картак і інш.

**КАШТАРЫС БІБЛІЯТЭКІ**

Фінансавы дакумент для вызначэння і планавання выдаткаў на ўтрыманне бібліятэкі.

**КАЭФІЦЫЕНТ АДПАВЕДНАСЦІ ФОНДУ КНІГАВЫДАЧЫ**

Паказчык суразмернасці аб'ёму розных частак фонду (па тэматыцы, тыпах, відах і перыядах дакументаў) і іх выкарыстання. Вызначаецца адносінамі долі кнігавыдачы пэўнага масіву дакументаў ад агульнай кнігавыдачы да долі фонду таго ж масіву дакументаў у агульным фондзе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**КАЭФІЦЫЕНТ ДАКЛАДНАСЦІ ВЫДАЧЫ ДАНЫХ**

Адносіны колькасці знойдзеных рэлевантных дакументаў да агульнага ліку выданых дакументаў; колькасная характарыстыка якасці інфармацыйнага пошуку, якая вызначаецца адносінамі паміж колькасцю выдадзеных рэлевантных дакументаў і агульнай колькасцю выданых дакументаў.

**КВАЛІФІКАЦЫЯ БІБЛІЯТЭЧНАГА РАБОТНІКА**

Узровень тэарэтычнай і практычнай падрыхтаванасці бібліятэчнага работніка да выканання пэўнай працы.

**КВАНТ**

Частка рэсурсу, якая выдзяляецца для выкарыстання праграмай або запытам.

**КВАЗІСІНАНІМІЯ**

Уласцівасць двух або некалькіх розных знакаў, якія могуць для асобых мэт разглядацца як сінонімы (**3.1.14**).

**КІНАДАКУМЕНТ**

Выяўленчы ці аўдыявізуальны дакумент, створаны кінематаграфічным спосабам.

**КІНАТЭКА**

Гл.: Фільматэка.

**КІНАФІЛЬМ**

Кінадакумент, у якім фатаграфічнае адлюстраванне (кадры) аб'яднана агульным сюжэтам.

**КІНАФОТАФОНАДАКУМЕНТ**

Абагульняльны тэрмін для паняццяў «кінадакумент», «фотадакумент», «фонадакумент». У бібліятэчнай практыцы – частка паняцця «аўдыявізуальныя матэрыялы».

**КІРАВАННЕ ФОНДАМ**

Рэгуляванне арганізацыі і камплектавання фонду з мэтай аптымізацыі і эфектыўнасці яго выкарыстання ў адпаведнасці з чытацкімі інтарэсамі і задачамі бібліятэкі.

**КІРАВАННЕ ЧЫТАННЕМ**

Аказанне дапамогі пэўным групам чытачоў (дзецям, падлеткам, юнакам) у набыцці сістэмы навыкаў работы з дакументам. Тэрмін К. ч. з'яўляецца валюнтарысцкім у адносінах да дарослага чытача, і ў рабоце бібліятэкара з дарослымі чытачамі не ўжываецца.

**КІРАЎНІК БІБЛІЯТЭКІ**

Асоба, якая здзяйсняе кіраўніцтва персаналам бібліятэкі або яе падраздзяленнем (філіялам, аддзяленнем, аддзелам,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сектарам). Валодае распараджальнымі, кантрольнымі і дысцыплінарнымі паўнамоцтвамі і нясе пэўную адказнасць.

**КІРАЎНІЦТВА БІБЛІЯТЭКАЙ**

Вядучая, накіроўваючая, арганізуючая дзейнасць кіраўніка бібліятэкай з дапамогай калектыву супрацоўнікаў і шырокай грамадскасці. З пункта гледжання працэсу накіраванасці гэта значыць: аналізаваць сітуацыі, тэндэнцыі і перспектывы развіцця, фарміраваць і вызначаць мэту дзейнасці, вызначаць сваю ролю ў вырашэнні праблем і ў здзяйсненні кантролю за дзейнасцю падпарадкаваных супрацоўнікаў, уменне распрацоўваць праграмы сумеснай дзейнасці з уладамі і шырокай грамадскасцю.

**КІШЭННАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, фармат якога не перавышае 75 х 90 $^{1}/_{32}$ (107 х 177 мм).

**КІШЭНЬКА КНІГІ**

Адкрыты канверт памерам 8,5 х 10 см са зрэзаным наўскос верхам пярэдняй часткі для ўкладвання кніжнага фармуляра.

**КЛАС**

Класіфікацыйная групоўка ў сістэме класіфікацыі, якая аб'ядноўвае групу паняццяў (аб'ектаў) па пэўнай прымеце.

**КЛАСІФІКАТАР**

Сістэматызаваны збор назваў і кодаў класіфікацыйных груповак якой-небудзь сістэмы класіфікацыі. У бібліятэчнай справе прынята назва «табліцы класіфікацыі».

**КЛАСІФІКАЦЫЙНАЕ ДЗЯЛЕННЕ**

Элемент табліц класіфікацыі, які складаецца з класіфікацыйнага індэкса, слоўнай фармулёўкі, спасылачна-даведачнага апарату і метадычных парад; у асноўных табліцах у залежнасці ад узроўню дзяленні атрымліваюць адпаведныя назвы (клас – падклас, раздзел – падраздзел і г.д.); у дапаможных табліцах – розныя назвы (напрыклад, ва УДК – вызначальнікі, у ББК – тыпавыя дзяленні). У гэтым значэнні тэрмін «рубрыка» не ўжываецца.

**КЛАСІФІКАЦЫЙНАЕ РАШЭННЕ**

Рашэнне аб адлюстраванні дакумента ў адпаведным раздзеле сістэматычнага каталога, паказальніка і размяшчэнні яго ў бібліятэчным фондзе пры сістэматычнай расстаноўцы. К.Р. ажыццяўляецца з дапамогай індэксаў: палічнага, каталожнага і поўнага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**КЛАСІФІКАЦЫЙНАЯ ГРУПОЎКА**

Аб'яднанне класіфікацыйных звестак (у прыватнасці, бібліяграм) ідэнтычнай сістэматычнай прыналежнасці ў адным дзяленні каталога.

**КЛАСІФІКАЦЫЙНАЯ ПРЫМЕТА**

Прымета дакумента (від, змест, чытацкае і мэтавае прызначэнне і інш.), якая ўлічваецца ў класіфікацыйным рашэнні.

**КЛАСІФІКАЦЫЙНАЯ СТРУКТУРА**

Узаемаразмяшчэнне класаў у сістэме класіфікацыі, абумоўленае іх адносінамі. Элементамі класіфікацыйнай структуры з'яўляюцца класіфікацыйныя дзяленні, якія ўтвараюць узроўні, рады і г.д.

**КЛАСІФІКАЦЫЙНАЯ ФОРМУЛА**

Уніфікаваны парадак размяшчэння класіфікацыйных індэксаў, якія вызначаюць класіфікацыйнае рашэнне.

**КЛАСІФІКАЦЫЙНЫ ЗАПІС**

Сукупнасць элементаў, якая абазначае ў класіфікацыйнай табліцы клас класіфікацыйнай сістэмы і ўключае код класа, апісанне класа і метадычныя ўказанні.

**КЛАСІФІКАЦЫЙНЫ ІНДЭКС**

Умоўнае (літарнае, лічбавае ці змешанае) вызначэнне дзялення якой-небудзь сістэмы класіфікацыі, да якога адносіцца бібліяграфаваны дакумент.

**КЛАСІФІКАЦЫЯ**

Сістэма размеркавання аб'ектаў (прадметаў, з'яў, працэсаў, паняццяў) па класах у адпаведнасці з пэўнымі прыметамі. Гэтае вызначэнне, якое мае агульны характар, не азначае, што ў якасці класіфікацыйных прымет будуць выступаць істотныя бакі зместу дакумента. Яно прымяняльнае да ўсякай К., у тым ліку, напрыклад, да алфавітнай, у якой паняцці размешчаны ў адпаведнасці з парадкам чаргавання літаратуры ў адпаведных назвах. К. – адно з фундаментальных паняццяў фармальнай логікі. У бібліятэчна-бібліяграфічнай і інфармацыйнай практыцы гэтае паняцце выкарыстоўваецца ў складзе словазлучэнняў («сістэма К.», «табліцы К.» і г.д.), а таксама ў выглядзе прыметніка («класіфікацыйнае дзяленне», «класіфікацыйнае рашэнне», «класіфікацыйны індэкс»). У фармальнай логіцы для азначэння працэсу выкарыстоўваецца тэрмін «класіфікаванне». Адпаведны яму тэрмін устаноўлены для індэксавання дакументаў – «сістэматызацыя».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вынік класіфікавання – К., дзеля стварэння, распрацоўкі якой класіфікуюцца паняцці і (ці) аб'екты непасрэдна, але не ў выглядзе дакументаў. Дакументы сістэматызуюць па раней падрыхтаваных табліцах К.

**КЛАСІФІКАЦЫЯ БІБЛІЯТЭКІ КАНГРЭСА ЗША**

Пералічальная сістэма бібліятэчна-бібліяграфічнай класіфікацыі, распрацаваная ў 1901–1941 гг. Сістэма прызнана нацыянальнай для ЗША і прымяняецца для арганізацыі каталогаў Бібліятэкі Кангрэса і цэнтралізаванай каталагізацыі.

**КЛАСІФІКАЦЫЯ ДВУКРОП'ЕМ**

Аналітыка-сінтэтычная сістэма бібліятэчна-бібліяграфічнай класіфікацыі, распрацаваная знакамітым індыйскім бібліятэказнаўцам Ш.Р.Ранганатанам (1892–1972) у канцы 20-х – пачатку 30-х гадоў. Сістэматызацыя праводзіцца па класіфікацыйнай формуле ў строга вызначаным для кожнага класа парадку сістэматызацыі азначэнняў, якія адлюстроўваюць змест дакумента, з індэксам асобных ізалатаў.

**КЛІП**

Кароткі (звычайна ад двух да пяці хвілін) радыё-, відэаролік з закончаным сюжэтам ці найбольш яркім эпізодам.

**КЛУБ**

Арганізацыя, якая аб'ядноўвае людзей пэўнай сацыяльнай групы для сумеснага адпачынку, забаў, гульняў.

**КЛУБ АМАТАРАЎ МАСТАЦТВА**

Гл.: Мастацтвазнаўчыя клубы; Клубы па чытацкай накіраванасці.

**КЛУБЫ ПА ЧЫТАЦКАЙ НАКІРАВАНАСЦІ**

Групы чытачоў, аб'яднаныя агульным інтарэсам да якой-небудзь праблемы, тэмы, віду дзейнасці і г.д. Распаўсюджаны ў публічных бібліятэках клубы сямейнага чытання, вясковых сустрэч, літаратурныя клубы, клубы аматараў мастацтва, беларускія вячоркі, экалагічныя, бытавыя, калекцыйна-збіральніцкія і інш. Многія з іх маюць сваю атрыбутыку, праграмы дзейнасці, лідэраў і пастаянную аўдыторыю.

**КЛЮЧ ДА ПРАДМЕТНАГА КАТАЛОГА**

Гл.: Рабочая картатэка да прадметнага каталога.

**КЛЮЧ ДА СІСТЭМАТЫЧНАГА КАТАЛОГА**

Гл.: Алфавітна-прадметны паказальнік да сістэмнага каталога.

**КЛЮЧАВОЕ СЛОВА**

1. Слова ці словазлучэнне прыроднай мовы, якое выбіраецца з тэксту дакумента і выкарыстоўваецца для яго індэксацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Слова ці словазлучэнне з тэксту дакумента ці запыту, якое нясе ў дадзеным тэксце асноўную сэнсавую нагрузку з пункта гледжання інфармацыйнага пошуку.

**КЛЮЧАВЫ ЗАГАЛОВАК**

Загаловак, які надаецца серыйнаму выданню цэнтрам Міжнароднай сістэмы даных аб серыйных выданнях (ISSN) у мэтах яго адназначнай ідэнтыфікацыі і рэгістрацыі; непарыўна звязаны з Міжнародным стандартным нумарам серыйнага выдання (ISSN).

**КНІГА**

Неперыядычнае тэкставае друкаванае выданне, аб'ём якога больш за 48 старонак.

**«КНІГА – ПОШТАЙ»**

Спосаб распаўсюджвання (набыцця) выданняў, пры якім спецыяльная кнігарня ці яе аддзел высылае іншагароднім заказчыкам выданні поштай.

**КНІГА СУМАРНАГА ЎЛІКУ ФОНДУ**

Бібліятэчны дакумент, у якім фіксуюцца паступленні, выбыццё твораў друку і іншых матэрыялаў, а таксама вынікі ўліку фонду бібліятэкі. Існуе ў традыцыйным і машыначытальным выглядзе.

**КНІГА ЎЛІКУ АДЗІНАГА ФОНДУ ЦБС**

Бібліятэчны дакумент, у якім фіксуюцца паступленне, набыццё твораў друку і іншых дакументаў, а таксама вынікі ўліку фонду ЦБС; з'яўляецца ўліковым дакументам па перадачы дакументаў з аддзела камплектавання і апрацоўкі ў структурныя падраздзяленні цэнтральнай бібліятэкі, у бібліятэку-філію, а таксама з аднаго структурнага падраздзялення ў другое. Усё часцей замяняецца электронным каталогам.

**КНІГААБМЕН**

Узаемная перадача дакументаў у карыстанне бясплатна ці на спецыяльных умовах з адной бібліятэкі ў іншыя. Формы К. наступныя: абмен прыватнымі выданнямі; бясплатнае распаўсюджанне якіх-небудзь дакументаў ці пераразмеркаванне нявыкарыстаных дакументаў; абмен камплектамі нацыянальнай выдавецкай прадукцыі; узаемнае выкарыстанне заказаў на дэзіраты. К. бывае ўнутрысістэмны, унутрыдзяржаўны, міжнародны.

**КНІГААБМЕННЫ ФОНД**

Гл.: Абменны фонд.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**КНІГАВЫДАВЕЦКАЯ БІБЛІЯГРАФІЯ**

Гл.: Выдавецкая бібліяграфія.

**КНІГАВЫДАЧА**

Колькасць дакументаў, выданых чытачам і абанентам па іх запытах; з’яўляецца адным з паказчыкаў абслугоўвання чытачоў, які характарызуе выкарыстанне бібліятэчнага фонду; прымяняецца таксама пры вызначэнні абарачальнасці фонду, чытальнасці і інш.

**КНІГАГАНДЛЁВАЯ БІБЛІЯГРАФІЯ**

Бібліяграфія, аб’ектам якой з’яўляюцца творы друку, што паступілі ці знаходзяцца ў кнігагандлёвых арганізацыях.

**КНІГАГАНДЛЁВАЯ ІНФАРМАЦЫЯ**

Звесткі аб выданнях, якія прапануюцца для продажу і апублікаваныя ў тэматычных планах выдавецтва або ў спецыяльна створаных для такога інфармавання крыніцах.

**КНІГАГАНДЛЁВЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік, які выдаецца або выкарыстоўваецца ў мэтах садзейнічання збыту друкаванай прадукцыі (**3.3.2.27**).

**КНІГАГАНДЛЁВЫ КАТАЛОГ**

Бібліяграфічны дапаможнік, які адлюстроўвае літаратуру, што маецца ў асартыменце пэўнай кнігарні ці кнігагандлёвай арганізацыі.

**КНІГАГАНДЛЁВЫ БЮЛЕТЭНЬ**

Выданне кнігагандлёвай інфармацыі, якое ўтрымлівае анатаваны пералік выданняў, што выходзяць у свет.

**КНІГАДРУКАВАННЕ**

1. Комплекс вытворчых працэсаў па стварэнні друкаванай кнігі і твораў друку ўвогуле.

2. Галіна вытворчасці, тое ж, што паліграфічная прамысловасць.

**КНІГАЗАБЕСПЯЧЭННЕ БІБЛІЯТЭК**

Забеспячэнне бібліятэк навінкамі друкаванай прадукцыі; заснавана на дзяржаўных пастановах і спецыяльных пагадненнях паміж выдавецтвамі, друкарнямі, кнігагандлёвымі арганізацыямі і бібліятэкамі. Ва ўмовах рынку падвяргаецца вялікім зменам.

**КНІГАЗАБЯСПЕЧАНАСЦЬ**

Адносны паказчык, што вызначае сярэднюю колькасць дакументаў, якія прыходзяцца на аднаго чытача бібліятэкі (або

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

групы бібліятэк), на аднаго жыхара раёна (горада, краіны), на аднаго члена калектыву прадпрыемства, установы і г.д. Паказчык К. характарызуе аб'ём фонду ў адносінах да колькасці чытачоў, яго дастатковасць; вызначаецца дзяленнем дакументаў, якія маюцца ў наяўнасці ў бібліятэцы (бібліятэках) раёна, на колькасць зарэгістраваных чытачоў (жыхароў, калектываў).

**КНІГАЗНАЎСТВА**

1. Комплекс роднасных, цесна ўзаемазвязаных, але адносна самастойных навуковых дысцыплін, якія вывучаюць творы друку, працэсы іх стварэння, распаўсюджвання і выкарыстання, а таксама тыя галіны культуры і народнай гаспадаркі, якія ажыццяўляюць пералічаныя працэсы.

2. Комплексная грамадская навука аб кнізе і кніжнай справе, якая вывучае ў гістарычным, сучасным і прагнозным планах працэсы стварэння, распаўсюджвання і выкарыстання твораў пісьменства і друку ў грамадстве.

**КНІГАНАШЭННЕ**

Форма пазастацыянарнага абслугоўвання чытачоў, сутнасць якой – дастаўка кніг (са стацыянарнай ці перасовачнай бібліятэкі) чытачам па месцы жыхарства ці працы. Асаблівае значэнне мае ў сельскай мясцовасці і для чытачоў, якія адносяцца да сацыяльна неабароненых груп (інвалідаў дзяцінства, працы, вайны і інш.).

**КНІГАСХОВІШЧА**

Сін.: Фондасховішча.

**КНІГАТРЫМАЛЬНІК**

Прыстасаванне з пругкага матэрыялу для падтрымкі кніг на паліцы або на стале ў вертыкальным становішчы.

**КНІЖКА-ЦАЦКА**

Выданне, якое мае незвычайную канструкцыйную форму, прызначаную для разумовага і эстэтычнага развіцця дзяцей. Адрозніваюць наступныя разнавіднасці: кніжка-шырмачка, кніжка-гармонік, кніжка-вяртушка (круцёлка, перакрутка), кніжка з гульнёвай задумай, кніжка-панарама, кніжка-забаўка, кніжка-фігура, кніжка-выцінанка.

**КНІЖНАЕ ВЫДАННЕ**

Неперыядычнае выданне ў выглядзе блока змацаваных у карашках лістоў друкаванага матэрыялу любога фармату ў вокладцы ці пераплёце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**КНІЖНАЯ ЗАКЛАДКА**

Падоўжаны вузкі аркуш цвёрдай паперы з інфармацыйна-рэкламнымі звесткамі ці рознымі выявамі, які можа служыць для закладкі патрэбнай старонкі ў кнізе.

**КНІЖНАЯ ПАЛІЦА**

Паліца, прызначаная для захоўвання і расстаноўкі кніг і іншых дакументаў.

**КНІЖНЫ БЛОК**

Змацаваныя паміж сабой элементы кнігі: сшытак, надрукаваныя асобна карты, схемы і г.д., падрыхтаваныя для злучэння з пераплётнай вокладкай ці накрыўкай.

**КНІЖНЫ ГАНДАЛЬ**

1. Дзейнасць па продажы і куплі неперыядычных выданняў (кніг, брашур, плакатаў, паштовак, нот і г.д.).

2. Галіна, якая арганізоўвае сферу абарачэння ў грамадскай вытворчасці кніг; выконвае функцыю давядзення выдавецкай прадукцыі да спажыўцоў.

**КНІЖНЫ ЗНАК**

Гл.: Экслібрыс.

**КНІЖНЫ ЛЕТАПІС**

Дзяржаўны бібліяграфічны паказальнік, які інфармуе грамадства аб кніжных выданнях, што выйшлі на тэрыторыі пэўнай краіны. У Беларусі К. л. выдаецца з 1924 г. Выпуск «К. л.» ажыццяўляе Нацыянальная кніжная палата Беларусі.

**КНІЖНЫ СШЫТАК**

Надрукаваны і сфальцаваны (складзены ў некалькі аркушаў) друкаваны ліст, які складае частку кніжнага блока.

**КНІЖНЫ ФОНД**

Частка бібліятэчнага фонду, якая складаецца з твораў друку з выражанымі прыметамі кніжнага выдання. Тэрмін К. ф. ужываюць у шырокім сэнсе слова як бібліятэчны фонд.

**КОД**

Сістэма прадстаўлення інфармацыі ў выглядзе даных, якія складаюцца з набору ўмоўных знакаў і правіл прысваення ім значэнняў **(3.2.1.8)**.

**КОДЭКС**

Найбольш распаўсюджаная форма кнігі, якая ўяўляе сабой блок сфальцаваных лістоў паперы, пергаменту ці іншага матэрыялу для пісьма, змацаваных у карашку і змешчаных у вокладку ці пераплёт.

Сін.: Скрутак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**КОЛА ЧЫТАННЯ**

1. Сукупнасць дакументаў, якая адлюстроўвае напрамак і змест чытання розных чытацкіх груп і асобных чытачоў; змяняецца пад уплывам развіцця светапогляду чытача, спрыяе сістэматычнасці і паслядоўнасці чытання; часцей прымяняецца ў дзіцячых бібліятэках і пры бібліятэчным абслугоўванні дзяцей.

2. Жанр рэкамендацыйнага дапаможніка.

**КОЛЬКАСНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА**

Сукупнасць матэрыяльных элементаў, якая характарызуе дакумент: колькасць тамоў, пагінацыя, ілюстрацыя, памер, суправаджальны матэрыял.

**КОЛЬКАСЦЬ ВЫДАЧ**

Адзін з абсалютных паказчыкаў, які характарызуе эфектыўнасць працы бібліятэкара за пэўны перыяд.

**КОМІКС**

Выяўленчае выданне, якое змяшчае серыю малюнкаў з адзіным, як правіла, сюжэтам і кароткім тлумачальным тэкстам.

**КОМПЛЕКСНА-СІСТЭМНЫ КАТАЛОГ**

Бібліятэчны каталог, у якім бібліяграфічныя запісы размяшчаюцца па буйных комплексах (іх падраздзяленнях) у сістэматычным парадку, а ўнутры іх – па комплексных рубрыках, размешчаных у алфавітным парадку. Асаблівасць каталога – шматаспектнае адлюстраванне зместу дакумента з улікам чытацкага і мэтавага прызначэння; прымяняецца ў спецыялізаваных бібліятэках.

**КОМПЛЕКС ПРАДМЕТНЫХ РУБРЫК**

Сукупнасць прадметных рубрык, якія аб'яднаны пэўнай тэматыкай; арганізуецца ў складзе прадметнага каталога (спіс, паказальнік) з дапамогай спецыяльных правіл методыкі прадметызацыі.

**КОМПЛЕКСНЫ АДДЗЕЛ БІБЛІЯТЭКІ**

Аддзел, які выконвае комплекс работ па фарміраванні свайго фонду, яго арганізацыі, выкарыстанні і абслугоўванні чытачоў (аддзел рукапісаў, нотна-музычны і інш.).

**КОНТРТЫТУЛ**

Левая старонка разваротнага тытульнага ліста, на якой змешчаны выхадныя звесткі, што адносяцца да шматтомнага і серыйнага выданняў цалкам (галоўны тытульны ліст – агульны), ці ў перакладным выданні аднаўляецца тытульны ліст выдання, які паслужыў арыгіналам для перакладу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**КОПІЯ**

Дакумент, атрыманы ў выніку дакладнага ці адносна дакладнага ўзнаўлення.

**КРАІНАЗНАЎЧАЯ БІБЛІЯГРАФІЯ**

Бібліяграфія, якая мае справу з дакументамі, што звязаны з пэўнай краінай (ці некалькімі блізкімі паміж сабой па якой-небудзь, напрыклад геаграфічнай, прымеце). Характэрнай асаблівасцю, якая адрознівае К. б. ад нацыянальных, з'яўляецца тое, што пад К. б. прынята разумець тыя, якія ўлічваюць літаратуру аб пэўнай краіне, выдадзеную за яе межамі і звычайна на іншых мовах, чым мова яе карэннага насельніцтва.

**КРАІНАЗНАЎЧЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік, які адлюстроўвае дакументы аб якой-небудзь краіне і (ці) шэрагу краін.

**КРАІНАЗНАЎЧЫ КАТАЛОГ**

Рэгіянальны каталог, што адлюстроўвае дакументы, змест якіх адносіцца да пэўнай краіны.

**КРАЯВАЯ БІБЛІЯГРАФІЯ**

1. Бібліяграфія, аб'ектам якой з'яўляюцца творы друку, што выдадзены ў краі (вобласці) незалежна ад іх тэматыкі.

2. Часам выкарыстоўваецца ў шырокім сэнсе як бібліяграфічная дзейнасць у краі (вобласці) і ўключае як бібліяграфію мясцовага друку, так і краязнаўчую бібліяграфію ў тым ліку.

**КРАЯВАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Універсальная бібліятэка, якая вядзе бібліятэчнае абслугоўванне і выконвае функцыі рэгіянальнага каардынацыйнага цэнтра, а таксама цэнтра МБА для бібліятэк усяго краю.

**КРАЯВЫ КАТАЛОГ**

Сін.: Каталог мясцовых выданняў.

**КРАЯЗНАЎЧАЕ БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА**

Навуковая дысцыпліна, якая вывучае бібліятэчнае краязнаўства, краязнаўчую дзейнасць бібліятэк.

**КРАЯЗНАЎЧАЕ ВЫДАННЕ**

Твор краязнаўчай літаратуры, які раскрывае гісторыю краю (мясцовасці), характарызуе вядомых яго прадстаўнікоў, перспектывы развіцця краю і іншыя звесткі аб ім.

**КРАЯЗНАЎЧАЯ БІБЛІЯГРАФІЯ**

Бібліяграфія, якая мае справу з дакументамі, што звязаны па змесце з пэўнай мясцовасцю ў краіне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**КРАЯЗНАЎЧАЯ КАРТАТЭКА**

Бібліяграфічная картатэка, якая адлюстроўвае дакументы краязнаўчага зместу незалежна ад наяўнасці іх у фондзе бібліятэкі.

**КРАЯЗНАЎЧЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік, які адлюстроўвае дакументы аб пэўнай мясцовасці (краі) у краіне **(3.3.2.21)**.

**КРАЯЗНАЎЧЫ ЗАПЫТ**

Сфармуляванае ў тэксце і прадастаўленае ў інфармацыйны цэнтр выяўленне патрэбнасці ў інфармацыі краязнаўчага характару.

**КРАЯЗНАЎЧЫ КАТАЛОГ**

Бібліятэчны каталог, які адлюстроўвае дакументы краязнаўчага зместу, што знаходзяцца ў фондзе бібліятэкі. Можа быць сістэматычным, алфавітным, прадметным; з'яўляецца разнавіднасцю рэгіянальнага каталога.

**КРАЯЗНАЎЧЫ КЛУБ**

1. Разнавіднасць чытацкага аб'яднання, мэтай якога з'яўляецца вывучэнне роднага краю.

2. Формы пасяджэнняў: вячоркі, гісторыка-літаратурна-экалагічныя вечарыны і інш.

**КРАЯЗНАЎЧЫ ФОНД**

Частка бібліятэчнага фонду, у якой сабраны дакументы, звязаныя з пэўным краем (сваім зместам ці паходжаннем).

**КРАЯЗНАЎЧЫЯ БІБЛІЯТЭЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ РЭСУРСЫ**

Сукупнасць краязнаўчага дакументнага фонду, краязнаўчага даведачна-бібліяграфічнага апарату, фізічных і юрыдычных асоб – суб'ектаў бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці ў пэўным краі.

**КРЫНІЦА БІБЛІЯГРАФІЧНЫХ ЗВЕСТАК**

Дакумент, у першую чаргу тыя яго элементы, якія ўтрымліваюць выхадныя звесткі.

**КРУГЛЫ СТОЛ**

Разнавіднасць прафесійнай сустрэчы, абавязковымі элементамі якой з'яўляюцца: актуальная праблематыка дыскусіі, удзел у ёй групы кампетэнтных і творчых суразмоўцаў, што маюць пэўны вопыт у гэтай галіне і ўласныя адносіны да абмяркоўваемага пытання. Вынікам абмеркавання, як правіла, з'яўляецца канструктыўная праграма пэўных дзеянняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**КРЫНІЦЫ КАМПЛЕКТАВАННЯ**

Арганізацыі, установы і асобы, пры дапамозе якіх папаўняюцца бібліятэчныя фонды.

**КРЫПТОНІМ**

Псеўданім, у якім імя аўтара заменена ініцыяламі, скарочаным прозвішчам або якім-небудзь знакам.

**КРЫТЭРЫІ БІБЛІЯТЭЧНАГА АБСЛУГОЎВАННЯ**

Аб’ём бібліятэчных паслуг і прадуктаў за пэўны перыяд часу; паўната задавальнення і развіцця грамадскіх (групавых, індывідуальных) патрэб у бібліятэчных паслугах і прадуктах.

**КРЫТЭРЫІ ВЫДАЧЫ**

Сукупнасць прымет, па якіх вызначаецца ступень адпаведнасці пошукавага вобраза дакумента пошукаваму прадпісанню і прымаецца рашэнне аб выдачы ці нявыдачы данага дакумента ў адказ на інфармацыйны запыт.

**КРЫТЭРЫІ КАМПЛЕКТАВАННЯ**

Прыметы дакумента, на падставе якіх вызначаецца мэтазгоднасць яго набыцця ў фонд. Маюць шматлікія формы выражэння: інфармацыйная каштоўнасць дакумента, яго актуальнасць і інш.

**КРЫТЭРЫІ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ ПРАЦЫ БІБЛІЯТЭКІ**

Адлюстроўваюцца ў паказчыках, якія характарызуюць бібліятэчную працу.

Гл.: Крытэрыі выдачы; Крытэрыі камплектавання; Бібліятэчныя паслугі.

**КСЕРАГРАФІЯ**

Электрафатаграфія з сухім праяўленнем скрытага адбітку і яго перанясеннем на звычайную паперу.

**КСІЛАГРАФІЧНАЯ КНІГА**

Кніга, тэкст і ілюстрацыі якой выкананы ў тэхніцы гравюры на дрэве.

**КСІЛАГРАФІЯ**

Друк з гравюры на дрэве.

**КУЛЬТУРА ЧЫТАННЯ**

Састаўная частка інфармацыйнай культуры, якая нясе ў сабе комплекс пэўных навыкаў у рабоце з дакументам, у тым ліку: свядомы выбар тэматыкі чытання, яго сістэматычнасць і паслядоўнасць, уменне знаходзіць патрэбныя дакументы з дапамогай бібліяграфічных паказальнікаў, карыстацца даведачна-бібліяграфічным апаратам, арыентавацца ў дакументах

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з мэтай максімальнага засваення і ўспрымання прачытанага, прымяняць рацыянальныя прыёмы работы з кнігай, беражліва адносіцца да твораў друку.

**КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКАЯ ФУНКЦЫЯ БІБЛІЯТЭК**

Сацыяльная функцыя, якая выяўляецца ў распаўсюджванні грамадска карысных ведаў, фарміраванні духоўнай культуры асобы і грамадства.

**КУЛЬТУРНЫ КОМПЛЕКС**

Аб'яднанне культурна-асветных устаноў (бібліятэк, клубаў, кінаўстаноў, спартыўных арганізацый, музычных і мастацкіх школ, музеяў і інш.) незалежна ад іх ведамаснай падпарадкаванасці.

**КУМУЛЮЮЧЫ КАТАЛОГ**

Каталог, вядзенне якога (у адрозненне ад закансерваванага) працягваецца, а інфармацыя ў ім набываецца. Не рэкамендуецца прымяненне тэрмінаў «адкрыты каталог» (замест «кумулюючы») і «закрыты каталог» (замест «закансерваваны»), бо гэтыя тэрміны ў першую чаргу абазначаюць ступень даступнасці (ці агульнадаступнасці) каталога.

**КУМУЛЯТЫЎНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік, які аб'ядноўвае матэрыял раней надрукаваных выпускаў **(3.3.2.34)**.

**КУРАТАРСТВА**

Форма метадычнай работы, якая ўтрымлівае назіранне і аналіз дзейнасці падначаленых падраздзяленняў бібліятэкі, а таксама разнастайную метадычную дапамогу па ўсіх кірунках іх дзейнасці.

## *Л*

**ЛАГАТЫП**

Элемент фірменнага стылю; слоўна-выяўленчы сімвал установы ці яе падраздзялення, што адлюстроўвае асаблівасці іх дзейнасці.

**ЛАГІЧНАЯ ІНДЭКСАЦЫЯ**

Сістэма індэксацыі, якая вызначае рода-відавыя (іерархічныя) адносіны паміж дзяленнямі сістэмы класіфікацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ЛАГІЧНАЯ РАССТАНОЎКА ФОНДУ**

Від расстаноўкі, заснаваны на ўпарадкаванні дакументаў па прыметах іх зместу, тэматыцы ці адлюстраванаму прадмету. Адрозніваюць сістэматычную, тэматычную, прадметную Л.р.ф.

**ЛАКАЛЬНАЕ ЭЛЕКТРОННАЕ ВЫДАННЕ**

Электроннае выданне, прызначанае для лакальнага выкарыстання; вылучаецца ў выглядзе пэўнай колькасці ідэнтычных экзэмпляраў (тыражу) на пераносных машыначытальных носьбітах.

**ЛАКАЛЬНАЯ БАЗА ДАНЫХ**

База даных, змешчаная на адным ці некалькіх лакальных носьбітах.

**ЛАКАЛЬНАЯ СЕТКА**

Сетка, якая ўтрымлівае невялікую колькасць вузлоў, што размяркоўваюцца ўнутры абмежаванай тэрыторыі (арганізацыі, установы, бібліятэк аднаго тыпу і інш.).

**ЛАКАЛЬНЫ БАНК ДАНЫХ**

Банк даных, размешчаных у адным вылічальным цэнтры ці ў знешняй памяці адной ЭВМ.

**ЛАКАЛЬНЫ (ПРАМЫ) ДОСТУП ДА ДАНЫХ**

Метад атрымання электронных рэсурсаў з дапамогай фізічнага носьбіта (дыска, касеты, картрыджа), які ўстаўляецца ў знешняе прыстасаванне, далучанае да камп'ютара.

**ЛАКУНА**

1. Прабел у фондзе бібліятэкі; пропуск, адсутнасць дакумента ў камплекце.

2. Прагал, прапушчанае месца ў тэксце.

**ЛАНЦУГОВЫ МЕТАД**

Складанне паслядоўнага рада (ланцуга) узаемазвязаных прадметных рубрык для АПП, які адлюстроўвае структуру класіфікацыйнага індэкса. Прапанаваны Ш.Р.Ранганатанам.

**ЛАТЭНТНАЯ (СКРЫТАЯ) БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ**

Бібліяграфічная інфармацыя, якая ўтрымліваецца ў дакументах асноўнага небібліяграфічнага зместу і прызначэння (манаграфіях, артыкулах, даведніках, часопісах, газетах і г.д.) і аформленая ў выглядзе ўнутры- і прыкніжных і да т.п. спісах, паказальніках, аглядах, бібліяграфічных спасылках і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ЛЕКСІЧНАЯ АДЗІНКА**

Абазначэнне асобнага паняцця, прынятае ў сістэме жывой ці спецыяльна распрацаванай штучнай мове і надалей у гэтай функцыі непадзельнае.

**ЛЕКЦЫЯ**

Вусны выклад матэрыялу пэўнай тэматыкі. У бібліятэцы звычайна Л. уключаецца ў комплекснае масавае мерапрыемства (тэматычны вечар, экалагічная вечарына, вусны часопіс, свята кнігі і інш.).

**ЛЕТАПІС ДРУКУ**

Бягучы дзяржаўны (нацыянальны) бібліяграфічны паказальнік, які адлюстроўвае ўсе віды твораў друку, што выходзяць на тэрыторыі пэўнай краіны. Раздзелы ці асобныя выданні прысвечаны акрэсленаму віду выданняў ці публікацый. Напрыклад: кніжны Л., Л. выяўленчага мастацтва, Л. нот, Л. часопісных артыкулаў і г.д.

**ЛІКВІДАЦЫЯ БІБЛІЯТЭКІ**

Прыпыненне дзейнасці бібліятэкі, якое можа адбывацца па ініцыятыве заснавальніка. У выпадку парушэння заканадаўства ці статута – ліквідацыя бібліятэкі ажыццяўляецца органам, які зарэгістраваў бібліятэку.

**ЛІНГВІСТЫЧНАЯ РАССТАНОЎКА ФОНДУ**

Сін.: Моўная расстаноўка фонду.

**ЛІНГВІСТЫЧНЫЯ СРОДКІ**

Комплекс інфармацыйна-пошукавых моў рознага тыпу (іерархічных, неіерархічных і інш.); методыка індэксавання і пошуку інфармацыі, а таксама нарматыўна-метадычных дакументаў, якія рэгламентуюць стварэнне і падтрыманне ў рабочым стане лінгвістычных сродкаў і забеспячэнне магчымасці абмену базамі даных. У аўтаматызаванай тэхналогіі выкарыстоўваюцца традыцыйныя ІПМ (мова бібліяграфічнага апісання, ББК, УДК і інш.) і нетрадыцыйныя (дэскрыптарныя ІПМ, мова ключавых слоў, аб’ектна-прыметныя ІПМ і інш.).

**ЛІСТ**

1. Старонка выдання з адваротам.

2. Адзінка аб’ёму выдавецкай прадукцыі.

**ЛІСТАВОЕ ВЫДАННЕ**

Выданне ў выглядзе аднаго ці некалькіх аркушаў друкаванага матэрыялу любога фармату без змацавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ЛІСТАВЫ КАТАЛОГ**

Каталог на асобных лістах, замацаваных з аднаго боку. Разнастайнасць блок-карткавага каталога.

**ЛІСТОК**

Перыядычнае (ці выданне з працягам) тэкставае ліставое выданне памерам не менш за чатыры старонкі, якое ўтрымлівае галоўным чынам грамадска-палітычную, навуковую ці вытворча-тэхнічную інфармацыю. Недапушчальна ў гэтым сэнсе выкарыстоўваць тэрмін «лістоўка».

**ЛІСТОК ТЭРМІНУ ЗВАРОТУ ДАКУМЕНТА**

Лісток, на якім пазначаецца тэрмін звароту дакумента і прастаўляецца рэгістрацыйны нумар фармуляра чытача. Служыць для напаміну чытачу аб неабходнасці своечасовага звароту дакументаў у бібліятэку, для адшукання фармуляраў чытачоў, а таксама для аналізу выкарыстання фонду.

**ЛІСТОЎКА (УЛЁТКА)**

Малафарматнае ліставое выданне аб'ёмам ад адной да чатырох старонак.

**ЛІТАГРАФАВАНАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, тэкст якога і ілюстрацыі надрукаваны спосабам літаграфіі.

**ЛІТАГРАФІЯ**

Спосаб друку, пры якім адбітак атрымліваецца шляхам пераносу фарбы пад ціскам з плоскай друкарскай формы (каменя ці металічнай пласціны); прымяняецца цяпер галоўным чынам у эстампах.

**ЛІТАРАТУРА**

Сукупнасць твораў пісьменства, якія маюць грамадскае значэнне.

**ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, якое змяшчае твор (творы) мастацкай літаратуры.

**ЛІТАРАТУРНА-МУЗЫЧНАЯ ГАСЦЁЎНЯ**

Чытацкае аб'яднанне на аснове зацікаўленасці літаратурай і музыкай.

**ЛІТАРАТУРНАЯ ВЕЧАРЫНА**

Масавае мерапрыемства, мэтай якога з'яўляецца рэклама літаратуры; звычайна складаецца з дзвюх частак: літаратурнай і мастацкай.

**ЛІТАРАТУРНАЯ ГАДЗІНА**

Масавае мерапрыемства ў бібліятэцы, мэта якога – знаёмства чытачоў з літаратурнымі навінкамі або з творчасцю таго ці іншага пісьменніка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ЛІТАРАТУРНАЯ ГУЛЬНЯ**

Масавае мерапрыемства, прысвечанае творчасці пісьменніка ці асобнаму літаратурнаму твору ў форме гульні, акрэсленай пэўнымі правіламі. Адным з відаў Л. г. з’яўляецца віктарына або літаратурна-паэтычны лабірынт.

**ЛІТАРАТУРНЫ КАЛЯНДАР**

Від нагляднай рэкламы літаратурнай з’явы (знаёмства чытача з новым у літаратуры прозвішчам, прэм’ера кнігі, юбілей пісьменніка).

**ЛІТАРАТУРНЫ СУД**

Від літаратурнай гульні – абмеркаванне твораў мастацкай літаратуры, арганізаванае ў форме тэатралізаванага паказу. Існаваў у практыцы публічных бібліятэк у 20–30-я гады ХХ ст.

**ЛІТАРАТУРНЫЯ ПЯТНІЦЫ**

Чытацкія творчыя аб’яднанні на аснове зацікаўленасці літаратурай. Звычайна аб’ядноўваюцца маладыя празаікі, паэты, крытыкі. Мэта іх – рэклама асабістых твораў у бібліятэках.

**ЛІТАРНАЯ ПАГІНАЦЫЯ**

Абазначэнне старонак загалоўнымі ці прапіснымі літарамі.

**ЛІЧБАВАЯ ІНДЭКСАЦЫЯ**

Сістэма індэксацыі, у якой галоўным чынам выкарыстоўваюцца лічбы разам з матэматычнымі і пунктуацыйнымі знакамі.

**ЛЯЛЕЧНЫ ТЭАТР ПРЫ ДЗІЦЯЧЫХ БІБЛІЯТЭКАХ**

Самадзейныя аб’яднанні дзяцей, мэта якіх – рэклама кнігі, чытання, адносін да кнігі і г.д. з дапамогай тэатралізаваных пастановак.

## *М*

**МАДЭЛЬ ФОНДУ**

Схема ці апісанне бібліятэчнага фонду, у якіх адлюстроўваюцца яго асноўныя характарыстыкі ў іх сувязях. Аптымальная М. ф. уяўляе абстрагаваны, ідэальны вобраз, што змяшчае пажаданыя якасныя і колькасныя параметры. Імітацыйная М. ф. – узнаўленне параметраў рэальна існуючага фонду. Ствараюцца апісальныя (якія даюць слоўны вобраз), якасна-галіновыя (матэматычныя), бібліяграфічныя (якія прапануюць пэўны пералік выданняў), тэматыка-тыпалагічныя (набор тэматычных рубрык з вызначэннем мэтавага і чытацкага прызначэння дакументаў) і іншыя М. ф.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**МАДЭЛЯВАННЕ ФОНДУ**

Узнаўленне ці вызначэнне пры дапамозе мадэляў якасцей і параметраў бібліятэчнага фонду з мэтай іх даследавання і наступнай аптымізацыі. М. ф. прымяняецца як для выпрацоўкі навуковых уяўленняў аб фондзе, так і для прагназавання яго развіцця.

**МАДЭРНІЗАЦЫЯ БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ЦЭНТРАЎ**

Абнаўленне, змяненне ўстаноў у прымяненні да новых сучасных інфармацыйна-электронных тэхналогій і патрабаванняў да іх матэрыяльна-тэхнічнай базы, вытворчых працэсаў і інш.

**МАКЕТ АНАТАВАНАЙ КАТАЛОЖНАЙ КАРТКІ**

Форма каталагізацыі ў выданні – публікацыя на адвароце тытульнага ліста ці на апошняй паласе выдання бібліяграфічнага апісання з класіфікацыйнымі індэксамі, анатацыяй, іншымі элементамі.

**МАКРАКАПІРАВАННЕ**

Капіраванне, пры якім памеры выявы на копіі большыя, чым на арыгінале.

**МАКРАКОПІЯ**

Копія, атрыманая ў выніку павелічэння адбітку выявы арыгінала.

**МАЛАЎЖЫВАЛЬНАЯ ЧАСТКА ФОНДУ**

Частка фонду, абарачальнасць якой ніжэй за аптымальны ўзровень для дадзенай бібліятэкі.

**МАНАГРАФІЧНАЕ БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ АПІСАННЕ**

Бібліяграфічнае апісанне аднатомнага выдання ўвогуле, а таксама асобнага тома шматтомнага ці серыйнага выдання.

**МАНАГРАФІЯ**

Навуковае кніжнае выданне, якое змяшчае звесткі пра ўсебаковае даследаванне адной праблемы ці тэмы і належыць аднаму або некалькім аўтарам.

**МАПА**

Пабудаваны ў графічнай праекцыі, зменшаны, абагульнены відарыс паверхні Зямлі, паверхні іншага нябеснага цела, які паказвае размешчаныя на ёй аб’екты ў пэўнай сістэме ўмоўных абазначэнняў.

**МАРГІНАЛІЯ**

1. Загаловак, які вынесены на поле старонкі і пастаўлены насупраць першага радка тэксту, да якога адносіцца.

2. Заўвага на палях выдання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**МАРКЕТЫНГ (БІБЛІЯТЭЧНЫ)**

Спосаб рэгулявання зносін бібліятэкі са знешнім асяроддзем у працэсе абмену вынікамі дзейнасці. М. уяўляе сабой вызначэнне спажыўцоў (рынкаў), распрацоўку і прадастаўленне прадукцыі і паслуг для кожнага з іх, выбар адпаведных інструментаў і тэхналогій, наяўнасць сучаснага вобраза мыслення спецыялістаў бібліятэкі з улікам новай карпаратыўнай культуры бібліятэчнай установы.

**МАСАВАЕ БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ ІНФАРМАВАННЕ**

Сукупнасць формаў і метадаў вуснага і нагляднага інфармавання аб дакументах сярод шырокага кола карыстальнікаў.

**МАСАВАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, разлічанае на самае шырокае кола чытачоў.

**МАСАВАЕ ІНФАРМАВАННЕ**

Інфармаванне шырокага кола спажыўцоў інфармацыі па сацыяльна значных тэмах (**3.2.2.10**).

**МАСАВАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Універсальная публічная бібліятэка, прызначаная для абслугоўвання шырокіх слаёў насельніцтва; садзейнічае павышэнню адукацыйнага ўзроўню чытачоў, прафесійнай кваліфікацыі, забеспячэнню вольнага часу грамадзян.

Гл.: Публічная бібліятэка.

**МАСАВА-ПАЛІТЫЧНАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, якое змяшчае матэрыялы (дакументы) грамадска-палітычнай тэматыкі, выкладзеныя ў форме, даступнай для масавага чытача.

**МАСАВАЯ ЛІТАРАТУРА**

Сукупнасць твораў, прызначаных для шырокага кола чытачоў.

**МАСАВАЯ РАБОТА БІБЛІЯТЭКІ**

Сукупнасць формаў і метадаў вуснай, друкаванай і нагляднай прапаганды твораў друку і іншых дакументаў сярод чытачоў.

**МАСТАК-АФАРМІЦЕЛЬ ВЫДАННЯ**

Мастак, які распрацоўвае праект мастацкага афармлення і рыхтуе эскізы і арыгіналы гэтага афармлення.

**МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА**

Сукупнасць твораў, у якіх сродкам пазнання і адлюстравання рэчаіснасці з’яўляецца мастацкае слова.

**МАСТАЦКАЯ РЭПРАДУКЦЫЯ**

Ліставое выданне, якое ўзнаўляе твор выяўленчага мастацтва (карціну, малюнак і г.д.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**МАСТАЦТВАЗНАЎЧЫЯ КЛУБЫ**

Клубы аматараў розных відаў мастацтва; часта ў якасці чытацкіх аб'яднанняў дзейнічаюць пры бібліятэках.

**МАТЫВЫ ЧЫТАННЯ**

Кампанент чытацкай накіраванасці – унутраныя намеры (стымулы, імкненні) чытача, якія выступаюць у форме магчымых уяўленняў аб тых ці іншых вартасцях дакументаў і задавальняюць яго патрэбы ў чытанні.

**МАШЫНАЧЫТАЛЬНАЯ КАТАЛАГІЗАЦЫЯ**

Сістэма каталагізацыі, якая выкарыстоўваецца для арганізацыі і распаўсюджання ў машыначытальнай форме структураваных у адпаведнасці з міжнароднымі правіламі каталагізацыі бібліяграфічных даных, аб'яднаных у нацыянальныя і лакальныя базы даных.

**МАШЫНАЧЫТАЛЬНЫ ДАКУМЕНТ**

Дакумент, тэкст якога можа быць счытаны чытальнымі прыстасаваннямі ЭВМ з распазнаваннем знакаў алфавіта.

**МАШЫНАЧЫТАЛЬНЫ КАТАЛОГ**

Бібліятэчны каталог на машыначытальных носьбітах, які выкарыстоўваецца ў ІПС у рэжыме «запыт-адказ» і (ці) для падрыхтоўкі кніжных версій каталогаў з дапамогай ЭВМ.

**МАШЫНАЧЫТАЛЬНЫЯ ТАБЛІЦЫ ББК**

Табліцы ББК для электроннага каталога, кожнае дзяленне якіх прадстаўлена ў выглядзе машыначытальнага запісу з указаннем іерархічных сувязей паміж дзяленнямі, спасылак і адсылак, метадычных указанняў і прадметнага ўваходу.

**МБА**

Гл.: Міжбібліятэчны абанемент.

**МЕДЫЦЫНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Спецыяльная бібліятэка, якая забяспечвае медыцынскія інфармацыйныя запатрабаванні медыцынскіх супрацоўнікаў усіх катэгорый.

**МЕДЫЯТЭКА**

Арганізацыя (служба, падраздзяленне ўстановы), у абавязкі якой уваходзіць збор, захаванне, прадастаўленне карыстальнікам аўдыявізуальных і медыяматэрыялаў.

**МЕМАРЫЯЛЬНАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, зробленае ў памяць якой-небудзь асобы (вучонага, пісьменніка, артыста і г.д.); змяшчае артыкулы і матэрыялы, звязаныя з дзейнасцю гэтай асобы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ФУНКЦЫЯ БІБЛІЯТЭКІ**

Сацыяльная функцыя, якая ўключае мэтанакіраваную дзейнасць бібліятэкі па захаванні і актуалізацыі сацыяльнай памяці пры дапамозе фарміравання і захавання фондаў дакументаў, стварэння бібліяграфічных зводаў літаратуры.

**МЕНЕДЖМЕНТ**

Прафесійная галіна дзейнасці, звязаная з пастаноўкай мэт і распрацоўкай спосабаў іх дасягнення ў працэсе выканання функцый планавання, арганізацыі кантролю; уменне дабівацца вынікаў, адпаведных пастаўленай мэце, выкарыстоўваючы працу, інтэлект, матывы паводзін людзей. Аб’ектам бібліятэчнага менеджменту з’яўляецца бібліятэка як складаная сацыяльна-эканамічная сістэма, прадметам – сукупнасць заканамернасцей упраўленчай дзейнасці бібліятэкі.

**МЕСЦА ВЫДАННЯ**

Месцазнаходжанне выдавецтва ці выдаўца, які надрукаваў дакумент.

**МЕТАДАНЫЯ (МЕТААПІСАННЕ) ЭЛЕКТРОННАГА ІНФАРМАЦЫЙНАГА РЭСУРСА**

Фармалізаванае апісанне электроннага інфармацыйнага рэсурса, якое выкарыстоўваецца для ідэнтыфікацыі і катэгарызацыі інфармацыйнага рэсурсу пры рабоце з вялікай сукупнасцю інфармацыйных рэсурсаў.

**МЕТАДЫСТ**

Супрацоўнік бібліятэкі, у функцыі якога ўваходзіць выкананне навукова-метадычнай работы: кансультацыі, аказанне практычнай і метадычнай дапамогі, распрацоўка метадычных рэкамендацый, парад і г.д.

**МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ АЎТАМАТЫЗАВАНАЙ СІСТЭМЫ**

Сукупнасць дакументаў аб тэхналогіі функцыянавання АС, метады адбору і прымянення карыстальнікамі тэхналагічных прыёмаў для атрымання пэўных вынікаў пры функцыянаванні АС.

**МЕТАДЫЧНАЯ ДАПАМОГА**

Дзейнасць навукова-метадычных цэнтраў, якая заключаецца ў дапамозе бібліятэкам у справе ўкаранення і выкарыстання найбольш эфектыўных метадаў, прыёмаў і формаў бібліятэчнай работы. Формамі М.д. з’яўляюцца: метадычны інструктаж, метадычная кансультацыя, практыкум і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**МЕТАДЫЧНАЯ КАНСУЛЬТАЦЫЯ**

Форма метадычнай дапамогі па якім-небудзь пытанні бібліятэчнай работы. М.к. можа быць індывідуальнай ці групавой, вуснай ці пісьмовай.

**МЕТАДЫЧНАЯ РАСПРАЦОЎКА**

Метадычнае выданне, якое спалучае ў сабе метадычныя парады і дакументы ў дапамогу арганізацыі і правядзення бібліятэчнага мерапрыемства або афармлення выстаўкі ці арганізацыі чытацкага аб'яднання пры бібліятэцы.

**МЕТАДЫЧНЫ АПАРАТ КЛАСІФІКАЦЫІ**

Сукупнасць дапаможнікаў, картатэк і паказальнікаў, якія забяспечваюць аднастайнасць метадаў каталагізацыі.

**МЕТАДЫЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Метадычнае выданне, прызначанае для пашырэння ведаў па агульных пытаннях бібліятэчнай справы. М. д. можа быць: комплекснага характару, калі змяшчае сістэматызаваны збор асноўных звестак і палажэнняў аб рабоце бібліятэк адпаведнага тыпу; па асобных напрамках бібліятэчнай работы; па афіцыйных дакументах, палажэннях, дзе змяшчаюцца парады па іх укараненні.

**МЕТАДЫЧНЫ ІНСТРУКТАЖ**

Форма метадычнай дапамогі, якая канкрэтызуецца з улікам асаблівасцей кожнай бібліятэкі. М. і. здзяйсняецца шляхам: наведвання бібліятэк і парад на месцы; кансультацый па просьбе бібліятэкараў; заўваг і водгукаў на планы, справаздачы і г.д.; запрашэння супрацоўнікаў бібліятэк у метадычныя цэнтры з рознымі мэтамі.

**МЕТАДЫЧНЫ СЕМІНАР**

Групавыя заняткі з мэтай абмеркавання прафесійных пытанняў і абмену вопытам работы.

**МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ**

Метадычнае выданне, якое змяшчае комплекс прапаноў і парад, што садзейнічаюць укараненню найбольш эфектыўных метадаў і формаў работы ў вырашэнні якой-небудзь праблемы бібліятэчнай справы.

**МЕТАІНФАРМАЦЫЯ**

Інфармацыя аб інфармацыі; арыенціры, якія дапамагаюць чытачу арыентавацца ў памяшканні бібліятэкі, ці ў яе структурных падраздзяленнях (аб'явы, схемы, піктаграмы, табло), а таксама ў інфармацыйна-дакументных рэсурсах бібліятэкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Камп'ютарныя тэхналогіі прапануюць шырокі спектр метаінфармацыйных сродкаў (каляровыя вокны, меню, паказчыкі, кнопкі з выявай прадметаў-сімвалаў і інш.). Метаінфармацыя забяспечвае хуткасць пошуку інфармацыі з дапамогай алгарытмаў бібліяграфічнага пошуку, садзейнічае больш лёгкаму доступу да інфармацыі.

**МЕТОДЫКА-БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ**

Метадычныя выданні, якія раскрываюць методыку работы бібліятэкара з літаратурай розных галін ведаў і змяшчаюць бібліяграфічны спіс літаратуры па дадзенай тэме.

**МЕТОДЫКА КАТАЛАГІЗАЦЫІ**

Сукупнасць прынцыпаў, прыёмаў і правіл, якія рэгламентуюць працэсы каталагізацыі.

**МЕТРАПАЛІЦА**

Міжнародная адзінка для супастаўляльнага вымярэння аб'ёму фондаў, за якую прыняты 1 м стэлажнай паліцы, занятыя кнігамі або іншымі дакументамі.

**МЕХАНІЗАЦЫЯ БІБЛІЯТЭЧНЫХ ПРАЦЭСАЎ**

Выкарыстанне ў бібліятэчнай тэхналогіі машын, прыстасаванняў, канструкцый і сістэм механічнага тыпу, якія павышаюць прадукцыйнасць працы бібліятэкара і паляпшаюць абслугоўванне чытачоў.

**МІЖБІБЛІЯТЭЧНЫ АБАНЕМЕНТ (МБА)**

Бібліятэчны абанемент, заснаваны на ўзаемным выкарыстанні фондаў бібліятэк краіны ў адпаведнасці з вызначанымі правіламі.

**МІЖВЕДАМАСНАЯ ЦЭНТРАЛІЗАЦЫЯ**

Аб'яднанне бібліятэк розных ведамстваў на прынцыпах цэнтралізацыі з мэтай стварэння адзінай бібліятэчнай сеткі для эфектыўнага выкарыстання рэсурсаў. Міжведамасныя цэнтралізаваныя бібліятэчныя сістэмы (ЦБС) аб'ядноўваюць публічныя дзяржаўныя бібліятэкі (ПДБ) і школьныя; спецыяльныя і тэхнічныя ў межах вытворчых аб'яднанняў.

**МІЖНАРОДНАЕ СТАНДАРТНАЕ БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ АПІСАННЕ (ISBD)**

Бібліяграфічнае апісанне, якое рэгламентуецца міжнароднымі патрабаваннямі да складання бібліяграфічнага апісання кніг, серыйных выданняў і іншых дакументаў.

**МІЖНАРОДНАЯ БІБЛІЯТЭЧНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ**

Аб'яднанне прадстаўнікоў некалькіх (многіх) дзяржаў, якое мае статус міжнароднай арганізацыі. Ставіць на мэце развіц-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цё супрацоўніцтва паміж бібліятэкамі розных краін, падрыхтоўку міжнародных стандартаў, правядзенне сумесных даследаванняў, абмен вопытам. Буйнейшымі грамадскімі М. б. а. з’яўляюцца ІФЛА (Міжнародная федэрацыя бібліятэчных асацыяцый і ўстаноў); МФД (Міжнародная федэрацыя па дакументацыі) і інш.

**МІЖНАРОДНАЯ БІБЛІЯТЭЧНАЯ СТАТЫСТЫКА**

Разнавіднасць бібліятэчнай статыстыкі, якая вывучае стан бібліятэчнай справы ва ўсіх ці ў многіх краінах свету. Распрацоўкай праграм назіранняў і методыкі, падрыхтоўкай і друкаваннем матэрыялаў міжнароднай бібліятэчнай статыстыкі займаюцца ЮНЕСКА і ІФЛА.

**МІЖНАРОДНАЯ ІНФАРМАЦЫЙНАЯ СІСТЭМА**

Сукупнасць інфармацыйных органаў краін, якія пастаянна ажыццяўляюць інфармацыйную работу ў якой-небудзь галіне і аб’яднаны ў адзіную сістэму.

**МІЖНАРОДНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік, створаны на аснове міждзяржаўнай кааперацыі краін-партнёраў (**3.3.2.41**).

**МІЖНАРОДНЫ БІБЛІЯТЭЧНЫ АБАНЕМЕНТ**

Бібліятэчны абанемент на ўзаемным выкарыстанні фондаў бібліятэк розных краін у адпаведнасці з устаноўленымі правіламі.

**МІЖНАРОДНЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫ АБМЕН**

Перадача і атрыманне інфармацыйных прадуктаў, аказанне інфармацыйных паслуг за межамі Рэспублікі Беларусь.

**МІЖНАРОДНЫ КНІГААБМЕН**

Кнігаабмен паміж бібліятэкамі ці навуковымі ўстановамі розных краін, які праводзіцца на ўзаемавыгаднай аснове для ўсіх бакоў, што ўдзельнічаюць у абмене, і абавязковасці выканання заключаных паміж імі пагадненняў, абумоўленых двухбаковымі ці шматбаковымі дамовамі, канвенцыямі (міждзяржаўнымі і непасрэдна паміж бібліятэкамі ці навуковымі ўстановамі).

**МІЖНАРОДНЫ СТАНДАРТНЫ НУМАР КНІГІ (ISBN)**

Літарна-лічбавы код рэгістрацыйнага характару, прызначаны для кадзіравання кніжных выданняў з мэтай іх ідэнтыфікацыі; уключае абрэвіятуру ISBN і, як правіла, дзесяць лічбаў. М. с. н. к. прысвойваецца міжнароднымі і нацыянальнымі агенцтвамі ISBN па адзінай методыцы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**МІЖНАРОДНЫ СТАНДАРТНЫ НУМАР СЕРЫЙНАГА ВЫДАННЯ (ISSN)**

Літарна-лічбавы код рэгістрацыйнага характару, прызначаны для кадзіравання серыйных выданняў з мэтай іх ідэнтыфікацыі; уключае абрэвіятуру ISSN і, як правіла, восем лічбаў; прысвойваецца ключавому загалоўку серыйнага выдання міжнародным і нацыянальным агенцтвамі ISSN па адзінай методыцы і ставіцца на кожным чарговым выпуску, нумары, томе.

**МІЖНАРОДНЫ ФАРМАТ MARC, UNIMARC**

Апублікаваны ІФЛА ў 1977 г. міжнародны бібліяграфічны фармат, мэтай якога з'яўляецца садзейнічанне міжнароднаму абмену данымі ў машыначытальнай форме паміж нацыянальнымі службамі.

**МІКРАВЫДАННЕ**

Дакумент, у якім тэкст і ілюстрацыі зменшаны ў памерах спосабам мікракапіравання.

**МІКРАКАПІРАВАННЕ**

Капіраванне, пры якім памеры адлюстравання на копіі значна меншыя, чым на арыгінале.

**МІКРАКАРТА**

Гл.: Мікрафіша.

**МІКРАКОПІЯ**

Копія, атрыманая ў выніку зменшанага адбітку выявы арыгінала.

**МІКРАФІЛЬМ**

Вельмі паменшаныя тэкст або малюнак, змешчаныя на спецыяльнай кінафотаплёнцы.

**МІКРАФІЛЬМАВЫ СЕЛЕКТАР**

Апарат для механізаванага ці аўтаматызаванага пошуку мікракопій дакументаў.

**МІКРАФІЛЬМАВАННЕ**

Сукупнасць працэсаў па падрыхтоўцы мікраформ на розных носьбітах.

**МІКРАФІША**

Рэтраграфічная копія, якая ўтрымлівае адно ці некалькі мікравыяўленняў арыгінала.

**МІНІЯЦЮРНАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне маленькага фармату, для кніжнага блока якога вызначаны верхнія межы (не менш за 100 х 100 мм).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**МІНІЯЦЮРЫЗАЦЫЯ ФОНДУ**

Замена традыцыйных носьбітаў дакументаў у бібліятэчным фондзе на мікракопіі.

**МОВА**

Сістэма знакаў, якая забяспечвае камунікацыю і ўключае набор знакаў (слоўнік) і правілы іх ужывання і інтэрпрэтацыі (граматыка) **(3.1.6)**.

**МОВА БІБЛІЯГРАФІЧНАГА АПІСАННЯ**

Мова, на якой складаецца апісанне дакумента ў адпаведнасці з прынятымі правіламі.

**МОВА ВЫДАННЯ**

Мова асноўнага тэксту выдання.

**МОВА НАТУРАЛЬНАЯ**

Мова, слоўнік і граматычныя правілы якой абумоўлены практыкай прымянення і не заўсёды фармальна зафіксаваны (**3.1.7)**.

**МОВА ШТУЧНАЯ**

Мова, якая створана спецыяльна і рэгулюецца на аснове ўзгодненых прынцыпаў (**3.1.8)**.

**МОНАВЫДАННЕ**

Неперыядычнае выданне, якое змяшчае адзін дакумент.

**МОЎНАЯ РАССТАНОЎКА ФОНДУ**

Фармальная расстаноўка па мовах, на якіх выйшлі ў свет дакументы; спалучаецца з сістэматычнай і алфавітнай расстаноўкай.

Сін.: Лінгвістычная расстаноўка.

**МОЎНЫ ДАПАМОЖНЫ ПАКАЗАЛЬНІК**

Дапаможны паказальнік, які ўяўляе сабой алфавітны пералік моў, на якіх напісаны дакументы, адлюстраваныя ў бібліяграфічным дапаможніку.

**МОЎНЫЯ ТЫПАВЫЯ ДЗЯЛЕННІ (МТД)**

Тыпавыя дзяленні ў ББК, УДК, якія паказваюць катэгорыю мовы.

**МУЗЫЧНАЯ ГАДЗІНА**

Масавае мерапрыемства ў бібліятэцы, якое праводзіцца з мэтай азнаямлення чытачоў з музычнымі творамі ці з творчасцю асобных аўтараў ці выканаўцаў.

**МУЛЬТЫМЕДЫЯ**

Асобны від камп’ютарнай тэхналогіі, які аб’ядноўвае ў сабе традыцыйную статычную (тэкст, графіку) і дынамічную інфармацыю (мову, музыку, відэафрагменты, анімацыю і г.д.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**МЭТАВЫ БЯСПЛАТНЫ ЭКЗЭМПЛЯР**

Бясплатны абавязковы экзэмпляр дакументаў, уведзены на абмежаваны прамежак часу ці з пэўнай мэтай.

## *Н*

**НАВАЦЫЯ**

Новая форма прадукцыі, паслуг, арганізацыі інфармацыйнай вытворчасці. Навацыі забяспечваюць бесперапыннае абнаўленне ўсіх сфер дзейнасці бібліятэкі, падтрымку яе іміджу на сучасным узроўні, які адпавядае навейшым інфармацыйным тэхналогіям, дасягненням навукі і практыкі, грамадскім патрэбнасцям, высокай якасці бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання.

**НАВЕДВАЛЬНІК БІБЛІЯТЭКІ**

Асоба, якая наведвае бібліятэку не з мэтай узяць дакументы для чытання, а з іншай (азнаёміцца з афармленнем, атрымаць даведку, правесці вольны час).

**НАВЕДВАННЕ**

Адносны паказчык абслугоўвання чытачоў, які характарызуе інтэнсіўнасць карыстання бібліятэкай. Вымяраецца колькасцю наведванняў, якія прыходзяцца на аднаго чытача за пэўны час.

**НАВУКОВА-БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік, які прызначаецца ў дапамогу навукова-даследчай дзейнасці **(3.3.2.13)**.

**НАВУКОВА-ДАПАМОЖНАЯ БІБЛІЯГРАФІЯ**

Спецыяльная бібліяграфія, якая забяспечвае інфармацыйныя патрэбы ў галіне навукова-даследчай дзейнасці.

**НАВУКОВАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, якое змяшчае вынікі тэарэтычных і (ці) эксперыментальных даследаванняў, а таксама навукова падрыхтаваныя да публікацыі пісьмовыя помнікі культуры і гістарычныя дакументы.

**НАВУКОВА-ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ**

Галіна дзейнасці па задавальненні патрэбнасцей (запытаў) у навукова-тэхнічнай інфармацыі. Да паняцця Н.-і. д. адносяцца збор, аналітыка-сінтэтычная перапрацоўка, захаванне, пошук, распаўсюджванне навукова-тэхнічнай інфармацыі **(3.1.32).**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЯ РАБОТА**

Дзейнасць па выяўленні і распрацоўцы найбольш эфектыўных метадаў, прыёмаў і формаў бібліятэчнай працы, укараненні іх у практыку з мэтай павышэння ўзроўню работы бібліятэк. Н.-м. р. уключае: а) распрацоўку рэгламентуючых дакументаў і стандартаў, метадычных рэкамендацый і інш.; б) аказанне метадычнай дапамогі. Н.-м. р. выконваюць органы кіравання бібліятэчнай справай і навукова-метадычныя цэнтры.

**НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ЦЭНТР**

Бібліятэка, якая ажыццяўляе навукова-метадычную работу ў групе бібліятэк, аб’яднаных па пэўнай прымеце. Функцыі Н.-м. ц. выконваюць адпаведныя рэспубліканскія, абласныя, цэнтральныя раённыя і цэнтральныя гарадскія бібліятэкі.

**НАВУКОВА-ПАПУЛЯРНАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, якое мае на мэце папулярызацыю тэарэтычных і (ці) эксперыментальных даследаванняў у галіне навукі, культуры і тэхнікі, пададзенае для карыстальніка ў даступнай форме.

**НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Спецыяльная бібліятэка, якая забяспечвае навуковай і бібліяграфічнай інфармацыяй спецыялістаў прамысловасці, будаўніцтва, транспарту, сувязі. Існуе як самастойная ўстанова і як частка навуковай установы ці прадпрыемства.

**НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ**

Інфармацыя, якая атрымліваецца і (або) выкарыстоўваецца ў галіне навукі і (або) тэхнікі **(3.1.25)**.

**НАВУКОВАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Бібліятэка, якая забяспечвае развіццё навукі, задавальняе інфармацыйныя патрэбнасці навуковых устаноў і пэўных асоб, што звязаны з даследчай дзейнасцю, на аснове адпаведнага фонду і інфармацыйна-пошукавага апарату **(3.4.2.16)**.

**НАВУКОВАЯ БІБЛІЯТЭКА (УНІВЕРСАЛЬНАЯ)**

Тып бібліятэкі, якая вызначаецца універсальным фондам, абслугоўваннем спецыялістаў, прымяненнем пераважна інфармацыйных формаў абслугоўвання. Да іх адносяцца Нацыянальная бібліятэка Беларусі, абласныя бібліятэкі.

**НАВУКОВАЯ ІНФАРМАЦЫЯ**

Лагічна арганізаваная інфармацыя, якая атрымліваецца ў працэсе навуковага пазнання і адлюстроўвае з’явы і законы прыроды, грамадства і мыслення **(3.1.24)**.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**НАВУКОВАЯ КАМУНІКАЦЫЯ**

Абмен навуковай інфармацыяй паміж установамі, вучонымі, спецыялістамі.

**НАВУКОВАЯ ЛІТАРАТУРА**

Сукупнасць твораў, якія асвятляюць навуковыя праблемы і служаць першакрыніцамі для навуковага даследавання.

**НАГЛЯДНАЕ РАСКРЫЦЦЁ ФОНДУ**

Гл.: Нагладная прапаганда літаратуры.

**НАГЛЯДНАЯ ПРАПАГАНДА ЛІТАРАТУРЫ**

Работа бібліятэкі па прапагандзе дакументаў пры дапамозе розных выяўленчых сродкаў з мэтай інтэнсіўнага наглядНага ўздзеяння на чытача. У Н. п. л. вылучаюцца напрамкі: непасрэдны паказ твораў друку (розныя віды выстаў); рэклама дакументаў сродкамі выяўленчага мастацтва.

**НАДЗАГАЛОВАЧНЫЯ ДАНЫЯ**

Частка выхадных звестак, якая размяшчаецца перад загалоўкам і ўключае звычайна назву арганізацыі, ад імя якой ажыццяўляецца выданне, загаловак серый, нумар выпуску серый, ініцыялы і прозвішча рэдактара серыі, звесткі аб падсерыі.

**НАДЗЕЙНАСЦЬ ФОНДУ**

Магчымасць фонду забяспечваць даволі поўнае задавальненне профільных запытаў чытачоў. Адным з паказчыкаў Н. ф. з'яўляецца каэфіцыент задавальнення запытаў за пэўны тэрмін (месяц, квартал, год); вызначаецца адносінамі колькасці задаволеных запытаў да агульнай колькасці чытацкіх запытаў, што паступілі ў бібліятэку.

**НАЗВА**

Слова або словазлучэнне, якое выкарыстоўваецца для ідэнтыфікацыі якой-небудзь істоты, прадмета або класа **(3.1.10)**.

**НАКЛАД**

Гл.: Тыраж.

**НАП**

Гл.: Навуковая арганізацыя працы ў бібліятэцы.

**НАМЕНКЛАТУРА**

Арганізаваная сукупнасць назваў, якія выкарыстоўваюцца ў вызначанай галіне ведаў **(3.1.12)**.

**НАМЕНКЛАТУРНЫ КАТАЛОГ**

Пералік прамысловай серыйнай прадукцыі, які ўтрымлівае асноўныя тэхнічныя характарыстыкі яе наменклатуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**НАРМАТЫВЫ БІБЛІЯТЭЧНАЙ ПРАЦЫ**

Разліковыя велічыні затрат разнастайных рэсурсаў – часовых, матэрыяльных, фінансавых і інш., якія ўжываюцца пры нарміраванні і планаванні дзейнасці.

**НАРМАТЫЎНАЕ (АЎТАРЫТЭТНАЕ) АПІСАННЕ**

Апісанне, якое выкарыстоўваецца ў электронных каталогах у якасці нарматыўна-даведачнай інфармацыі для пашырэння магчымасцей аўтаматызаванага інфармацыйнага пошуку.

**НАРМАТЫЎНАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, якое змяшчае нормы, правілы і патрабаванні з розных сфер вытворчай дзейнасці.

**НАРМАТЫЎНА-ТЭХНІЧНЫЯ І ТЭХНІЧНЫЯ ДАКУМЕНТЫ**

Сукупнасць афіцыйных і нарматыўна-вытворчых выданняў: стандартаў, тэхнічных умоў, прамысловых каталогаў, апісанняў вынаходніцтваў да аўтарскіх пасведчанняў ці патэнтаў і г.д. Раней выкарыстоўваўся тэрмін «спецыяльныя віды нарматыўна-тэхнічных і тэхнічных дакументаў і літаратуры».

**НАРМАТЫЎНЫ ЗАПІС**

Машыначытальны запіс нарматыўнага апісання, які захоўваецца ў ЭВМ і перадаецца ў выглядзе файлаў – нарматыўных даных.

**НАРМІРАВАННЕ БІБЛІЯТЭЧНАЙ ПРАЦЫ**

Установка меры затрат працы (у выглядзе нормаў) для выканання за адзінку часу пэўнай бібліятэчнай работы ў вызначаных галінах.

**НАТАЦЫЯ (ІНДЭКСАЦЫЯ)**

Сістэма ўмоўных пісьмовых азначэнняў, прынятая ў якой-небудзь галіне ведаў.

**НТБ**

Гл.: Навукова-тэхнічная бібліятэка.

**НТІ**

Гл.: Навукова-тэхнічная інфармацыя.

**НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯГРАФІЯ**

1. Агульная бібліяграфія, якая забяспечвае рэгістрацыю ўсіх дакументаў, што выйшлі на тэрыторыі краіны, і інфармаванне аб іх. Пры такім вызначэнні гэтае паняцце супадае з тэрмінам «дзяржаўная бібліяграфія».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Агульная бібліяграфія, якая адлюстроўвае дакументы на той ці іншай мове.

3. Агульная бібліяграфія, якая адлюстроўвае дакументы на пэўнай нацыянальнай мове, дакументы нацыянальных аўтараў, якія надрукаваны за межамі краіны, і дакументы, якія па змесце адносяцца да той ці іншай краіны.

**НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Галоўная бібліятэка краіны, якая забяспечвае захоўванне і выкарыстанне айчынных і сусветных інфармацыйных рэсурсаў у інтарэсах грамадства. Н. б. служыць дзяржаўным сховішчам айчынных і сусветных твораў друку і іншых дакументаў; прадастаўляе дакументы і інфармацыю аб іх; займае вядучую ролю ў развіцці ўсёй айчыннай сістэмы бібліятэчнага абслугоўвання шляхам каардынацыі работы бібліятэк, метадычнай дапамогі ім, арганізацыі навуковых даследаванняў. Узначальвае бібліятэкі краіны ў міжнародным бібліятэчным супрацоўніцтве; з'яўляецца цэнтрам нацыянальнай памяці народа.

**НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІНФАРМАЦЫЙНАЯ СЕТКА**

Сукупнасць усіх інфармацыйных органаў у маштабе краіны.

**НАЦЫЯНАЛЬНАЯ КАЛЕКЦЫЯ ДАКУМЕНТАЎ**

Паняцце Н. к. д. у міжнароднай практыцы ўжываецца для абазначэння нацыянальных дакументаў разам з тымі, якія па змесце, аўтарстве і мове адносяцца да пэўнай краіны, але надрукаваны за яе межамі.

**НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ПРАДУКЦЫЯ (ДРУК)**

Друкаваная прадукцыя, якая выпрабляецца на тэрыторыі пэўнай краіны, а таксама за яе межамі па заказе айчынных арганізацый (выдаўцоў).

**НАЦЫЯНАЛЬНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ЦЭНТР**

Бібліяграфічны цэнтр, які забяспечвае дзяржаўны ўлік і распаўсюджванне інфармацыі аб друкаванай прадукцыі краіны **(3.4.1.8)**.

**НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ДАКУМЕНТЫ**

Сукупнасць нацыянальнага друку, неапублікаваных дакументаў, аўдыявізуальнай прадукцыі і электронных выданняў.

**НАЧЫТАНАСЦЬ**

Дасведчанасць у розных галінах ведаў ці ў якой-небудзь адной галіне, набытая ў працэсе карыстання дакументамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адрозніваюць: агульную Н., Н. у пэўных галінах ведаў і Н. у мастацкай літаратуры. Н. адрозніваецца ад многачытання якасцю набытых ведаў і іх сістэмнасцю.

**НЕАПРАЦАВАНЫ ФОНД**

Частка бібліятэчнага фонду, якую складаюць дакументы, не падвергнутыя бібліятэчнай апрацоўцы.

**НЯВЫКАРЫСТАНАЯ ЧАСТКА ФОНДУ**

Частка фонду, якая за ўвесь час знаходжання ў бібліятэцы ні разу не запатрабавана. У складзе Н. ч. ф. адрозніваюць пасіўную частку, якая забяспечвае яму запас трываласці, і баласт фонду.

**НЕЗАЛЕЖНЫЯ ВЫЗНАЧАЛЬНІКІ**

Агульныя вызначальнікі, якія выкарыстоўваюцца ў камбінацыі з індэксамі асноўнай табліцы ці самастойна.

**НЕНАТУРАЛЬНАЯ (ШТУЧНАЯ) КЛАСІФІКАЦЫЯ**

Класіфікацыя, якая ўтрымлівае ў аснове адвольна ўзятыя прыметы, з практычнага пункта гледжання зручныя для дасягнення класіфікацыйных мэт.

**НЕНАТУРАЛЬНАЯ (ШТУЧНАЯ) МОВА**

Мова, спецыяльна створаная і рэгулюемая на аснове ўзгодненых (дапасаваных) прынцыпаў. Выкарыстоўваецца для дасягнення пэўных інфармацыйна-практычных мэт.

**НЕНУМАРАВАНАЯ СТАРОНКА**

Старонка, якая не ўваходзіць у агульную пагінацыю выдання (уклейкі, укладкі і г.д.).

**НЕПЕРЫЯДЫЧНАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, якое выходзіць аднаразова, не мае працягу. У якасці Н. в. выходзяць кнігі, брашуры, лістоўкі і г.д.

**НЕТРАДЫЦЫЙНЫЯ НОСЬБІТЫ ІНФАРМАЦЫІ**

Носьбіты інфармацыі, створаныя з выкарыстаннем пэўных тэхнічных сродкаў – перфаленты, перфакарты, магнітныя стужкі, дыскі і інш.

**НОВАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, якое выпускаецца выдавецтвам упершыню (у адрозненне ад перавыдання).

**НОРМА АБСЛУГОЎВАННЯ**

Колькасць чытачоў, наведванняў і г.д., што прыходзіцца на аднаго бібліятэкара ў пэўны прамежак часу (працоўны дзень, месяц, год).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**НОРМА БІБЛІЯТЭЧНАЙ ПРАЦЫ**

Рэгламентаваная велічыня затрат працы і часу на выкананне бібліятэчнага цыкла, бібліятэчнага працэсу і бібліятэчнай аперацыі ў вызначаных арганізацыйна-тэхнічных умовах. Адрозніваюць Н. часу, Н. выпрацоўкі, Н. абслугоўвання і інш.

**НОРМА ВЫПРАЦОЎКІ**

Рэгламентаваная велічыня аб'ёму работы (колькасць апрацаваных дакументаў, колькасць чытачоў і г.д.), якая павінна быць выканана за адзінку часу (за хвіліну, гадзіну, працоўны дзень).

**НОРМА ЧАСУ**

Рэгламентаваная адзінка часу на выкананне якога-небудзь працэсу, аперацыі ці правядзенне мерапрыемства.

**НОСЬБІТ ІНФАРМАЦЫІ (ДАНЫХ)**

Сродкі рэгістрацыі, захоўвання, перадачы інфармацыі (даных) **(3.2.1.4)**.

Спецыяльнае прыстасаванне, сістэма, фізічнае асяроддзе, напрыклад выданне, мікраформа, магнітная стужка, дыск, дыскета і інш.

**НОТНАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, большую частку аб'ёму якога складае нотны запіс музычных твораў (твора).

**НУМАРАВАНАЯ СТАРОНКА**

Старонка, якая ўваходзіць у агульную пагінацыю выдання.

**НУМАРАЦЫЙНАЯ РАССТАНОЎКА ФОНДУ**

Фармальная расстаноўка па нумарах, якія прысвойваюцца дакументам па меры іх паступлення ў бібліятэку ці ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартнымі нумарамі; прымяняецца ў буйных бібліятэках. Разнавіднасці Н. р. ф. – інвентарная і прыгонная.

**НУМАРАЦЫЙНЫ ДАПАМОЖНЫ ПАКАЗАЛЬНІК**

Дапаможны паказальнік, які ўтрымлівае пералік нумароў, што прысвоены дакументам, адлюстраваным у бібліяграфічным дапаможніку па прынятай сістэмай нумарацыі.

**НУМАРАЦЫЙНЫ КАТАЛОГ**

Бібліятэчны каталог, у якім бібліяграфічныя запісы размяшчаюцца па парадку прысвоеных дакументам нумароў.

**НУМАРНЫЯ ПАДРАЗДЗЯЛЕННІ КОМПЛЕКСУ УДК**

Далучэнне да індэкса УДК з дапамогай астэрыкса лічбаў, якія вызначаюць колькасную характарыстыку паняцця ці лічбавыя індэксы іншай класіфікацыйнай сістэмы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## О

**ОРГАН НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАЙ ІНФАРМАЦЫІ**

Спецыялізаваная арганізацыя або структурнае падраздзяленне прадпрыемства, арганізацыі, якія ажыццяўляюць інфармацыйную дзейнасць, а таксама навуковыя даследаванні ў гэтай галіне (**3.4.1.7**).

## П

**ПАБЛІК РЫЛЕЙШНЗ У БІБЛІЯТЭЧНАЙ УСТАНОВЕ**

Сувязі з грамадскасцю, спосаб фарміравання іміджу бібліятэчна-інфармацыйнай установы.

**ПАВАРАЧАЛЬНАЯ КАРТАТЭКА**

Картатэка ў выглядзе вертыкальна размешчаных прамавугольных секцый, якія змяшчаюць каталожныя карткі. Секцыі замацоўваюцца левым бокам да цэнтральнага рухомага стрыжня, на якім картатэка паварочваецца вакол вертыкальнай восі.

**ПАВЕДАМЛЕННЕ**

Інфармацыя, якая перададзена і (або) атрымана ў працэсе камунікацыі (**3.1.23**).

**ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ ПРАТЭРМІНОЎЦЫ**

Спосаб інфармавання чытача (звычайна паштоўкай) аб заканчэнні тэрміну карыстання дакументам з просьбай вярнуць яго ў бібліятэку.

**ПАВЫШЭННЕ КВАЛІФІКАЦЫІ БІБЛІЯТЭКАРАЎ**

Удасканаленне прафесійных ведаў, навыкаў і ўменняў, павышэнне агульнаадукацыйнага ўзроўню бібліятэкараў у адпаведнасці з найноўшымі дасягненнямі культуры, навукі і тэхнікі, перадавым бібліятэчным вопытам. Ажыццяўляецца праз інстытуты павышэння кваліфікацыі, курсы, практыкумы, майстар-класы, навукова-практычныя канферэнцыі; шляхам самаадукацыі.

**ПАГІНАЦЫЯ**

1. Парадкавая нумарацыя старонак, палос, калонак ці асобных элементаў (адрэзкаў тэксту, табліц, ілюстрацый і г.д.).

2. Агульная колькасць старонак у дакуменце, уключаючы карты, дадаткі і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**«ПАДАРОЖЖА» ПА КРАІНАХ СВЕТУ**

Масавае мерапрыемства ў бібліятэцы; праводзіцца з мэтай больш дэталёвага азнаямлення чытачоў з геаграфічным, эканамічным, культурным жыццём розных народаў; часцей за ўсё праводзіцца сярод дзяцей і падлеткаў.

**ПАДЗАГАЛОВАК ПРАДМЕТНАЙ РУБРЫКІ**

Другі (і кожны наступны) элемент шматлікай прадметнай рубрыкі, што аддзяляецца ад іншых раздзяляльным знакам. П. п. р. у залежнасці ад зместу можа быць тэматычным, геаграфічным і храналагічным; у залежнасці ад ступені і межаў прымянення – агульным і спецыяльным.

**ПАДЗАГАЛОВАЧНЫЯ ЗВЕСТКІ (ДАНЫЯ)**

Элемент выхадных звестак выдання, які змешчаны на тытульным лісце пад загалоўкам і ўтрымлівае ўдакладненні загалоўка, указанні на характар і жанр твора, яго прызначэнне, прозвішчы асоб, якія ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы выдання, звесткі аб паўторнасці і перыядычнасці выдання і г.д. Частка П. з. можа быць змешчана на адвароце тытульнага ліста.

**ПАДПІСКА**

Афармленне права бібліятэк атрымліваць перыядычныя ці падпісныя выданні; спосаб папаўнення бібліятэчнага фонду.

**ПАДПІСНОЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, якое распаўсюджваецца па папярэдняй падпісцы, як правіла, праз кніжны гандаль.

**ПАДРУБРЫКА**

Другое і наступныя тэматычныя дзяленні рубрыкі.

**ПАДРУЧНІК**

Вучэбнае выданне, у якім сістэматычна, у адпаведнасці з вучэбнай праграмай, выкладаюцца асновы ведаў у пэўнай галіне, што складаюць змест вучэбнай дысцыпліны ці яе часткі, і якое афіцыйна зацверджана ў якасці дадзенага віду выдання.

**ПАДСЕРЫЯ**

Частка серыі з больш вузкім, чым серыя, прызначэннем ці зместам і загалоўкам, які дапаўняе загаловак серыі.

**ПАДСОБНЫ ФОНД**

Частка бібліятэчнага фонду, якая складаецца з дакументаў, што найчасцей запытваюцца чытачом. П. ф. з’яўляецца часткова дубліруючым у адносінах да асноўнага фонду.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ПАЗАБЮДЖЭТНЫ ДАХОД БІБЛІЯТЭКІ**

Сукупнасць дадатковых даходаў бібліятэкі, атрыманых за кошт платных паслуг.

**ПАЗАСТАЦЫЯНАРНАЕ БІБЛІЯТЭЧНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ**

Абслугоўванне чытачоў за межамі стацыянарнай бібліятэкі: у бібліятэчных пунктах, перасовачных бібліятэках сродкамі завочнага абанемента і інш., што забяспечвае набліжэнне бібліятэчных паслуг да месца працы, вучобы або жыхарства насельніцтва **(3.2.2.5)**.

**ПАЗІЦЫРАВАННЕ БРЭНДА**

Месца на рынку, занятае бібліятэчна-бібліяграфічным брэндам па адносінах да канкурэнтаў, а таксама набор патрэбнасцей карыстальнікаў бібліятэчна-інфармацыйных рэсурсаў, іх успрыманне; частка індывідуальнага брэнда, якая павінна актыўна выкарыстоўвацца для «адстройкі» ад канкурэнтаў.

**ПАКАЗАЛЬНІК (СПІС, АГЛЯД) БІБЛІЯГРАФІЧНЫХ ДАПАМОЖНІКАЎ**

Бібліяграфічны паказальнік, які ўтрымлівае звесткі аб бібліяграфічных дапаможніках.

**ПАКАЗАЛЬНІК ДА ВЫДАННЯ**

Частка даведачнага апарату выдання, якая раскрывае склад ці змест твораў, што змешчаны ў дадзеным выданні, і забяспечвае пошук асобных твораў, змешчаных у дадзеным выданні, напрыклад у зборы твораў (алфавітны паказальнік загалоўкаў твораў), а таксама паглыбляе арыентацыю ў розных аспектах зместу дакумента, які змешчаны ў дадзеным выданні (прадметныя, імянныя, геаграфічныя і іншыя паказальнікі).

**ПАКАЗАЛЬНІК ДА КАТАЛОГА**

Элемент сістэмы каталогаў і картатэк, які забяспечвае пошук інфармацыі ў каталогах і картатэках. У адрозненне ад іншых элементаў сістэмы не ўтрымлівае бібліяграфічнай інфармацыі.

**ПАКАЗАЛЬНІК (СПІС, АГЛЯД) МЯСЦОВАГА ДРУКУ**

Бібліяграфічны паказальнік, які адлюстроўвае дакументы незалежна ад іх зместу, выдадзеныя на тэрыторыі пэўнага рэгіёна, краіны **(3.3.2.22)**.

**ПАКАЗАЛЬНІК ЦЫТАВАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ**

Бібліяграфічны дапаможнік, пабудаваны такім чынам, што кожнаму аўтару і яго публікацыі пастаўлены ў адпаведнасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

іншыя аўтары і іх публікацыі, у якіх упамінаюцца ці цытуюцца работы першых. П. ц. л. раскрывае ўнутраныя сувязі паміж дакументамі, зафіксаванымі ў бібліяграфічных спасылках.

Сін.: Паказальнік бібліяграфічных спасылак.

**ПАКАЗЧЫКІ БІБЛІЯТЭЧНАЙ СТАТЫСТЫКІ**

Колькасныя характарыстыкі той ці іншай з'явы або працэсу бібліятэчнай справы. Выражаюцца ў абсалютных велічынях (колькасць чытачоў, кніг і г.д.) і ў адносных (абарачальнасць фонду, чытальнасць і інш.). Прымяняюцца таксама сярэднія П. б. с. (сярэдняя колькасць жыхароў, чытачоў, кніг на адну бібліятэку, сярэдняя чытальнасць, абарачальнасць і інш.).

**ПАКАЗЧЫКІ РЭЗУЛЬТАТЫЎНАСЦІ ДАКУМЕНТНЫХ ПАСЛУГ**

Ступень задавальнення запыту, узровень адмоў, ступень аператыўнасці выканання запыту. Ступень задавальнення запыту – адносіны колькасці задаволеных запытаў да ўсіх запытаў. Узровень адмоў – адносіны колькасці адмоў на запыты да агульнай колькасці запытаў. Ступень аператыўнасці выканання запыту – адносіны часу ад паступлення запыту да выдачы дакумента (даведкі, копіі) да нарматыўнага часу для выканання запыту дадзенага тыпу. Акрамя гэтых паказчыкаў, бібліятэкі выкарыстоўваюць таксама дакладнасць задавальнення запыту абанентаў (адносіны колькасці адпаведных запытам (рэлевантных) дакументаў да агульнай колькасці выдадзеных чытачам дакументаў); паўнату задавальнення запыту (адносіны колькасці рэлевантных дакументаў, выдадзеных абанентам, да колькасці рэлевантных дакументаў, якія маюцца ў пошукавым масіве дакументаў).

**ПАКАЗЧЫКІ РЭЗУЛЬТАТЫЎНАСЦІ КАМУНІКАТЫЎНЫХ ПАСЛУГ**

Сярод П. р. к. п. трэба вылучыць наступныя:

а) узровень валодання чытачамі навыкамі работы з бібліятэчным фондам, каталогамі, картатэкамі, бібліяграфічнымі дапаможнікамі і г.д. (адносіны колькасці чытачоў, якія валодаюць гэтымі ўменнямі, да агульнай колькасці чытачоў);

б) ступень абгрунтаванасці выбару бібліятэкарамі формаў навучання элементам культуры чытання (вызначаецца метадам экспертных ацэнак, зыходзячы з уліку педагагічнага мэтавага і чытацкага прызначэння);

в) ступень ахопу абанентаў навучаннем элементам культуры чытання (адносіны колькасці чытачоў, якія вучыліся

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рабоце з бібліятэчнымі сродкамі, да агульнай колькасці тых чытачоў, якім на аснове экспертных ацэнак патрабавалася навучанне);

г) ступень выкарыстання формаў, накіраваных на актывізацыю зносін (адносіны колькасці выкарыстаных бібліятэкай формаў, накіраваных на зносіны, да колькасці ўсіх вядомых формаў падобнай арыентацыі з улікам магчымасці іх прымянення ў дадзенай бібліятэцы);

д) ступень удзелу чытачоў у бібліятэчных мерапрыемствах (адносіны колькасці чытачоў, якія прынялі ўдзел у мерапрыемствах, да агульнай колькасці чытачоў бібліятэкі);

е) узровень культуры зносін (методыка гэтага паказчыка ў стадыі распрацоўкі, у бібліятэках пакуль што праводзіцца ў парадку эксперымента).

Гл.: Бібліятэчная паслуга; Камунікатыўныя бібліятэчныя паслугі.

**ПАКАЗЧЫКІ РЭЗУЛЬТАТЫЎНАСЦІ ПА КЛАСЕ ПАСЛУГ БІБЛІЯТЭЧНАГА СЭРВІСУ**

Можна адзначыць наступныя П. р. п. к. п. б. с.:

а) ступень адпаведнасці рэжыму работы бібліятэкі і яе падраздзяленняў патрэбам абанентаў (вызначаецца шляхам апытання абанентаў і ўстанаўліваецца як адносіны колькасці абанентаў, задаволеных рэжымам бібліятэкі, да агульнай колькасці абанентаў);

б) ступень забеспячэння ўмовамі для працы і адпачынку чытачоў (адносіны рэальных паказчыкаў па кожным з відаў паслуг і нарматыўных паказчыкаў);

в) ступень рэалізацыі бібліятэкай паслуг, што забяспечваюць набліжэнне бібліятэчнага абслугоўвання да чытачоў (адносіны выкарыстаных бібліятэкай «паслуг набліжэння» да нарматыўнага пераліку такіх паслуг);

г) ступень распаўсюджанасці бібліятэчных паслуг (адносіны колькасці чытачоў бібліятэкі да колькасці насельніцтва рэгіёна ці да колькасці працуючых на прадпрыемстве, у арганізацыі). Памножыўшы гэтую лічбу на 100, атрымаем працэнт ахопу насельніцтва ці працаўнікоў і паказчыкі дынамікі (адносіны колькасці за бягучы год да колькасці за мінулы) па наступных параметрах: агульная колькасць чытачоў, колькасць абанентаў МБА, ЗА, чытачоў бібліятэчных пунктаў, перасовачных бібліятэк, абанементаў, чытальных залаў, колькасць наведвальнікаў масавых мерапрыемстваў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

д) ступень пашырэння наменклатуры бібліятэчных паслуг (адносіны колькасці назваў паслуг за бягучы год да колькасці назваў паслуг за мінулы год). Наменклатура бібліятэчных паслуг распрацоўваецца, зацвярджаецца і з'яўляецца нарматыўным дакументам для кожнага тыпу бібліятэк.

Гл.: Бібліятэчная паслуга; Паслуга бібліятэчнага сэрвісу.

**ПАКАЗЧЫКІ ДЫНАМІКІ** (у бібліятэчнай статыстыцы)

Адносныя велічыні, якія характарызуюць змены вывучаемай з'явы ў часе, тэмпы яе развіцця. Напрыклад, тэмпы развіцця бібліятэчнага фонду, колькасць чытачоў, колькасць наведванняў і інш. Вызначаюцца супастаўленнем аднародных паказчыкаў за розныя перыяды часу. Напрыклад, П. д. колькасці чытачоў вызначаецца адносінамі колькасці чытачоў за вывучаемы перыяд (бягучы ўзровень) да таго ж паказчыка за які-небудзь мінулы перыяд (базісны ўзровень).

**ПАКАЗЧЫКІ ІНТЭНСІЎНАСЦІ** (у бібліятэчнай статыстыцы)

Адносныя велічыні, якія характарызуюць частату ці інтэнсіўнасць з'явы, ступень яе развіцця. Напрыклад, ступень выкарыстання бібліятэчнага фонду, частата наведвання чытачом бібліятэкі за год і інш. Вызначаюцца шляхам суадносін дзвюх розных па змесце, але ўзаемазвязаных велічынь. Напрыклад, П. і. нагрузкі бібліятэкара вызначаецца адносінамі колькасці выдадзеных за год дакументаў да колькасці бібліятэкараў.

**ПАКАЗЧЫКІ СТРУКТУРЫ** (у бібліятэчнай статыстыцы)

Адносныя велічыні, якія характарызуюць адносіны часткі да цэлага, выяўляючы будову, склад якой-небудзь з'явы. Напрыклад, размеркаванне выдач дакументаў па галінах ведаў, групоўку чытачоў па сацыяльным становішчы, размеркаванне бібліятэчнай сеткі паміж горадам і вёскай. Вызначаюцца дзяленнем часткі на цэлае (прынятае за аснову параўнання) і выражаюцца звычайна ў працэнтах, паказваючы ўдзельную вагу часткі ў агульнай сукупнасці.

**ПАЛІ СТАРОНКІ**

Чыстыя, не занятыя тэкстам ці графічным адбіткам, вузкія палоскі па краях старонак выдання.

**ПАЛІГРАФІЯ**

Галіна прамысловасці, занятая выпускам усіх відаў друкаванай прадукцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ПАЛІТЫЧНАЯ ЛІТАРАТУРА**

Сін.: Грамадска-палітычная літаратура.

**ПАЛІЧНЫ ІНДЭКС**

Класіфікацыйны індэкс, які паказвае месца захоўвання дакумента пры сістэматычнай расстаноўцы фонду. Не рэкамендуецца ў гэтым сэнсе выкарыстанне тэрмінаў «расстановачны індэкс» і «індэкс шыфра».

**ПАЛІЧНЫ РАЗДЗЯЛЯЛЬНІК**

Прыстасаванне з якога-небудзь матэрыялу (дрэва, кардон, пластмаса), якое раздзяляе розныя групы дакументаў у адпаведнасці з прынятай расстаноўкай фонду. На П. р. надпісваюцца раздзел, прозвішча аўтара, назва часопіса і інш.

**ПАМАТЫП**

Друкаванае выданне першай паловы XVI ст.

**ПАМЕР ВЫДАННЯ**

Элемент бібліяграфічнага апісання – характарыстыка вышыні (ці вышыні і шырыні) выдання ў сантыметрах.

**ПАМЯТКА**

Брашура ці лістоўка, якая змяшчае неабходны мінімум звестак для выканання якой-небудзь дзейнасці.

**ПАНЯЦЦЕ**

Форма мыслення, якая адлюстроўвае істотныя ўласцівасці, сувязі і адносіны прадметаў і з'яў **(3.1.5)**.

**ПАПІРУС**

1. Расліна, з якой выраблялі пісчы матэрыял у Егіпце.

2. Старажытны рукапіс на выробленым з папірусу пісчым матэрыяле.

**ПАПУЛЯРНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік, які прызначаны для задавальнення пазнавальных інтарэсаў шырокіх колаў чытачоў **(3.3.2.16)**.

**ПАПЯРЭДНІ ЗАКАЗ ЛІТАРАТУРЫ**

Форма арганізацыі бягучага камплектавання фонду шляхам афармлення заявак на выданні, якія рыхтуюцца да выпуску з друку. П. з. л. складаецца на падставе анатаванага тэматычнага плана выпуску выданняў і кнігагандлёвых бюлетэняў; ажыццяўляецца праз кнігагандлёвую сетку.

**ПАРАГРАФ**

Дробнае структурна-кампазіцыйнае падраздзяленне тэксту ў кнізе, артыкуле, а таксама ў афіцыйным дакуменце, якое пазначана знакам §.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ПАРАДКАВАЯ ІНДЭКСАЦЫЯ**

Індэксацыя, у якой класіфікацыйныя дзяленні маюць парадкавыя нумарныя абазначэнні, што не адлюстроўваюць іх супадпарадкавання.

**ПАРАДЫГМАТЫЧНЫЯ АДНОСІНЫ**

Пазакантэкставыя адносіны паміж ключавымі словамі і дэскрыптарамі. Да П. а. могуць належаць адносіны лагічныя (раўназначнасці ці сінаніміі, падпарадкавання, скрыжавання, сузалежнасці, процілегласці) і адносіны асацыятыўныя (сістэма – элемент, цэлае – частка, прычына – следства, умова – абумоўленасць, прадмет – функцыя прадмета, прадмет – прымета прадмета, тэорыя (навука) – аб’ект яе вывучэння і інш.).

**ПАРАЛЕЛЬНЫ ЗАГАЛОВАК**

Асноўны загаловак дакумента на іншай мове ці ў іншай графіцы; дакумент можа мець адзін або некалькі П. з. Калі П. з. граматычна звязаны з другой часткай апісання, то ён не разглядаецца як паралельны.

**ПАРАЛЕЛЬНЫ ТЫТУЛЬНЫ ЛІСТ**

Дадатковы тытульны ліст, які паўтарае звесткі асноўнага тытульнага ліста на іншай мове.

**ПАРАЎНАЛЬНЫ МЕТАД У БІБЛІЯТЭКАЗНАЎЧЫХ ДАСЛЕДАВАННЯХ**

Сістэматычнае і мэтанакіраванае выкарыстанне параўнанняў для вырашэння пазнавальных задач; гэты метад садзейнічае выяўленню сутнасці ці заканамернасці даследаванай з’явы, выводзіць гэтую з’яву з катэгорыі адзінкавай, ставіць яе ў шэраг аналагічных.

**ПАСІЎНАЯ ЧАСТКА ФОНДУ**

Частка бібліятэчнага фонду, якая па аб’ектыўных прычынах не выкарыстоўвалася чытачамі ў пэўны перыяд. У складзе П. ч. ф. могуць быць дакументы, што адпавядаюць чытацкім інтарэсам, але незаслужана забытыя, непрофільныя, лішнія дублетныя экзэмпляры, а таксама рэдка ці выпадкова выкарыстаныя чытачамі дакументы. П. ч. ф. забяспечвае запас яго трываласці.

**ПАСЛУГА БІБЛІЯТЭЧНАГА СЭРВІСУ**

Паслуга, якая забяспечвае шматлікія патрэбы абанентаў, звязаныя з удасканаленнем бібліятэчнага абслугоўвання, прадастаўленнем выгод. Сюды адносяцца: паслугі, якія забяспечваюць набліжэнне бібліятэчнага сэрвісу да чытачоў; дыфе-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэнцаванае абслугоўванне абанентаў у памяшканні бібліятэкі; зручнасць карыстання бібліятэчным абсталяваннем, новымі тэхналогіямі і інш.

Гл.: Бібліятэчная паслуга.

**ПАСЛЯСЛОЎЕ**

Элемент апарату выдання, які размяшчаецца за асноўным тэкстам. Утрымлівае звесткі аб аўтары і яго творы (творах); разлічаны на чытача, які азнаёміўся з асноўным тэкстам.

**ПАТРЫЁТЫКА**

Частка бібліятэчнага фонду, якая аб'ядноўвае дакументы айчыннага і замежнага паходжання, прысвечаныя дадзенай краіне. Часта атрымлівае канкрэтызаванае найменне па асноўнай назве краіны: напрыклад Беларусіка (фонд дакументаў аб Рэспубліцы Беларусь).

Гл.: Экстэрыёрыка.

**ПАТРЭБА Ў ЧЫТАННІ**

Адносіны сацыяльнага суб'екта (асобы, групы, грамадства) да чытання як жыццёва неабходнай дзейнасці, дзякуючы якой спецыфічным чынам задавальняюцца камунікатыўныя, пазнавальныя, эстэтычныя і іншыя запатрабаванні.

**ПАТЭНТНАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Спецыяльная бібліятэка, якая афіцыйна праводзіць рэгістрацыю выдадзеных патэнтаў і (або) фарміруе фонд апісанняў вынаходніцтваў і патэнтаў, задавальняе інфармацыйныя патрэбнасці ў іх (**3.4.2.15**).

**ПАТЭНТНЫ ФОНД**

Частка бібліятэчнага фонду, якая складаецца з патэнтных дакументаў.

**ПАЎНАТА БІБЛІЯГРАФІЧНАГА ПОШУКУ**

Паказчык, які выяўляе адносіны колькасці знойдзеных рэлевантных запыту бібліяграфічных запісаў да агульнай лічбы рэлевантных гэтаму запыту запісаў у тым масіве бібліяграфічнай інфармацыі, па якім вёўся пошук.

**ПАЎНАТА ДАКУМЕНТНАГА ПОШУКУ**

Паказчык, які выяўляе адносіны колькасці знойдзеных рэлевантных запыту дакументаў у тым дакументным масіве, па якім вёўся пошук.

**ПАЎНАТА ФОНДУ**

Ступень ахопу дакументаў пры камплектаванні фонду з мэтай найбольш поўнага забеспячэння чытацкага запыту. Вы-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

значаецца адносінамі наяўных у фондзе бібліятэкі дакументаў пэўнай тэматыкі (віду) да колькасці дакументаў, неабходных па профілі бібліятэкі для аптымальнага забеспячэння інфармацыйных патрэб чытачоў.

**ПАЎТОРНАЕ ВЫДАННЕ**

Сін.: Перавыданне.

**ПАШПАРТ БІБЛІЯТЭКІ**

Дакумент вызначанай формы, які адлюстроўвае асноўныя звесткі аб будынку бібліятэкі наогул, уключае канструкцыйныя элементы і аздобу пабудовы, інжынерна-тэхнічнае абсталяванне і канструкцыі, дапаможныя збудаванні, ацэначны кошт па балансе і месца размяшчэння. У залежнасці ад мэтавай устаноўкі П. б. можа змяшчаць і іншыя звесткі аб бібліятэцы.

**ПАШПАРТ КАТАЛОГА**

Службовы дакумент, у якім зафіксаваны асноўныя звесткі аб пэўным каталогу: назва, дата арганізацыі, спосаб групоўкі бібліяграфічных запісаў, чытацкае прызначэнне, адлюстраваныя фонды, метадычныя матэрыялы па арганізацыі каталога і г.д.

**ПАШЫРАНАЕ БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ АПІСАННЕ**

Апісанне, якое змяшчае ўсе абавязковыя элементы і выбарачна факультатыўныя; вызначаецца бібліяграфічнай установай і з'яўляецца пастаянным для выдання, каталога і г.д.

**ПАЭТЫЧНЫ ЛАБІРЫНТ**

Мерапрыемства, арганізаванае з удзелам аматараў паэзіі, нагадвае паэтычную віктарыну.

**ПВД**

Гл.: Пошукавы вобраз дакумента.

**ПВЗ**

Гл.: Пошукавы вобраз запыту.

**ПЕРАВЫДАННЕ**

Новы выпуск выдання, які адрозніваецца ад папярэдняга як мінімум нумарам друкарскага заказу ці дапаўненнямі, зменамі ў галоўным тэксце, апараце выдання, афармленні.

Сін.: Паўторнае выданне.

**ПЕРАДАВЫ БІБЛІЯТЭЧНЫ ВОПЫТ**

Сукупнасць формаў і метадаў практычнай работы, якія садзейнічаюць эфектыўнасці і павышэнню якасці арганізацыі работы бібліятэкара.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ПЕРАКЛАДНОЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, тэкст якога ўяўляе сабой пераклад з адной мовы на другую.

**ПЕРАКЛАДНЫ СЛОЎНІК**

Слоўнік, які супастаўляе моўныя адзінкі, адабраныя па пэўнай прымеце (агульнаўжывальныя словы, фразеалагічныя адзінкі, тэрміны і г.д.) дзвюх і больш моў.

**ПЕРАКРЫЖАВАНАЯ СПАСЫЛКА**

Гл.: Спасылка.

**ПЕРАЛІЧАЛЬНАЯ СІСТЭМА КЛАСІФІКАЦЫІ**

Сістэма класіфікацыі, якая ўяўляе сабой пералік паняццяў, падзеленых на аддзелы (класы); тыпавыя паняцці не выдзелены ў асобныя табліцы і адлюстроўваюцца паўторам рубрык аднолькавага зместу. Дакумент па змесце адносіцца да больш ці менш адэкватнага дзялення з раней устаноўленым індэксам.

**ПЕРАЛІК ФОНДУ**

Сін.: Праверка фонду.

**ПЕРАПІС БІБЛІЯТЭК**

Статыстычнае абследаванне бібліятэк за пэўны тэрмін; бывае поўным (абследуюцца бібліятэкі ўсіх тыпаў і ведамстваў) і частковым (збіраюцца звесткі аб групе бібліятэк).

**ПЕРАПЛЁТ**

Трывалае пакрыццё з кардону, пластмасы ці кардонных старонак, якое абцягнута паперай, скурай, тканінай, што злучаны з кніжным блокам пры дапамозе фóрзацаў, і захоўвае яго ад псавання і забруджвання, а таксама служыць для першапачатковай інфармацыі аб выданні і ў якасці элемента мастацкага афармлення.

**ПЕРАПРАЦАВАНАЕ ВЫДАННЕ**

Перавыданне, якое мае больш ці менш істотныя змены ў параўнанні з папярэднім выданнем.

**ПЕРАРЭГІСТРАЦЫЯ ЧЫТАЧОЎ**

Перыядычная рэгістрацыя чытачоў бібліятэкі, якая дазваляе ўдакладніць іх колькасць, састаў і ўнесці новыя звесткі ў чытацкія дакументы.

**ПЕРАСІСТЭМАТЫЗАЦЫЯ**

Перавод сістэматычнага каталога на іншыя табліцы бібліятэчна-бібліяграфічнай класіфікацыі.

Не рэкамендуецца ў гэтым сэнсе выкарыстанне тэрмінаў «перакласіфікацыя» і «рэкласіфікацыя».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ПЕРАСОВАЧНАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Бібліятэка, якая размешчана ў спецыяльна абсталяваным, укамплектаваным транспартным сродку і мяняе сваё месцазнаходжанне з мэтай абслугоўвання тэрытарыяльна аддаленых ад стацыянарнай бібліятэкі груп насельніцтва **(3.4.2.7)**.

**ПЕРАСОВАЧНЫ ФОНД**

Бібліятэчны фонд, прызначаны для нестацыянарных форм бібліятэчнага абслугоўвання. Адрозніваюць універсальны і спецыялізаваны П. ф.

**ПЕРМУТАЦЫЙНЫ ДАПАМОЖНЫ ПАКАЗАЛЬНІК**

Дапаможны паказальнік, які ўяўляе сабой алфавітны пералік ключавых слоў, што змешчаны ў кантэксце загалоўкаў дакументаў, адлюстраваных у бібліяграфічным дапаможніку. Пасля ключавых слоў ідуць усе іншыя словы, якія складаюць загаловак дакумента.

**ПЕРСАНАЛЬНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік, які прысвечаны адной асобе **(3.3.2.25)**.

**ПЕРСПЕКТЫЎНАЯ БІБЛІЯГРАФІЯ**

Бібліяграфія, якая забяспечвае інфармаванне аб дакументах, якія рыхтуюцца да друку.

Сін.: Праспектыўная бібліяграфія.

**ПЕРСПЕКТЫЎНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік, які адлюстроўвае дакументы, намечаныя да выпуску **(3.3.2.33).**

Сін.: Праспектыўны бібліяграфічны дапаможнік.

**ПЕРСПЕКТЫЎНЫ ПЛАН КАМПЛЕКТАВАННЯ**

Дакумент, які вызначае галоўную мэту і канчатковыя вынікі камплектавання фонду. У свой час быў шырока вядомы ў бібліяграфічнай практыцы і складаўся на 5 і больш гадоў.

**ПЕРСПЕКТЫЎНЫ ПЛАН РАБОТЫ БІБЛІЯТЭКІ**

Дакумент перспектыўнага планавання, у якім вызначаюцца мэты, напрамкі дзейнасці, паказчыкі з дэталізацыяй на больш кароткі тэрмін (год, паўгоддзе, квартал).

**ПЕРТЫНЕНТНАСЦЬ ФОНДУ**

Адпаведнасць зместу дакументаў, якія знаходзяцца ў фондзе, інфармацыйным патрэбам чытачоў.

**ПЕРТЫНЕНТНЫ ДАКУМЕНТ**

Дакумент, істотны для дадзенага выпадку, адпаведны патрэбнасці карыстальніка інфармацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ПЕРФАКАРТА**

Уніфікаваны носьбіт інфармацыі ў выглядзе прамавугольнай карткі з тонкага кардону, шчыльнай паперы ці пластмасы, якая прызначаецца для запісу інфармацыі шляхам прабіўкі адтулін (перфарацыі) ці выразкі яе пэўных участкаў.

**ПЕРФАРАТАР**

Прыстасаванне для запісу інфармацыі з дапамогай прабіўкі дзірак у перфакартках ці перфастужках.

**ПЕРФАСТУЖКА**

Уніфікаваны носьбіт інфармацыі ў выглядзе стужкі (звычайна папяровай), на якую запісваецца інфармацыя шляхам прабіўкі адтулін у пэўных кодавых камбінацыях.

**ПЕРШАДРУКАВАНАЯ КНІГА**

Гл.: Старадрукаваная кніга.

**ПЕРШАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, якое ствараецца ўпершыню.

**ПЕРШАСНЫ АДБОР**

Адбор дакументаў, якія належыць уключыць у фонд у працэсе бягучага і рэтраспектыўнага камплектавання.

**ПІСЬМОВАЯ БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА**

Бібліяграфічная даведка, якая выдаецца спажыўцу (чытачу) у дакументальна зафіксаванай форме.

**ПЛАКАТ**

Ліставое выданне ў выглядзе аднаго ці некалькіх аркушаў друкаванага матэрыялу ўстаноўленага фармату, надрукаванае з аднаго ці абодвух бакоў і прызначанае для экспанавання.

**ПЛАН КАМПЛЕКТАВАННЯ**

Дакумент унутрыбібліятэчны ці міжбібліятэчны, які рэгламентуе змест і аб'ём камплектавання аднаго або некалькіх бібліятэчных фондаў. Адрозніваюць два віды П. к.: аператыўны і перспектыўны.

**ПЛАН РАБОТЫ БІБЛІЯТЭКІ**

Дакумент, які вызначае змест, аб'ём, паслядоўнасць, тэрмін выканання работ і выканаўцу. Адрозніваюць П. р. б. перспектыўныя і бягучыя.

**ПЛАН ЧЫТАННЯ**

Спіс (пералік) дакументаў для арганізацыі чытання ў пэўнай паслядоўнасці, звычайна ад простага да больш складанага. П. ч. складаюцца бібліятэкарамі ў рабоце з дзіцячым чытачом.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ПЛАНАВАННЕ РАБОТЫ БІБЛІЯТЭКІ**

Састаўная частка кіравання бібліятэкай – распрацоўка сістэмы мерапрыемстваў, у якой вызначаны мэты, шляхі іх дасягнення і планавыя паказчыкі работы бібліятэкі на пэўны тэрмін. Адрозніваюць П. р. б. перспектыўнае і бягучае. Сярод метадаў планавання вылучаюць: аналітычны, нарматыўны, балансавы, сеткавы ці мэтавы.

**ПЛАНАВЫЯ ПАКАЗЧЫКІ**

Колькасна выражаныя заданні па развіцці дзейнасці асобнай бібліятэкі ці бібліятэчнай справы ў планавым перыядзе. Адлюстроўваюць усе бакі планавага працэсу: аб'ём і размяшчэнне інфармацыйных рэсурсаў, вынікі бібліятэчнага абслугоўвання, эфектыўнасць выкарыстання рэсурсаў, ахоп насельніцтва бібліятэчным абслугоўваннем, хуткасць і напрамак змянення асобных бакоў дзейнасці бібліятэк ці бібліятэчнай справы.

**ПЛАНІРОЎКА БІБЛІЯТЭЧНЫХ БУДЫНКАЎ**

Сістэма размяшчэння памяшканняў усіх падраздзяленняў бібліятэкі, якая адпавядае зместу паслядоўнасці бібліятэчных тэхналагічных працэсаў. Для невялікіх бібліятэк – элементарная, на адным паверсе, для буйных – прасторавая, з размяшчэннем памяшканняў на многіх паверхах.

**ПЛАН РАЗМЯШЧЭННЯ**

У ББК – дзяленні дапаможных табліц класіфікацыі, якія адрозніваюцца ад тыпавых дзяленняў адсутнасцю апазнавальнага знака ў класіфікацыйным індэксе.

**ПЛАТНЫЯ ПАСЛУГІ Ў БІБЛІЯТЭЦЫ**

Адзін са сродкаў паляпшэння бібліятэчнага сэрвісу; прызначаны для задавальнення звышнарматыўных, не фінансуемых з бюджэту індывідуальных патрэб насельніцтва. Да платных паслуг адносяцца: капіраванне, рэпрадуцыраванне, перадрукаванне дакументаў, пераплёт матэрыялаў, складанне картатэк для прыватных бібліятэк, выдача складаных даведак, падборка матэрыялаў, пераклады з замежных моў па разавых запытах, арганізацыя клубаў па інтарэсах, работы розных гурткоў, студый, аб'яднанняў, таварыстваў, распаўсюджванне розных відаў выданняў (бібліятэчных, даведачных, метадычных), выкананых бібліятэкай і інш. П. п. звязаны з выкарыстаннем новых камп'ютарных і сацыяльных тэхналогій.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ПОЛІСЕМІЯ**

Наяўнасць розных, але ў якой-небудзь меры звязаных інтэрпрэтацый аднаго і таго ж знака **(3.1.15)**.

**ПОСТТЭСЦІНГ**

Ацэнка ўздзеяння рэкламы, атрыманая ў выніку апытання прадстаўнікоў мэтавай аўдыторыі бібліятэчна-інфармацыйнай установы пасля таго, як кожны з іх пазнаёміўся з тэсціруемымі рэкламнымі звесткамі ў рэальных умовах экспанавання.

**ПОСТЭР (ПЛАКАТ) БІБЛІЯТЭЧНЫ**

Сродак бібліятэчна-бібліяграфічнай рэкламы, змешчаны на вуліцы, у будынку бібліятэкі, які ўтрымлівае бібліятэчна-бібліяграфічную інфармацыю на лісце паперы значнага памеру; фарматны разварот у буклеце ці часопісе.

**ПОЎНАЕ БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ АПІСАННЕ**

Бібліяграфічнае апісанне, якое ўключае ўсе абавязковыя і ўсе факультатыўныя элементы.

**ПОЎНЫ ЗБОР ТВОРАЎ**

Разнавіднасць збору твораў аўтара, што ўключае ўсе яго творы.

**ПОЎНЫ ІНДЭКС**

Класіфікацыйны індэкс, што паказвае дзяленне сістэматычнага каталога, у якім адлюстроўваецца пэўны дакумент. П. і. супадае з каталожным індэксам, калі дакумент адлюстроўваецца ў адным аддзеле сістэматычнага каталога. Пры шматразовым адлюстраванні П. і. паказвае ўсе дзяленні, у якіх адлюстроўваецца дакумент.

**ПОШУКАВАЕ ПРЫСТАСАВАННЕ**

Спецыяльная машына ці прыстасаванне, прызначанае для ажыццяўлення інфармацыйнага пошуку.

**ПОШУКАВЫ ВОБРАЗ ДАКУМЕНТА**

Тэкст, які паказвае на інфармацыйна-пошукавай мове асноўны змест дакумента і выкарыстоўваецца для інфармацыйнага пошуку. П. в. д. можа быць перададзены дэскрыптарамі, ключавымі словамі, прадметнымі рубрыкамі ці класіфікацыйнымі індэксамі або іх спалучэннем.

**ПОШУКАВЫ ВОБРАЗ ЗАПЫТУ**

Тэкст, які выяўляе на інфармацыйна-пошукавай мове сэнс зместу інфармацыйнага запыту. У працэсе пераўтварэння інфармацыйнага запыту, што выяўлена спажыўцом інфармацыі на натуральнай мове, у П. в. з. могуць быць выкарыстаны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

розныя інфармацыйныя пошукавыя мовы і адпаведныя ім тэрміны індэксавання.

**ПРАВЕРКА ФОНДУ**

Вызначэнне наяўнасці зарэгістраваных ва ўліковай дакументацыі выданняў і іншых дакументаў у бібліятэчным фондзе. П.ф. здзяйсняецца шляхам зверкі кожнай адзінкі захоўвання фонду з дакументамі індывідуальнага ўліку для ўстанаўлення наяўнасці ў фондзе твораў друку і іншых матэрыялаў, зарэгістраваных у дакументацыі бібліятэкі.

Сін.: Перападлік фонду.

**ПРАВІЛЫ КАРЫСТАННЯ БІБЛІЯТЭКАЙ**

Дакумент, які ўстанаўлівае найбольш рацыянальныя формы і парадак абслугоўвання чытачоў у бібліятэцы, адлюстроўвае наменклатуру бібліятэчных паслуг, іх падзел на платныя і бясплатныя, прадугледжвае правы грамадзян на доступ да крыніц інфармацыі, узаемадзеянне паміж персаналам бібліятэкі і чытачамі.

**ПРАВІЛЬНАСЦЬ ІНДЭКСА**

Вычарпальная адпаведнасць структуры класіфікацыйнага індэкса патрабаванням методыкі сістэматызацыі.

**ПРАГРАМАВАНАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, кампазіцыя якога падпарадкавана прынцыпам праграмаванага навучання.

**ПРАГНАЗАВАННЕ БІБЛІЯТЭЧНАЙ СПРАВЫ**

Навуковае вызначэнне аб'ектыўных тэндэнцый, галоўных фактараў і перспектыў развіцця бібліятэчнай справы, якое апіраецца на метадычныя асновы агульнай тэорыі прагназавання.

Адрозніваюць прагнозы па пэўных пастаўленых задачах, па часе (кароткатэрміновыя – 3–7 гадоў, сярэднетэрміновыя – 7–15 гадоў, доўгатэрміновыя – 15 і больш гадоў) і метадах прагназавання (эўрыстычныя метады, метады экстрапаляцыі, мадэліравання і інш.).

**ПРАДМЕТНАЯ КЛАСІФІКАЦЫЯ**

Камбінацыйная сістэма бібліятэчна-бібліяграфічнай класіфікацыі, распрацаваная англійскім бібліятэказнаўцам Джэймсам Дафам Браунам (1862–1914).

**ПРАДМЕТНАЯ РАССТАНОЎКА ФОНДУ**

Лагічная расстаноўка, якая прымяняецца для збору дакументаў па якім-небудзь прадмеце (аб'екце, аспекце, з'яве, падзеі і г.д.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ПРАДМЕТНАЯ РУБРЫКА**

Кароткая фармулёўка прадмета (факта, здарэння, аспекту і г. д.), які разглядаецца ў дакуменце.

**ПРАДМЕТНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік, у якім бібліяграфічныя запісы прыведзены пад прадметнымі рубрыкамі, што размешчаны ў алфавітным парадку **(3.3.2.37)**.

**ПРАДМЕТНЫ ДАПАМОЖНЫ ПАКАЗАЛЬНІК**

Дапаможны паказальнік, які ўяўляе сабой алфавітны пералік прадметных рубрык, што раскрываюць змест дакументаў, адлюстраваных у бібліяграфічным дапаможніку.

**ПРАДМЕТНЫ КАТАЛОГ (ПК)**

Бібліятэчны каталог, у якім бібліяграфічныя запісы размяшчаюцца ў алфавітным парадку прадметных рубрык.

**ПРАДМЕТНЫ ПАКАЗАЛЬНІК ДА ВЫДАННЯ**

Паказальнік, які ўяўляе сабой алфавітны пералік паняццяў з указаннем старонак, на якіх упамінаецца гэтае паняцце ці раскрываецца яго змест.

**ПРАДМЕТЫЗАТАР**

Спецыяліст, які займаецца распрацоўкай мовы прадметных рубрык, ажыццяўляе прадметызацыю дакументаў, арганізацыю і рэдагаванне прадметнага каталога (спіса, паказальніка).

**ПРАДМЕТЫЗАЦЫЯ**

Вызначэнне прадметнай рубрыкі для дакумента ў адпаведнасці з яго зместам.

**ПРАДМОВА**

Элемент апарату выдання, які папярэднічае асноўнаму тэксту і ўтрымлівае тлумачэнне мэты і асаблівасцей твора і г. д. П. можа належыць аўтару, выдавецтву, рэдактару, перакладчыку.

**ПРАДУКЦЫЙНАСЦЬ ЧЫТАННЯ**

Характарыстыка разумення (успрымання) тэксту, якая вызначаецца як адпаведнасць вынікаў чытання яго задачы; залежыць ад: а) мэтавай і кампазіцыйнай структуры тэксту; б) моўных характарыстык тэксту; в) знешніх прымет тэксту (шрыфт, вёрстка, колер шрыфту, фону і інш.); г) умоў для чытання (святло, цішыня і інш.); д) навыкаў чытання; е) асабістых фактараў, якія ўплываюць на адносіны да зместу (матывы чытання, чытацкія ўстаноўкі і г.д.); ж) асабістых фактараў, якія ўплываюць на працэс чытання (узровень разумення і інш.); з) эмацыянальнасці тэксту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ПРАЕКТАВАННЕ БІБЛІЯТЭКІ**

Стварэнне неабходнай для будаўніцтва бібліятэкі тэхнічнай дакументацыі (праекта), што адлюстроўвае яе функцыянальныя, канструкцыйныя, эстэтычныя і эканамічныя асаблівасці. Існуюць праекты тыпавыя і індывідуальныя.

**ПРАЕКТНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ БІБЛІЯТЭКІ**

Распрацоўка і рэалізацыя дакументных (мэтавых) праграм, канцэпцый, стратэгічных планаў, праектаў, якія вызначаюць магчымыя шляхі дасягнення выканаўцамі адной ці некалькіх мэт пры пэўным рэсурсным забеспячэнні. Класіфікацыя праектаў адбываецца па маштабе, змесце (тэматыцы), функцыянальным прызначэнні.

**ПРАЕКЦЫЙНЫ АПАРАТ**

Апарат, які служыць для паказу адбіткаў, што змешчаны на празрыстых ці непразрыстых плёнках.

**ПРАКТЫКУМ**

Вучэбнае выданне, якое змяшчае практычныя заданні і практыкаванні, што спрыяюць засваенню адукацыйнага матэрыялу.

**ПРАКТЫЧНАЕ КІРАЎНІЦТВА**

Практычны дапаможнік для самастойнага авалодання прыёмамі і навыкамі пэўнай прафесіі ці дзейнасці, якое служыць павышэнню кваліфікацыі спецыялістаў. Адрозніваецца большай паўнатой, дэталізацыяй і інструкцыйнасцю ў параўнанні з практычным дапаможнікам.

Не рэкамендуецца ў гэтым сэнсе ўжыванне тэрміна «вытворчы дапаможнік».

**ПРАКТЫЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Вытворча-практычнае выданне, прызначанае садзейнічаць авалоданню практыкай выканання якога-небудзь вытворчага працэсу (працэсаў) ці ўдасканаленню выканання.

**ПРАПАГАНДА ЛІТАРАТУРЫ**

Рэклама дакументаў і ведаў аб іх з мэтай павышэння культурнага і прафесійнага ўзроўню карыстальнікаў бібліятэк, кіравання чытаннем, уздзеяння на розум і паводзіны чытачоў. Заснавана на дыферэнцаваным падыходзе, на выкарыстанні такіх прынцыпаў, як сістэмнасць уздзеяння, мэтанакіраванасць, нагляднасць, інтарэс.

**ПРАПУСКНАЯ ЗДОЛЬНАСЦЬ БІБЛІЯТЭКІ**

Колькасць чытачоў, якія абслугоўваюцца ў бібліятэцы за пэўны тэрмін (гадзіну, працоўны дзень); лімітуецца матэ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рыяльнай базай (колькасцю месцаў у чытальных залах) і колькасцю работнікаў, занятых абслугоўваннем чытачоў.

**ПРАСПЕКТ**

Жанр рэкламы; даведачнае і (ці) рэкламнае выданне, якое ўтрымлівае сістэматызаваны пералік паслуг, прадметаў, выданняў, прызначаных да выпуску, на продаж і (ці) экспанаванне.

**ПРАСПЕКТ БІБЛІЯТЭЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНЫ**

Сродак друкарскай рэкламы ў выглядзе яркай брашуры, выкананай на высокім паліграфічным узроўні; утрымлівае інфармацыю аб рэкламадаўцы, супрацоўніках бібліятэкі, яе паслугах і прадуктах; бывае інфармацыйна-рэкламны і інфармацыйна-прапагандысцкі.

**ПРАЎДЗІВАСЦЬ ІНФАРМАЦЫІ**

Уласцівасць інфармацыі адлюстроўваць з'явы без скажэння; быць правільна зразумелай.

**ПРАФЕСІЙНА-ВЫТВОРЧАЯ БІБЛІЯГРАФІЯ**

Спецыяльная бібліяграфія, якая забяспечвае прафесійна-інфармацыйныя патрэбы спецыялістаў розных галін практычнай дзейнасці.

**ПРАФЕСІЙНА-ВЫТВОРЧЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Спецыяльны бібліяграфічны дапаможнік, які прызначаны ў дапамогу спецыялістам розных галін практычнай дзейнасці **(3.3.2.15)**.

**ПРАЦЫ**

Тыпавы загаловак перыядычнага ці з працягам зборніка навуковых работ адной або некалькіх навучальных ці навукова-даследчых устаноў.

**ПРОБНАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, якое выпушчана невялікім тыражом перад друкаваннем асноўнага тыражу з мэтай высвятлення попыту на яго.

**ПРОСТАЯ ПРАДМЕТНАЯ РУБРЫКА**

Прадметная рубрыка, якая складаецца з адной лексічнай адзінкі.

Не рэкамендуецца ў гэтым значэнні выкарыстанне тэрміна «загаловак прадметнай рубрыкі».

**ПРОСТЫ ІНДЭКС**

Індэкс асноўных табліц класіфікацыі.

**ПРОФІЛЬ КАМПЛЕКТАВАННЯ**

Дакумент, які рэгламентуе асноўныя напрамкі і асаблівасці камплектавання бібліятэчнага фонду ў адпаведнасці з зада-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чамі бібліятэкі, народнагаспадарчым і культурным профілем абслугоўваемага рэгіёна.

**ПРОФІЛЬ ФОНДУ**

Спецыфічныя рысы фонду, якія абумоўлены задачамі бібліятэкі і запытамі чытачоў і адлюстраваны ў складзе адабраных у фонд дакументаў па прыметах: тэматыка, тып, від, хsavлагічныя межы, моўны склад і інш.

**ПРЫАРТЫКУЛЬНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік, які змешчаны пасля артыкула і адлюстроўвае дакументы па яго тэматыцы – выкарыстаныя, цытаваныя і (або) рэкамендаваныя (**3.3.2.46**).

**ПРЫВАТНАЕ БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА**

Раздзел бібліятэказнаўства, зместам якога з’яўляецца вучэнне аб бібліятэчных фондах, каталогах, функцыянаванні бібліятэк, бібліятэчным абслугоўванні.

**ПРЫВАТНАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Бібліятэка, якая вызначаецца своеасаблівым набыццём дакументаў (купляй і зборам іх асобай на ўласныя сродкі) з мэтай задавальнення індывідуальных патрабаванняў.

**ПРЫВАТНЫ ЗАГАЛОВАК**

Загаловак асобнага тома, выпуску ці самастойнай часткі серыйнага выдання, які адрозніваецца ад агульнага загалоўка.

**ПРЫГОННАЯ РАССТАНОЎКА ФОНДУ**

Фармальная расстаноўка, заснаваная на прынцыпе замацавання пастаяннага месца на паліцы за кожнай адзінкай захоўвання; прымяняецца толькі для асноўных фондаў буйных бібліятэк. Уяўляе сабой спалучэнне розных відаў расстановак.

**ПРЫКНІЖНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік, які змешчаны ў кнізе і, як правіла, адлюстроўвае дакументы па яе тэматыцы − выкарыстаныя, цытаваныя і (або) рэкамендаваныя (**3.3.2.45**).

**ПРЫМЕТА/АДЗНАКА**

Уласцівасць аб’екта, якая абумоўлівае яго адрозненне або агульнасць з іншымі аб’ектамі (**3.1.2**).

**ПРЫПІСКА ДУБЛЕТНАГА ЭКЗЭМПЛЯРА**

Працэс рэгістрацыі дублетнага экзэмпляра ў каталогах бібліятэкі, мэта якога – забяспечыць магчымасць адшукання ў фондзе бібліятэкі любога экзэмпляра дакумента.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

**ПРЫРОДАЗНАЎЧЫЯ КЛУБЫ**

Чытацкія аб'яднанні пры бібліятэках, мэта якіх – глыбей вывучаць экалогію, прыроду і прапагандаваць яе ахову.

**ПРЭЗЕНТАЦЫЯ**

Форма масавай работы, сродак рэкламы бібліятэчнай, паблік рылейшнз з прыцягненнем меркаванняў, ацэнак спецыялістаў, зацікаўленых спажыўцоў інфармацыі.

**ПРЭМ'ЕРА КНІГІ**

Разнавіднасць чытацкай канферэнцыі, звычайна праходзіць пры ўдзеле аўтара твора.

**ПРЭПРЫНТ**

Навуковае выданне, якое змяшчае матэрыялы папярэдняга характару, апублікаваныя да выхаду ў свет выдання, дзе іх мяркуюць выкарыстаць.

**ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЯ**

Дыскусійная форма масавай работы з чытачамі, запазычаная з журналісцкай практыкі.

**ПСЕЎДАНІМ**

Выдуманае імя або прозвішча, якім аўтар падпісвае творы.

**ПСІХАЛОГІЯ ЧЫТАННЯ**

Навуковая дысцыпліна, якая вывучае фарміраванне навыкаў чытання, структуру ўспрымання і разумення літаратуры, ролю і асаблівасці псіхічных працэсаў і адчуванняў чалавека пры чытанні, іх залежнасць ад аб'ектыўных якасцей друкаваных выданняў, ад асаблівасцей чытацкай псіхалогіі асобы.

**ПСІХАЛОГІЯ ЧЫТАЧА**

Навуковая дысцыпліна, якая вывучае структуру чытацкай псіхалогіі, прыроду і заканамернасці яе асноўных напрамкаў (патрэбы ў чытанні, чытацкія інтарэсы, установкі, думкі і інш.); фактары яе фарміравання і выхавання, тыпалогію чытачоў, сацыяльна-псіхалагічныя асаблівасці чытацкіх груп і аўдыторый.

**ПУБЛІКАЦЫЯ**

Дакумент, які даступны для масавага выкарыстання **(3.1.33)**.

**ПУБЛІЧНАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Агульнадаступная бібліятэка, якая прызначана для задавальнення інфармацыйных патрэбнасцей шырокіх колаў насельніцтва **(3.4.2.14)**.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**РАБОТА З ЧЫТАЧАМІ**

Дзейнасць бібліятэкара, скіраваная на бібліятэчна-бібліяграфічнае і інфармацыйнае абслугоўванне чытачоў, забеспячэнне ім бібліятэчнага сэрвісу. У цэнтры работы – павага да суверэнітэту чытача з поўнай свабодай у выбары дакументаў для чытання. Пры рабоце з дзіцячым чытачом бібліятэкар звяртае ўвагу на вывучэнне яго здольнасцей, на кіраўніцтва чытаннем з мэтай творчага развіцця дзяцей, падлеткаў.

**РАБОЧАЕ МЕСЦА БІБЛІЯТЭКАРА**

Месца працоўнай дзейнасці бібліятэкара, абсталяванае спецыяльнымі прыстасаваннямі, неабходнымі для пэўных тэхналагічных працэсаў і аперацый.

**РАБОЧАЯ КАРТАТЭКА ДА ПРАДМЕТНАГА КАТАЛОГА**

Картатэка сістэматызаваных у алфавітным парадку прадметных рубрык і метадычных парад, якая адлюстроўвае структуру пэўнага прадметнага каталога. У гэтым значэнні неўжывальны тэрмін «ключ да прадметнага каталога».

**РАБОЧЫЯ ТАБЛІЦЫ КЛАСІФІКАЦЫІ**

Табліцы класіфікацыі, якія адлюстроўваюць асаблівасці структуры і ступень дэталізацыі пэўнага сістэматычнага каталога і сістэматычнай расстаноўкі пэўных фондаў.

**РАДОК**

Шэраг слоў, літар ці іншых знакаў (напрыклад, нотных), размешчаных на адной лініі; у выданні састаўная частка набору.

**РАЗВАРОТ**

Дзве сумежныя (левая і правая ці цотная і няцотная) старонкі выдання, асноўная кампазіцыйная яго адзінка.

**РАЗВАРОТНЫ ТЫТУЛЬНЫ ЛІСТ**

Чатырохстаронкавы тытульны ліст у пачатку выдання, які складаецца з авантытула, контртытула, тытульнай старонкі і адвароту тытульнага ліста. На контртытуле змяшчаюцца звесткі аб усім шматтомным ці серыйным выданні ўвогуле, у перакладных выданнях – тэкст тытульнай старонкі на мове арыгінала. На тытульнай старонцы (асноўным тытульным лісце) змяшчаюцца звесткі аб дадзеным томе ці перакладзе на мову выдання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**РАЁННАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Універсальная публічная бібліятэка, якая выконвае функцыі рэгіянальнага каардынацыйна-метадычнага цэнтра, а таксама з'яўляецца цэнтральнай бібліятэкай у ЦБС.

**РАЗГОРНУТЫ ТЫТУЛЬНЫ ЛІСТ**

Тытульны ліст, тэкст і выяўленчыя элементы якога пачынаюцца на левай старонцы тытульнага развароту і пераходзяць на правую старонку.

**РАЗДЗЕЛ**

Структурна-кампазіцыйная адзінка твора рознага зместу і жанру, якая мае нумар і часта загаловак.

**РАЗДЗЯЛЕННЕ ПРАЦЫ Ў БІБЛІЯТЭЦЫ**

Размежаванне функцый паміж структурнымі падраздзяленнямі, а таксама размежаванне абавязкаў паміж супрацоўнікамі. Р. п. замацоўваецца службовымі інструкцыямі і палажэннямі аб структурных падраздзяленнях.

**РАЗДЗЯЛЯЛЬНІК**

Гл.: Каталожны раздзяляльнік; Палічны раздзяляльнік.

**РАЗМНОЖВАННЕ ДАКУМЕНТА**

Гл.: Рэпрадуцыраванне.

**РАЗМОЎНІК**

Элементарны дапаможнік для зносін на замежнай мове, які змяшчае словы і найбольш ужывальныя фразы на дзвюх ці больш мовах.

**РАЗМЯШЧЭННЕ БІБЛІЯТЭЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ РЭКЛАМНАЙ ПРАДУКЦЫІ**

Прадстаўленне рэкламных звестак у сродках масавай інфармацыі і іншых рэкламных сродках і каналах (на носьбітах вонкавай, транспартнай рэкламы, у глабальных і лакальных электронных сетках і інш.), якое здзяйсняецца на падставе спецыяльных дапасаванняў бібліятэкі з рэкламнымі агенцтвамі, СМІ, другімі суб'ектамі распаўсюджання бібліятэчна-бібліяграфічнай прадукцыі.

**РАЗМЯШЧЭННЕ ФОНДУ**

Размяшчэнне фонду па структурных падраздзяленнях і памяшканнях бібліятэкі з мэтай зручнасці яго выкарыстання і захоўвання. Адрозніваюць спосабы Р. ф. у фондасховішчы: вертыкальнае, гарызантальнае і змешанае.

**РАЗУМЕННЕ ТЭКСТУ**

Разумовая дзейнасць, у выніку якой засвойваецца змест тэксту. Р. т. залежыць і ад аб'ектыўных фактараў – структуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэксту, ступені яго складанасці, і ад суб'ектыўных – узроўню развіцця чытача, аб'ёму, глыбіні ведаў аб прадмеце. Уласцівасць Р. т. – глыбіня, выразнасць, паўната асэнсавання. Адносна мастацкай літаратуры Р. т. разглядаецца як зыходны кампанент складанага працэсу ўспрымання.

**РАСПАЎСЮДЖАНАСЦЬ ЧЫТАННЯ**

Ступень прыцягнення насельніцтва да чытання; Р. ч. характарызуюць: суадносіны паміж чытаючай і нечытаючай часткамі насельніцтва, частата звяртання да дакументаў, інтэнсіўнасць іх выкарыстання ў чытацкім асяроддзі, удзельная вага чытання ў структуры вольнага часу. Вывучэннем Р. ч. займаецца сацыялогія чытання. Аналіз Р. ч. дае магчымасць скласці навуковую карціну масавага чытання, вызначыць яго ўдзельную вагу ў жыцці грамадства, а таксама дапамагае высветліць рэальнае выкарыстанне бібліятэкі насельніцтвам.

**РАССТАНОВАЧНЫЯ ТАБЛІЦЫ**

Упарадкаваныя спісы ўмоўных літарна-лічбавых абазначэнняў, якія спрашчаюць расстаноўку фонду ў алфавітным ці храналагічным парадку.

**РАССТАНОЎКА ФОНДУ**

1. Парадак размяшчэння дакументаў на паліцах фондасховішча, які вызначаецца аб'ёмам фонду, яго прызначэннем і складам. Адрозніваюць два асноўныя віды Р. ф.: лагічная (сістэматычная, тэматычная, прадметная) і фармальная (алфавітная, геаграфічная, інвентарная, прыгонная, нумарацыйная, храналагічная, моўная). Віды Р. ф. могуць прымяняцца ў розных спалучэннях (напрыклад, сістэматычна-алфавітная, дзе першая прымета – асноўная, а другая – дапаможная).

2. Бібліятэчная аперацыя па размяшчэнні дакументаў на паліцах у адпаведнасці з шыфрам іх захавання.

**РАСЦЯЖНАЯ КЛАСІФІКАЦЫЯ**

Іерархічная камбінацыйная сістэма бібліятэчна-бібліяграфічнай класіфікацыі, распрацаваная знакамітым амерыканскім бібліятэказнаўцам Эмі Кетэрам (1837–1902).

**РАТАПРЫНТ**

Друкарская машына малога габарыту, створаная на афсетным прынцыпе друкавання.

**РУБРЫКА**

1. Асобная частка тэксту літаратурнага твора, якая мае ўласны загаловак.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Загаловак асобных частак тэксту літаратурнага твора. Можа быць тэматычным (вызначаным словам), фармальна-графічным (літара, лічба, зорачка і г.д.) ці «нямым» (прабел у суцэльным тэксце).

**РУБРЫКАТАР**

Слоўнік рубрык у выглядзе іерархічнай класіфікацыі, прызначаны для фарміравання даведачна-інфармацыйнага фонду, інфармацыйных выданняў і інфармацыйнага пошуку.

**РУБРЫКАЦЫЯ**

Сукупнасць асноўных і падпарадкаваных загалоўкаў твора, якія ўтвараюць яго структуру.

**РУКАПІС**

1. Твор (тэкст), напісаны ад рукі ці машынапісны.

2. Умоўная назва формы фіксацыі твора, незалежна ад таго, напісаны ён ад рукі ці машынапісны, які прадстаўлены ў выдавецтва для выдання. Сучасны тэрмін – «аўтарскі арыгінал».

**РУКАПІСНАЯ КНІГА**

Кніга, у якой тэкст і ілюстрацыі пададзены (напісаны і намаляваны) ад рукі ў адрозненне ад друкаванай кнігі; форма кнігі да вынаходніцтва кнігадрукавання, пазней заменена друкаванай.

**РУХ ФОНДУ**

Працэс паступлення і выключэння дакументаў у бібліятэцы. Р. ф. фіксуецца ва ўліковым каталогу ці (пры наяўнасці) у кнізе сумарнага ўліку.

**РЫНАК ПАСЛУГ**

Сукупнасць выстаўленых на продаж рэкламных паслуг, прапанаваных бібліятэчна-інфармацыйнымі ўстановамі і рэкламнымі агенцтвамі.

**РЭАЛЬНЫ КАТАЛОГ**

Каталог, які адлюстроўвае змест дакументаў; да Р. к. адносяцца сістэматычны, прадметны, комплексна-сістэмны і інш.

**РЭГІЁНАЗНАЎЧЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік, які адлюстроўвае літаратуру, што звязана сваім зместам з пэўным рэгіёнам.

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЯ КАРТАТЭКА ПЕРЫЯДЫЧНЫХ ВЫДАННЯЎ**

Алфавітная картатэка перыядычных выданняў, якія паступаюць у бібліятэку ў бягучым годзе; выконвае даведачна-інфармацыйныя функцыі пра тое, якія перыядычныя выданні выпісвае бібліятэка, які апошні нумар атрымала.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЯ КАРТКА ЧЫТАЧА**

Картка, якая змяшчае асноўныя звесткі пра чытача: прозвішча, імя і імя па бацьку, узрост, месца працы, пасада, адрас і інш. Р. к. ч. запаўняецца пры запісе чытача ў бібліятэку, захоўваецца ў рэгістрацыйнай картатэцы; дае ўяўленне і звесткі для статыстыкі аб чытачах у бібліятэцы.

**РЭГІСТРАЦЫЙНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік, які максімальна поўна адлюстроўвае дакументы ў адпаведнасці з пэўнымі фармальнымі крытэрыямі (тыпалагічнымі, храналагічнымі, тэрытарыяльнымі і інш.) **(3.3.2.28)**.

**РЭГІСТРАЦЫЯ ЧЫТАЧОЎ**

1. Афармленне права карыстання бібліятэкай.
2. Улік складу чытачоў.

**РЭГІЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯГРАФІЯ**

1. Бібліяграфічная дзейнасць у рэгіёне, якая садзейнічае яго ўсебаковаму развіццю.
2. Бібліяграфічная дзейнасць, якая звязана з пэўным рэгіёнам зместам ці месцам выдання аб'ектаў бібліяграфавання.

**РЭГІЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Цэнтральная бібліятэка, створаная ў адпаведнасці з адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленнем краіны (абласная, раённая і інш.).

**РЭГІЯНАЛЬНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік, які выдадзены ў пэўным рэгіёне і (або) адлюстроўвае дакументы, што звязаны з рэгіёнам па паходжанні, змесце і іншых прыметах **(3.3.2.23)**.

**РЭГІЯНАЛЬНЫ КАТАЛОГ**

Каталог, які адлюстроўвае літаратуру, што па сваім змесце належыць да пэўнага рэгіёна. Па спосабе групоўкі матэрыялу можа быць сістэматычным, прадметным, алфавітным. Рэгіянальная прымета ў структуры Р. к. вылучаецца на першае месца. Каталог арганізуецца ў адпаведнасці з табліцай тэрытарыяльных тыпавых дзяленняў ББК ці дапаможнай табліцай вызначальнікаў месца УДК. У Р. прадметным к. рэгіянальныя адзінкі выступаюць у якасці загалоўка прадметных рубрык. Алфавітны Р. к. істотных адрозненняў ад традыцыйнага не мае.

**РЭДАГАВАННЕ**

1. Кіраўніцтва падрыхтоўкай і выпускам выдання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Працэс вызначэння грамадскай каштоўнасці твора, прызначанага да выдання, інакш кажучы, адпаведнасці яго зместу і формы мэтаваму і чытацкаму прызначэнню, а таксама працэс дапамогі аўтару ва ўдасканаленні прыгоднага ў цэлым да выдання твора.

**РЭДАГАВАННЕ КАТАЛОГА**

Праверка адпаведнасці структуры, зместу і афармлення бібліятэчнага каталога патрабаванням, што прад’яўляюцца да іх, і ліквідацыя выяўленых у ходзе праверкі недахопаў. У гэтым значэнні неўжывальны тэрмін «рэдакцыя каталога». Адрозніваюць планавае і бягучае, поўнае і выбарачнае, метадычнае і тэхнічнае Р. к.

**РЭДАКТАР**

Спецыяліст, які займаецца рэдагаваннем твора (твораў), што рыхтуецца да друку, ці бібліятэчнага каталога.

**РЭДКАЯ КНІГА**

Кніга, якая захавалася ці выпушчана ў адносна невялікай колькасці экзэмпляраў і мае мастацкую, навуковую, бібліяграфічную ці іншую каштоўнасць.

**РЭЗЕРВОВЫ ФОНД**

Частка бібліятэчнага фонду, прызначаная для папаўнення фонду бібліятэкі і яе філіялаў.

**РЭКАМЕНДАЦЫЙНАЯ АНАТАЦЫЯ**

Анатацыя, у якой характарызуецца і ацэньваецца дакумент з улікам інтарэсаў, узроўню падрыхтоўкі, узросту і іншых асаблівасцей спажыўцоў інфармацыі, якім яна прызначаецца.

**РЭКАМЕНДАЦЫЙНАЯ БІБЛІЯГРАФІЯ**

Від бібліяграфіі, грамадскае прызначэнне якой – садзейнічаць агульнай і прафесійнай адукацыі, самаадукацыі чытачоў і прапагандзе ведаў.

**РЭКАМЕНДАЦЫЙНАЯ ГУТАРКА**

Від зносін паміж бібліятэкарам і чытачом з мэтай даць параду, рэкамендацыю для чытання; у бібліятэках часцей прымяняецца пры абслугоўванні дзяцей і падлеткаў.

**РЭКАМЕНДАЦЫЙНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік, які адлюстроўвае дакументы, што рэкамендаваны пэўным катэгорыям чытачоў і адабраны па адпаведных змястоўных і якасных крытэрыях **(3.3.2.14).**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**РЭКАМЕНДАЦЫЯ КНІГІ**

Комплекс метадаў (наглядных, вусных, пісьмовых), з дапамогай якіх бібліятэкар прапануе кнігу чытачу.

**РЭКАТАЛАГІЗАЦЫЯ**

Поўная перапрацоўка каталога, звычайна звязаная з заменай каталожных картак.

**РЭКЛАМНАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, якое змяшчае звесткі аб розных мерапрыемствах, аб выпуску прадукцыі, прамысловых вырабаў, аб бытавых паслугах і г. д., што выдадзены ў кароткай, змястоўнай і прывабнай форме. У гэтым сэнсе неўжывальны тэрмін «рэклама».

**РЭКЛАМНАЯ КАМПАНІЯ**

Комплекс рэкламных мерапрыемстваў, які распрацаваны і рэалізоўваецца ў адпаведнасці з маркетынгавай праграмай, накіраваны на пэўную аўдыторыю сегмента рынку з мэтай выклікаць спажывецкую рэакцыю, якая садзейнічала б вырашэнню стратэгічных і (ці) тактычных задач.

**РЭКЛАМНАЯ СЛУЖБА**

Служба, якая займаецца вытворчасцю, зборам, распаўсюджваннем бібліятэчна-бібліяграфічнай рэкламы і ажыццяўляе ўвесь спектр рэкламных паслуг.

**РЭКЛАСІФІКАЦЫЯ**

Складанне новага сістэматычнага каталога замест існуючага ці перапрацоўка каталога ў сувязі з пераходам на новую сістэму класіфікацыі.

**РЭЛЕВАНТНАСЦЬ**

Адпаведнасць атрыманай пры пошуку інфармацыі інфармацыйнаму запыту.

**РЭЛЕВАНТНАСЦЬ ФОНДУ**

Адпаведнасць зместу дакументаў, што знаходзяцца ў фондзе бібліятэкі, чытацкаму запыту.

**РЭЛЯТАР**

Сімвал ці слова, якое выкарыстоўваецца для адрознення паняццяў шматзначнага тэрміна. З'яўляецца незалежнай лексічнай адзінкай інфармацыйна-пошукавай мовы.

**РЭПРАДУЦЫРАВАННЕ**

1. Працэс атрымання новых экзэмпляраў дакументаў шляхам капіравання з прымяненнем фота-, электра- і іншай капіравальнай апаратуры.

2. Паліграфічнае ўзнаўленне выявы фотамеханічнымі ці іншымі сродкамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**РЭПРАДУКЦЫЯ**

Вынік рэпрадуцыравання, адбітак адлюстравання, узноўленага фотамеханічным ці іншым спосабам рэпрадуцыравання.

**РЭПРЫНТНАЕ ВЫДАННЕ**

Перавыданне без новага набору тэксту шляхам фотарэпрадуцыравання старонак аднаго з папярэдніх выданняў.

**РЭСТАЎРАЦЫЯ ДАКУМЕНТА**

Аднаўленне фізічнай цэласнасці састарэлых ці пашкоджаных дакументаў у іх першапачатковым ці блізкім да яго выглядзе.

**РЭТРАСПЕКТЫЎНАЕ КАМПЛЕКТАВАННЕ**

Папаўненне фонду профільнымі назвамі ці экзэмплярамі дакументаў за мінулыя гады, якіх не хапае.

**РЭТРАСПЕКТЫЎНАЯ БІБЛІЯГРАФІЯ**

Бібліяграфія, што забяспечвае арыентацыю ў дакументах, якія з’явіліся за які-небудзь перыяд мінулага, ці ў назапашаным масіве дакументаў (напрыклад, у бібліятэчных фондах) і мае звычайна храналагічную глыбіню.

**РЭТРАСПЕКТЫЎНАЯ ВЫСТАВА**

Выстава дакументаў, створаных за пэўны мінулы перыяд.

**РЭТРАСПЕКТЫЎНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік, які адлюстроўвае масіў дакументаў за які- небудзь гістарычны перыяд **(3.3.2.32)**.

**РЭФЕРЫРАВАННЕ**

Працэс складання рэфератаў, кароткі выклад тэкстаў.

**РЭФЕРАТ**

Скарочаны выклад зместу першаснага дакумента (ці яго часткі) з асноўнымі фактычнымі звесткамі і вывадамі; акцэнтуе ўвагу на новых звестках і вызначае мэтазгоднасць звароту да дакумента, змяшчаецца ў першасных і другасных дакументах (рэфератыўных часопісах і зборніках, інфармацыйных картках і інш.). У другасных дакументах тэксту Р. папярэднічае загаловак і бібліяграфічнае апісанне першаснага дакумента.

**РЭФЕРАТЫЎНАЕ ВЫДАННЕ**

Інфармацыйна-бібліятэчнае выданне, асноўны змест якога складаюць рэфераты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**РЭФЕРАТЫЎНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік, у якім усе ці большасць бібліяграфічных запісаў складаюць рэфераты.

**РЭФЕРАТЫЎНЫ ЧАСОПІС**

Часопіс, у якім друкуюцца ў сістэматызаваным выглядзе рэфераты публікацый па якіх-небудзь галінах, прадмеце, праблеме і які забяспечаны прадметным, імянным і іншымі паказальнікамі.

**РЭЦЭНЗІЯ**

Твор, які змяшчае аналіз і крытычную ацэнку дакумента (састаўной часткі дакумента).

## С

**САМААДУКАЦЫЙНАЕ ЧЫТАННЕ**

Мэтанакіраваная сістэматычная дзейнасць, неабходная для самаўдасканалення асобы; адзін са спосабаў рэалізацыі пазнавальнай функцыі чытання; важнейшы кампанент і метад самаадукацыі і бесперапыннай адукацыі. С. ч. абумоўлена патрэбнасцямі асобы і грамадства. Класіфікуецца па відах: агульнае, прафесійнае, эстэтычнае, палітычнае, звязанае з самавыхаваннем і інш.

**САМААДУКАЦЫЯ**

Сістэматычная самастойная пазнавальная дзейнасць асобы, абумоўленая асабістымі і грамадскімі запатрабаваннямі, якая выходзіць за межы планаў і праграм навучальных установ сістэмы народнай адукацыі. Здзяйсняецца ў розных напрамках: агульная, прафесійная, эстэтычная, палітычная і інш.

**САМАВУЧЫЦЕЛЬ**

Вучэбны дапаможнік для самастойнага авалодання мовай, рамяством ці мастацтвам.

**САСТАЎНЫ ІНДЭКС**

Класіфікацыйны індэкс камбінацыі двух ці некалькіх індэксаў, кожны з якіх можа быць прадстаўлены індэксам асноўных табліц класіфікацыі ці складаным індэксам. У гэтым значэнні неўжывальны тэрмін «камбінаваны індэкс».

**САЦЫЯЛОГІЯ КНІГІ**

Дысцыпліна, якая вывучае заканамернасці стварэння і функцыянавання твораў друку ў грамадстве. Асноўныя яе раздзелы: сацыялогія аўтарскай творчасці і сацыялогія кнігараспаўсюджвання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## САЦЫЯЛОГІЯ ЧЫТАННЯ

Раздзел сацыялогіі кнігі, звязаны з вывучэннем сацыяльных фактаў і заканамернасцей функцыянавання твораў друку ў грамадстве. Сацыялагічны аналіз чытання раскрывае прыроду чытацкіх запатрабаванняў і інтарэсаў; вызначае месца чытання ў сістэме грамадскіх з'яў і яго ролю ў фарміраванні духоўнага развіцця чалавека. С. ч. выконвае функцыі: пазнавальную – вывучэнне аб'ектыўных заканамернасцей чытання; кіраўніцкую – выпрацоўка рэкамендацый для кіравання, планавання, прагназавання бібліятэчнай і кніжнай справы.

## САЦЫЯЛЬНАЯ ІНФАРМАЦЫЙНА-КАМУНІКАТЫЎНАЯ СІСТЭМА

Шматмэтавая і шматфункцыянальная сістэма інфармацыйнага абслугоўвання, якая задавальняе інфармацыйна-камунікатыўныя патрэбнасці грамадства.

## САЦЫЯЛЬНАЯ ФУНКЦЫЯ БІБЛІЯТЭКІ

Комплекс функцый бібліятэкі, якія адпавядаюць пэўнаму кірунку дзейнасці яе як сацыяльнага інстытута і адлюстроўваюць узаемаадносіны бібліятэкі і грамадства. С.ф.б. падзяляюцца па розных падставах. У прыватнасці, выдзяляюцца дзве асноўныя функцыі: мемарыяльная і камунікатыўная.

З пункта гледжання функцыянавання бібліятэкі як інфармацыйнай установы выдзяляецца інфармацыйная функцыя, якая шматаспектна адлюстроўвае дзейнасць бібліятэкі ў зададзеным кірунку.

У адносінах да арганізацыі бібліятэчнага абслугоўвання адрозніваюць адукацыйную, культурна-асветніцкую, выхаваўчую і іншыя функцыі.

## САЦЫЯЛЬНЫ БІБЛІЯМАРКЕТЫНГ

Абмен паслугамі сацыяльна адказных арганізацый (бібліятэк, музеяў, цэнтраў культуры і інш.), накіраваны на падтрымку і апякунства розных сацыяльных груп.

## СВЯТА КНІГІ

Комплекснае мерапрыемства з мэтай ушанавання кнігі; уключае бібліятэчныя агеньчыкі, чытацкія бенефісы, паэтычныя лабірынты і іншыя формы работы.

## СВЯТЛОКАПІРАВАННЕ

Спосаб капіравання дакументаў, заснаваны на ўласцівасцях злучэнняў, што ўваходзяць у склад святлоадчувальнай паперы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**СЕГМЕНТАЦЫЯ РЫНКУ БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ПАСЛУГ І ПРАДУКТАЎ**

Падзел усёй сукупнасці рэальных і патэнцыяльных карыстальнікаў на групы (сегменты). Дазваляе ўлічваць асаблівасці і запатрабаванні розных груп карыстальнікаў бібліятэчна-інфармацыйных паслуг і мэтанакіравана ўздзейнічаць на попыт. Сегментацыя адбываецца па сацыяльна-эканамічных прыметах (пол, узрост, род заняткаў, адукацыя, веравызнанне, сямейнае становішча і г.д.).

**СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Бібліятэка, якая абслугоўвае работнікаў сельскай гаспадаркі, вучоных і спецыялістаў сельскагаспадарчай вытворчасці.

**СЕЛЬСКАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Публічная ўніверсальная бібліятэка, што размешчана ў сельскай мясцовасці, абслугоўвае насельніцтва адной ці некалькіх вёсак. Як правіла, з'яўляецца філіялам раённай ЦБС.

**СЕМІЁТЫКА**

Галіна ведаў, якая вывучае агульныя ўласцівасці знакаў, знакавыя сістэмы, знакавыя сітуацыі, мовы.

**СЕРЫЙНАЕ ВЫДАННЕ**

1. Неперыядычная серыя.

2. Выданне, што ўваходзіць у неперыядычную серыю.

**СЕРЫЯ**

Сукупнасць выданняў, аб'яднаных агульнасцю задумы, тэматыкі, мэтавым ці чытацкім прызначэннем; выходзіць пад агульным серыйным загалоўкам, як правіла, у аднатыпным афармленні. С. можа быць перыядычнай, неперыядычнай і з працягам.

**СІГЛА**

Кароткае ўмоўнае абазначэнне бібліятэкі, якое выкарыстоўваецца ў зборных каталогах, бібліяграфічных паказальніках і паказвае адрас пошуку ці месцазнаходжанне дакументаў у міжбібліятэчных інфармацыйна-пошукавых сістэмах.

**СІГНАЛЬНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ**

Аператыўнае інфармаванне карыстальнікаў аб новых дакументах па адпаведных галінах ведаў.

**СІГНАЛЬНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бягучы бібліяграфічны дапаможнік, у якім усе або большасць запісаў абмежаваны бібліяграфічным апісаннем **(3.3.2.31)**.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**СІГНАЛЬНЫ ЭКЗЭМПЛЯР**

Адзін з першых экзэмпляраў выдання, які прадастаўляецца паліграфічным прадпрыемствам выдаўцу для зацвярджэння яго ў якасці ўзору для вытворчасці тыражу і выпуску ў свет.

**СІГНАТУРА**

Лічба, якая абазначае парадкавы нумар друкаванага аркуша ў кнізе ці часопісе, друкуецца злева ўнізе на першай старонцы кожнага аркуша.

**СІДЗІРОМ (CD-ROM)**

Гл.: Кампакт-дыск.

**СІМВАЛ**

Элемент узгодненага набору матэрыяльных прадметаў, якія выкарыстоўваюцца для адлюстравання знакаў.

**СІНАНІМІЯ**

Уласцівасць двух або некалькіх розных па форме, але аднолькавых ці блізкіх па значэнні знакаў **(3.1.13)**.

**СІНТАГМАТЫЧНЫЯ АДНОСІНЫ**

Кантэкстуальныя адносіны паміж ключавымі словамі ці дэскрыптарам у пошукавым вобразе дакумента ці ў пошукавым прадпісанні.

**СІСТЭМА БАЗ ДАНЫХ**

Гл.: Банк даных.

**СІСТЭМА БІБЛІЯГРАФІЧНЫХ ДАПАМОЖНІКАЎ**

Цэласная сукупнасць бібліяграфічных дапаможнікаў, якія аб'яднаны якой-небудзь істотнай сацыяльна значнай прыметай (змест, мэтавае і чытацкае прызначэнне, тэрыторыя, від бібліяграфаваных выданняў і інш.) **(3.3.2.3)**.

**СІСТЭМА БІБЛІЯТЭЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ КЛАСІФІКАЦЫІ**

Сістэма класіфікацыйных дзяленняў, прызначаная для ўпарадкаванага размяшчэння дакументаў у лагічнай паслядоўнасці і сузалежнасці на аснове прымет зместу, формы выдання, чытацкага прызначэння і г.д.; ляжыць у аснове структуры сістэматычнага каталога і сістэматычных картатэк; прымяняецца для расстаноўкі фондаў.

**СІСТЭМА БІБЛІЯТЭЧНЫХ КАТАЛОГАЎ І КАРТАТЭК**

Частка даведачна-бібліяграфічнага апарату бібліятэкі, якая ўяўляе сукупнасць планамерна арганізаваных, узаемазвязаных і ўзаемадапаўняльных бібліяграфічных каталогаў, у тым ліку электронных, і бібліяграфічных картатэк, баз даных **(3.3.2.49)**.

**СІСТЭМА КАМУНІКАЦЫІ**

Сістэма, якая прызначана для кіравання працэсамі перадачы інфармацыі (**3.1.22**).

**СІСТЭМА ДАКУМЕНТНЫХ КАМУНІКАЦЫЙ**

Комплекс мер, якія ўключаюць стварэнне, аналітыка-сінтэтычную перапрацоўку, захаванне, распаўсюджанне і выкарыстанне дакументаў як носьбітаў сацыяльнай інфармацыі. Уключае рэдакцыйна-выдавецкую справу, кніжны гандаль, бібліятэчную справу, архіўную справу, навукова-інфармацыйную і бібліяграфічную дзейнасць.

**СІСТЭМА ДЭПАЗІТАРНАГА ЗАХОЎВАННЯ ФОНДУ**

Рэгіянальнае ці агульнанацыянальнае аб'яднанне бібліятэк з мэтай рацыянальнага камплектавання, выкарыстання і захоўвання малаўжывальных дакументаў на падставе міжбібліятэчнай кааперацыі, якая забяспечвае канцэнтрацыю максімальна поўных фондаў пэўнага профілю ў бібліятэках-дэпазітарыях.

**СІСТЭМА КАТАЛОГАЎ І КАРТАТЭК**

Частка даведачна-бібліяграфічнага апарату бібліятэкі, якая ўяўляе сабой сукупнасць планамерна арганізаваных, узаемазвязаных, узаемадапаўняльных каталогаў і картатэк.

**СІСТЭМА КІРАВАННЯ РЭКЛАМНАЙ ДЗЕЙНАСЦЮ**

Комплекс працэсаў, мер, тэхналогій, прыёмаў, спосабаў, сродкаў па планаванні, кіраўніцтве, арганізацыі, кантролі і інфармацыйным забеспячэнні рэалізацыі рэкламнай функцыі бібліятэкі з выкарыстаннем сістэмнага падыходу ў цеснай каардынацыі і кааперацыі з маркетынгавымі функцыямі.

**СІСТЭМА МАРКЕТЫНГАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ**

Сістэма ўзаемасувязі і ўзаемадзеяння суб'ектаў рэкламна-маркетынгавай дзейнасці, тэхналогій, інфармацыйных сродкаў і прадуктаў; адказвае за збор, генерыраванне, структураванне, аналіз, ацэнку, распаўсюджанне актуальнай, сучаснай, дакладнай, рэлевантнай і пертынентнай бібліятэчна-бібліяграфічнай інфармацыі для выкарыстання ў сферы маркетынгу і рэкламы з мэтай удасканалення планавання, правядзення рэкламна-маркетынгавых акцый бібліятэкі.

**СІСТЭМА НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАЙ ІНФАРМАЦЫІ**

Сістэма ўзаемазвязаных органаў, якія ажыццяўляюць сумесную навукова-інфармацыйную дзейнасць з узгодненым раздзяленнем функцый (па відах апрацоўкі, інфармацыі, тэматыцы, тэрыторыі і (або) іншых прыметах) (**3.4.1.1**).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**СІСТЭМА ФОНДАЎ**

Сукупнасць узаемазвязаных і ўзаемадапаўняльных бібліятэчных фондаў адной ці некалькіх бібліятэк, фарміраванне і выкарыстанне якіх арганізуецца па адзіным плане.

**СІСТЭМАТЫЗАТАР**

Спецыяліст, які сістэматызуе дакументы, арганізуе, вядзе і рэдагуе сістэматычны каталог і алфавітна-прадметны паказальнік.

**СІСТЭМАТЫЗАЦЫЯ**

Вызначэнне класіфікацыйнага індэкса твора друку ці іншага дакумента ў адпаведнасці з яго зместам па табліцы пэўнай сістэмы бібліятэчна-бібліяграфічнай класіфікацыі. Тэрмін уведзены ДАСТ 7.26-80 замест мнагазначных тэрмінаў «класіфікацыя», «класіфікаванне».

**СІСТЭМАТЫЧНАЯ КАНТРОЛЬНАЯ КАРТАТЭКА**

Дапаможная картатэка службовага характару, у якой фіксуюць прадметныя рубрыкі АПП (алфавітна-прадметнага паказальніка), арганізаваныя ў сістэматычным парадку іх класіфікацыйных індэксаў.

**СІСТЭМАТЫЧНАЯ КАРТАТЭКА АРТЫКУЛАЎ**

Бібліяграфічная картатэка, якая адлюстроўвае матэрыялы з перыядычных выданняў і выданняў, якія прадаўжаюцца, зборнікаў незалежна ад наяўнасці іх у фондзе бібліятэкі. Да С. к. а. і да сістэматычнага каталога ствараецца адзіны алфавітна-прадметны паказальнік.

**СІСТЭМАТЫЧНАЯ РАССТАНОЎКА ФОНДУ**

Лагічная расстаноўка дакументаў па галінах ведаў, шырока прымяняецца ў бібліятэках з невялікім фондам, падсобных і спецыялізаваных фондах буйных бібліятэк, фондах адкрытага доступу.

**СІСТЭМАТЫЧНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік, у якім бібліяграфічныя запісы размешчаны па пэўнай сістэме бібліятэчна-бібліяграфічнай класіфікацыі (**3.3.2.39**).

**СІСТЭМАТЫЧНЫ ДАПАМОЖНЫ ПАКАЗАЛЬНІК**

Дапаможны паказальнік, які ўяўляе сабой пералік дзяленняў якой-небудзь сістэмы класіфікацыі з аднясеннем да іх адлюстраваных у бібліяграфічным дапаможніку дакументаў у адпаведнасці з іх зместам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**СІСТЭМАТЫЧНЫ ПАКАЗАЛЬНІК ДА ВЫДАННЯ**

Паказальнік да зместу выдання, напрыклад, да выпускаў перыядычных выданняў, рубрыкі якога размеркаваны ў іерархічным парадку, напрыклад па галінах ведаў.

**СІСТЭМАТЫЧНЫ КАТАЛОГ (СК)**

Бібліятэчны каталог, у якім бібліяграфічныя запісы размяшчаюцца па галінах ведаў у адпаведнасці з пэўнай сістэмай класіфікацыі.

**САСТАЎ ЧЫТАЧОЎ**

Характарыстыка сукупнасці чытачоў бібліятэкі па сацыяльна-дэмаграфічных прыметах: узросце, полу, прафесіі, адукацыі і інш.

**СКЛАДАЛЬНІК**

Асоба ці арганізацыя, якія склалі выданне з твораў аднаго ці некалькіх аўтараў або сабралі з розных крыніц і апрацавалі для друку друкаваныя, рукапісныя і іншыя матэрыялы.

**СКЛАДАНАЯ ПРАДМЕТНАЯ РУБРЫКА**

Прадметная рубрыка, якая складаецца з некалькіх лексічных адзінак; можа быць апісальнай ці мнагачленнай.

**СКЛАДАННЕ БІБЛІЯГРАФІЧНАГА АПІСАННЯ**

Працэс выяўлення і занатавання па ўстаноўленых правілах бібліяграфічных звестак аб дакуменце. У працэс С. б. а. уваходзіць: аналіз выдання; выяўленне бібліяграфічных звестак; вызначэнне неабходнага набору элементаў апісання; выбар першага элемента бібліяграфічнага запісу; фіксацыя выяўленых звестак ва ўстаноўленай паслядоўнасці адпаведнымі ўмоўнымі раздзяляльнымі знакамі.

**СКЛАДАНЫ ІНДЭКС**

Класіфікацыйны індэкс, які складаецца з камбінацыі індэкса асноўных табліц класіфікацыі з адным ці некалькімі індэксамі дапаможных табліц класіфікацыі. У гэтым значэнні неўжывальны тэрмін «камбінаваны індэкс».

**СКЛАД ФОНДУ**

Характарыстыка фонду па тыпе дакументаў, змесце, дзяржаўнай прыналежнасці, месцы выдання, мове, годзе выдання, відзе і калекцыйнай каштоўнасці твораў друку і іншых матэрыялаў. С. ф. залежыць ад профілю камплектавання і разам з іншымі фактарамі вызначае структуру фонду.

**СКРУТАК**

Адна са старажытных форм рукапіснай кнігі, лісты якой змацаваны ў адну стужку, згорнутую ў рулон.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**СЛАЙД**

Гл.: Каляровы дыяпазітыў.

**СЛОВАЎТВАРАЛЬНЫ СЛОЎНІК**

Лінгвістычны слоўнік, які раскрывае словаўтваральную структуру слоў, звычайна найменш ужывальных.

**СЛОГАН**

Ёмкая формула (дэвіз, прызыў), якая адлюстроўвае асноўную думку прадмета рэкламы.

**СЛОЎНІК**

Даведачнае выданне, якое змяшчае ўпарадкаваны пералік моўных адзінак (слоў, словазлучэнняў і г. д.) з кароткімі іх характарыстыкамі або характарыстыкамі азначаных імі паняццяў з перакладам на іншую мову. У гэтым значэнні неўжывальны тэрмін «слоўнік-даведнік».

**СЛОЎНІК АМОНІМАЎ**

Лінгвістычны слоўнік, які змяшчае пары ці групы слоў з аднолькавым гучаннем, але супрацьлеглых па значэнні; могуць суправаджацца граматычнымі, стылістычнымі і гістарычнымі паметамі.

**СЛОЎНІК АНТОНІМАЎ**

Лінгвістычны слоўнік, які змяшчае пары слоў, супрацьлеглых па значэнні ці супрацьпастаўленых у якіх-небудзь адносінах, з прыкладамі іх ужывання.

**СЛОЎНІК ІМЁН**

Лінгвістычны слоўнік, які змяшчае прыватныя імёны адной ці некалькіх (многіх) нацый, звычайна з іх граматычнай характарыстыкай і вытворнымі словамі.

**СЛОЎНІК ІНШАМОЎНЫХ СЛОЎ**

Лінгвістычны слоўнік, які змяшчае словы іншамоўнага паходжання і тлумачыць іх значэнне.

**СЛОЎНІК МОВЫ ПІСЬМЕННІКА**

Лінгвістычны слоўнік, які змяшчае лексіку твораў пісьменніка.

**СЛОЎНІК НОВЫХ СЛОЎ**

Лінгвістычны слоўнік, які змяшчае характарыстыку новых слоў, што не ўваходзілі ў раней выдадзеныя слоўнікі.

**СЛОЎНІК СІНОНІМАЎ**

Лінгвістычны слоўнік, які змяшчае лексічныя адзінкі, словы, сінтаксічныя канструкцыі, фразеалагічныя адзінкі, што супадаюць у асноўным значэнні, але адрозніваюцца адценнямі сэнсу ці стылістычнай афарбоўкай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**СЛОЎНІК ПАРОНІМАЎ**

Лінгвістычны слоўнік, які змяшчае пары (групы) аднакарэнных і markрознакарэнных з падобным гучаннем слоў і паказвае адрозненні ў іх значэнні.

**СЛОЎНІК ПРАДМЕТНЫХ РУБРЫК**

Адзіны алфавітны пералік сінонімаў прадметных рубрык (простых і складаных) з устаноўленымі паміж імі парадыгматычнымі адносінамі, выражанымі спасылачным апаратам.

**СЛОЎНІК СКАРАЧЭННЯЎ (АБРЭВІЯТУР)**

Слоўнік, які змяшчае найбольш ужывальныя ў пісьмовай мове ўмоўныя скарачэнні слоў ці словазлучэнняў, дае іх расшыфроўку.

**СЛОЎНІКАВЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Пералік бібліяграфічных запісаў, якія размешчаны ў адзіным алфавіце прозвішчаў аўтараў, загалоўкаў і прадметных рубрык (**3.3.2.38**).

**СЛОЎНІКАВЫ КАТАЛОГ**

Бібліятэчны каталог, у якім бібліяграфічныя запісы размяркоўваюцца ў адзіным алфавітным парадку імён (прозвішчаў) індывідуальных аўтараў, назваў калектыўных аўтараў, загалоўкаў і прадметных рубрык. У С. к. спалучаюцца прынцыпы алфавітнага і прадметнага каталогаў.

**СЛУЖБА МАРКЕТЫНГУ БІБЛІЯТЭКІ**

Структура ўстановы, якая займаецца зборам інфармацыі аб стане рынку, вытворцах і спажыўцах бібліятэчных рэсурсаў, прадуктаў, паслуг, аб становішчы бібліятэкі і яе канкурэнтах на рынку; распрацоўвае рэкамендацыі па рабоце з пэўнымі сектарамі рынку, прадастаўляе аддзелу рэкламы звесткі, неабходныя для яго нармальнага функцыянавання.

**СЛУЖБОВЫ КАТАЛОГ**

Бібліятэчны каталог, прызначаны для карыстання супрацоўнікамі бібліятэкі.

**СПАЖЫВЕЦ БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ ІНФАРМАЦЫІ**

Асоба, калектыў ці арганізацыя, якія атрымліваюць і выкарыстоўваюць бібліяграфічную інфармацыю.

**СПАЖЫВЕЦ ІНФАРМАЦЫІ**

Асоба, калектыў ці арганізацыя, якія маюць патрэбу ў поўнай інфармацыі з мэтай выкарыстання яе ў сваёй працы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**СПАСЫЛАЧНА-ДАВЕДАЧНЫ АПАРАТ ПРАДМЕТНАГА КАТАЛОГА**

Сукупнасць указанняў, якія фіксуюць сувязі і размежаванні паміж прадметнымі рубрыкамі.

**СПАСЫЛАЧНА-ДАВЕДАЧНЫ АПАРАТ ТАБЛІЦ КЛАСІФІКАЦЫІ СІСТЭМАТЫЧНАГА КАТАЛОГА**

Сукупнасць указанняў, якія фіксуюць сувязі і размежаванні паміж класіфікацыйнымі дзяленнямі.

**СПАСЫЛКА**

Складаная частка апарату выдання, якая ўтрымлівае ўказанні на крыніцу (гл.: Бібліяграфічная спасылка) ці кароткі запіс, што звязвае паміж сабой часткі дакумента (каталога, паказальніка). Бываюць С. агульныя і прыватныя. Агульная С. адсылае да другога месца дакумента (каталога, паказальніка). Прыватная С. звязвае паміж сабой роднасныя, сумежныя, узаемадапаўняльныя і тлумачальныя часткі дакумента (каталога, паказальніка).

**СПЕЦЫФІКАЦЫЯ**

Частка зборнага бібліяграфічнага апісання, якая ўтрымлівае звесткі аб асобных тамах (выпусках) шматтомнага (серыйнага) выдання.

**СПЕЦЫЯЛІЗАВАНАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Бібліятэка, якая мае спецыяльны фонд, прызначаны для абслугоўвання пэўных катэгорый чытачоў. Напрыклад, патэнтная бібліятэка, бібліятэка стандартаў, бібліятэка літаратуры па Брайлю і інш.

**СПЕЦЫЯЛІЗАВАНЫ ФОНД**

Бібліятэчны фонд, які складаецца з дакументаў, адабраных па якой-небудзь прымеце: чытацкае прызначэнне, від дакументаў і г. д.

**СПЕЦЫЯЛІЗАВАНЫЯ СПАЖЫВЕЦКІЯ КАТАЛОГІ**

Каталогі-пералікі адпаведных тавараў і паслуг, у прыватнасці бібліятэчна-інфармацыйныя; дасылаюцца тым спажыўцам, якія разглядаюцца як іх патэнцыяльныя карыстальнікі.

**СПЕЦЫЯЛЬНАЯ БІБЛІЯГРАФІЯ**

Бібліяграфія, прызначэннем якой з'яўляецца дыферэнцаванае забеспячэнне інфармацыйных патрэб у розных сферах грамадскай практыкі, г. зн. стварэнне і давядзенне да спажыўцоў крыніц бібліяграфічнай інфармацыі, што маюць канкрэтнае мэтавае і чытацкае прызначэнне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**СПЕЦЫЯЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Бібліятэка, якая забяспечвае прафесійныя патрэбнасці карыстальнікаў і іншыя спецыфічныя патрэбнасці асобных груп чытачоў на аснове адпаведнага фонду і інфармацыйна-пошукавага апарату (патэнтна-тэхнічная, нотная, бібліятэка для сляпых, бібліятэка НДІ і г. д.) **(3.4.2.11)**.

**СПЕЦЫЯЛЬНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік канкрэтнага мэтавага і чытацкага прызначэння (рэкамендацыйны, навукова-дапаможны, прафесійна-вытворчы і інш.) **(3.3.2.12)**.

**СПЕЦЫЯЛЬНЫ КАТАЛОГ**

Каталог, у якім адлюстраваны спецыяльныя бібліятэчныя фонды, калекцыі, дакументы пэўнай тэматыкі, разнавіднасці і прызначэння ў адрозненне ад асноўнага каталога бібліятэкі.

**СПІС ІЛЮСТРАЦЫЙ**

Элемент апарату выдання, які ўяўляе сабой пералік ілюстрацый, змешчаных у выданні, з іх кароткім апісаннем і ўказаннем старонак, на якіх яны надрукаваны.

**СПІС ПРАДМЕТНЫХ РУБРЫК**

Сукупнасць прадметных рубрык і спасылачна-даведачнага апарату прадметнага каталога (спіса, паказальніка).

**СПІС СКАРАЧЭННЯЎ**

Элемент апарату выдання, які змяшчае пералік скарачэнняў, прынятых для пэўнага выдання, і іх расшыфроўку.

**СПРАВАЗДАЧА АБ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ РАБОЦЕ**

Від дакумента, што ўтрымлівае сістэматызаваныя звесткі аб выкананні навуковай установай (прадпрыемствам, арганізацыяй) даследавання, яго этапаў і афармляецца ў адпаведнасці са спецыяльным стандартам.

**СПРАВАЗДАЧА БІБЛІЯТЭКІ**

Сукупнасць звестак аб выніках працы бібліятэкі за пэўны тэрмін. Асноўным відам С. б. з’яўляецца гадавая справаздача, якая падаецца органам дзяржаўнай статыстыкі, чытацкай грамадскасці, вышэйстаячым органам кіравання бібліятэчнай справы.

**СПРОШЧАНАЯ АПРАЦОЎКА**

Метад бібліятэчнай апрацоўкі, які дазваляе спрасціць адлюстраванне ў каталогах некаторых відаў дакументаў (перавыданняў, перадрукоўвак, серыйных выданняў і інш.) з мэтай змяншэння кошту і паскарэння апрацоўкі, паляпшэння работы з карткавымі каталогамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**СРОДКІ РАСПАЎСЮДЖВАННЯ БІБЛІЯТЭЧНАЙ РЭКЛАМЫ**

Спосабы інфармавання грамадства аб бібліятэчнай дзейнасці, якія ўключаюць рэкламу ў сродках масавай інфармацыі, індывідуальную, наглядную, камп'ютарную і інш.

**СТАНДАРТ**

Нарматыўна-вытворчы дакумент па стандартызацыі, які ўстанаўлівае комплекс норм, правіл, патрабаванняў да аб'екта стандартызацыі і зацверджаны кампетэнтным органам. С. падраздзяляюць на катэгорыі: міжнародныя, дзяржаўныя (ДАСТы), галіновыя (ГСТ) і прадпрыемстваў (СТП).

**СТАРАДРУКАВАНАЯ КНІГА**

Кніга, якая ўваходзіць у лік тых, што надрукаваны ў пэўнай краіне на працягу пэўнага часу, пачынаючы ад узнікнення кнігадрукавання да яе масавага распаўсюджання. Напрыклад, у Беларусі – на працягу XVI–XVIII стст. Да іх адносяцца таксама інкунабулы, палеатыпы.

Сін.: Першадрукаваная кніга.

**СТАРОНКА**

Адзін бок ліста ў выданні, адзінка пагінацыі пры аднакалонкавай вёрстцы набору.

**СТАРОНКА ПЕРАПЛЁТУ**

Пярэдняя ці задняя частка пераплёту, якая змяшчае на знешніх баках некаторыя выхадныя звесткі.

**СТАРЭННЕ ІНФАРМАЦЫІ**

Уласцівасць інфармацыі страчваць з часам сваю каштоўнасць, абумоўленая змяненнем стану адлюстраванага ёю прадметнага абсягу.

**СТАТЫСТЫКА БІБЛІЯТЭЧНАГА АБСЛУГОЎВАННЯ НАСЕЛЬНІЦТВА**

Раздзел бібліятэчнай статыстыкі, які вывучае колькасныя працэсы фарміравання чытацкіх кантынгентаў, дынаміку іх развіцця, іх адносіны да колькасці насельніцтва і асобных яго груп, характар і ступень карыстання грамадскімі фондамі. Асноўнымі паказчыкамі С. б. а. н. з'яўляюцца: колькасць чытачоў, наведванне бібліятэк, чытальнасць, выдача дакументаў.

**СТАТЫСТЫКА БІБЛІЯТЭЧНАЙ СЕТКІ**

Раздзел бібліятэчнай статыстыкі, які вывучае колькасць бібліятэк, дынаміку іх развіцця, групоўку па розных прыметах, асаблівасці фарміравання бібліятэчнай сеткі па рэгіёнах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**СТАТЫСТЫКА БІБЛІЯТЭЧНЫХ КАДРАЎ**

Раздзел бібліятэчнай статыстыкі, які вывучае колькасць работнікаў бібліятэк, іх групоўку па класіфікацыі, адукацыйным узроўні, узросце, размеркаванне па відах бібліятэчных устаноў.

**СТАТЫСТЫКА БІБЛІЯТЭЧНЫХ ФОНДАЎ**

Раздзел бібліятэчнай статыстыкі, які вывучае дынаміку аб'ёму і складу фондаў у розных аспектах: па відах дакументаў, мовах і галінах ведаў, па відах бібліятэк, па адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках.

**СТАТЫСТЫКА ДРУКУ**

Збор, апрацоўка, аналіз і публікацыя статыстычных звестак аб творах друку.

**СТАТЫСТЫЧНЫ ЎЛІК У БІБЛІЯТЭЦЫ**

Рэгістрацыя, падлік і колькасная характарыстыка аб'ёму, складу і руху бібліятэчнага фонду; колькасці і саставу чытачоў і кнігавыдач; аб'ёму і саставу масавай, бібліяграфічнай, метадычнай, інфармацыйнай і іншых відаў бібліятэчнай работы для вывучэння дзейнасці бібліятэк, абагульнення вынікаў і наступнага планавання развіцця бібліятэчнай справы.

**СТАЦЫЯНАРНАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Бібліятэка з пастаянным месцам знаходжання і зонай абслугоўвання **(3.4.2.6)**.

**СТВАРЭННЕ БАЗЫ ДАНЫХ**

Комплекс аперацый, які складаецца з ініцыялізацыі носьбіта, яго разметкі, трансляцыі апісання базы, загрузкі запісаў у базу даных.

**СТРАТЭГІЯ ЧЫТАННЯ**

Найбольш аптымальны з пункту гледжання прадукцыйнасці спосаб чытання, які выбіраецца чытачом для кожнай дадзенай сукупнасці ўмоў чытання, тэксту і пастаўленай мэты.

**СТРАХАВЫ ФОНД**

Частка бібліятэчнага фонду на мікраносьбітах, які ствараецца з мэтай захоўвання найбольш каштоўных твораў друку і іншых дакументаў у асобны перыяд; не прызначаецца для выкарыстання абанентамі і патрабуе асабліва беражлівага захоўвання ў бяспечным месцы.

**СТРУКТУРА БІБЛІЯТЭКІ**

Сістэма арганізацыйнага ўладкавання бібліятэкі, якая прадугледжвае сузалежнасць і ўзаемасувязі падраздзяленняў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліятэкі з размеркаваннем функцый паміж імі. Вызначаецца відам бібліятэкі і яе задачамі, аб'ёмам фонду, патрэбамі дыферэнцаванага абслугоўвання чытачоў і г. д. Звычайна С. б. складаюць аддзелы, падраздзяленні, сектары, групы.

**СТРУКТУРА КІРАЎНІЦТВА БІБЛІЯТЭКАЙ**

Сукупнасць узаемазвязаных элементаў, якія знаходзяцца паміж сабой ва ўстойлівых адносінах, што забяспечваюць функцыянаванне і развіццё бібліятэкі як адзінага цэлага. Элементамі С.к.б. з'яўляюцца асобныя кіраўнікі, службы і іншыя звёны апарату кіраўніцтва. Сувязі паміж імі падраздзяляюцца на гарызантальныя (носяць узгоднены характар), вертыкальныя (падпарадкавальная сувязь), лінейныя (упраўленчыя рашэнні і інфармацыя паміж лінейнымі кіраўнікамі), функцыянальныя (у залежнасці ад розных функцый кіраўніцтва).

С.к.б. з'яўляецца формай падзелу і кааперацыяй кіраўніцкай дзейнасці.

**СТРУКТУРА ФОНДУ**

Функцыянальная арганізацыя фонду, якая прадугледжвае ўзаемаразмяшчэнне і ўзаемасувязі падраздзяленняў фонду бібліятэкі, вызначаецца аб'ёмам фонду, галіновым і моўным складам, наяўнасцю розных відаў дакументаў, патрэбамі дыферэнцаванага абслугоўвання чытачоў.

**СТУПЕНЧАТАЯ (ЛАГІЧНАЯ) ІНДЭКСАЦЫЯ**

Від індэксацыі ў іерархічных сістэмах класіфікацыі; адлюстроўвае супадпарадкаванне класіфікацыйных рубрык.

**СТЫМУЛЫ ЧЫТАННЯ**

Уздзеянні, якія з'яўляюцца знешнімі пабуджальнымі фактарамі пры выбары і чытанні дакументаў. Сюды адносяцца і формы бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці: выстаўкі, адкрытыя прагляды навінак, каталогі, картатэкі, рэкамендацыйныя бібліяграфічныя дапаможнікі, агляды літаратуры, гутаркі, парады бібліятэкара і інш.

**СТЭЛАЖ**

Прыстасаванне для захоўвання дакументаў, якое складаецца са злучаных у некалькі ярусаў адкрытых паліц. Адрозніваюць аднабаковы (змяшчае адзін рад дакументаў) і двухбаковы (змяшчае два рады) С. Вырабляюцца з дрэва, металу і іншых матэрыялаў.

**СТЭРЭАТЫПНАЕ ВЫДАННЕ**

Перавыданне, надрукаванае са стэрэатыпаў (копій арыгінальных друкарскіх форм), інакш кажучы, без змяненняў. У шырокім сэнсе – любое перавыданне без змен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**СУАЎТАР**

Асоба ці арганізацыя, якія з'яўляюцца аўтарамі твора сумесна з іншай асобай (асобамі) ці арганізацыяй (арганізацыямі).

**СУМАРНЫ ЎЛІК ФОНДУ**

Від уліку бібліятэчнага фонду партыямі (групамі), якія паступаюць ці выбываюць па адным суправаджальным дакуменце (рахунак, накладная і інш.) ці акце аб спісанні дакументаў з фонду.

**СУМЕСНАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, якое выпускаецца ад імя двух ці некалькіх выдавецтваў (сувыдаўцоў) адной ці розных краін, ствараецца ў выніку сумеснай аўтарскай і рэдакцыйна-выдавецкай работы. Прадугледжвае ўдзел кожнага сувыдаўца ў аўтарскіх правах на выданне (цалкам або часткова) і эканамічны ўклад у выданне кожнага сувыдаўца.

**СУПЕРВОКЛАДКА**

Дадатковая, звычайна здымная вокладка кнігі ці брашуры ў выглядзе ліста паперы з клапанамі, загнутымі на ўнутраную частку старонак пераплёту ці вокладкі. Выконвае ахоўную, афарміцельскую і рэкламна-інфармацыйную функцыі.

**СУПЕРЭКСЛІБРЫС**

Знак, адціснуты на карашку або знешняй частцы старонкі пераплёту выдання для абазначэння яе ўладальніка.

**СШЫТАК УЛІКУ АДМОЎ**

Гл.: Картатэка адмоў.

**СЯМЕЙНАЕ ЧЫТАННЕ**

Творчая чытацкая дзейнасць дарослых (бацькоў) і дзяцей ва ўмовах суб'ектных зносін, накіраваных на развіццё асобы дзіцяці, удасканаленне педагагічнай, у тым ліку псіхалагічнай і метадычнай адукаванасці бацькоў.

**СЯМЕЙНЫ АБАНЕМЕНТ**

Форма бібліятэчнага абанемента, якая афармляецца на аднаго члена сям'і (лідэра чытання); па просьбе іншых членаў сям'і ён атрымлівае кнігі на ўсіх.

**СЯМЕЙНЫЯ КЛУБЫ ЧЫТАННЯ**

Своеасаблівыя чытацкія аб'яднанні пры бібліятэках, мэта якіх – прапагандаваць сямейнае чытанне, выяўляць сямейныя чытацкія дынастыі, умацоўваць сям'ю, дапамагаць выхаванню ў дзяцей любові да кнігі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СЯРЭДНІЯ ПАКАЗЧЫКІ БІБЛІЯТЭЧНАЙ СТАТЫСТЫКІ

Абагульненыя паказчыкі, якія даюць агульныя або зборныя характарыстыкі якасна аднародных і колькасна адрозных адна ад другой велічынь.

# *Т*

## ТАБЛІЦЫ АЎТАРСКІХ ЗНАКАЎ

Алфавітны пералік найбольш распаўсюджаных пачатковых спалучэнняў літар, якія пранумараваны арабскімі лічбамі ад 11 да 99 (у двухзначных Т. а. з.) ці ад 111 да 999 (у трохзначных Т. а. з.). Прызначаюцца для вызначэння аўтарскага знака.

## ТАБЛІЦЫ КЛАСІФІКАЦЫІ

1. Практычны дапаможнік, які служыць для вызначэння класіфікацыйных індэксаў у мэтах упарадкаванага размяшчэння твораў друку і іншых дакументаў у лагічнай паслядоўнасці, сувязі і сузалежнасці адпаведна з прыметамі зместу, формы выдання, чытацкага прызначэння. Т. к. складаюцца з асноўных табліц, дапаможных табліц і алфавітна-прадметнага паказальніка; можа быць у карткавай або машыначытальнай форме, на мікраносьбітах, а таксама ў форме кніжнага выдання. У гэтым значэнні неўжывальны тэрмін «схема класіфікацыі».

2. Дапаможнікі, якія прызначаюцца для вызначэння класіфікацыйных індэксаў у мэтах упарадкавання дакументаў. Адлюстроўваюць структуру, змест, індэксацыю якой-небудзь бібліятэчна-бібліяграфічнай класіфікацыі на шляху яе развіцця, што вызначаны годам выдання Т.к. Яны могуць быць у карткавай ці машыначытальнай форме, на мікраносьбітах, а таксама ў форме кніжнага выдання.

## ТАКСАНАМІЧНЫЯ КАТЭГОРЫІ

Прымяняльныя ў класіфікацыйнай тэрміналогіі паняцці «клас – падклас», «аддзел – пададдзел», «раздзел – падраздзел»; характарызуюць класіфікацыйныя дзяленні розных сістэм класіфікацыі.

## ТАКСАНОМІЯ

Тэорыя класіфікацыі і сістэматызацыі складана арганізаваных галін дзейнасці, якія маюць звычайна іерархічны склад

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(арганічны свет, аб'екты геаграфіі, геалогіі, мовазнаўства, этнаграфіі і г.д.). Агульныя прынцыпы, заканамернасці і тэарэтычныя палажэнні таксама пакладзены ў аснову сістэматызацыі дакументаў.

**ТАЛОН ЗВАРОТНАЙ СУВЯЗІ**

Элемент арганізацыі сістэмы ВРІ. Адрыўная частка рассылаемай абанентам карты (інфармацыйнага паведамлення), якая ўключае бібліяграфічнае апісанне дакумента і шкалу ацэнкі яго адпаведнасці інфармацыйным патрэбам абанентаў.

**ТАПАГРАФІЧНАЯ РАССТАНОЎКА ФОНДУ**

Сін.: Геаграфічная расстаноўка фонду.

**ТАПАЛАГІЧНЫ КАТАЛОГ**

Бібліятэчны каталог, у якім бібліяграфічныя запісы змешчаны ў адпаведнасці з расстаноўкай дакументаў на паліцах. У гэтым значэнні неўжывальны тэрмін «шафавы вопіс».

**ТАПАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК**

Лінгвістычны слоўнік назваў геаграфічных аб'ектаў.

**ТАРЫФІКАЦЫЯ БІБЛІЯТЭЧНАГА РАБОТНІКА**

Устанаўленне бібліятэчнаму работніку адпаведна са штатным раскладам аклада (стаўкі), заробку ў адпаведнасці з займаемай пасадай, кваліфікацыяй і тыпам бібліятэкі, у якой ён працуе.

**ТВОР**

Прадукт мастацкай ці літаратурнай творчасці, які вызначаецца завершанасцю думкі ці ўвасабленнем вобразаў з дапамогай мовы, знакаў, сімвалаў або іншых выяўленчых сродкаў.

**ТВОР ДРУКУ**

Адзінка паліграфічнай вытворчасці, атрыманая ў выніку друку ці адбітку. Можа быць выданнем або іншым відам друкаванага вырабу (бланкі, этыкеткі і г.д.).

**ТЛУМАЧАЛЬНЫ СЛОЎНІК**

Слоўнік, у якім раскрываюцца значэнні слоў, падаецца іх граматычная і стылістычная характарыстыка, прыклады ўжывання ў якой-небудзь мове і іншыя звесткі.

**ТОМ**

1. Асобная, паліграфічна завершаная частка шматтомнага выдання.

2. Частка перыядычнага ці бягучага выдання, якая ўяўляе сабой яго асобны выпуск або аб'ядноўвае групу выпускаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ТРАНСКРЫПЦЫЯ**

Перадача слоў ці спалучэнняў літар адной мовы алфавітам іншай з улікам фанетыкі.

**ТРАНСЛІТАРАЦЫЯ**

Перадача слоў ці спалучэнняў літар адной мовы алфавітам іншай без уліку фанетыкі. Выкарыстоўваецца пры перадачы ўласных імёнаў іншамоўнага паходжання.

**ТРАНСФАРМАВАННЕ ДАНЫХ**

Перанясенне даных з аднаго носьбіта даных на другі без істотнага змянення інфармацыі, якая ў іх утрымліваецца **(3.2.1.7)**.

**ТРАФАРЭТНЫ ДРУК**

Спосаб малатыражнага друку, заснаваны на прымяненні формы, у якой элементы выявы ўяўляюць сабой адтуліны, праз якія на паперу наносіцца фарба, утвараючы адпаведны адбітак.

**ТЫПАВОЕ КЛАСІФІКАЦЫЙНАЕ ДЗЯЛЕННЕ**

Класіфікацыйнае дзяленне, якое адлюстроўвае тыпавое, паўторнае паняцце, прызначанае для аднастайнай пабудовы табліц бібліятэчна-бібліяграфічнай класіфікацыі, сістэматычных каталогаў (картатэк, спісаў, паказальнікаў). У пэўных сістэмах бібліятэчна-бібліяграфічнай класіфікацыі Т. к. дз. атрымліваюць розныя назвы. У залежнасці ад ступені агульнасці і межаў прымянення Т. к. дз. падраздзяляюцца на агульныя, якія прымяняюцца ў табліцах класіфікацыі па ўсіх галінах ведаў, і спецыяльныя, якія прымяняюцца ў межах бібліятэчна-бібліяграфічнай класіфікацыі па адной галіне ці па шэрагу сумежных галін. У залежнасці ад прызначэння Т. к. дз. адлюстроўваюць фармальныя, тэрытарыяльныя, храналагічныя, этнічныя, моўныя і іншыя тыпавыя паняцці.

**ТЫПАВЫ ЗАГАЛОВАК**

Асноўны загаловак, які складаецца з тыпавых слоў, што абазначаюць назву віду выдання ці літаратурны жанр твора (вучоныя запіскі, даклады і інш.); звычайна суправаджаецца назвай арганізацыі.

**ТЫПАВЫ ІНДЭКС**

У бібліятэчна-бібліяграфічнай класіфікацыі (ББК) – індэкс дапаможных табліц класіфікацыі, які абазначае тыпавыя дзяленні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ТЫПАВЫ КАТАЛОГ**

Сістэматычны рэкамендацыйны паказальнік дакументаў у дапамогу папаўнення фонду бібліятэк пэўнага віду; адначасова служыць мадэллю для арганізацыі сістэматычнага каталога. Т. к. выкарыстоўваецца таксама ў даведачна-бібліяграфічнай рабоце і з’яўляецца адной з форм цэнтралізаванай каталагізацыі.

**ТЫПАВЫЯ ДЗЯЛЕННІ ВА УДК**

Вызначальнікі ў выглядзе табліц, распрацаваныя М.Дзьюі, якія знайшлі развіццё ва УДК у якасці сістэмы агульных і спецыяльных вызначальнікаў.

**ТЫПАВЫЯ ДЗЯЛЕННІ Ў ББК**

Дзяленні дапаможных табліц класіфікацыі. Сістэма Т. дз. ББК уключае агульныя Т. дз. (тэматычныя, фармальныя, тэрытарыяльныя, этнічныя) і спецыяльныя Т. дз., якія адлюстроўваюць паняцці, характэрныя для адной галіны ведаў.

**ТЫПАЛАГІЧНЫ СКЛАД ФОНДУ**

Суадносіны (у фондзе цалкам і ў асобных яго раздзелах) дакументаў рознага мэтавага і чытацкага прызначэння; звычайна выражаецца ў працэнтах, якія паказваюць удзельную вагу кожнага тыпу дакументаў у фондзе.

**ТЫПАЛОГІЯ**

Навуковая дысцыпліна, асноўны метад якой – расчляненне сістэм аб’ектаў і іх групоўка з дапамогай абагульняльнай мадэлі ці тыпу. Выкарыстоўваецца ў мэтах параўнальнага вывучэння існуючых прымет, сувязей, функцый, адносін, узроўню ў арганізацыі аб’ектаў як аднachасова існуючых, так і раздзеленых часам. Праблема Т. узнікае ва ўсіх навуках, якія маюць справу з вельмі розным па сваім складзе мноствам аб’ектаў і вырашаюць задачу ўпарадкавання апісання і тлумачэння.

**ТЫПАЛОГІЯ БІБЛІЯТЭК**

Навуковая класіфікацыя бібліятэк па агульнасці прымет (характары задавальнення грамадскіх інфармацыйных патрэб, аб’ектах дзейнасці бібліятэк, рэгіянальным узроўні, ведамаснай прыналежнасці), якімі вызначаюцца склад фондаў, кантынгент чытачоў, месца ў сістэме бібліятэчных устаноў краіны.

**ТЫПАЛОГІЯ ЧЫТАЧОЎ**

Навуковая класіфікацыя чытачоў па агульнасці прымет; з’яўляецца адным са сродкаў дыферэнцыяцыі чытачоў, раз-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

віваецца ў двух асноўных напрамках: 1) з улікам структуры чытацкіх інтарэсаў ці матываў чытання, ступені чытацкай актыўнасці, начытанасці і інш.; 2) з улікам асаблівасцей успрымання літаратуры розных відаў і жанраў.

**ТЫПІЗАЦЫЯ**

У класіфікацыйных сістэмах – адбор тыпавых паняццяў, якія паўтараюцца, і распрацоўка табліц тыпавых дзяленняў. З выкарыстаннем Т. пералічальная сістэма класіфікацыі ператварылася ў камбінаваную сістэму класіфікацыі. Далейшае развіццё методыка Т. атрымала ў тэорыі пабудовы аналітыка-сінтэтычных сістэм класіфікацыі. У аснову метаду Т. пакладзены прынцыпы і заканамернасці агульнанавуковай дысцыпліны – тыпалогіі.

**ТЫРАЖ**

Колькасць экзэмпляраў выдання (наогул выдавецкай прадукцыі).

Сін.: Наклад.

**ТЫТУЛЬНЫ ЛІСТ**

Загаловачны ліст выдання (кнігі, брашуры і г.д.), які ўтрымлівае асноўныя звесткі аб ім і дазваляе адрозніваць яго ад любога іншага; служыць асновай для складання бібліяграфічнага апісання. Існуюць: разваротны Т. л., распашны Т. л., контртытул, асноўны Т. л., галоўны Т. л., паралельны Т. л., авантытул.

**ТЫТУЛЬНЫ РЭДАКТАР**

Аўтарытэтны спецыяліст, вучоны, пісьменнік, які кіруе работай аўтара ці аўтарскага калектыву над творам. Прозвішча яго друкуецца на тытульным лісце.

**ТЭЗАЎРУС**

Аўтаматызаваны слоўнік, які адлюстроўвае семантычныя адносіны паміж лексічнымі адзінкамі дэскрыптарнай інфармацыйна-пошукавай мовы і прызначаны для пошуку слоў па іх сэнсавым значэнні.

**ТЭЗІСЫ ДАКЛАДАЎ НАВУКОВАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ (СІМПОЗІУМА, З'ЕЗДА)**

Навуковы неперыядычны зборнік, які змяшчае апублікаваныя да пачатку канферэнцыі або пасля яе матэрыялы (тэзісы дакладаў, паведамленняў і г. д., іх анатацыі або рэфераты).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ТЭКСТ**

1. Тэматычная ўзаемазвязаная паслядоўнасць выказванняў ці адно выказванне, якое выражана з дапамогай пэўнай сістэмы знакаў, а таксама пісьмовая фіксацыя выказванняў.

2. Асноўная частка літаратурнага твора, якая прадстаўлена ў выглядзе ўзаемазвязных лексічных, граматычных, лагічных, стылістычных адзінак, што перадаюць яго змест. У выданні вызначаюць Т. асноўны (літаратурнага твора ці твораў), дапаможны (навуковага і даведачна-дапаможнага апарату), дадатковы (дадаткаў да асноўнага Т.).

**ТЭКСТАВАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, большую частку аб'ёму якога займае тэкст.

**ТЭКСТАВЫ РЭДАКТАР**

Прырама-рэдактар, якая забяспечвае рэдагаванне тэкставых файлаў.

**ТЭКСТАВЫ ФАЙЛ**

Файл, які ўтрымлівае інфармацыю ў выглядзе паслядоўнасці тэкставых сімвалаў (літар, лічбаў, знакаў прыпынку, прабелаў і г.д.), падзеленых сімваламі новага радка.

**ТЭЛЕАПРАЦОЎКА ДАНЫХ**

Апрацоўка даных у электроннай сістэме, карыстальнікі якой аддалены ад ЭВМ і выкарыстоўваюць сродкі дыстанцыйнай перадачы даных.

**ТЭЛЕДОСТУП**

Доступ да аддаленых даных.

**ТЭЛЕКАМУНІКАЦЫЯ**

Дыстанцыйная сувязь; дыстанцыйная перадача даных.

**ТЭЛЕКАНФЕРЭНЦЫЯ**

Сэрвіс Інтэрнэта, які заключаецца ў арганізацыйным тэматычным абмене інфармацыяй паміж карыстальнікамі, г. зн. у групавых дыскусіях.

**ТЭЛЕТЭКСТ**

Абанентная служба пакетнай перадачы тэкставых паведамленняў па тэлефоннай сетцы ці сетцы перадачы даных.

**ТЭМАТЫКА-ТЫПАЛАГІЧНЫ СКЛАД ФОНДУ**

Змест фонду, ступень дэталізацыі змешчанай у ім інфармацыі і яе мэтавае і чытацкае прызначэнне. Устанаўліваецца для кожнай бібліятэкі ў адпаведнасці з інфармацыйнымі патрэбамі чытачоў, з улікам яе месца ў сістэме абслугоўвання. У аснове Т.-т. с. ф. ляжыць пералік пэўных тэм, якім прысве-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чаны выданні ў фондзе, з удакладненнем мэтавага і чытацкага іх прызначэння. Т.-т. с. ф. адлюстроўваецца ў тэматыка-тыпалагічным плане камплектавання і становіцца такім чынам мадэллю фонду.

**ТЭМАТЫЧНАЯ БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА**

Бібліяграфічная даведка, якая ўтрымлівае пералік дакументаў, што адпавядаюць тэматычнаму запыту (рэлевантных запыту).

**ТЭМАТЫЧНАЯ ВЫСТАВА**

Выстава твораў друку і іншых матэрыялаў пэўнай тэматыкі з мэтай азнаямлення чытачоў (спецыялістаў).

**ТЭМАТЫЧНАЯ КАРТАТЭКА**

Бібліяграфічная картатэка, якая адлюстроўвае дакументы па пэўнай тэме незалежна ад іх наяўнасці ў фондзе бібліятэкі.

**ТЭМАТЫЧНАЯ РАССТАНОЎКА ФОНДУ**

Лагічная расстаноўка, якая прымяняецца для збору дакументаў розных галін ведаў і розных відаў у межах пэўнай тэмы.

**ТЭМАТЫЧНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік, які адлюстроўвае дакументы па пэўнай тэме, праблеме (**3.3.2.19**).

**ТЭМАТЫЧНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ПОШУК**

Пошук бібліяграфічнай інфармацыі, які адпавядае (рэлевантны) тэматычнаму запыту.

**ТЭМАТЫЧНЫ ВЕЧАР**

Масавае мерапрыемства, якое арганізуецца бібліятэкай з мэтай прыцягнення ўвагі чытачоў да пэўнай тэмы, праблемы.

**ТЭМАТЫЧНЫ ДАПАМОЖНЫ ПАКАЗАЛЬНІК**

Дапаможны паказальнік, які ўяўляе сабой пералік тых дакументаў, што адлюстраваны ў бібліяграфічным дапаможніку, з адсылкай да адпаведных бібліяграфічных запісаў.

**ТЭМАТЫЧНЫ ЗАГАЛОВАК**

Асноўны загаловак, які складаецца са слоў, што раскрываюць тэматыку і змест выдання.

**ТЭОРЫЯ КАМУНІКАЦЫІ**

Навуковая дысцыпліна, якая вывучае метады і сістэмы камунікацыі (**3.1.21**).

**ТЭРМАГРАФІЯ**

Спосаб капіравання дакументаў, заснаваны на ўласцівасцях спецыяльнай паперы ўзнаўляць пад уздзеяннем інфрачырвонага выпраменьвання копію тэксту ці іншага графічнага адлюстравання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ТЭРМІН**

Слова або словазлучэнне, якое з'яўляецца дакладным абазначэннем пэўнага паняцця якой-небудзь галіны ведаў (**3.1.9**).

**ТЭРМІН ІНДЭКСАВАННЯ**

Адна ці некалькі ўзаемазвязаных лексічных адзінак, якія прадстаўлены ў пошукавым вобразе дакумента і афармлены па правілах дадзенай ІПМ. У класіфікацыйнай ІПМ гэты тэрмін выражаны пры дапамозе поўнага індэкса, у прадметызацыйнай ІПМ – у выглядзе сукупнасці прадметных рубрык.

**ТЭРМІНАЛ**

Прыстасаванне ўводу-вываду інфармацыі, злучанае з электронна-вылічальнай машынай пры дапамозе каналаў перадачы даных (напрыклад, тэлетайп, экранны пульт).

**ТЭРМІНАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК**

Слоўнік, у якім падаюцца і тлумачацца тэрміны якой-небудзь галіны ведаў.

**ТЭРМІНАСІСТЭМА**

Арганізаваная сукупнасць тэрмінаў у спецыяльнай мове пэўнай галіны ведаў (**3.1.11**).

**ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫЯ ТЫПАВЫЯ ДЗЯЛЕННІ (ТТД)**

Тыпавыя дзяленні, якія адлюстроўваюць катэгорыю месца і прасторы. Табліцы ТТД пададзены ў выглядзе дзвюх адносна ўзаемадапасаваных табліц, першая прызначана для выкарыстання ў раздзелах прыродазнаўчых навук, другая – грамадскіх. Асобна выдадзены табліцы ТТД Старажытнага свету.

**ТЭХНАЛАГІЧНАЯ КАРТА**

Паслядоўнае апісанне па пэўнай форме працэсаў і аперацый, якія складаюць цыкл і выконваюцца ў адным ці некалькіх структурных падраздзяленнях.

**ТЭХНАЛОГІЯ АПРАЦОЎКІ ІНФАРМАЦЫІ**

Сукупнасць працэдур стварэння, апрацоўкі, кадзіравання, дэкадзіравання, перадачы, захавання і выкарыстання даных на базе комплексу тэхналагічных сродкаў.

**ТЭХНІЧНАЯ АПРАЦОЎКА**

Частка бібліятэчнай апрацоўкі дакументаў, якая ўключае штэмпеляванне, прастаўленне інвентарнага нумара і шыфру, афармленне фармуляраў, наклейванне кішэнек, лістоў тэрміну звароту і інш.

**ТЭХНІЧНАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Спецыяльная бібліятэка, якая забяспечвае інфармацыйныя патрэбы работнікаў прадпрыемства, арганізацыі і фарміруе фонд у адпаведнасці з іх вытворчым профілем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ТЭХНІЧНАЯ ЛІТАРАТУРА**

Сукупнасць дакументаў, якія асвятляюць пытанні тэхнікі, тэхналогіі, тэхнічных навук і разнастайных галін прамысловасці.

**ТЭХНІЧНЫЯ ЎМОВЫ**

Нарматыўнае вытворча-практычнае выданне, якое ўтрымлівае комплекс тэхнічных патрабаванняў да прадукцыі, правілы прыёмкі, пастаўкі і г.д.

## *У*

**УВАХОДНЫ ДАКУМЕНТ**

Дакумент (запыт), які складаецца па вызначанай форме і ўтрымлівае даныя для ўводу ў ЭВМ.

**УВОД-ВЫВАД**

Агульны тэрмін, які вызначае працэс перадачы даных паміж знешнімі (вонкавымі) прыстасаваннямі і асноўнай памяццю.

**УВОД ДАНЫХ У СІСТЭМУ**

Аперацыя чытання даных з носьбітаў (дыскета, магнітная стужка, аптычны дыск і г.д.), з клавіятуры тэрмінала або з голасу і наступны запіс даных у асноўную памяць.

**УВОД ІНФАРМАЦЫІ Ў ЭЛЕКТРОННЫ КАТАЛОГ (ЭК)**

Вылучэнне элементаў бібліяграфічнага запісу і занясенне іх у адпаведныя палі і падпалі фармату, абазначаныя меткамі, якія дазваляюць камп'ютару ідэнтыфікаваць уводзімую інфармацыю аб дакуменце.

Палі і падпалі высвятляюцца на экране, пасля чаго адбываецца іх запаўненне.

**УВОДЗІНЫ**

Уступная, пачатковая частка асноўнага тэксту, якая мае на мэце зарыентаваць чытача ў далейшым выкладзе матэрыялу, падрыхтаваць яго да ўспрымання асноўнага тэксту. Ва У. можа падавацца кароткі гістарычны нарыс, агляд літаратурных крыніц, эксперыментальных даных, абгрунтаванне тэмы, тлумачэнне асноўнай тэрміналогіі.

**УДАКЛАДНЯЛЬНАЯ БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА**

Бібліяграфічная даведка, якая вызначае ці ўдакладняе элементы бібліяграфічнага апісання дакументаў.

**УДАКЛАДНЯЛЬНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ПОШУК**

Адшуканне адсутных ці ўдакладненне недакладных элементаў бібліяграфічнага апісання дакументаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**УДК**

Гл.: Універсальная дзесятковая класіфікацыя.

**УЗАЕМАДЗЕЯННЕ БІБЛІЯТЭК**

Аб'яднанне бібліятэк для сумеснай дзейнасці і для ўзаемнага абмену яе вынікамі на аснове пэўных адносін узаемасувязей з мэтай найбольш поўнага задавальнення інфармацыйных патрэб і эфектыўнага выкарыстання бібліятэчных рэсурсаў. У.б. уключае ўсе асноўныя напрамкі дзейнасці бібліятэк (камплектаванне і выкарыстанне бібліятэчных фондаў, абслугоўванне чытачоў, інфармацыйную, даведачна-бібліяграфічную, навукова-метадычную, даследчую работу і г.д.). У.б. можа быць унутрыведамасным і міжведамасным.

**УЗАЕМАДЗЕЯННЕ ПА МБА**

Супрацоўніцтва заказчыка і выканаўцы з мэтай ажыццяўлення заказу па міжбібліятэчным абанеменце, якое ўключае запыт, атрыманне дакумента (яго копіі) ці адмовы, зварот дакумента фондатрымальніку; здзяйсняецца з выкарыстаннем электроннай пошты.

**УЗНОЎЛЕНАЕ ЭЛЕКТРОННАЕ ВЫДАННЕ**

Электроннае выданне, якое выходзіць праз вызначаныя або нявызначаныя прамежкі часу ў выглядзе нумараваных ці датаваных выпускаў, якія маюць аднолькавы загаловак і часткова паўторны змест. Кожны наступны выпуск утрымлівае ў сабе ўсю астатнюю актуальную інфармацыю і цалкам замяняе папярэдні.

**УКАРАНЕННЕ ВЫНІКАЎ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ РАБОТЫ**

Працэс выкарыстання ў практыцы бібліятэк навуковых вынікаў з мэтай паляпшэння зместу і арганізацыі работы бібліятэк, удасканалення сістэмы бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва. Працэс уключае этапы ацэнкі і адбору навуковых вынікаў, іх асваення і ўкаранення.

**УКАРАНЕННЕ ПЕРАДАВОГА БІБЛІЯТЭЧНАГА ВОПЫТУ**

Працэс актыўнага ўздзеяння на работу бібліятэк з мэтай прымянення ў іх перадавых форм і метадаў працы. Уключае распрацоўку і распаўсюджванне рэкамендацый па ўкараненні, рэкламаванні перадавога вопыту, навучанне бібліятэкараў новым формам і метадам работы, аказанне метадычнай дапамогі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**УКЛЮЧЭННЕ АПІСАННЯЎ У КАТАЛОГ**

Бібліятэчная тэхналагічная аперацыя па вядзенні каталога; каталожная картка з бібліяграфічным апісаннем дакумента ўключаецца ў каталог, месца яе вызначана відам каталога.

**УЛАСНАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, якое выпускае выдавецтва цалкам ад сябе, на прыватныя сродкі, у адрозненне ад заказнога, якое друкуецца за кошт заказчыка і з выкарыстаннем яго матэрыялаў.

**УЛІК У БІБЛІЯТЭЦЫ**

Сістэматычная рэгістрацыя і падлік колькасных і якасных паказчыкаў, якія характарызуюць дзейнасць бібліятэкі. Устаноўлены адзіныя і абавязковыя формы ўліку для бібліятэк аднаго віду: аператыўны, статыстычны, бухгалтарскі.

**УЛІК ФОНДУ**

Комплекс аперацый, якія забяспечваюць фіксацыю звестак аб аб'ёме, складзе і руху фонду, а таксама яго захаванні.

**УЛІКОВА-ВЫДАВЕЦКІ АРКУШ**

Адзінка аб'ёму выдання, роўная 40 тыс. друкаваных знакаў ці 700 радкам вершаванага тэксту або 3 тыс. $см^2$ ілюстрацыйнага матэрыялу.

**УЛІКОВАЯ АДЗІНКА**

Гл.: Адзінка ўліку фонду.

**УЛІКОВЫ КАТАЛОГ**

Службовы каталог, на картках якога здзяйсняецца індывідуальны ўлік кніг і брашур адзінага фонду, бібліяграфічныя запісы ва У.к. заносяцца на карткі асобай формы і размяшчаюцца ў алфавітным парадку. Ва ўмовах камп'ютарызацыі бібліятэк замяняецца электронным каталогам.

**УМОЎНЫ ЗАГАЛОВАК**

Загаловак, сфармуляваны складальнікам бібліяграфічнага апісання ў выпадку адсутнасці загалоўка на дакуменце ці яго састаўной частцы.

**УМОЎНЫЯ РАЗДЗЯЛЯЛЬНЫЯ ЗНАКІ**

Знакі прыпынку і матэматычныя знакі (кропка, працяжнік, двукроп'е, знак роўнасці, касая рыска і інш.), якія папярэднічаюць элементам і абласцям апісання, раздзяляюць вобласці і складаюць іх элементы, ідэнтыфікуюць іх.

**УНІВЕРСАЛЬНАЯ БІБЛІЯГРАФІЯ**

Бібліяграфія, якая забяспечвае грамадства інфармацыяй аб дакументах па ўсіх галінах ведаў у пэўных фармальных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(тыпалагічных, храналагічных, тэрытарыяльных, моўных і інш.) граніцах.

**УНІВЕРСАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Бібліятэка, якая задавальняе разнастайныя чытацкія запатрабаванні на аснове фондаў, баз даных і электронных рэсурсаў, што сфарміраваны без тэматычных і тыпалагічных абмежаванняў (**3.4.2.9**).

**УНІВЕРСАЛЬНАЯ ДЗЕСЯТКОВАЯ КЛАСІФІКАЦЫЯ (УДК)**

Іерархічная камбінацыйная сістэма бібліятэчна-бібліяграфічнай класіфікацыі, распрацаваная ў 1895–1905 гг. у Міжнародным бібліяграфічным інстытуце ў Брусэлі пад кіраўніцтвам бельгійскіх вучоных Поля Атле (1868–1944) і Анры Лафантэна (1854–1943) на аснове Дзесятковай класіфікацыі.

**УНІВЕРСАЛЬНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік, які адлюстроўвае дакументы па ўсіх галінах ведаў, што бібліяграфаваны па фармальных крытэрыях (тыпалагічных, тэрытарыяльных, дзяржаўных, храналагічных і інш.) (**3.3.2.17**).

**УНІВЕРСАЛЬНЫ ФОНД**

Бібліятэчны фонд, які змяшчае розныя віды твораў друку і іншых дакументаў па ўсіх ці большасці галінах ведаў.

**УНІВЕРСАЛЬНЫЯ ТАБЛІЦЫ КЛАСІФІКАЦЫІ**

Табліцы класіфікацыі па ўсіх галінах ведаў. У. т. к. публікуюцца ў варыянтах рознай ступені дэталізацыі (поўныя, сярэднія, скарочаныя), а таксама ў залежнасці ад прызначэння (для публічных, навуковых і інш. бібліятэк).

**УНІКАЛЬНАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, якое не мае сабе падобных, адрозніваецца ад іншых арыгінальнымі асаблівасцямі зместу і формы.

**УНІКАЛЬНЫ ЭКЗЭМПЛЯР ВЫДАННЯ**

Адзіны ў сваім родзе экзэмпляр, дзякуючы якому можна пазнаёміцца з індывідуальнымі асаблівасцямі, што маюць літаратурнае, навуковае, мастацкае значэнне (напрыклад, з паметкамі знакамітай асобы, з праўкамі аўтара і г.д.).

**УНІФІКАВАНЫ ЗАГАЛОВАК**

Найбольш распаўсюджаная форма загалоўка ананімнага класічнага твора, які выдаваўся пад рознымі загалоўкамі; прымяняецца ў якасці загалоўка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**УНУТРЫГАЗЕТНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік, які апублікаваны ў газеце ў якасці самастойнага матэрыялу (**3.3.2.44**).

**УНУТРЫКНІЖНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік, які ўключаны ў склад неперыядычнага выдання ў якасці самастойнага матэрыялу (**3.3.2.42**).

**УНУТРЫСІСТЭМНЫ АБМЕН**

Працэс перадачы дакументаў з аднаго структурнага падраздзялення ЦБС у другое (часцей за ўсё з цэнтральнай бібліятэкі ў бібліятэку-філіял) і зварот дакумента пасля выкарыстання ў бібліятэку па прыналежнасці.

Сін.: Унутрысістэмная цыркуляцыя фонду.

**УНУТРЫСІСТЭМНЫ КНІГААБМЕН**

Абмен дакументамі паміж бібліятэкамі, якія ўваходзяць у цэнтралізаваную бібліятэчную сістэму. Ажыццяўляецца праз абменныя фонды бібліятэк з дапамогай цэнтралізаванай інфармацыі аб існуючых і запатрабаваных дакументах.

**УНУТРЫЧАСОПІСНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік, надрукаваны ў часопісе як самастойная публікацыя (**3.3.2.43**).

**УСПРЫМАННЕ ЛІТАРАТУРЫ**

Псіхічная дзейнасць чытача, якая адбываецца ў працэсе чытання і накіраваная на ўспрыманне зместу, формы, мастацкіх асаблівасцей і гістарычных фактаў твора мастацкай літаратуры. У адносінах да іншых відаў дакументаў часцей выкарыстоўваецца тэрмін «разуменне».

**УСТАЎ (СТАТУТ) БІБЛІЯТЭКІ**

Нарматыўны дакумент, звод правіл, якія рэгулююць арганізацыю і парадак яе дзейнасці. Зацвярджаецца заснавальнікамі бібліятэкі. Адлюстроўвае юрыдычны статус бібліятэкі, крыніцы пастаяннага фінансавання, асноўныя задачы дзейнасці, даступнасць, парадак маёмасных узаемаадносін бібліятэкі і заснавальніка, а таксама кіраванне бібліятэкай.

**УСТУПНЫ АРТЫКУЛ**

Артыкул, які папярэднічае апублікаванаму ў кнізе твору (творам). Характарызуе звычайна творчы шлях аўтара, значэнне кнігі ўвогуле і г.д.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# *Ф*

**ФАЙЛ**

1. Ад англ. *картка, дакумент*. Мінімальны лагічны элемент інфармацыі, з якім працуе карыстальнік персанальнага камп'ютара. Ідэнтыфікаваная сукупнасць экзэмпляраў апісанага ў праграме тыпу даных, якія знаходзяцца ў знешняй памяці і даступныя праграме з дапамогай спецыяльных аперацый.

2. У мікраЭВМ – названы абсяг у знешняй памяці.

3. Масіў аднародных даных у межах адной БД, напрыклад самастойны Ф. даведачных ці дапаможных функцый; паказальнік аўтараў з аднолькавым прозвішчам; алфавітны паказальнік адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак ці назваў фізіка-геаграфічных аб'ектаў і г.д.

**ФАКСІМІЛЬНАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне, якое дакладна ўзнаўляе арыгінал – звычайна рэдкія і (ці) каштоўныя выданні, рукапісныя кнігі (памеры, від паперы, пераплёту, асаблівасці тэксту і ілюстрацый і г. д.).

**ФАКТАГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА**

Адказ на разавы запыт, які ўтрымлівае фактычныя звесткі (**3.2.2.20**).

**ФАКУЛЬТАТЫЎНЫ ЭЛЕМЕНТ БІБЛІЯГРАФІЧНАГА АПІСАННЯ**

Элемент, які дае дадатковую інфармацыю аб дакуменце, яго змесце, чытацкім прызначэнні, даведачным ці ілюстрацыйным матэрыяле і г.д.

**ФАНАТЭКА**

Арганізацыя або служба (аддзел бібліятэкі), у абавязкі якой уваходзіць збор, захоўванне і прадастаўленне ў распараджэнне карыстальнікаў гукавых дакументаў (**3.4.2.20**).

**ФАНДРЭЙЗІНГ (БІБЛІЯТЭЧНЫ)**

Сістэма мэтанакіраваных дзеянняў па выяўленні і прыцягненні пазабюджэтнай рэсурснай дапамогі для развіцця сацыяльна значных кірункаў бібліятэчнай дзейнасці. У сам Ф. уключаецца сацыяльнае партнёрства, праектная дзейнасць і дабрачыннасць.

**ФАРМАЛЬНАЯ РАССТАНОЎКА ФОНДУ**

Расстаноўка, у аснове якой – фармальная прымета дакументаў: іх памер (фармат), алфавітны парадак аўтараў і загалоўкаў, месца выдання. Да Ф. р. ф. адносяцца: алфавітная,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

геаграфічная, інвентарная, прыгонная, нумарацыйная, фарматная, храналагічная, моўная.

**ФАРМАЛЬНЫЯ КАТАЛОГІ**

Каталогі, у якіх дакументы адлюстраваны па фармальнай прымеце (алфавітны, нумарны і інш.).

**ФАРМАТ**

Спосаб размяшчэння і прадастаўлення даных на носьбіце інфармацыі (**3.2.1.10**).

**ФАРМАТ ВЫДАННЯ**

Памеры (даўжыня і шырыня) старонкі выдання пасля абрэзкі кніжнага блока, пазначаныя ў міліметрах ці ў выглядзе фармату папяровага аркуша (у сантыметрах) і долі, якую старонка складае ад папяровага аркуша, напрыклад 60х90 $^{1}/_{16}$.

**ФАРМАТ КАТАЛАГІЗАЦЫІ**

Стандартны фармат, які прызначаецца для пераўтварэння бібліяграфічных запісаў у зручную форму для апрацоўкі на ЭВМ. Ф. к. вызначае ўнутраную структуру даных, а таксама знакі і коды (ідэнтыфікатары, індыкатары, маркеры, меткі і інш.), з дапамогай якіх асобныя часткі бібліяграфічных запісаў раздзяляюцца і ідэнтыфікуюцца. Асновай многіх Ф. к. з’яўляецца фармат MARC.

**ФАРМАТНАЯ РАССТАНОЎКА ФОНДУ**

Фармальная расстаноўка дакументаў па іх памерах; спалучаецца з алфавітнай, нумарацыйнай ці інвентарнай; як дапаможная Ф. р. ф. выкарыстоўваецца пры сістэматычнай ці храналагічнай расстаноўцы.

**ФАРМІРАВАННЕ БІБЛІЯГРАФІЧНАГА ЗАПІСУ**

Сукупнасць шэрагу працэсаў каталагізацыі ці бібліяграфавання, якія звязаны з бібліяграфічнай апрацоўкай дакументаў; уключае складанне бібліяграфічнага апісання, выбар першага элемента бібліяграфічнага запісу, індэксаванне (сістэматызацыю і прадметызацыю), фіксацыю вынікаў бібліяграфічнай апрацоўкі на пэўным носьбіце ў зададзенай паслядоўнасці, дапаўненне бібліяграфічнага запісу шыфрам захоўвання дакумента, пералікам прадметных рубрык аб дадатковых бібліяграфічных запісах і іншыя службовыя ўказанні. Пры неабходнасці ў склад бібліяграфічнага запісу ўводзіцца таксама анатацыя ці рэферат. Падрыхтаваны такім чынам адзіны (для дадзенага дакумента) бібліяграфічны запіс можа служыць арыгіналам да тыражавання каталожных картак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У міжнароднай практыцы лічыцца мэтазгодным дапаўняць бібліяграфічнае апісанне ў адзіным бібліяграфічным запісе наступнымі пошукавымі элементамі: у алфавітным каталогу – загалоўкам, калі бібліяграфічны запіс у іншых каталогах адсутнічае; у сістэматычным каталогу – каталожным індэксам (у склад элементаў адзінага бібліяграфічнага запісу ўваходзіць поўны індэкс); у прадметным каталогу – прадметным загалоўкам, які змяшчаецца на месцы загалоўка бібліяграфічнага запісу, а пры яго адсутнасці – вышэй першага радка бібліяграфічнага апісання.

**ФАРМІРАВАННЕ ФОНДУ**

Сукупнасць працэсаў, накіраваных на стварэнне і развіццё бібліятэчнага фонду; складаецца з камплектавання, арганізацыі і кіравання фондам, а таксама выключэння твораў друку і іншых матэрыялаў; залежыць ад віду бібліятэкі, саставу, колькасці і інтарэсаў чытачоў, ад выпуску выдавецкай прадукцыі і развіцця інфармацыйных патрэб навукі і вытворчасці.

**ФАРМУЛЯР КНІГІ**

Картка пэўнай формы, на якой змяшчаюцца асноўныя звесткі аб кнізе; служыць для рэгістрацыі часовых зваротаў кнігі, а таксама для вывучэння фонду.

**ФАРМУЛЯР ЧЫТАЧА**

Картка вызначанай формы, якая служыць для індывідуальнага ўліку чытачоў, выдадзеных ім дакументаў і аналізу чытання.

**ФАСЕТ**

Іерархічны рад паняццяў, аб’яднаных адзінствам зместу ці формы. Тэрмін прапанаваны Ш.Р. Ранганатанам, які вызначыў ім не толькі катэгорыі, але і асноўныя аддзелы (класы), падставы класіфікацыі ўнутры катэгорый, адзінкавыя паняцці.

**ФАСЕТНЫ АНАЛІЗ**

У «Класіфікацыі двукроп’ем» – катэгарыяльны аналіз, у адпаведнасці з якім уся сукупнасць паняццяў, што ўваходзяць у дадзеную навуку, падраздзяляецца на пяць катэгорый: індывідуальнасць, матэрыял, энергія, час, месца. Паняцці, якія ўваходзяць у кожную катэгорыю, у сваю чаргу падзяляюцца на асобныя рады, вылучаныя на многіх падставах; усе паняцці, што ўваходзяць у адзін рад, размяшчаюцца ў іерархічным парадку.

**ФАСЕТНАЯ КЛАСІФІКАЦЫЯ**

Тое, што і аналітыка-сінтэтычная класіфікацыйная сістэма. Тэрмін прапанаваны Ш. Р. Ранганатанам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ФАСЕТНАЯ ФОРМУЛА**

У «Класіфікацыі двукроп'ем» – класіфікацыйная форма, якая дазваляе ў дакладна вызначаным для кожнага класа парадку сінтэзаваць азначэнне, што адлюстроўвае змест дакументаў з індэксаў асобных ізалатаў. У «Класіфікацыі двукроп'ем» існуе ўніверсальная Ф.ф., аднак у кожным з класаў прыведзена свая Ф.ф., якая створана на базе ўніверсальнай, але адлюстроўвае асаблівасці дадзенага класа.

**ФАТАГРАФІЯ РАБОЧАГА ЧАСУ БІБЛІЯТЭКАРА**

Спосаб вывучэння рабочага часу бібліятэкара пры дапамозе бесперапыннага назірання і вымярэння ўсіх затрат рабочага часу на працягу дня ці яго часткі. Разнавіднасць Ф. р. ч. б. – самафатаграфія рабочага часу, якая праводзіцца самім супрацоўнікам.

**ФІЗІЧНАЯ АДЗІНКА**

Фізічна звязаная дакументная адзінка, якая свабодна выбіраецца з іншых дакументных адзінак.

**ФІЛІЯЛ (ФІЛІЯ) ЭСТЭТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ**

Спецыялізаваная філія ЦБС, у якой фонды і формы работы прыстасаваны для ажыццяўлення эстэтычнага выхавання чытачоў.

**ФІЛЬМ**

Празрыстая стужка са святлоадчувальным пакрыццём, на якой фатаграфічным спосабам нанесена серыя відарысаў.

**ФІЛЬМАТЭКА**

Арганізацыя або служба (аддзел бібліятэкі), у абавязкі якой уваходзіць збор, захоўванне і прадастаўленне ў распараджэнне карыстальнікаў кінематаграфічных дакументаў і відэаграм **(3.4.2.21)**.

**ФОНАДАКУМЕНТ**

Дакумент, які змяшчае гукавую інфармацыю, зафіксаваную любой сістэмай гуказапісу.

**ФОНД АЎДЫЯВІЗУАЛЬНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ**

Частка бібліятэчнага фонду, якая складаецца з матэрыялаў, што ўтрымліваюць гукавую і выяўленчую інфармацыю, аднаўленне якой магчыма пры дапамозе спецыяльных тэхнічных сродкаў.

**ФОНД ВЫКАНАНЫХ БІБЛІЯГРАФІЧНЫХ ДАВЕДАК**

Частка даведачна-бібліяграфічнага апарату бібліятэкі, якая ўяўляе сабой збор раней выкананых пісьмовых даведак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ФОНД ВЫЯЎЛЕНЧЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ**

Частка бібліятэчнага фонду, якая складаецца з выяўленчых выданняў (эстампаў, мастацкіх рэпрадукцый, выяўленчых плакатаў, паштовак і альбомаў твораў выяўленчага мастацтва, гравюр, фотаздымкаў і г.д.).

**ФОНД ГУКАЗАПІСАЎ**

Сін.: Фанатэка.

**ФОНД ДЫСЕРТАЦЫЙ**

Частка бібліятэчнага фонду, якая складаецца з дысертацый на атрыманне вучонай ступені кандыдата ці доктара навук, а таксама аўтарэфератаў дысертацый. Збіраецца ў нацыянальных і навуковых бібліятэках, а таксама ў бібліятэках навуковых установаў, у якіх яны выкананы ці абаронены.

**ФОНД ІНКУНАБУЛ**

Частка бібліятэчнага фонду, якая складаецца з кніг, набраных і надрукаваных у пачатку кнігадрукавання (на 1 студзеня 1501 г.).

**ФОНД КАРТАГРАФІЧНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ**

Частка бібліятэчнага фонду, якая складаецца з картаграфічных выданняў (матэрыялаў, якія ўтрымліваюць умоўнае абагульняльнае адлюстраванне паверхні Зямлі і іншых нябесных цел, а таксама прасторавага размяшчэння і развіцця розных аб’ектаў і з’яў; рукапісныя і друкаваныя карты, атласы, планы, глобусы, рэльефныя карты).

**ФОНД КРАЯЗНАЎЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ**

Частка бібліятэчнага фонду, якая складаецца з краязнаўчых дакументаў, што ўтрымліваюць змястоўную інфармацыю аб пэўным геаграфічным рэгіёне, адміністрацыйна-тэрытарыяльным раёне ці населеным пункце.

**ФОНД МАТЭРЫЯЛАЎ ГРУПАВОЙ АПРАЦОЎКІ**

Частка бібліятэчнага фонду, якая ўключае дакументы, аб’яднаныя па аднатыпных прыметах, з мэтай спрашчэння апрацоўкі, адлюстравання ў каталогах і выкарыстання чытачамі.

**ФОНД МІКРАКОПІЙ**

Частка бібліятэчнага фонду, якая складаецца з мікракопій дакументаў, паменшаных у некалькі разоў (друкаваных і рукапісных тэкстаў, ілюстрацый, чарцяжоў, нот і г.д.).

**ФОНД МІКРАФІЛЬМАЎ**

Частка бібліятэчнага фонду, якая складаецца з мікрафільмаў. Ф. м. часта з’яўляецца структурнай часткай фонду мікракопій.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ФОНД МІКРАФІШ**

Частка бібліятэчнага фонду, якая складаецца з мікрафіш. Ф. м. часта з'яўляецца структурнай часткай фонду мікракопій.

**ФОНД НАРМАТЫЎНА-ТЭХНІЧНЫХ І ТЭХНІЧНЫХ ДАКУМЕНТАЎ**

Частка бібліятэчнага фонду, якая ўключае нарматыўна-тэхнічныя дакументы па стандартызацыі, тэхніка-эканамічныя нарматывы і нормы, патэнтныя дакументы, тыпавыя праекты і чарцяжы, каталогі прамысловага абсталявання і вырабаў, прайскуранты на матэрыялы, абсталяванне і прадукцыю, неапублікаваныя пераклады навукова-тэхнічнай літаратуры і іншыя дакументы. Іншы раз існуе ў выглядзе асобных фондаў.

**ФОНД НОТНЫХ ВЫДАННЯЎ**

Частка бібліятэчнага фонду, якая складаецца з нот, надрукаваных у форме кніжнага, часопіснага ці ліставога выдання.

**ФОНД НЕНАДРУКАВАНЫХ ПЕРАКЛАДАЎ**

Частка бібліятэчнага фонду, якая складаецца з ненадрукаваных перакладаў навуковых і навукова-тэхнічных дакументаў.

**ФОНД РАБОЧАГА ЧАСУ БІБЛІЯТЭКІ**

Запланаваны час работы ўсяго персаналу бібліятэкі на працягу пэўнага перыяду. Адрозніваюць гадавы, квартальны, месячны Ф.р.ч.б.

**ФОНД РУКАПІСАЎ**

Частка бібліятэчнага фонду, якая змяшчае рукапісныя кнігі, архівы, калекцыі аўтографаў і іншых рукапісных (машынапісных) матэрыялаў.

**ФОНД РЭДКІХ КНІГ**

Частка бібліятэчнага фонду, якая складаецца з вельмі каштоўных твораў друку (у тым ліку бібліяграфічных рэдкасцей) і рукапісных кніг.

**ФОНДАСХОВІШЧА**

Спецыяльна абсталяванае памяшканне, якое выкарыстоўваецца для захавання дакументаў.

Сін.: Кнігасховішча.

**ФОНДАТРЫМАЛЬНІК**

Бібліятэка ці орган навукова-тэхнічнай інфармацыі, у фондах якіх знаходзіцца неабходны заказчыку дакумент.

**ФОРМА БІБЛІЯТЭЧНАГА КАТАЛОГА**

Гл.: Бібліятэчны каталог.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ФОРМА ЛІЧБАВАЯ**

Спосаб запісу і захоўвання інфармацыі ў выглядзе лічбаў (у адрозненне ад аналагавай формы).

**ФОРМЫ МЕТАДЫЧНАЙ ДАПАМОГІ**

Дапамога бібліятэкару па якім-небудзь пытанні бібліятэчнай дзейнасці. Да вусных Ф.м.д. адносяць такія, як метадычны інструктаж, кансультацыя, практыкум, а да пісьмовых – метадычную распрацоўку, парады і рэкамендацыі, метадычны дапаможнік.

Гл.: Метадычная дапамога.

**ФОТАДАКУМЕНТ**

Выяўленчы дакумент, створаны фатаграфічным спосабам.

**ФОТАТЭКА**

Арганізацыя або служба (аддзел бібліятэкі), у абавязкі якой уваходзіць збор, захоўванне і прадастаўленне ў распараджэнне карыстальнікаў фатаграфічных дакументаў **(3.4.2.22)**.

**ФРАЗЕАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК**

Лінгвістычны слоўнік, які змяшчае фразеалагічныя адзінкі, г.зн. лексічна непадзельныя ўстойлівыя па складзе і структуры словазлучэнні з цэласным значэннем, і іх характарыстыку.

**ФРАНТЫСПІС**

Ілюстрацыя, змешчаная ў пачатку кнігі перад авантытулам ці тытулам, якая вобразна выяўляе змест кнігі наогул ці найбольш важны эпізод.

**ФУНКЦЫЯНАЛЬНЫ АБАНЕМЕНТ**

Абанемент, дзе за кожным бібліятэкарам замацавана пэўная частка работы (працэсаў, аперацый) па абслугоўванні чытачоў (запіс у бібліятэку, прыём дакументаў, афармленне выдачы і г.д.).

**ФУНКЦЫЯНАЛЬНЫ АДДЗЕЛ БІБЛІЯТЭКІ**

Аддзел, які выконвае адну з асноўных функцый бібліятэкі (аддзел камплектавання фондаў, абслугоўвання чытачоў, маркетынгу, рэкламы і інш.).

## *Х*

**ХРАНАЛАГІЧНАЯ ГЛЫБІНЯ ФОНДУ**

Характарыстыка фонду па пачатковым перыядзе сістэматычнага камплектавання дакументаў, якія ўяўляюць навукова значную калекцыю ці збор дакументаў; вызначаецца па больш раннім годзе выдання іх.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ХРАНАЛАГІЧНАЯ РАССТАНОЎКА ФОНДУ**

Фармальная расстаноўка па гадах выпуску ў свет дакументаў; спалучаецца з алфавітнай, фарматнай, нумарацыйнай і іншымі расстаноўкамі.

**ХРАНАЛАГІЧНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАПАМОЖНІК**

Бібліяграфічны дапаможнік, у якім бібліяграфічныя запісы размешчаны ў храналогіі выхаду ў свет і (або) напісання адлюстраваных дакументаў (**3.3.2.40**).

**ХРАНАЛАГІЧНЫ ДАПАМОЖНЫ ПАКАЗАЛЬНІК**

Дапаможны паказальнік, які ўяўляе сабой храналагічны пералік дат выхаду ў свет або дат стварэння дакументаў, што адлюстраваны ў бібліяграфічным дапаможніку.

**ХРАНАЛАГІЧНЫ КАТАЛОГ**

Бібліятэчны каталог, у якім бібліяграфічныя запісы размяшчаюцца па гадах выдання (ці першай публікацыі) дакументаў.

**ХРАНАЛАГІЧНЫ ПАКАЗАЛЬНІК ДА ВЫДАННЯ**

Паказальнік да выдання, які адлюстроўвае храналагічны пералік (у храналогіі дат напісання ці першай публікацыі) дакументаў, што ўключаны ў дадзенае выданне, з адсылкай да адпаведнага тома або старонкі.

**ХРЭСТАМАТЫЯ**

Вучэбны дапаможнік, які ўяўляе сабой зборнік сістэматычна падабраных матэрыялаў – мастацкіх, мемуарных, навуковых, публіцыстычных ці ўрыўкаў з іх, а таксама розных дакументаў.

**ХУТКАСЦЬ ЧЫТАННЯ**

Колькасная характарыстыка прадукцыйнасці чытання; звычайна вымяраецца колькасцю прачытаных слоў у хвіліну і залежыць ад навыкаў чытання, мэтавай установкі і суб'ектыўнага ўспрымання тэксту.

## *Ц*

**ЦБС**

Гл.: Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма.

**ЦЭНТР АНАЛІЗУ ІНФАРМАЦЫІ**

Арганізацыя (або структурнае падраздзяленне), якая спецыяльна створана з мэтай пошуку, адбору, ацэнкі, аналізу і сінтэзу, назапашвання і захоўвання інфармацыі ў пэўнай прадметнай галіне (**3.4.1.4**).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ЦЭНТР МІЖБІБЛІЯТЭЧНАГА АБАНЕМЕНТА**

Бібліятэка, што каардынуе выкарыстанне па міжбібліятэчным абанеменце фондаў бібліятэк, якія знаходзяцца ў сферы яе дзейнасці; існуюць універсальныя і галіновыя цэнтры.

**ЦЭНТР ПА АБМЕНЕ ІНФАРМАЦЫЯЙ**

Інфармацыйны цэнтр, які займаецца зборам і распаўсюджваннем інфармацыі, што ўяўляе ўзаемны інтарэс для розных інфармацыйных цэнтраў на парытэтных некамерцыйных умовах (**3.4.1.5**).

**ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЕ ІНДЭКСАВАННЕ (ЦІ)**

Індэксаванне, якое праводзіцца ў метадычных цэнтрах ці пад іх кіраўніцтвам для выкарыстання ў розных арганізацыях. Састаўнымі часткамі ЦІ з'яўляюцца цэнтралізаваная прадметызацыя і цэнтралізаваная сістэматызацыя.

**ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЕ СКЛАДАННЕ БІБЛІЯГРАФІЧНЫХ АПІСАННЯЎ**

Складанне бібліяграфічных апісанняў дакументаў, якія праводзяцца для сеткі ўстаноў і арганізацый, цэнтраў навукова-тэхнічнай інфармацыі, у рэдакцыях і выдавецтвах з мэтай павышэння якасці каталогаў і ўніфікацыі методыкі складання бібліяграфічных апісанняў.

**ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЯ АПРАЦОЎКА**

Бібліятэчная апрацоўка дакументаў у адной установе для некалькіх філіялаў (аддзяленняў) адной бібліятэкі (у цэнтральнай бібліятэцы). Адрозніваюць Ц. а. поўную і незавершаную (якая патрабуе дадатковай работы).

**ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЯ БАЗА ДАНЫХ**

База даных, змест якой размяшчаецца ў выглядзе адзінага інфармацыйнага масіву на адным ці некалькіх носьбітах у адной ЭВМ.

**ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЯ БІБЛІЯТЭЧНАЯ СІСТЭМА (ЦБС)**

Бібліятэчнае аб'яднанне, якое функцыянуе на аснове агульнага арганізацыйнага і тэхналагічнага адзінства. У ЦБС, як правіла, уваходзіць цэнтральная бібліятэка і бібліятэкі-філіялы. У ЦБС могуць уваходзіць і бібліятэкі, якія не з'яўляюцца падраздзяленнем цэнтральнай бібліятэкі (**3.4.2.3**).

**ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЯ КАТАЛАГІЗАЦЫЯ**

Каталагізацыя дакументаў у метадычных цэнтрах ці пад іх кіраўніцтвам для бібліятэчнай сеткі. Састаўнымі часткамі Ц.к. з'яўляюцца цэнтралізаванае складанне бібліяграфічных апі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

санняў, цэнтралізаваная сістэматызацыя, цэнтралізаваная прадметызацыя. Формамі Ц.к. з'яўляюцца друкаваная каталожная картка і макет анатаванай каталожнай карткі ў выданні. Вынікі Ц.к. могуць быць пададзены ў традыцыйнай (карткавай) ці ў машыначытальнай форме на магнітных стужках, дыскетах, кампакт-дысках і іншых носьбітах інфармацыі.

**ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЯ ПРАДМЕТЫЗАЦЫЯ**

Састаўная частка цэнтралізаванага індэксавання, вынікам якога з'яўляюцца прадметныя рубрыкі, што публікуюцца на друкаваных каталожных картках ці непасрэдна ў выданнях.

**ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЯ СІСТЭМА ФОНДАЎ**

Сістэма фондаў, якая складаецца ў выніку цэнтралізацыі сеткі бібліятэк і іх філіялаў па рэгіянальнай ці ведамаснай прымеце.

**ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЯ СІСТЭМАТЫЗАЦЫЯ**

Састаўная частка цэнтралізаванага індэксавання, вынікам якога з'яўляюцца класіфікацыйныя індэксы, якія публікуюцца на друкаваных каталожных картках ці непасрэдна ў выданнях.

**ЦЭНТРАЛІЗАЦЫЯ БІБЛІЯТЭЧНАЙ СЕТКІ**

Стварэнне бібліятэчных аб'яднанняў, у якія ўваходзяць цэнтральная бібліятэка (ажыццяўляе адміністрацыйнае і метадычнае кіраванне, цэнтралізаванае камплектаванне і апрацоўку літаратуры) і бібліятэкі-філіялы, якія абслугоўваюць насельніцтва пэўнага рэгіёна. Ц.б.с. магчыма ўнутры аднаго ведамства і можа быць міжведамаснай. Адрозніваюць поўную Ц. – аб'яднанне бібліятэк у адзіную сістэму з агульным кніжным фондам, штатам работнікаў, адзіным кіраўніцтвам, цэнтралізаваным камплектаваннем і апрацоўкай, і частковую, калі аб'ядноўваюцца сродкі на камплектаванне, апрацоўку літаратуры і іншыя агульнасістэмныя расходы.

**ЦЭНТРАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Галаўное падраздзяленне ЦБС, якое кіруе бібліятэкамі-філіяламі і забяспечвае цэнтралізаванае камплектаванне, апрацоўку дакументаў, інфармацыйнае абслугоўванне на аснове адзінага ДБА (**3.4.2.4**).

**ЦЭНТРАЛЬНЫ КАТАЛОГ**

Бібліятэчны каталог, што адлюстроўвае фонд цэнтральнай бібліятэкі і фонды ўсіх бібліятэк-філіялаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Ч

**ЧАСОВЫ СУПРАЦОЎНІК**

Супрацоўнік, які ўзяты на працу ў бібліятэку па дагаворы на пэўны тэрмін для замены бібліятэкара на час чарговага адпачынку, доўгатэрміновай хваробы, у іншых сітуацыях.

**ЧАСОПІС**

Перыядычнае тэкставае збрашураванае выданне, якое змяшчае артыкулы ці рэфераты па розных грамадска-палітычных, навуковых, вытворчых і іншых пытаннях, літаратурныя творы, ілюстраваныя матэрыялы, афіцыйна зацверджанае ў якасці дадзенага віду выдання.

**ЧАСОПІСНАЕ ВЫДАННЕ**

Выданне ў выглядзе блока змацаваных карэньчыкаў лістоў друкаванага матэрыялу пэўнага фармату ў вокладцы або пераплёце, які прыстасаваны да спецыфікі дадзенага перыядычнага выдання. Віды Ч. в.: часопісы, перыядычныя зборнікі, бюлетэні.

**ЧАСОПІСНЫ ФОНД**

Частка бібліятэчнага фонду, якая складаецца з твораў друку, якім уласцівы прыметы часопіснага выдання.

**ЧАСТКА ВЫДАННЯ**

Буйная структурна-кампазіцыйная адзінка выдання, якая мае нумар ці загаловак. Можа быць выпушчана як асобная кніга.

**ЧАСТОТНЫ СЛОЎНІК**

Лінгвістычны слоўнік, які змяшчае пералік слоў, размешчаных па ступені іх выкарыстання ў мове.

**ЧЫТАЛЬНАСЦЬ**

Адносны паказчык абслугоўвання чытачоў, які характарызуе інтэнсіўнасць чытання. Вымяраецца колькасцю дакументаў, выданых у сярэднім аднаму чытачу за пэўны час.

**ЧЫТАЛЬНАЯ ЗАЛА**

Спецыяльна абсталяванае памяшканне, якое выкарыстоўваецца для прадастаўлення чытачам дакументаў і магчымасці працаваць з імі.

**ЧЫТАЛЬНАЯ ЗАЛА ДЛЯ ЮНАЦТВА**

Структурнае падраздзяленне ў бібліятэцы, якое займаецца бібліятэчным абслугоўваннем юнацтва.

**ЧЫТАЛЬНАЯ ЗАЛА ПЕРЫЁДЫКІ**

Зала месцазнаходжання выданняў перыядычнага друку, прыстасаваная для працы карыстальніка бібліятэкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ЧЫТАЛЬНА-КАПІРАВАЛЬНЫ АПАРАТ**

Праекцыйны апарат для прагляду павялічаных адлюстраванняў мікракопій на экране і выраб іх павялічаных копій на паперы.

**ЧЫТАЛЬНЫ АПАРАТ**

Рэпраграфічны апарат з аптычным прыстасаваннем для павелічэння і чытання мікракопій дакументаў.

**ЧЫТАННЕ**

Від камунікатыўна-пазнавальнай дзейнасці (духоўных зносін і ўзаемаўплыву людзей), накіраванай на задавальненне розных патрэб (прафесійных, эстэтычных і інш.) сродкамі друкаванай інфармацыі. Ч. – адзін з важных сродкаў фарміравання грамадскай свядомасці і светапогляду людзей. Найважнейшыя напрамкі тэорыі Ч.: сацыялогія Ч., педагогіка Ч., псіхалогія Ч.

**ЧЫТАЦКАЕ МЕСЦА**

Стацыянарнае месца для работы чытача ў бібліятэцы, забяспечанае неабходным бібліятэчным абсталяваннем.

**ЧЫТАЦКАЕ ПАТРАБАВАННЕ**

Запоўнены чытачом бланк для заказу дакументаў з фонду бібліятэкі.

**ЧЫТАЦКАЯ АЎДЫТОРЫЯ**

Група чытачоў, арыентаваных на пэўны від дакументаў або каналы камунікацый. Ч. а. звычайна размеркавана не толькі ў прасторы, але і ў часе. Разнавіднасцю Ч. а. бібліятэкі з'яўляецца кантактная аўдыторыя, з якой бібліятэкар уступае ў непасрэдныя зносіны ў працэсе работы.

**ЧЫТАЦКАЯ ГРУПА**

Пэўная частка чытачоў, аб'яднаных па пэўнай прымеце: сацыяльна-дэмаграфічнай, прафесійнай і інш. Унутры гэтых груп выдзяляюцца малыя групы: па ўзроўні начытанасці, накіраванасці і ўстойлівасці чытацкіх інтарэсаў і інш. Выдзяленне Ч.г. неабходна ў першую чаргу ў дзіцячых бібліятэках з мэтай іх дыферэнцаванага абслугоўвання і кіраўніцтва чытаннем.

**ЧЫТАЦКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ**

Публічнае абмеркаванне кніг, якое садзейнічае развіццю публічнага мыслення, аналітычнаму асэнсаванню матэрыялу, зносінам паміж чытачамі. Разнавіднасці Ч.к.: чытацка-глядзельная канферэнцыя, адначасовае абмеркаванне фільма, спек-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

такля і твора, па матывах якога ён створаны; прэм'ера кнігі, прэс-канферэнцыя, прэзентацыя і інш.

**ЧЫТАЦКАЯ НАКІРАВАНАСЦЬ**

Дынамічная сістэма адносін асобы, групы ці грамадства да чытання дакументаў; вызначае выбіральнасць чытацкай актыўнасці і праяўляецца ў патрэбнасці чытання, чытацкіх інтарэсах і ўстаноўках, устойлівых матывах чытання.

**ЧЫТАЦКАЯ ПСІХАЛОГІЯ**

Цэласнае структурнае ўтварэнне ў грамадскім ці індывідуальным усведамленні, якое рэгулюе ўзаемаадносіны чытача (асобы, групы, грамадства) да дакументаў розных форм. У паводзінах і дзейнасці чытачоў Ч.п. праяўляецца ў выбары зместу і спосабу чытання, запыце на дакументы, асаблівасцях успрымання, разумення і інш.

**ЧЫТАЦКАЯ ЎСТАНОЎКА**

Кампанент чытацкай накіраванасці – цэласны псіхалагічны стан асобы (групы, грамадства), які выражаецца ў падрыхтаванасці (настроі) рэагаваць пэўным чынам на дакументы: выбіраць іх, чытаць, успрымаць і ацэньваць з пэўнага пункту гледжання. Кампаненты Ч.у. звязаны з жыццёвым вопытам асобы (начытанасць, чытацкія звычкі, навыкі, інфармацыйная культура і г.д.) ці з яе індывідуальна-тыпалагічнымі ўласцівасцямі (спецыфічныя чытацкія здольнасці, асаблівасці чытання, абумоўленыя рысамі характару) або грамадскай псіхалогіяй (чытацкая накіраванасць).

**ЧЫТАЦКІ БІЛЕТ**

Дакумент, які дае права на карыстанне бібліятэкай ці цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмай. Ч.б. змяшчае асноўныя звесткі пра чытача.

**ЧЫТАЦКІ ІНТАРЭС**

Выбіральна-станоўчыя адносіны чытача да чытання дакументаў, якія прыцягваюць яго эмацыянальна ці з'яўляюцца значнымі для яго ў нейкім аспекце. У залежнасці ад таго, хто выступае суб'ектам Ч. і., іх можна разглядаць як асабістыя, групавыя, грамадскія. Ч. і. класіфікуюць таксама па змесце (накіраванасці на дакументы розных відаў, жанраў, тэматыкі і г.д.) і па глыбіні, устойлівасці і актыўнасці.

**ЧЫТАЦКІ КАТАЛОГ**

Бібліятэчны каталог для чытачоў; можа адначасова выконваць функцыі і службовага пры яго адсутнасці.

Гл.: Электронны каталог.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ЧЫТАЦКІ СТОЛ**

Стол, прызначаны для работы чытачоў з дакументамі, а таксама (пры выкарыстанні адпаведнай настольнай апаратуры) для работы з мікракопіямі, для праслухоўвання гуказапісаў і інш. Ч.с. бываюць індывідуальныя, двух-, трохмесныя і групавыя.

**ЧЫТАЧ**

Сацыяльны суб’ект чытання як рэгулярнай дзейнасці, якая адпавядае яго духоўным запатрабаванням, характарызуецца спецыфічнай чытацкай псіхалогіяй і з’яўляецца ў той жа час аб’ектам уздзеяння з боку аўтара, друкаванай прадукцыі, каналаў яе распаўсюджвання.

**ЧЫТАЧ БІБЛІЯТЭКІ**

Асоба, якая карыстаецца бібліятэкай на аснове афіцыйнага запісу ва ўстаноўленых дакументах (**3.2.2.24**).

**ЧЫТАЧАЗНАЎСТВА**

Бібліятэказнаўчая дысцыпліна, якая ўключае гісторыю, тэорыю, методыку і арганізацыю абслугоўвання чытачоў.

## *Ш*

**ШКОЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Бібліятэка, якая з’яўляецца структурным падраздзяленнем агульнаадукацыйнай установы і арганізуе бібліятэчнае абслугоўванне вучняў, настаўнікаў, іншых работнікаў школы, бацькоў.

**ШЛЯХ БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ ДАВЕДКІ**

Вызначэнне паслядоўнасці працэсаў і аперацый выканання бібліяграфічнай даведкі ў бібліятэцы. Ш.б.д. фіксуецца наборам правіл у інструкцыі, а таксама можа быць паказаны графічна ў выглядзе блок-схемы.

**ШЛЯХ КНІГІ**

Вызначаная паслядоўнасць працэсаў і аперацый работы над кнігай з моманту яе набыцця ў бібліятэку да выключэння з фонду. Ш.к. фіксуецца наборам правіл у інструкцыі, а таксама можа быць адлюстраваны графічна ў выглядзе блок-схемы.

**ШЛЯХ ЧЫТАЦКАГА ПАТРАБАВАННЯ**

Вызначаная паслядоўнасць працэсаў і аперацый па выкананні чытацкага запыту на дакументы. Ш.ч.п. фіксуецца наборам правіл у інструкцыі, а таксама можа быць адлюстраваны графічна ў выглядзе блок-схемы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ШМАТАСПЕКТНАЕ ІНДЭКСАВАННЕ**

Індэксаванне тэксту (дакумента) паралельна па некалькіх розных прыметах.

**ШМАТГАЛІНОВЫ ФОНД**

Бібліятэчны фонд, які складзены з дакументаў па некалькіх (многіх) галінах ведаў.

**ШМАТМЕРНАЯ КЛАСІФІКАЦЫЯ**

Класіфікацыйная сістэма, у якой кожны клас можа раздзяляцца больш чым па адной прымеце.

**ШМАТМОЎНЫ СЛОЎНІК**

Слоўнік, які супастаўляе моўныя адзінкі некалькіх моў.

**ШМАТРАЗОВАЕ АДЛЮСТРАВАННЕ Ў СІСТЭМАТЫЗАЦЫІ (ПРАДМЕТЫЗАЦЫІ)**

Метад сістэматызацыі (прадметызацыі), пры якім аб’ект сістэматызацыі (прадметызацыі) адлюстроўваецца па сваім змесце ў двух і больш дзяленнях сістэматычнага (прадметнага) каталога. Адпаведна афармляецца неабходная колькасць каталожных картак. Прымяненне тэрмінаў «дубліраванне», «паўторнае адлюстраванне» тут не рэкамендуецца.

**ШМАТТОМНАЕ ВЫДАННЕ**

Неперыядычнае выданне, якое складаецца з двух ці больш нумараваных тамоў і ўяўляе сабой адзінае цэлае па змесце і афармленні.

**ШМАТЧЛЕННАЯ ПРАДМЕТНАЯ РУБРЫКА**

Складаная прадметная рубрыка, у якой лексічныя адзінкі размешчаны ў пэўным парадку і адасоблены адна ад другой пры дапамозе раздзяляльнага знака. У якасці раздзяляльнага знака ўжываецца працяжнік, іншы раз – кропка з коскай.

**ШМУЦТЫТУЛ**

1. У старажытных выданнях дадатковы тытул, які змяшчаецца перад тытульным лістом для захавання яго ад забруджвання.

2. Асобны ліст ці старонка з загалоўкам часткі, раздзела выдання, загаловак твора без асноўнага тэксту публікацыі.

**ШРЫФТ**

Графічная форма знакаў пэўнай сістэмы пісьменства. У залежнасці ад тэхнікі выканання адрозніваюць рукапісныя, маляваныя, гравіраваныя, наборныя Ш. (апошнія ўяўляюць сабой камплект літар для ручнога ці механізаванага набору тэксту); наборныя Ш. называюцца друкарскімі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ШТОГОДНІК**

Перыядычнае выданне ці выданне, якое прадаўжаецца. Выпускаецца раз у год і ўтрымлівае абазначаныя ў загалоўку звесткі за год ці іншага роду бягучыя матэрыялы.

**ШТОМЕСЯЧНІК**

Перыядычнае выданне, якое выпускаецца раз у месяц.

Сін.: Штомесячнае выданне.

**ШТОТЫДНЁВІК**

Перыядычнае выданне, якое выпускаецца адзін раз у тыдзень.

Сін.: Штотыднёвае выданне.

**ШТРЫХАВЫ КОД**

Спосаб кадзіравання інфармацыі пры дапамозе камбінацый, якія наносяцца тыпаграфічным спосабам паралельных штрыхавых ліній рознай таўшчыні з рознымі прамежкамі паміж імі. Чытаецца спецыяльным аптычным прыстасаваннем. У аўтаматызаваных інфармацыйна-бібліятэчных сістэмах выкарыстоўваецца для кадзіравання адзінак захоўвання і чытацкіх білетаў.

**ШТЭМПЕЛЬ БІБЛІЯТЭКІ**

Пячатка з тэкстам-назвай бібліятэкі звычайна памерам 1,5х 4 см.

**ШЫРОКІ КОМПЛЕКС ПРАДМЕТНЫХ РУБРЫК**

Комплекс прадметных рубрык, у якім сабраны прадметныя рубрыкі аб многіх тэматычна ўзаемазвязаных прадметах і аб'яднаных з дапамогай спасылачна-даведачнага апарату. У гэтым значэнні неўжывальны тэрмін «складаны комплекс прадметных рубрык».

**ШЫФР ЗАХОЎВАННЯ ДАКУМЕНТА**

Умоўнае азначэнне месца захоўвання дакумента ў выглядзе літарных або лічбавых знакаў; можа ўключаць парадкавыя нумары дакументаў па меры іх паступлення ў бібліятэку, інвентарныя нумары, класіфікацыйныя індэксы, аўтарскія знакі і г.д. Структура Ш.з.д. залежыць ад спосабу расстаноўкі фонду.

Сін.: Бібліятэчны шыфр.

## Э

**ЭВМ (КАМП'ЮТАР)**

Вылічальная машына, асноўныя функцыі якой ажыццяўляюцца на электронных прыборах і схемах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ЭКАНОМІКА БІБЛІЯТЭЧНАЙ СПРАВЫ**

Частка эканомікі культуры, прадметам якой з'яўляюцца эканамічны аналіз дзейнасці бібліятэк, асаблівасці прымянення эканамічных законаў і катэгорый у бібліятэчнай справе.

**ЭКЗЭМПЛЯР**

Адзінка ўліку дакумента – кожная асобная адзінка выдання з тыражу, катушка (для дыяфільмаў і мікрафільмаў), дыск (для грамафонных пласцінак) і інш.

**ЭКЗЭМПЛЯРНАСЦЬ**

Сярэдняя колькасць экзэмпляраў адных і тых жа назваў дакументаў у бібліятэчным фондзе. Адрозніваюць Э. агульную (устанаўліваецца шляхам дзялення агульнага аб'ёму фонду на колькасць назваў дакументаў) і прыватную (разлічваецца шляхам дзялення колькасці дакументаў пэўных частак бібліятэчнага фонду на колькасць назваў, якія змяшчаюцца ў гэтай частцы).

**ЭКСЛІБРЫС** (ад. лац. *ex libris* – з кніг)

Кніжны знак, папяровы ярлык, які наклейваўся ўладальнікамі бібліятэк на кнігу (пераважна на ўнутраны бок пераплёту (вокладкі)); звычайна на ім абазначана імя і прозвішча ўладальніка і малюнак, які лаканічна і вобразна гаворыць аб яго прафесіі, інтарэсах ці аб складзе бібліятэкі.

**ЭКСПРЭС-ІНФАРМАЦЫЯ**

Перыядычнае часопіснае ці ліставое інфармацыйнае выданне, якое змяшчае пашыраныя рэфераты (рэферат) найбольш актуальных апублікаваных айчынных дакументаў, якія патрабуюць аператыўнага апавяшчэння пра іх.

**ЭКСТЭРЫЁРЫКА**

Тэрмін паходзіць ад лацінскага слова *terra*, што азначае краіна, і прыстаўкі *ex* (азначае з, па-за). У міжнароднай бібліятэчна-бібліяграфічнай практыцы паняцце Э. ужываецца для абазначэння групы дакументаў, якія па мове, аўтарскай прымеце і змесце адносяцца да пэўнай краіны, але выдадзены за яе межамі.

**ЭЛЕКТРАГРАФІЯ**

Метады капіравання, заснаваныя на выкарыстанні электрычных з'яў.

**ЭЛЕКТРАФАТАГРАФІЯ**

Спосаб капіравання дакументаў, заснаваны на ўласцівасці адпаведных паўправадніковых матэрыялаў, зараджаных элек-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

трычнасцю, ствараць скрытае адлюстраванне праецыруемага арыгінала.

**ЭЛЕКТРОННАЯ БІБЛІЯГРАФІЯ**

Бібліяграфія, якая функцыянуе ў электронным асяроддзі і апіраецца на электронна-інфармацыйныя тэхналогіі і сучасныя сродкі сувязі.

**ЭЛЕКТРОННАЯ ПОШТА**

Сродкі перасылкі паведамленняў паміж карыстальнікамі сеткі ЭВМ і захоўвання гэтых паведамленняў.

**ЭЛЕКТРОННАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Від размеркаванай дакументнай сістэмы, якая адлюстроўвае дакументы незалежна ад іх фізічнага знаходжання і юрыдычнай прыналежнасці (да бібліятэк, архіваў, музеяў, інфацэнтраў і г.д.) у машынаўспрымальнай (электроннай) форме. Доступ да іх забяспечваецца праграмнымі сродкамі з аднаго пункта праз глабальныя інфармацыйныя сродкі.

**ЭЛЕКТРОННЫ КАТАЛОГ (ЭК)**

Бібліятэчны каталог у машыначытальнай форме (працуе ў рэальным рэжыме часу), што прадстаўлены для карыстання чытачам у бібліятэцы. Работа з ЭК вядзецца з дапамогай тэрмінала. Спажывец ЭК (чытач, бібліятэкар) з дапамогай спецыяльных праграм і алгарытмаў можа ўвайсці ў банк даных ці выкарыстаць падключаную да пэўнага ЭК базу даных. Дыялог карыстальнікаў ажыццяўляецца з дапамогай меню і масак.

**ЭЛЕКТРОННЫ ЎЛІК**

Улік дакументаў, якія складаюць фонд бібліятэкі, пры дапамозе сродкаў камп’ютарнай тэхналогіі.

**ЭЛЕМЕНТ БІБЛІЯГРАФІЧНАГА АПІСАННЯ**

Мінімальная структурная адзінка бібліяграфічнага апісання, якое змяшчае адну ці некалькі пэўных бібліяграфічных звестак. Э. б. а. падраздзяляюцца на абавязковыя і факультатыўныя.

**ЭНЦЫКЛАПЕДЫЧНЫ СЛОЎНІК**

Гл.: Энцыклапедыя.

**ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ**

Аднатомнае ці шматтомнае даведачнае выданне, якое змяшчае ў абагульняльным выглядзе асноўныя звесткі па адной ці ўсіх галінах ведаў у практычнай дзейнасці; выкладзена ў форме кароткіх артыкулаў, размешчаных у алфавітным або сістэматычным парадку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ЭПІДЫЯСКОП**

Праекцыйны апарат, які служыць для аднаўлення на экране нерухомых адлюстраванняў як з празрыстых, так і з непразрыстых носьбітаў.

**ЭСТАМП**

Адбітак твора выяўленчага мастацтва з друкарскай формы (напрыклад, гравюры), зроблены самім мастаком.

**ЭТНІЧНЫЯ ТЫПАВЫЯ ДЗЯЛЕННІ**

Тыпавыя дзяленні ББК, якія адлюстроўваюць катэгорыю «народ».

**ЭТЫМАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК**

Лінгвістычны слоўнік, у якім тлумачыцца паходжанне слоў.

**ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ РАБОТЫ БІБЛІЯТЭКІ**

Ступень адпаведнасці вынікаў бібліятэчнай дзейнасці мэтам функцыянавання бібліятэкі. Павышэнне эфектыўнасці заключаецца ў атрыманні дадатковых канчатковых вынікаў пры дадзеных аб'ёме і структуры затрачаных бібліятэчных рэсурсаў. Праблемы Э.р.б. вывучаюцца ў сацыяльным, функцыянальным, эканамічным аспектах.

## *Ю*

**ЮБІЛЕЙНАЕ ВЫДАННЕ**

Палепшанае ў афармленні выданне, якое выпускаецца да юбілейнай даты.

**ЮНАЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА**

Бібліятэка ўніверсальнага профілю, якая арганізуе бібліятэчнае абслугоўванне юнацтва, а таксама чытачоў, якія займаюцца праблемамі юнацтва.

## *Я*

**ЯДРО ФОНДУ**

Мінімум каштоўных у навуковых, мастацкіх адносінах дакументаў і іншых матэрыялаў па тых галінах ведаў і відах выданняў, якія адпавядаюць профілю фонду гэтай бібліятэкі.

**ЯКАСНЫЯ ПАКАЗЧЫКІ БІБЛІЯТЭЧНАГА АБСЛУГОЎВАННЯ**

Асноўныя крытэрыі, на падставе якіх можна даць ацэнку дзейнасці бібліятэкі з пункту гледжання яе сацыяльнай эфек-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тыўнасці. Да іх адносяцца, напрыклад, аб'ём абслугоўвання, наведванне, ступень ахопу карыстальнікаў, чытальнасць, аператыўнасць абслугоўвання, прымяненне навацыйных тэхналогій і г.д.

**ЯКАСЦЬ БІБЛІЯТЭЧНАГА АБСЛУГОЎВАННЯ**

Сукупнасць уласцівасцей, што характарызуюць ступень задавальнення і развіцця чытацкіх патрэб паслугамі і прадуктамі бібліятэкі.

**ЯКАСЦЬ БІБЛІЯТЭЧНАЙ ПАСЛУГІ**

Ступень паўнаты, аператыўнасці і дакладнасці аказання паслугі карыстальніку.

**ЯРЛЫК**

Лісток паперы любой формы невялікага памеру, які наклейваецца на пераплёт (вокладку) твора друку і прызначаецца для напісання шыфра.

**ЯРУСНАЕ ФОНДАСХОВІШЧА**

Сховішча ў выглядзе размешчаных адзін над адным ярусаў-паверхаў (звычайна 2,2 м) з металічнымі рашоткамі, што служаць перакрыццямі паміж імі і металічнымі стэлажамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**У слоўнік уключаны тэрміны з наступных стандартаў:**

*1. СТБ 7.0-2004.* Інфармацыйна-бібліятэчная дзейнасць, бібліяграфія. Тэрміны і азначэнні = Информационно-библиотечная деятельность, библиография. Термины и определения. – Узамен ГОСТ 7.0 – 84, ГОСТ 7.26-80; уведз. 2005- 07- 01. – Мінск: Дзяржстандарт, 2004. – 35 с.

*2. ГОСТ 7.1-2003.* Библиографическая запись. Библиографическое описание. Общие требования и правила составления = Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне. Агульныя патрабаванні і правілы састаўлення; введ. 2004-11-01. – Минск: Госстандарт Республики Беларусь, 2004. – 48 с.

*3. ГОСТ 7.4-95.* Издания. Выходные сведения. – Взамен ГОСТ 7.4 – 86; введ. 1997-01-01. – Минск, 1996. – 51 с. – Измен. №1 РБ; введ. 2003-09-01.

*4. СТБ 7.20-2000.* Бібліятэчная статыстыка. Асноўныя палажэнні = Библиотечная статистика. Основные положения. – Мінск: Дзяржстандарт, 2000. – [6] с. – (Сістэма стандартаў па інфармацыі, бібліятэчнай і выдавецкай справе) (Дзяржаўны стандарт Рэспублікі Беларусь).

*5. СТБ 7.200-2003.* Альбомы. Общие технические условия = Альбомы. Агульныя тэхнічныя ўмовы. – Минск, [2003]. – 27 с. – (Система стандартов по информации, библиотечному и издательскому делу) (Государственный стандарт Республики Беларусь).

*6. СТБ 7.201-2003.* Журналы. Общие технические условия = Часопісы. Агульныя тэхнічныя ўмовы. – Минск: Госстандарт, 2003. – [40] с. – (Система стандартов по информации, библиотечному и издательскому делу) (Государственный стандарт Республики Беларусь).

*7. СТБ 7.202-2005.* Справочники. Основные виды. Требования к основному тексту, аппарату издания и издательскому оформлению = Даведнікі. Асноўныя віды. Патрабаванні да асноўнага тэксту, апарату выдання і выдавецкага афармлення. – Минск: Госстандарт, 2005. – [7] с. – (Система стандартов по информации, библиотечному и издательскому делу) (Государственный стандарт Республики Беларусь).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЛІТАРАТУРА

1. *Аб бібліятэчнай* справе ў Рэспубліцы Беларусь: Закон Рэсп. Беларусь, 22 сак. 1995 г., № 3680-XII (у рэд. Закона, 11 лістап. 2002 г., № 147. 3 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2002. – № 128. – С. 21–29.

2. *Баранов, В. М.* Традиционная и автоматизированная каталогизация: теоретический и технологический аспекты: учеб. пособие / В. М. Баранов. – М.: Моск. гос. ин-т культуры, 1990. – 74 с.

3. *ГОСТ* 7.90-2007. Универсальная десятичная классификация. Структура, правила ведения и индексирования. – М.: Стандарт ИНФОРМ, 2008. – 22 с.

4. *ГОСТ* 7.82-2001. Библиографическая запись. Библиографическое описание электронных ресурсов. Общие требования и правила составления. – Минск: Межгосударственный совет по стандартизации, метрологии и сертификации, 2001. – 23 с.

5. *Библиотечная* энциклопедия / науч. ред. Ю. А. Гриханов. – М.: Пашков дом, 2007. – С. 190–191.

6. *Библиотечное* дело: терминологический словарь. – 3-е изд., перераб. и доп. – М.: Книга, 1997. – 168 с.

7. *Государственный* рубрикатор научно-технической информации. – 6-е изд. – М.: ФАИР, 2007. – 136 с.

8. *Гринина, Р.Ф.* Теоретические основы предметизации и предметного каталога: учеб. пособие для студ. библ. фак. / Р. Ф. Гринина. – Л.: Ленингр. гос. ин-т культуры им. Н. К. Крупской, 1989. – 72 с.

9. *Зупарова, Л. Б.* Аналитико-синтетическая переработка информации: учебник для студ. высш. учеб. заведений, обучающихся по специальности 052700 – Библиотечно-информационная деятельность / Л. Б. Зупарова, Т. А. Зайцева. – М.: ФАИР, 2007. – 400 с.

10. *Зупарова, Л. Б.* Библиотечная обработка документа: учеб.- метод. пособие / Л. Б. Зупарова, Т. А. Зайцева, Л. И. Сазонова; под науч. ред. Ю. Н. Столярова. – М.: Либерея, 2003. – 208 с.

11. *Иванов, Н. В.* К проблеме оценки качества индексирования технической литературы по УДК / Н. В. Иванов // Вопросы библиографоведения и библиотековедения. – М., 1982. – Вып. 12. – С. 81–91.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

12. *Карачинская, Э. Т.* Предметизация произведений печати. Предметный каталог: учеб. пособие / Э. Т. Карачинская, В. К. Удалова. – Харьков: Ин-т культуры, 1987. – 88 с.

13. *Ковалевская, Н. И.* УДК как инструмент индексирования документов по фундаментальным наукам: опыт Национальной библиотеки Беларуси / Н. И. Ковалевская // Науч.-техн. информация. Сер. 1: Организация и методика информационной работы. – 2009. – № 9. – С. 36–40.

14. *Ляйко, Н. А.* Выкарыстанне ББК у якасці інфармацыйна-пошукавай мовы (ІПМ) каталогаў бібліятэк Беларусі / Н. А. Ляйко // Бібліятэчны свет. – 2002 . – № 2. – С. 52–54.

15. *Об информации,* информатизации и защите информации: Закон Респ. Беларусь, 10 ноябр. 2008 г., № 455-З // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2008. – № 279. – С. 14–27.

16. *Об электронном* документе: Закон Респ. Беларусь, 10 янв. 2000 г., № 357-З // Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэсп. Беларусь. – 2000. – № 3. – Арт. 27.

17. *Российские* правила каталогизации / Рос. библ. ассоц., Межрегион. ком. по каталогизации; авт. кол.: Н. Н. Каспарова (рук.) [и др.]. – М., 2004. – Ч. 1: Основные положения и правила. – 2004. – 242 с.

18. *Справочник* библиографа / науч. ред.: А. Н. Ванеев, В. А. Минкина. – СПб.: Профессия, 2002. – С. 276–320.

19. *Справочник* библиотекаря / науч. ред.: А. Н. Ванеев, В. А. Минкина. – 2-е изд., испр. и доп. – СПб.: Профессия, 2001. – С. 93–97.

20. *Справочник* библиографа / науч. ред.: А. Н. Ванеев, В. А. Минкина. – СПб.: Профессия, 2002. – С. 276–320.

21. *Сукиасян, Э. Р.* Библиотечные каталоги: метод. материалы / Э. Р. Сукиасян. – М.: Профиздат, 2001. – 187 с.

22. *Учебное* пособие по Универсальной десятичной классификации / ВИНИТИ РАН; гл. ред. Ю. М. Арский. – 2-е изд., испр. и доп. – М., 2009. – 188 с.

23. *Фокеев, В. А.* Библиографическая наука и практика: терминологический словарь / В. А. Фокеев. – СПб.: Профессия, 2008. – 270 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ

Прадмова ………………………………………………………..……. 3
Спіс скарачэнняў ……………………………………….………… 5
А ………………………………………………………………………… 6
Б ……………………………………………………………………….. 34
В ………………………………………………………………………… 59
Г ……………………………………………………………………….. 73
Д ………………………………………………………………………… 79
Ё ……………………………………………………………………….. 91
Ж ………………………………………………………………………… 91
З ……………………………………………………………………….. 91
І ………………………………………………………………………… 97
К ………………………………………………………………………. 106
Л ………………………………………………………………………… 130
М ……………………………………………………………………… 134
Н ……………………………………………………………………… 144
О ……………………………………………………………………… 151
П ……………………………………………………………………… 151
Р ……………………………………………………………………….. 172
С ………………………………………………………………………… 180
Т ……………………………………………………………………….. 195
У ……………………………………………………………………… 203
Ф ……………………………………………………………………… 208
Х ……………………………………………………………………… 214
Ц ……………………………………………………………………… 215
Ч ………………………………………………………………………… 218
Ш ……………………………………………………………………… 221
Э ………………………………………………………………………… 223
Ю ……………………………………………………………………… 226
Я ………………………………………………………………………… 226

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Даведачнае выданне*

**Лявончыкаў** Васіль Емяльянавіч
**Дзямешка** Лілія Адамаўна
**Саматыя** Рычард Іванавіч

# ТЛУМАЧАЛЬНЫ СЛОЎНІК БІБЛІЯТЭЧНЫХ І БІБЛІЯГРАФІЧНЫХ ТЭРМІНАЎ

*3-е выданне, выпраўленае і дапоўненае*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2012. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 13,48. Ул.-выд. арк. 9,96. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 от 19.05.2011.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ